


# Гарадзенскія чытанні



ДУК "ГРОДЗЕНСКАЯ АБЛАСНАЯ НАВУКОВАЯ
БІБЛІЯТЭКА ІМЯ Я.Ф.КАРСКАГА"

АДДЗЕЛ КРАЯЗНАЎСТВА

# ГАРАДЗЕНСКІЯ ЧЫТАННІ

Зборнік матэрыялаў

Гродна
«Гродзенская друкарня»
2011

УДК 908(476.6)(082)
ББК 26.89(4Беи)я43
Г20

Складальнік
Л.І. Турмасава, загадчык аддзела краязнаўства ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага"

Навуковы рэдактар
С.В. Марозава, доктар гістарычных навук, прафесар,
загадчык кафедры гісторыі Беларусі УА "ГрДУ імя Я.Купалы

Рэдакцыйная калегія:
А.Ч. Лойка, начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама
Л.В. Мальцава, дырэктар ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага"
С.У. Амелька, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі УА "ГрДУ імя Я.Купалы"
С.Я. Куль-Сяльверстава, доктар гістарычных навук, прафесар кафедры археалогіі і этналогіі УА "ГрДУ імя Я.Купалы"
С.В. Марозава, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі УА "ГрДУ імя Я.Купалы"
А.М. Пяткевіч, кандыдат філалагічных навук, прафесар кафедры беларускай культуры і рэгіянальнага турызму УА "ГрДУ імя Я.Купалы"
В.В. Швед, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай культуры і рэгіянальнага турызму УА "ГрДУ імя Я.Купалы"
Э.С. Ярмусік, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дэкан факультэта гісторыі і сацыялогіі УА "ГрДУ імя Я.Купалы"

Рэцэнзент
С.А. Піваварчык, доктар гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры археалогіі і этналогіі УА "ГрДУ імя Я.Купалы"

Зборнік уключае матэрыялы Першых-Чацвёртых Гарадзенскіх чытанняў. Першыя прысвячаліся 230-годдзю "Газэты Гродзеньскай", Другія – 880-годдзю горада Гродна, Трэція – тэме "Гісторыя Гародні ў асобах", Чацвёртыя – 240-годдзю Гродзенскага тэатра Тызенгаўза.

**ISBN 978-985-6835-90-5**

© Дзяржаўная ўстанова культуры «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага», 2011
© Афармленне. ГАУПП «Гродзенская друкарня», 2011

# ПЕРШЫЯ ГАРАДЗЕНСКІЯ ЧЫТАННІ

***да 230-годдзя "Газэты Гродзеньскай"***




Гродна, 2006

**Пяткевіч Аляксей Міхайлавіч,** *кандыдат філалагічных навук, прафесар УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы"*

# РАЗВІЦЦЁ РУКАПІСНАЙ КНІГІ НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ

Беларускія даўнія рукапісы рассеяліся па свеце. Асабліва многа іх трапіла ў музеі, бібліятэкі, прыватныя зборы Расіі. Прычына гэтаму – войны, паўстанні і за імі – рэпрэсіі, рэлігійна-палітычныя канфлікты, у выніку якіх кнігі гінулі ці вывазіліся за межы краю. Таму сучасныя звесткі пра рукапісы, што ствараліся і зберагаліся на беларускай этнічнай тэрыторыі, даволі фрагментарныя. Тым больш карысная уяўляецца сістэматызацыя рукапісных кніг, што належаць да пэўнага рэгіёну, у дадзеным выпадку – рэгіёну Гродзеншчыны. Рэгіянальную іх прыналежнасць варта вызначыць не толькі месцам напісання кнігі і яе захоўвання, але і паходжаннем пісца, калі яно фіксуецца ў рукапісе.

Першы вядомы на Гродзеншчыне вядомы рукапіс адносіцца да XIII ст., дакладней, да 1241 г. Гэта "Напісанія Афанасія мниха к Панкови о древе добру и злу...", выкананы ўставам на пергаменце "рукою многогрешного дьяка Никиты з Любъчи" (цяпер у Навагрудскім р-не) [1]. Рукапіс захаваўся ў бібліятэцы Храптовічаў у Шчорсах.

З рукапісаў XIV ст. вядомае першае ў рэгіёне евангелле – Лаўрышаўскае. Яно перапісана каля 1329 года дзеля манастырскай царквы ў Лаўрышыраве (Навагрудскі р-н). Евангелле пісана ўставам на пергаменце стараславянскай мовай з прыкметнымі беларускімі асаблівасцямі. Рукапіс змяшчае тэкст чатырох евангельскіх кніг і 14 разгорнутых запісаў XIV–XVI стст. і пазнейшага часу пра ўклады ў манастыр землямі, дваровымі людзьмі, збожжам, грашыма з упамінаннем шмат якіх мясцовых прозвішчаў і геаграфічных пунктаў. Фундушавыя запісы спалучаюцца з устаўкамі на старабеларускай мове і

маюць кароткія каментарыі на беларускай і польскай мовах. У кнізе – 374 старонкі. Яна аздоблена шматлікімі ініцыяламі ў тэраталагічным стылі і 19-цю мініяцюрамі (7 з іх – складаныя шматфігурныя кампазіцыі на ўсю старонку). Дошкі пераплёту абцягнуты аксамітам, на пераплёце – адзін з самых старажытных беларускіх абкладаў. Верхняя дошка мае 4 накутнікі з бірузой. Іх краі, звернутыя да цэнтра, аздоблены суцэльным карункавым арнаментам. Сярэднік – выява святога з дзідаю і шчытом, упісаная ў кампазіцыю з срэбнай пласціны, якая мае форму прамавугольнага праёму з франтонам, дэкараваную па краях тым жа карункавым узорам. На ніжняй вокладцы – пазалочаны крыж-распяцце [2]. Захоўваецца евангелле ў бібліятэцы Чартарыйскіх у Кракаве, копія яго фрагментаў – у Навагрудскім гісторыка-краязнаўчым музеі.

Да XIV ст. адносіцца і Вялікажухавіцкае евангелле, якое зберагалася да Першай сусветнай вайны ў царкве вёскі Вялікія Жухавічы (Карэліцкі р-н), пасля – у Беларускім музеі ў Вільні. У евангеллі ёсць мініяцюры чатырох евангелістаў і застаўкі да ўсіх чатырох частак кнігі [2].

XV ст. ужо багатае на рукапісную прадукцыю ў прынёманскім рэгіёне. Перш за ўсё гэта евангеллі, пісаныя на пергаменце. Сярод іх – Гродзенскае, Ваўкавыскае і Жыровіцкае. Гродзенскае ўвайшло ў зборнік, які складаецца з 388 старонак і ўмяшчае, акрамя чатырох рэдакцый евангелля, асноўныя святочныя службы па месяцах года. У прыпісках на беларускай і польскай мовах, зробленых у 1655 і 1656 гг., згадваецца "Ян Сашка, пратапоп Гродзенскі", таксама "места" Індура і Горніцкая царква (Гродзенскі р-н) [4]. Ваўкавыскае евангелле ў спісе XV ст. можа быць аднесена да больш ранняга часу, як мяркуе П.Гільтэбрандт [5]. Кніга змяшчае 648 старонак. У 1751 г. у тэксце зроблена прыпіска, якую выканаў "Иоанн Савич, презвитер церкви Волковицкой". У евангеллі ёсць застаўкі, ініцыялы, цікавыя багаццем каляровай гамы. Сустракаюцца тут і дэкаратыўныя малюнкі на палях. Жыровіцкае евангелле-тэтр спісана ў XV ст. са старажытнага арыгінала. Пра гэта сведчаць граматычныя формы і асабліва тып пісьма – правільны, прыгожы, буйны ўстаў. У кнізе

– 404 аркушы. Пераплёт – дошкі, абцягнутыя аксамітам малінавага колеру і акаваныя золатам. Афармленне тэксту выканана на высокім для таго часу мастацкім узроўні. Мініяцюры – кампазіцыйна распрацаваныя выявы. Вобразы евангелістаў у іх псіхалагічна змястоўныя і паводле тыпажу набліжаныя да жыцця. У гэтым можна бачыць сляды беларускай школы іканапісу, якая фармавалася ў гэты час. Застаўкі і ініцыялы ў Жыровіцкім евангеллі багатыя фарбамі і шчодра раззалочаныя. У кнізе ёсць фундушовы запіс ад 1516 г. канцлера Вялікага Княства Літоўскага Льва Сапегі, які перадае Жыровіцкай Успенскай царкве "шмат землі". Запіс 1763 г. сведчыць, што "сия Евангелия есть церкви Жировицкой".

Увогуле ж Жыровіцкі манастыр з яго храмамі становіцца з XVI ст. буйным цэнтрам рукапіснай творчасці ў Беларусі. Да яго "прыпісваюцца" многія творы ранейшага часу, XV ст. Складваецца тут вялікі бібліятэчны збор. Сярод жыровіцкіх рукапісаў – самая разнастайная паводле зместу і жанру літаратура.

Гэта, напрыклад, Апостал XV ст. з застаўкамі ў скураным пераплёце, пісаны на 310 аркушах. Гэта зборнік 16 "слоў" св. Грыгорыя Багаслова, выканананы ўставам на 377 аркушах (XV ст.); зборнік жыцій святых (паўустаў, XV ст., 147 арк). Таксама – "Беседы" папы рымскага Грыгорыя, пісаныя паўуставам у пачатку XVI ст. на 451 арк. Мова гэтага рукапісу – стараславянская са старабеларускімі элементамі. Зборнік належаў спачатку Навагрудскаму манастыру, адкуль трапіў у Жыровічы. З мясцовага манастыра – і павучанні Ісаака Сірына (паўустаў XV ст.), "Беседы" св. Іаана Златавуста XVI–XVII ст. на 630 аркушах, "Сказанія полезная о латинах" на 110 аркушах (XV ст.). Зборнік, які складаюць павучанні Кірылы Ерусалімскага і жыціе Іаана Златавуста (паўустаў, XV ст.), што змяшчаецца на 401 аркушы, належаў спачатку манастыру ў Дубне (Украіна). Затым кніга была "пожичона" Віленскаму манастыру св.Тройцы, адкуль трапіла ў Жыровічы. Нельга не згадаць жыровіцкі Трэбнік, які датуецца 1545 г. Мясцоваму манастыру належалі і дзве "Мінеі месячныя" XV ст., выкананыя паўуставам на 221 і 183

аркушах. У другой была разгорнутая прыпіска 1437 г., зробленая "рукою многогрешного и грубаго діака Сенка".

У 1466 г. пісалася Трыёдзь "к церкви соборной пресвятые богородица (...) еже ест оу Городне роукою многогрешнаго раба божія Еоустафія" і "повеленіем раба божія пана Федора Воловича" [7].

Да XVI ст. адносіцца Галынкаўскае ("Голынское") пергаментнае евангелле-апракас на 258 аркушах. Розныя ўскосныя звесткі даюць падставу аднесці гэты рукапісны помнік да царквы ў вёсцы Старая Галынка (Зэльвенскі р-н). Пераплёт кнігі апраўлены ў аксаміт малінавага колеру. На верхняй вокладцы – срэбныя накутнікі з выявамі евангелістаў, на ніжняй – паўшарыі па кутах.

Мала захавалася звестак пра Малажухавіцкае (Карэліцкі р-н) евангелле XV–XVI ст., аздобленае мініяцюрамі і застаўкамі. Таксама – пра Шчорсаўскае (Навагрудскі р-н) евангелле 1545 г. і Маламажэйкаўскае (Шчучынскі р-н), што стваралася для царквы ў вёсцы Малое Мажэйкава, пабудаванай у першай палове XVI ст. Скупа абазначана рэгіянальная прыналежнасць евангелля-тэтр другой паловы XVI ст., у канцы якога запісана: "Новагородка Литовского" [9].

Заслугоўваюць увагі кнігі, якія ствараліся за межамі Гродзеншчыны, але пісцамі тутэйшага паходжання. Так, Чэццю 1589 г. пісаў у Камянцы на Брэстчыне "попович" Бярозка з Навагрудка. У ёй вельмі шырока выкарыстаны арфаграфічныя, граматычныя, лексічныя нормы беларускай мовы [10]. У 1530 г. манах Макарый, які паходзіў з Гальшанаў (Ашмянскі р-н) пісаў у Луцку і Дубне Пралог. У тым жа Дубне ў XVI ст. працаваў пісцом манах Арсеній з Ваўкавыска, які "надаў" Дубненскаму манастыру паўтара дзесятка выкананых ім рукапісных кніг. У Навагрудку пісаўся Пралог 1512 г. (паўустаў-устаў, 625 арк). У канцы кнігі ёсць рэдкае для тагачасных рукапісаў разгорнутае пасляслоўе, у якім згадваецца храм святых Барыса і Глеба. Таксама падкрэсліваецца, што "при великом короле Жігимонти" і "прі воеводе Новогородском пану Яну Яновічу Заберезенском напісана быс сіа книга". Зазначана, што аўтар–перапісчык – "инок діаконець

Іоакимець", а "переплетена быс сіа книга рукою ієрея Пръфиріа иж в Любчи". У гэтым Пралогу змешчаны яшчэ тэкст "Мученіе святых новоявленых мученикь родом Літвы Іоана, Антонія і Еустафіа. Литовская ж имена Круглець, Коумець, Нежило" [11].

У XVII–XVIII ст., хаця і дзейнічае ў рэгіёне цэлы шэраг друкарняў, рукапісная творчасць развіваецца вельмі інтэнсіўна. Па-ранейшаму шмат рукапісных кніг трапляла ў Жыровіцкі манастыр. Гэта дзве Кормчыя XVII ст. па 308 і 427 аркушаў, Хранограф, пісаны скорапісам у XVII ст. (350 арк.), два зборнікі павучанняў XVII ст. па 674 аркушы (на беларускай мове) і 198 аркушаў. Таксама – Трэбнік XVII ст. на 289 аркуша.х, Богагласнік XVII ст., што змяшчаў нядзельныя царкоўныя спевы, трапары і нядзельныя ірмасы на 8 галасоў. У гэтым стагоддзі яшчэ з'яўляюцца ў рэгіёне рукапісныя евангеллі. Два з іх, пісаныя ў Карэлічах (1647 г.) [12] і Вялікіх Жухавічах (Карэліцкі р-н) у 1668 г. [13], маюць разгорнутыя прыпіскі, пасляслоўі, што дазваляюць іх датаваць і звязваць з дакладнай мясцінай. Нямала рукапісаў зберагалася ў гэты час і ў Барунскім манастыры (Ашмянскі р-н). Напрыклад, Мінея зборная XVII ст. на 299 аркушах і ў багатым пераплёце. Шмат тут было кніг XVIII ст. Сярод іх – Ірмалой з застаўкамі, на 177 аркушах, які ўключаў "стихири", каноны, "антифоны", літургічныя і іншыя песенныя тэксты, некаторыя – на 8 "гласов". У Жыровічах быў уніяцкі Службоўнік XVIII ст. на 297 аркушах, розныя зборнікі і вельмі цікавы Памяннік, датаваны 1763 г. У ім зафіксаваны сотні імёнаў памерлых, іх сваякоў, таксама назваў тутэйшых вёсак і маёнткаў.

У XVIII ст. плённа развіваліся ўжо многія жанры рукапіснай літаратуры, у тым ліку і свецкай.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**

1. Ластоўскі, В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі / В.Ластоўскі. – Коўна, 1925. – С. 78.

2. Востоков, А. Описанне русских и словенских рукописей Румянцевского музеума / А.Востоков. – СПб, 1842. – С. 124–127;

Варшавские университетские известия. – 1883. – № 2. – С. 23-24; Владимиров, В. Обзор южно–русских и западно–русских памятников письменности от XI до XVII ст. / В.Владимиров. – Киев, 1890. – С.16; Щапов, Я. Восточнославянские и южнославянские рукописные книги в собраниях Польской Народной Республики / Я.Щапов. – Москва, 1976. – С. 78–85.

3. Гадавік беларускага навуковага таварыства. Кн. 1. – Вільня, 1933. – С. 32.

4. Гильтебрандт, П. Рукописное отделение Виленской публичной библиотеки. Вып. I / П. Гильтебрандт. – Вильна, 1871. – С. 35.

5. Тамсама, С. 13, 193.

6. Добрянский, Ф. Описание рукописей Виленской публичной библиотеки, церковно-славянских и русских / Ф.Добрянский. – Вильна, 1882. – С. 34-44.

7. Карский, Е. Славянская кирилловская палеографкя / Е.Карский. – Л., 1928. – С. 295; Ластоўскі, В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі / В.Ластоўскі. – С. 161.

8. Гильтебрандт, П. Рукописное отделение Виленской публичной библиотеки. Вып. 1 / П.Гильтебрандт. – Вильна, 1871. – С. 37.

9. Перетц, В. Рукописи библиотеки Московского университета, Самарских библиотеки и музея и Минских собраний / В.Перетц. – Л., 1934. – С. 177.

10. Пяткевіч, А. Маршруты кніжнага слова. З гісторыі кнігі, друку на Гродзеншчыне / А.Пяткевіч. – Варшава, 2002. – С. 10–11.

11. Добрянский, Ф. Описание рукописей Виленской публичной библиотеки, церковно-славянских і русских / Ф.Добрянский. – Вильна, 1882. – С. 193–194; Карский, Е. Белорусы. Т. 3. Вып. .2. / Е.Карский. – Петроград, 1921. – С. 140.

12. Снитко, А. Описание рукописей и старопечатных книг Минского церковного историко–археологического музея / А.Снитко // Минская старина. Вып. 2. – Минск, 1911. – С. 202.

13. Ластоўскі, В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі / В.Ластоўскі. – Коўна, 1926. – С. 577–578.

**Швед Вячаслаў Вітальевіч**, *доктар гістарычных навук, прафесар УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы"*

# "ГАЗЭТА ГРОДЗЕНЬСКА" – АДНА З ПЕРШЫХ ГАЗЕТ БЕЛАРУСІ

У 1776 – 1783 гг. у друкарні штотыдзень выходзіла адна з першых на Беларусі перыядычная газета. Першы нумар, відаць, з'явіўся ў палове мая 1776 г. па ініцыятыве сакратара гродзенскай пошты Сабалеўскага. Яму надакучыла перапісваць у некалькіх дзесяткаў экземпляраў для распаўсюджвання па краю "Газэту Варшаўскую" і ён пачаў яе друкаваць. Назва "Газэта Гродзеньска партыкулярная, замест звычайнай пісанай" падкрэслівала, што дадзеная газета выходзіць замест старой рукапіснай.

Сабалеўскі, відаць, не толькі перадрукоўваў навіны з "Газэты Варшаўскай", але праявіў і самастойнасць: публікаваў абшырныя палітычныя і гаспадарчыя артыкулы, каментарыі палітычных падзей. Гэта была своеасаблівая тагачасная "калонка рэдактара". Так было ўпершыню ў Рэчы Паспалітай і, калі адзін з першых нумароў трапіў у рукі караля польскага Станіслава Аўгуста Панятоўскага, ён не прамінуў звярнуць увагу Антонія Тызенгаўза на журналісцкія артыкулы. У лісце ад 8 ліпеня 1776 г. кароль патрабаваў ад гарадзенскага старосты вывучэння справы і пазбягаць "дрэннага пісання", вучыў яго: "... трэба зрабіць так, каб друкаваная "Газэта Гродзеньска" не змяшчала такія рэчы, якія сведчаць аб дрэннай якасці і з'яўляюцца памылковымі. Але паколькі самае дрэннае можа стацца крыніцамі добрага, на маю думку, трэба абараціць гэтую маючуюся магчымасць на карысць. Калі ўжо абвешчана пастанова, што друкуецца "Газета Гродзенска", мог бы Вяльможны Пан вызначыць асобу, якая бы мела абавязак кожны нумар складаць і потым газету паказваць Вяльможнаму Пану перад друкам, а прыдалася б з часам і на з'яўленне якога-небудзь артыкула адсюль прысланага". Такім чынам, уводзілася цэнзура.

З адказу Антонія Тызенгаўза ад 11 ліпеня 1776 г. мы даведваемся, што друкаванне газеты задумана сакратаром пошты, а сам ён як бы ніякіх адносін да яе не мае, бо "не заўсёды ў Гродне знаходжуся". Нам здаецца, што не мог гаспадар друкарні і кіраўнік Гродзенскай эканоміі Тызенгаўз не ведаць, што ў яго валоданнях робіцца. Пацверджаннем гэтай думкі з'яўляюцца ананімныя "Заўвагі аб перспектывах гродзенскай друкарні" 1775 г. (AGAD, архіў Тызенгаўзаў), дзе прадугледжвалася прыняцце на працу чалавека, які будзе "выдаваць кожны тыдзень газету", і выдаткі на выпіску нямецкіх і французскіх газет, неабходных для публікацыі польскіх.

Пасля заўваг караля выдаваемая ў Гродне газета змяніла назву на "Ведамасці партыкулярныя Варшаўскія, замест пісаных звычайных". Колькі выйшла нумароў з такой назваю невядома, а захавалася, па сведчанню даследчыка Ст.Кондэка, тры – за 8, 15 і 22 ліпеня 1776 г. Да першапачатковай назвы вярнуліся, па дадзеным даследчыка Е.Лойека, восенню гэтага ж года, калі Тызенгаўз наладзіў кантроль над зместам газеты.

Першапачатковая цэнзура, відаць, не працавала, бо ў красавіку 1777 г. Станіслаў Аўгуст зноў напісаў гродзенскаму старосце ліст, дзе пратэставаў супраць вольнага трактавання ягоных слоў, па якіх выходзіла, што ён прадугледжвае рэстаўрацыю ордэна езуітаў у Іспаніі. "Паўтараю, – пісаў кароль, – што з газет друкаваных у Польшчы могуць перанесціся ў іншаземныя і нарабіць клопату, бо гэты гіспанскі кароль зайздросны. А таму добра было бы, калі б Вяльможны Пан пастанавіў бы каго–небудзь, хто заўсёды чытаў бы экзэмпляры "Газэты", перад тым, як пойдуць у друк, каб такія непрыемнасці з яе выкінуць заўчасна".

Газета, якая выдавалася ў каралеўскай друкарні, сапраўды павінна была пазбягаць памылак, бо ўспрымалася голасам каралеўскага двара. У адказе Тызенгаўза ад 3 красавіка 1777 г. відаць распрацаваны механізм выдання газеты: "Ксендз прэфект друкарні (Караль Маліноўскі – В.Ш.) даваную ад сакратара мясцовай пошты газету да друку павінен быў адсылаць да пана Сухадольца (сакратара Тызенгаўза – В.Ш.) для экзаменавання, які ад'ехаў у Варшаву, а яшчэ да таго ж і сам ксёндз прэфект аддаліўся, проста тады з пошты

пайшлі газеты да друкароў, а карэктаваннем займаўся блізкі яму чалавек, у палітыцы нічога не разумеючы, і пільнаваў толькі правільнасць напісання літар; запрошаны да мяне сакратар пошты прызнаўся, што нават ён з прычыны экспедыцыі нечытаную газету аддаў да друкарні. Але разам з тым пры вывучэнні гэтай акалічнасці аказалася, што карэспандэнт яго (з Варшавы) пан Зямецкі прысылае яму пісаныя газеты ... і каб з гэтага часу газету, якую пасылае ў Гродна, даваў на экзамен пану Касакоўскаму (сакратару караля – В.Ш.) або ў кабінет, і, такім чынам, мяркую, адбывалася бы больш дасканалае карэктаванне".

"Газэта Гродзеньска" выходзіла кожны чацвер штотыдзень у выглядзе аднаго ліста памерам 20x15. Тэкст акрамя "Данясенняў" друкаваўся ў дзве калонкі. Тыраж даходзіў да 200–300 экзэмпляраў, якія распаўсюджваліся па тэрыторыі ВКЛ, Польшчы і беларускіх зямель, захопленых Расіяй пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай.

Гаворачы пра "Газэту Гродзеньску", нас больш усяго цікавіць інфармацыя ў ёй, асабліва па Гродзеншчыне. Сказаць падрабязна пра публікацыі газеты немагчыма, бо на сённяшні дзень поўны яе камплект невядомы. Мне пашчасціла, дзякуючы фонду падтрымкі навукі імя Ю.Мяноўскага, пагартаць у Польшчы падшыўку "Газэты Гродзенскай" за 1779–1780 гады. Яна захоўваецца ў аддзеле старадрукаў бібліятэкі Варшаўскага універсітэта (шыфр 2 д. 20.38). Рукою, я думаю, сучаснага бібліятэкара напісана: "У г. 1779 № XXII, відаць, памылкова прапушчаны, у г. 1780 адсутнічаюць № 1, 2, 6, 7, 8". Вось на аснове прачытаных мною газет я і хачу пазнаёміць з яе матэрыялам.

На старонках газеты тагачасны чытач мог знайсці замежныя навіны. Перш за ўсё апісваліся падзеі знешняй палітыкі, якія датычыліся інтарэсаў Рэчы Паспалітай, Расіі, Аўстрыі, Прусіі, а з іншых краін – Англіі і Францыі. Так, пяты нумар "Газэты Гродзеньскай" за 4 лютага 1779 г. паведамляў аб спрэчках за гішпанскую карону і аб канцэнтрацыі войск на Дунаі. У іншых нумарах за гэты год былі публікацыі аб барацьбе амерыканскіх калоній за незалежнасць, аб расійска-турэцкіх і расійска-аўстрыйскіх адносінах, аб аўстра-прускай вайне, аб размеркаванні ў Польшчы з боку Маравіі расійскай

арміі на чале з Камінскім (19 батальёнаў пяхоты, 2 корпусы кавалерыі, 2 драгунскіх, 2 гусарскіх і 15 казачых палкоў). У № II за 1779 г. гаварылася аб нараджэнні 19 снежня 1778 г. у французскай каралевы дачкі, ахрышчанай Марыі–Тэрэзы–Караліны мадам Раяль. У наступным нумары газеты была інфармацыя аб тым, што 17 студзеня 1779 г. у Вроцлаў прыбыў князь М.В.Рапнін. Раніцай 18 студзеня ён быў на аўдыенцыі ў караля, які запрасіў яго на абед. Мікалай Васільевіч Рапнін – паўнамоцны міністр у Польшчы, будучы генерал-губернатар на землях ВКЛ, адышоўшых да Расіі пасля другога і трэцяга падзелаў Рэчы Паспалітай (рэзыдэнцыя яго была ў Гродне).

З замежных навін выдаўцы газеты прапаноўвалі чытачу цікавыя падзеі і здарэнні. Сярод іх наступныя. У Францыі атрымалі з бульбы белую, лёгкую муку, спяклі хлеб, які елі ў Версальскім палацы і пахвалілі. Мука магла быць выкарыстана і як пудра (№ III, 1779 г.). 30 сакавіка 1779 г. з Парыжа прыйшла навіна пра чалавека, які нарадзіўся без рук і ўсё робіць нагамі: есць, п'е, курыць, добра піша, усоўвае нітку ў іглу, страляе з пісталета, капае зямлю ў сваім хатнім агародзе і ўсё астатняе, што звычайна робіцца рукамі (№ XVII, 1779 г.). 1 мая 1779 г. з Варшавы паведамілі, што ў Парыжы пасля доўгіх пошукаў адзін майстар, які робіць сёдлы, зрабіў экіпаж, які ніколі не зможа перавярнуцца, нават, калі застанецца з адным колам або зламаецца вось (№ XVIII, 1779 г.). На той час гэта было вельмі патрэбным адкрыццём, бо пры дарожных здарэннях карэты, каляскі, вазы звычайна пераварочваліся і пад імі ні адзін пасажыр страціў здароўе або загі-нуў.

З Пецярбурга 12 ліпеня 1779 г. даносілі, што ў Іркуцку, дзякуючы імператрыцы Кацярыне II, створаны дом для прышчэпак супраць воспы. У 1778 г. у горадзе і краі прывіта 5749 чалавек, з якіх памёрла 5, але ад іншых хвароб (№ XXXVII, 1779 г.). З Неапалю 10 жніўня 1779 г. прыйшло паведамленне аб вывяржэнні Везувія: цэлую ноч кратэр выкідваў попел, вялікія камяні з моцным гоманам і громам. Асабліва пацярпела княства, якое знаходзілася ў 1 мілі (прыкладна 7,5 км), ад гары – ад лавы і каменнагя града разбураны дамы, загінула каля 150 чалавек, зруйнаваны каралеўскі палац. Агонь быў такім, што ноч стала днём, а князь Баргэзэ за 2 тысячы крокаў мог чытаць ліст (№ XXXVIII, 1779 г.).

Другі аб'ём асноўных публікацый "Газэты Гродзеньскай" датычыўся ўнутранай палітыкі: афіцыйныя матэрыялы, прыдворная хроніка, урадавыя аб'явы, інфармацыя аб паседжаннях органаў улады і іншае. Так, увесь 1779 г. (53 нумары) друкаваўся ўказ Кацярыны II аб губернiях ад 7 лютага 1775 г. Яго трэба было ведаць, бо на далучаных землях уладкоўвалася расійская сістэма кіравання. У XXV–XXXII нумарах гэтага ж года можна прачытаць умовы мірнага трактату каралевы Венгерскай і Чэшскай з каралём Прусіі, заключаным у Цечыне 13 мая 1779 г. Нумар XXVI за 29 чэрвеня 1780 г. выйшаў у два разы павялічаным, бо публікаваў на другой і чацвёртай старонках дзённік знаходжання Кацярыны II у Полацку. Са спісам асоб ад ВКЛ у складзе Пастаяннай Рады можна пазнаёміцца ў № XLII ад 19 кастрычніка 1780 г. Сярод нававыбраных – князь Радзівіл, кашталян віленскі, Агінскі, кашталян трокскі, Рагалінскі, ваявода інфлянцкі, Хмара, кашталян мінскі, Кажанеўскі, рэгент меньшай канцылярыі ВКЛ, Вінцэнт Тышкевіч, пасол мінскі, Е.Белапятровіч, лоўчы лідскі, Дзеконскі, стражнік польскі літоўскі.

У нумарах XLIII–XLVIV за 1780 г. знаходзім дзённік варшаўскага сейма Рэчы Паспалітай 1780 г. Універсал Камісіі Скарба Кароннага апублікаваны ў XLV за 1779 г. А перад гэтым газета паведамляла ў № X за 1779 г. аб працы ў Гродне Скарбовай камісіі ВКЛ пад старшынствам падскарбія надворнага літоўскага А.Тызенгаўза. Камісарамі камісіі былі: стражнік польны літоўскі Дзяконскі, ковенскі земскі суддзя Казакоўскі, ваўкавыскі земскі суддзя Сухадольскі, палкоўнік Ельскі, падчашы лідскі Нарбут, Патоцкі. Гэтая камісія абвясціла аб продажы маёнтка Навасёлкі Навагрудскага ваяводства (№ X), староства Гратэльск у Вількамірскім павеце і валодання Мяцеліца ў Трокскім ваяводстве (№ XII, 1779 г.), староства Інгурск у Віленскім ваяводстве, валоданняў Ракішкі Ковенскага павета (№ XLIV, 1779 г.), Янішкі Браслаўскага павета (№ XLVII, 1779 г.).

З Коўна 28 лістапада 1779 г. перадалі, што 23 лістапада пасля працяглага дрэннага надвор'я каля дзевяці гадзін вечара неба раз'яснілася і адбылося амаль гадзіннае зацьменне Луны, абрыс якой быў бачны, як вогненная акружнасць. Наглядалі гэтую карціну з дапамогаю астранамічных інстру-

ментаў каралеўскі астраном, рэктар Віленскай езуіцкай акадэміі М.Пачобут–Адляніцкі, рэктар школ Рашкоўскі і прафесар-матэматык.

11 і 18 лютага 1779 г. "Газэта Гродзеньска" змясціла вынікі выбараў дэпутатаў у Галоўны Трыбунал ВКЛ. Думаю, будзе цікава пазнаёміцца з гэтымі людзьмі: у Лідзе – земскі суддзя Скіндар, гродскі пісар Стыпалкоўскі; у Гродне – пісар вялікі літоўскі Тышкевіч, падкаморы гродзенскі Ваўкавыскі; у Ваўкавыску – земскі пісар Булгарын, гараднічы Гулаўскі; у Слоніме – ваўкавыскі канюшы Быкоўскі, ротмістр Вайніловіч, у Навагрудку – земскі пісар Т.Рэйтан, ротмістр Мітарноўскі; у Брэсце – брэсцкі староста Марыконі, гродскі пісар Влодэк; Ашмяны – падкаморы Важынскі і Гутаровіч.

Значнае месца ў асноўнай частцы "Газэты Гродзеньскай" аддавалася мясцовым гарадзенскім навінам. Да тых падзей, якія мы называлі раней, можна дабавіць яшчэ шмат чаго. Напрыклад, у № IV за 1779 г. апісваліся ўрачыстасці ў Гродне, прысвечаныя памяці сям'і Найяснейшага Пана караля польскага і Вялікага князя літоўскага. Зіма і цяжкая дарога не перашкодзілі сабрацца ў горадзе прадстаўнікам усіх ваяводстваў і паветаў ВКЛ. Раніцаю 17 студзеня раздаўся стократны гарматны салют, у адну гадзіну папалудні ў езуіцкім касцёле канонік інфлянцкі, афіцыял Падляшскі і Гродзенскі Ігнаці Кадлубоўскі вёў службу, казанне гаварыў ксёндз Пжэтоцкі, граў прыдворны аркестр Тызенгаўза, спявалі "Te deum laudamus" ("Цябе Божа ўсхваляем") за шчаслівае і доўгае панаванне караля, гарнізон Гродзенскай эканоміі, польская каманда Мараўскага і Харутова Скарбовай камісіі трохкратна выстрэлілі з ружжаў.

Потым госці паехалі на Гарадніцу, дзе віншавалі караля ў асобе ягонага міністра і былі запрошаны на абед. Зноў граў аркестр і спявала капэла Тызенгаўза. Раз'ехаліся пасля 6 гадзін, але ў 9 сабраліся на бал-маскарад у Новым замку. Брама і палац былі ўпрыгожаны ілюмінацыяй з лямпачак з літарамі "NP", у ззяючым фейерверку асабліва прыгожым бачыўся алтар, дзе два Генія палілі сэрцы жыхароў у дар каралю. Пры выбухах гармат адбылася вячэра і да самага ранку танцы.

13 чэрвеня 1779 г. з Гродна паведамілі, што ў дзень Святога Антонія ў фальварку Кульбакі за горадам сабраліся гродзенскія афіцыйныя асобы, госці, суддзі Галоўнага трыбунала, служачыя з розных ваяводстваў і паветаў, якія знаходзіліся ў той час у Гродне. Повадам для ўрачыстасці сталі імяніны Антонія Тызенгаўза. Парк, альтанка, канал і бат на ім былі ілюмінаваны агнём, на франтоне альтанкі гарэў надпіс "Няхай жыве Антоні", а ніжэй – "Няхай штучным агнём Нясвіж уносе табе віншаванні. Ёсць і тут гэтага света непадзельныя цені" (№ XXV, 1779 г.). Каб было зразумела, трэба сказаць, што сам Тызенгауз у гэты час знаходзіўся ў Нясвіжы, а ўрачыстасці з нагоды імянін былі апошнімі ў яго жыцці, бо ў красавіку 1780 г. яго прымусяць адысці ў адстаўку.

Яшчэ адныя імяніны апісваюцца ў № XXXI за 1780 г. На гэты раз ужо вядомага нам ксяндза Кадлубоўскага. У дзень святога Ігнація ў тых жа Кульбаках, у садзе рэйтырады была дадзена вячэра, у час якой госці вымаўлялі віншаванні ў гонар пастыра, гучалі мясцовыя марціры (арматы). На франтоне альтанкі былі вершы на польскай мове, а на супрацьлеглым боку – у гонар 19-годдзя ўлады дэцэзіі па латыні. Вечарам быў ілюмінаваны канал і бат на ім з лічбаю "V".

Пра святкаванне штогадовага дня памяці элекцыі караля 7 верасня 1780 г. знаходзім матэрыял у № XXXVII за 14 верасня. У гэты дзень у 10 гадзін раніцы ў парафіяльным фарным касцёле адбылося набажэнства, якое вёў біскуп Касакоўскі. Гучалі гарматны і ружэйны салюты. Потым ксёндз запрасіў гасцей на Гарадніцу, дзе даў абед, на якім бясконца гучалі віншаванні каралю і ягонай сям'і. Зноў чуліся выбухі гармат і ружжаў двух польскіх палкоў і Гараднічанскага гарнізона. На абедзе прысутнічалі члены Галоўнага Трыбунала на чале з маршалкам (генерал князь Радзівіл, лоўчы вялікі каронны Чапліц, стражнік літоўскі Дзяконскі, харунжы літоўскі Волмер, лоўчы літоўскі Боўфал, генерал Грабоўскі, падкаморы варшаўскі Сабалеўскі, ксёндз Кадлубоўскі і шмат іншых з розных ваяводстваў і паветаў. Хочацца адзначыць, што наперадзе жыццё развядзе гэтых людзей па розныя бакі. Ксёндз-біскуп Юзаф Касакоўскі будзе праціўнікам рэформ

Чатырохгадовага сейма, адным з галоўных кіраўнікоў Таргавіцкай канферэнцыі, за што яго павесяць у Вільні ў час паўстання 1794 г. Францішак Боўфал, паплечнік Тызенгаўза прыме актыўны ўдзел у паўстанні і ўзначаліць парадкавую камісію Гарадзенскага павета. Генерал Ежы Грабоўскі таксама стане ў шэрагі касцюшкоўцаў.

У двух нумарах "Газэты Гродзеньскай" (XXXI за 1779 г. і XXX за 1780 г.) расказваецца пра адукацыю ў Гродне. У канцы ліпеня штогод адбываліся экзамены ў ваяводскіх школах. Вучні (кавалеры) павінны былі падцвердзіць свае веды па наступных прадметах: алгебры, трыганаметрыі, арыфметыцы (нізкай і вышэйшай), фізіцы (генеральнай і партыкулярнай), механіцы, гідрастатыцы, гідраўліцы, астранамічнай геаграфіі, логіцы, рыторыцы, геаметрыі (тэарэтычнай і практычнай), геаграфіі (натуральнай і палітычнай), праву (натуральнаму і народнаму), гісторыі (канкрэтнай і сучаснай), маральным навукам, мовам (латыні, французскай і нямецкай), малюнку, фехтаванню, танцам, вопратцы. Апытанне праводзілася ў прысутнасці самога Тызенгаўза, членаў Трыбунала, іншых важных асобаў апарату кіравання. Усё гэта павінна было падкрэсліць важнасць моманту: выкананне правіл Эдукацыйнай камісіі прыносіць удзячнасць і дае перспектыву ў жыцці. Па выніках экзаменаў маглі ўзнагародзіць срэбным або залатым медалём.

"Газэта Гродзеньска" мела рубрыку "Данясенні з Гродна", дзе звычайна змяшчаліся аб'явы аб згубах, крадзяжах, збеглых сялянах і слугах. Прывядзём для прыкладу некалькі такіх паведамленняў, якія трапілі на Гродзенскі паштамт, а сакратар іх адрэдагаваў і апублікаваў. Аб уцечках падуладных людзей аб'явы ёсць у нумарах VII, XXVIII, XLIX за 1779 г. і XX, XXXV, XLIV за 1780 г. У іх указваліся прыкметы людзей, апісвалася іх вопратка, газета асцерагала не прымаць збеглых на працу, а паведамляць на паштамт (часам за ўзнагароду). "З фальварку Грандзічы, з паўмілі ад Гродна, ад кармялітаў уцёк чалавек Алаізі Яноўскі з беласівым канём. Затрымаўшы яго атрымае 5 талераў," – такая аб'ява была змешчана ў № XXVIII за 8 ліпеня 1779 г. (указваліся прыкметы чалавека і каня).

Як і сёння, людзі тады таксама гублялі рэчы і газета дапамагала іх знайсці: чорны кітайскі плашч, згублены на бале ў Новым Замку (№ III за 1779 г.) або залаты гадзіннік з залатым ланцужком, янтарнай пячаткаю, ключыкам для накруткі і кручком для навешвання. Але аб самай неверагоднай згубе паведамлялі № V–VIII за 4-25 лютага 1779 г. "Яшчэ ў студзені паштальён Мастоўскі (з тэкста не зразумела, ці гэта прозвішча чалавека, ці ён быў з Мастоў – В.Ш.), едучы са Слонімскай пошты, згубіў мех з Дзярэчынскай поштаю, набіты экспедыцыямі і добра апячатаны. Просім знайшоўшага даць паведамленне ў Дзярэчынскую пошту або звярнуцца ў Гродзенскі паштамт за добрую ўзнагароду". Гродзенскі паштамт просіць кожнага, хто праязджае трактам са Слоніма ў Гродна, быць уважлівым – можа хто і знойдзе. Аб знаходцы газета ў будучым не паведамляла.

Яшчэ адной важнай часткай "Газэты Гродзеньскай" была рэклама. Галоўным чынам рэкламавалася прадукцыя Гродзенскай друкарні: кнігі (камедыя ў трох актах "Сканарэл. Прымушаны Доктар", вершы Падстолега, дзённікі знаходжання Кацярыны II ў Полацку, Варшаўскага сейма 1780 г.), "Гаспадарчы каляндар", "каляндары для прымацавання на сцяну", сеймавыя матэрыялы (рэчы паслоў, справаздачы і рапарты). Акрамя таго за два гады мне сустрэліся толькі дзве іншыя рэкламныя аб'явы: самаго Сабалеўскага – аб продажы па памяркоўнай цане паўкрытай калясці (№ XL, 1779 г.), а таксама мануфактурнага касіра Хопе (Hoppe) – аб продажы галандскага агароднага насення (№ XIII, 1780 г.).

Такім чынам, у час, калі не тое, што радыё і тэлебачання не было, але і газеты толькі з'яўляліся, "Газэта Гродзеньска" несумненна адыгрывала значную ролю. Не толькі тым, што была "прапагандыстам і агітатарам". Газета адкрывала чытачам сусвет і жыццё сваёй краіны, знаёміла з цікавымі падзеямі і здарэннямі, дапамагала ў вырашэнні бытавых праблем, запрашала да авалодання здабыткамі культуры. Пашана і хвала ёй за гэта! "Газэта Гродзеньска" – цікавая і шматбаковая крыніца па гісторыі Гродна, Гродзеншчыны, сусветнай гісторыі.

**Игнатович Федор Иванович,** *кандидат медицинских наук, преподаватель УО "Гродненский государственный медицинский университет"*

# Ж.Э.ЖИЛИБЕР И ЕГО ПОПЫТКА ИЗДАНИЯ МЕДИКО-БИОЛОГИЧЕСКОГО ЖУРНАЛА В ГРОДНО

Создание медицинской периодической печати, призванной способствовать развитию медицинской науки и практики, является одним из ведущих направлений общественной деятельности передовых ученых и врачей. Роль и значение ее могут быть оценены только на фоне конкретных исторических и социально-экономических условий, характерных для той или иной страны. История зарождения на современной территории Беларуси медицинской печати вообще, и медицинских журналов, в частности, изучена пока еще недостаточно. Данной проблеме посвящены пока единичные публикации [1, 3 и др.]. В связи с этим имеется необходимость активизации исследований.

Как известно, в XVIII в. в странах Западной Европы (Франция, Англия, Италия и др.) по инициативе научных учреждений, обществ естествоиспытателей и врачей уже выходило в свет более 170 периодических изданий (журналов и трудов). Их издателям и редакторам приходилось преодолевать значительные материальные трудности и цензурные препятствия. Но передовых представителей научной медицинской мысли это не останавливало. Первый журнал под названием "Новые открытия по всем разделам медицины" выходил в 1679–1684 г. во Франции по инициативе врача–хирурга Н.Бленьи (N.Blegny). В Голландии врач С.Бланкар (S.Blankard) с 1680 по 1688 г. выпускал ежегодно "Медико-физический сборник". В странах Восточной Европы медицинская периодическая печать зародилась гораздо позже. В 1765 г. в Митаве (ныне Латвия) благодаря врачу П.Э.Вильде стали выходить два журнала: "Сельский врач" на немецком языке и "Латыш-

ский врач" на латышском. В России профессором Ф.Уденом "Санкт-Петербургские ведомости", являвшиеся фактически газетой, издавались с 1792 по 1794 г. [4]. В Польше врач Л.Лафонтане (L.Lafontaine) "Журнал здоровья для всех состояний" стал выпускать с 1801 г. [13 ].

Как показали проведенные нами исследования, вопрос о необходимости издания медицинских журналов в Беларуси возник во второй половине XVIII в., когда она, как часть Великого княжества Литовского (ВКЛ), входила в состав Речи Посполитой (Польско-Литовского государства). Как и в коренной Польше, в этот период здесь отсутствовала государственная система здравоохранения. Имевшееся небольшое число врачей, чаще всего иностранцев, занималось частной практикой в городах или при дворах крупных магнатов и землевладельцев. Поэтому большинство населения, особенно проживавшего в сельской местности, было лишено медицинской помощи.

На этом фоне представляют особый интерес реформы в области здравоохранения, начатые при поддержке короля С.А.Понятовского (1732–1798) управляющим (подскарбием надворным) государственными имениями ВКЛ и старостой Гродно А.Тизенгаузом (1733–1785 г.). Для осуществления своих планов они пригласили из Франции известного врача и ученого Ж.Э.Жилибера (1741–1814 г.). Первоначально предполагалось использовать его только для создания ветеринарной школы. Но, познакомившись с профессором, пользовавшимся европейской известностью, А. Тизенгауз предпочел возложить на него более актуальные задачи.

В соответствии с договором, заключенным 9 мая 1776 г. Ж.Э.Жилибером и А.Тизенгаузом, он принял на себя обязанность в течение 10 лет отдавать свой труд на благо короля и Речи Посполитой [14]. Его будущая работа имела три основные направления. Первым и ведущим стала деятельность по подготовке кадров, для чего была создана медицинская школа, или академия [15]. При этом от открытия ветеринарной школы пришлось отказаться, т.к. не нашлось желающих получить эту профессию. А поскольку во Франции в Лионском

медицинском колледже профессор преподавал и ветеринарию, то было решено включить основы этой науки в программу подготовки гродненских врачей.

Вторым по значению следует считать административно-медицинскую деятельность. Как теоретик и организатор здравоохранения Ж.Э.Жилибер проявил себя еще во Франции. В книге "Анархия медицины", опубликованной им анонимно, кроме критики тогдашнего состояния медицинской помощи, были изложены рекомендации по реформированию здравоохранения и медицинского образования. А.Тизенгауз решил также использовать его прогрессивные идеи и организаторские способности. Ему было доверено руководство создаваемой медицинской службой.

Третьим, не менее важным, направлением предполагало стать изучение природных условий ВКЛ. А.Тизенгауз, учитывая важную роль их в проводимых экономических реформах, включил в договор специальный пункт №7 о необходимости первоочередного исследования естественной истории ВКЛ, в особенности состояния ботаники, сельского хозяйства и минералогии. При этом предусматривалось не только выявить наличие и запасы ценных природных ресурсов, но и установить возможность расширения их использования в хозяйственных и производственных целях.

Для научного обобщения и публикации получаемых результатов Ж.Э.Жилибер планировал издание специального журнала. Необходимость и полезность его удалось доказать после повторных и настойчивых ходатайств. В итоге не только А.Тизенгауз, но и король С.А.Понятовский согласились с этим. Более того, по их далеко идущим планам со временем этот журнал должен был стать печатным органом будущего университета (Городницкой академии). Медицинская школа даже считалась королем его первым "медицинским факультетом".

Как видно из упомянутого выше договора, в пункте №7 предварительно было даже указано его название: "Эфемериды" ("Ephemeridibys"). Хотя тип будущего издания в договоре не был оговорен, польский исследователь С.Косцялковский в

1970 г. при переводе оригинального текста с латинского на польский без какого-либо обоснования назвал его журналом "Эфемериды" [12]. Однако, судя по названию (греч. ephemeris – дневник, книга или тетрадь для периодических записей), вполне возможно, что речь идет о периодически публикуемых сборниках научных работ и наблюдений, т.е. о продолжающемся издании как разновидности медицинской печати.

Возможность и необходимость создания в Гродно медицинской периодической печати можно обосновать тем, что для этого уже имелись нужные условия. С 1775 г. по инициативе А.Тизенгауза здесь действовала типография. В ней печаталось первое на территории Беларуси периодическое издание "Газета Гродзеньска" (1776–1783 г.), а также "Хозяйственный календарь..." (1776–1800 г.). Ж.Э.Жилибер пользовался услугами этой типографии. Здесь в 1781 г. был издан первый том его "Флоры Литвы...". Готовились к печати два учебника: "Общая ботаника" и "Сравнительная анатомия", но до этого дело не дошло. Судьба рукописей этих книг неизвестна, до нашего времени они не сохранились.

Научное наследие и труды проф. Ж.Э.Жилибера исследованы пока еще недостаточно. Проведенные нами поиски в библиотеках и архивах показали, что за период работы в ВКЛ им выполнен и опубликован ряд крупных работ монографического и учебно-методического плана [2]. Однако, несмотря на углубленные библиографические поиски, выявить среди них "Эфемериды" не удалось. Наиболее ценной книгой, получившей европейскую известность, является "Флора Литвы...", первый том которой в трех частях издан в Гродно в 1781 г. Из–за перевода медицинской академии в Вильно издание ее приостановилось. В конце первого тома автор поместил приписку, в которой ставил в известность читателей-ботаников о своих дальнейших намерениях. В частности, следующий том он планировал посвятить низшим растениям. Одновременно сообщал, что в дальнейшем часть научных работ по флоре Литвы намерен публиковать на страницах нового издания под названием "Indogatores" и просил их обратить на это внимание [10].

Нам удалось выявить это издание в библиотеках Академии наук СССР, Литовской ССР и Гродненского историко–археологического музея. Как установлено, оно вышло в виде отдельной книги, содержащей в основном научные статьи. Классифицировать ее можно двояко: как сборник и журнал. На первый взгляд показалось, что мы имеем дело с обычным сборником медико-биологических статей, опубликованных Ж.Э.Жилибером в 1781 г. после переезда в Вильно. Однако более углубленное изучение опубликованных материалов показало, что, по-видимому, это и есть то периодическое издание, которое предусматривалось договором 1776 г. Появление его стало возможным после накопления ученым научных данных не только по ботанике, но и по медицине, ветеринарии и зоологии. Его удалось напечатать после доработки в типографии Виленского университета.

В связи с изменившимися обстоятельствами Ж.Э.Жилиберу пришлось, по-видимому, вместо предусмотренного ранее названия "Эфемериды" выбрать другое, более соответствующее содержанию и местным условиям – "Исследования природы в Литве или различные произведения, которые могут разъяснить описание животных и растений в Великом княжестве Литовском и болезней, которым в этой стране особенно подвержены люди" [8]. На титульном листе указано, что автором статей и редактором издания является профессор Ж.Э.-Жилибер.

Большинство научных исследований, судя по содержанию сборника, было выполнено Ж.Э.Жилибером в период его работы в Гродно. Отсутствие в нем трудов других авторов можно объяснить тем, что в медицинской академии он был единственным доктором медицины и профессором. Из числа преподавателей (адъюнктов) академии в состав авторского актива мог войти только К.И.Вирион. Он имел глубокие знания в области анатомии и нередко привлекался профессором в качестве консультанта. Другой преподаватель – Менард, обучавший студентов латинскому и французскому языкам, был полезен только как корректор или технический редактор. Единичные и непостоянно работавшие в городе врачи тогда

еще не проявляли интереса к научно-практической деятельности.

К сожалению, из-за отсутствия источников нельзя дать точное определение типа этого регионального издания. Ряд известных польских историков и ботаников считает, что "Исследования природы Литвы..." были задуманы как журнал. Первым такое мнение, как отмечает Л.Яновский, высказал еще в 1791 г. С.Б.Юндзил, ученик и последователь Ж.Э.Жилибера [11]. Не сомневаются в том, что издание является журналом, современные исследователи В.Грембецка [9] и П.Дашкевич [6]. Они считают это начинание Ж.Э.Жилибера одной из его значительных заслуг.

Нами проведено изучение содержания сборника "Исследования природы Литвы...". Как и большинство других научных трудов Ж.Э.Жилибера, он был написан на латинском языке, который тогда обычно использовался для публикации научных достижений и общения ученых. По традиции того времени на титульном листе указано, что автор имеет ученую степень доктора медицины от университета в Монпелье, раньше был профессором ботаники, анатомии и хирургии в Лионском медицинском колледже, а сейчас является штадт-физиком естественной истории Литвы, профессором естественной истории, ботаники и лекарствоведения Виленского университета.

Как показал проведенный анализ, основное содержание этого, пока до конца неразгаданного издания, общим объемом в 145 страниц составляют научные статьи или очерки, единоличным автором которых является профессор Ж.Э.Жилибер. Им предшествует его обращение (на 16 ненумерованных страницах) к королю польскому и великому князю литовскому С.А.Понятовскому, в котором изложены в духе идей просвещения цели и методы обучения естественной истории, а также основные научно-практические достижения за период работы в ВКЛ. Затем следует предисловие, названное прологом. По традиции это должно быть обращением редактора нового издания к читателям. Однако, вместо изложения целей и задач, автор представил в нем расписание занятий и крат-

кую программу преподавания естественной истории, предназначенную для студентов Виленского университета.

Это было, по-видимому, вынужденной мерой, поскольку в расписании занятий на 1781–1782 учебный год фамилия новоизбранного профессора Ж.Э.Жилибера не значилась, так как он приступил к работе после его опубликования. В прологе также указывается название тех предметов, которые он будет преподавать студентам на протяжении первого года обучения: минералогия, ботаника и зоология. Этому предшествует обзор состояния природы ВКЛ, отчет об опыте преподавания медико-биологических наук, о методах и результатах научных исследований за 7 лет. Знакомство с ними позволяет также судить об организации, уровне и методах преподавания в Гродненской медицинской академии.

Затем следует изложение 14 научных статей Ж.Э.Жилибера, посвященных проблемам биологии, медицины и ветеринарии. В них в основном представлены результаты научных исследований, проведенных им еще в Гродненской медицинской академии. Из них только 2 выполнены или дополнены после перехода на работу в Виленский университет. Полагая, что это может привлечь внимание и современных читателей, приводим названия всех статей в переводе с латинского языка:

– Наблюдения за литовским бизоном.

– Анатомические изыскания над плодом ацефалического урода.

– Наблюдение за бобром.

– Наблюдение за лосем.

– Наблюдение за плодом европейского ежа.

– Зоологические и анатомические наблюдения над литовской черепахой.

– Об эндемической язве в Литве.

– Наблюдение за воспалительной болезнью домашнего скота в Литве.

– Наблюдение за заразным зудом, поразившим домашний скот Литвы.

– Наблюдение за веткой тиса, покрытой ягодами и удивительным образом изогнутой в виде серпа.

– Научные изыскания о волке.

– Анатомия волка.

– Наблюдения за гибридами волков.

– Наблюдение над камешком, найденным в головном мозгу быка.

Содержание большинства входящих в сборник научных работ пока еще мало изучено. Только отдельные из них переведены с латинского на польский или русский языки и подвергнуты анализу учеными-медиками, биологами и философами. Несмотря на описательный характер, для многих из них характерна приверженность автора к непосредственному наблюдению, острому и хроническому экспериментам. Широко применялись им патологоанатомические вскрытия, предпринимались попытки микроскопирования отделяемого язвенных поражений кожи.

Хотя тираж сборника был небольшим, до нашего времени дошло только несколько десятков экземпляров. При этом он не остался незамеченным, но не всегда получал объективную оценку. К сожалению, отдельные ученые-последователи, оценивая через десятки и сотни лет уровень их значимости для науки и практики, делали это в сравнении с достижениями своего времени [7].

Таким образом, результаты проведенного нами исследования показывают, что идея Ж.Э.Жилибера об издании в Гродно первого на современной территории Беларуси медико-биологического журнала была частично реализована, хотя это подтверждается пока только косвенными источниками. По нашему мнению, не так уж существенно, что он вышел не под названием "Эфемериды", как это предусматривалось в договоре. Более значительной потерей является то, что "Исследования природы Литвы..." были единственным выпуском. Основные причины этого: разорение и опала в 1781 г. А.Тизенгауза, вынужденное досрочное возвращение в 1783 г. Ж.Э.-Жилибера во Францию.

Полученные нами предварительные данные позволяют признать, что первая попытка издания медико-биологического журнала на современной территории Беларуси во второй половине XVIII века представляет значительный интерес и не может быть предана забвению. Для окончательного заключения о том, был это сборник или журнал, необходимо продолжение исследований.

## Литература


1. Грицкевич В. П. Медико-биологическая литература Белоруссии, Литвы и Подлясья XV–XVIII вв. // История и методология естествознания. – Минск, 1966. – С.17-21.

2. Гродненская медицинская академия: библиогр. указ. лит. / Сост. Ф. И. Игнатович и Т. Б. Журавлева. – Гродно, 2006. – 24 с.

3. Игнатович Ф. И. Врачи Беларуси за создание медицинской периодической печати во второй половине XVIII – начале XX столетия // Здравоохранение. – 1997. – № 2. – С.60–61.

4. Левит М. М., Мультановский М. П. Медицинская периодическая печать // Большая медицинская энциклопедия. – М., 1980. – Т.14. – С.1112.

5. Парфенов И. М. Медицинские журналы в Белоруссии // Здравоохранение. – 1958. – № 1. – С.69-72.

6. Daszkiewicz P. Polityka i przyroda: rzecz o Jean Emmanyelu Gilibercie. – Warszawa, 1995. – S.35.

7. Там же, С.18–19.

8. Gilibert J. E. Indagatores naturae Lithuaniae... – Vilnae, 1781. – 128 s.

9. Grebecka, W. Wilno-Krzemieniec. Botaniczna szkoła naukowa (1791–1841). – Warszawa, 1998. – S.56, 87.

10. Там же, С.130.

11. Janowski L. W promeniach Wilna i Krzemieńca. – Wilno, 1923. – S.44.

12. Kościałkowski S. Antoni Tyzenhauz-podskarbi nadworny litewski. – Londyn, 1970. – T.1. – S.383.

13. Sewda B. Dzieje medycyny w zarysie. – Warszawa, 1977. – S.475.

14. Slawinski W. Dr. Jan Emmanuel Gilibert profesor i założyciel ogrodu botanicznego w Wilnie. – Wilno, 1925. – S.5-6.

15. Wrzosek A. Zalozenie królewskiej szkoły lekarskiej w Grodnie za Stanisława Augusta // Archiwum historii i filozofii medycyny. – Poznan, 1925. – Z.2. – S.149-168.

**Афанасьева Татьяна Юрьевна,** *директор ГУ "Национальный исторический архив Беларуси в г.Гродно"*

# "ГРОДНЕНСКИЕ ГУБЕРНСКИЕ ВЕДОМОСТИ" В ФОНДАХ НАЦИОНАЛЬНОГО ИСТОРИЧЕСКОГО АРХИВА БЕЛАРУСИ В Г.ГРОДНО.

Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно является одним из крупнейших в республике документохранилищ. Здесь хранятся документальные материалы учреждений бывшей Гродненской губернии и бывших Виленского, Лидского и Ошмянского уездов Виленской губернии Российской империи за XIX – начало XX вв., в отдельных фондах – документы XVI–XVIII вв. В архиве состоит на учете 1252 фонда и более 410 тысяч дел. Более 16 тысяч книг, брошюр, газет и журналов за XVI – начало XXI вв. находится в научно-справочной библиотеке архива. В фондах архива и библиотеки хранятся и экземпляры "Гродненских губернских ведомостей" за 1838–1915 гг.

Указом Николая 1 от 3 июня 1837 г. в главе III "О порядке сношений губернского правления" параграфом 86 было определено, что "для облегчения и сокращения в порядке сношений губернского правления и доставления как присутственным местам и должностным лицам, так и вообще всем и каждому, удобнейшего средства получать в надлежащее время сведения о постановлениях и распоряжениях губернского начальства, а равно и о других предметах, следующих к общему сведению, издаются при каждом губернском правлении особые губернские ведомости" [1].

"Гродненские губернские ведомости" стали издаваться с января 1838 г. и являлись официальным изданием Гродненского губернского правления, общий надзор над газетой принадлежал вице-губернатору. Издавалась газета в губернской типографии на 4 листах жесткой бумаги формата 17x21. Формат газеты постоянно менялся в сторону увеличения. Доказательством этого являются экземпляры "Гродненских ведомостей" за 1838, 1864, 1868, 1915 гг. Периодичность выхода газеты также менялась: с 1838 г. – один раз в неделю, 1891 г. – 2

раза, 1899 г. – 4 раза, с 1900 г. – ежедневно, 1902 г. – 2 раза в неделю. "Гродненские ведомости" печатались на русском языке. Экземпляры ведомостей обязательно отсылались в Императорскую публичную библиотеку.

"Гродненские губернские ведомости" имели два отдела: общий и местный, а местный, в свою очередь, делился на часть официальную и неофициальную. В общем отделе помещались только официальные документы, предназначавшиеся для всего государства – указы, манифесты, постановления и др. В официальной части местного отдела помещались материалы, относящиеся только к Гродненской губернии: постановления губернского правления, циркуляры и предписания губернатора, сообщения о предстоящей продаже имущества и различные другие объявления. К официальной части следует отнести и так называемые "прибавления", печатавшиеся обычно на отдельных листах.

В неофициальной части помещались материалы, статьи, заметки по топографии, истории, археологии, статистике, этнографии, сельскому хозяйству, торговле, ярмаркам, а также метеорологические сводки и частные объявления, но в первые десятилетия эта часть была слабой, заполнялась совершенно безликими материалами. Особенностью "Гродненских ведомостей" являлось то, что они почти совершенно не занимались перепечаткой из других изданий.

С начала 90-х г. XIX в. в "Гродненских ведомостях" было напечатано значительно больше материала и более интересного, чем за все предыдущие годы существования газеты. В таком виде она стала богатым источником по истории экономической и культурной жизни губернии. В объявлении, помещенном в начале 1899 г., редакция писала: "Восьмилетний опыт издания "Гродненских губернских ведомостей" по особой расширенной до пределов частных газет программе, показал, что издание такого губернского органа приносит несомненную пользу, давая, с одной стороны, возможность губернской администрации следить за такими явлениями в жизни населения губернии, которые легко ускользают от обычного официального надзора, с другой, – предоставляет интеллигентным людям возможность заявлять о нуждах населения губернии, о необходимых улучшениях в его быте и выдающихся фактах личной общественной жизни" [2].

За длительный период своего существования неофициальная часть проделала значительную эволюцию. В середине XIX в. количество лиц, помещавших в газете свои статьи или заметки, исчислялось буквально единицами, к концу столетия картина изменилась, увеличилось во много раз число корреспонденций.

И лица, участвовавшие в газете, и характер статей были очень разнообразны. В "Гродненских губернских ведомостях" печатались Е.Ф.Орловский, Д.Милюта, А.Е.Богданович, Л.Солоневич, М.Дмитриев, Т.Нарбут, И.Крашевский и др. Так, например, в неофициальной части "Гродненских ведомостей" за 1905 г. были напечатаны статьи Л. Солоневича "Почему спиртные напитка вредны", Д.Милютина "Красностокский епархиальный собор". В этот год газета печатала статьи по исследованию белорусских наречий в Гродненской губернии; о возможности столкновения русской и японской эскадр; о предупреждении холерной эпидемии и о борьбе с нею; о способе ремонта мостовых в Гродно; из области суеверий и предрассудков и др.

"Гродненские ведомости" уделяли также внимание вопросам народного образования и сельского хозяйства. Кроме того, газета помещала много материалов о промышленном развитии губернии. Она часто печатала материалы по этнографии, помещала рецензии о театральных постановках в Гродненском театре.

В рапорте начальника Гродненского губернского жандармского управления гродненскому губернатору от 16 марта 1915 г. отмечено, что в Гродно кроме "Гродненских губернских ведомостей" издаются также газеты-телеграммы "Наше Утро" и "Гродненское эхо" [3].

Для исследователей, краеведов "Гродненские губернские ведомости" являлись и являются одним из немаловажных источников по истории экономики и культуры Гродненской губернии, т.е. Гродненской и Брестской областей.

**Литература**

1. Полное собрание Законов Российской империи Т.XII. – СПб., 1838. – С.459.

2. Национальный исторический архив Беларуси в г.Гродно. – Ф. 9, оп 1, д. 2860, л. 4.

3. Там же. – Ф. 1, оп. 9, д. 2102, л. 8.

**Смалянчук Алесь Фёдаравіч,** *доктар гістарычных навук, прафесар Беларускага інстытута правазнаўства*

# ГОРАДНЯ НА СТАРОНКАХ "НАШАЙ НІВЫ". 1906 – 1910 гг.

"Наша Ніва" была другой (пасля "Нашай Долі") легальнай беларускай газетай на пачатку XX ст., якая адыграла вялікую ролю ў нацыянальна-культурным Адраджэнні беларусаў. У адрозненні ад сваёй папярэдніцы, якая больш нагадвала рэвалюцыйную пракламацыю, "Наша Ніва" была традыцыйнай газетай, рэдакцыя якой бачыла сваю галоўную задачу ў тым, каб "служыць усему беларускаму скрыўджэнаму народу", называла сябе газетай "усіх беларусоў і ўсіх тых, хто ім спагадае", і абяцала, што будзе імкнуцца, каб "усе беларусы, што ня ведаюць, хто яны ёсць, – зразумелі, што яны беларусы"[1].

Праблемы палітычнага жыцця і беларускага нацыянальна-культурнага Адраджэння былі прыярытэтнымі. Фактычна, першая згадка Горадні ў аналітычных матэрыялах "Нашай Нівы" была звязаная з выбарамі ў II Думу. Адразу пасля выбараў у Горадні "Наша Ніва" паведаміла пра адміністрацыйнае ўмяшальніцтва ў іх ход, што і прадвызначыла перамогу "правых". Газета распавяла пра абедню, якую правадзіў архерэй спецыяльна, для сялянскіх дэпутатаў на губернскі выбарчы сход. Архерэй скончыў абедню чарнасоценнай прамовай, у якой "лаяў жыдоў апошнімі словамі" і пераконваў, што памешчыкі – гэта лепшыя сябры мужыкоў. Пасля гэтага сялянскіх дэпутатаў размясцілі ў Народным доме пад аховай паліцыі, каб ізаляваць ад гарадскіх выбаршчыкаў (тых самых "жыдоў"), з якімі яны раней заключылі пагадненне. Пасля выбараў гарадскія выбаршчыкі падалі скаргу, якую падтрымалі некаторыя сялянскія дэпутаты. Яны прасілі адмяніць вынікі выбараў, заяўляючы, што былі "адурманеныя духоўнымі асобамі"[2].

На выбарах ў III Дзяржаўную думу, якія адбыліся ў кастрычніку 1907 г., таксама перамаглі чарнасоценныя кан-

дыдаты. Паводле "Нашай Нівы", гэтая перамога была абумоўлена актыўнасцю Сафійскага праваслаўнага брацтва і пагадненнем паміж "ісцінно-рускімі" і "ісцінно-польскімі" чарнасоценцамі. Супрацьстаяў гэтаму саюзу ліберальна-дэмакратычны Прагрэсіўны блок, пазіцыю якога падзяляла таксама "Наша Ніва". Агітуючы за тое, каб сялянскія дэпутаты падтрымалі прагрэсістаў, карэспандэнт "Нашай Нівы" (Nemo) пісаў, што "мужыком патрэбна не грызня паміж рознымі верамі і нацыямі, а новыя свабодныя парадкі і землі"[3].

У студзені 1908 г. праблему стаўлення беларусаў да сваёй роднай мовы ўзняў ананімны настаўнік з Гарадзеншчыны ў лісце ў рэдакцыю:

"...Даўно ўжо мучыць мяне думка аб нашай роднай мові. Народ мае сваю мову. Гаворыць у ёй, не ўстыдаецца яе, а сын гэтаго народу, як выйдзе ў людзі ўжо гаворыць іначэй з гэтым самым народам, каторы яго выгадаваў, на зямліцы каторага ён вырас і сынам каторага ён лічыцца. Чаму гэтак у нас зрабілася, што ўжо так многа інтэлігенцыі выйшла з народу, і ўся яна выраклася сваёй роднай мовы?" Аўтар заўважыў, што пасля атрымання адукацыі для інтэлігенцыі ўжо пакута размаўляць у роднай мове. Ліст канчаўся праклёнам: "Каб таму было цяжка дыхаць, хто гэта зрабіў!"[4]

Уласна беларускае культурнае жыццё ў Горадні актывізавалася пазней. У сакавіку 1910 г. нехта "Паўлюк" (?) (Павел Аляксюк!?) паведаміў пра беларускую вечарыну, якая, па яго словах, "вельмі добра ўдалася". Гэтае паведамленне датычыла першай вечарыны, арганізаванай Гуртком беларускай моладзі, да якога належала Людвіка Сівіцкая, больш вядомая як Зоська Верас. "Паўлюк" заўважыў, што Горадня – горад беларускі, але "дагэтуль аб беларусах нешта мала было чутно, і толькі цяпер пачалі яны тут будзіцца. С пачатку, праўда, ішло туга, але пасьля што раз болей і болей пачалі цікавіцца беларускім адраджэньнем, і вось цяпер ужо маем нямала беларусоў, каторые душой і сэрцэм прыналежаць да сваёй бацькоўшчыны... Найбольш нас цешыць і тое, што і нашы браты – славяне – расейцы і палякі – спагадаюць нам тутака, а найболей то цешацца літвіны, што беларускі народ, каторага сілы ешчэ не выкарыстаны, а нават і не пачынаны, – прачнуўся"[5].

Пазней праблему беларускай культуры неаднаразова ўздымаў вядомы дзеяч беларускага руху гарадзенец Павел Аляксюк. Праўда, ягоныя "беларускія замалёўкі" датычылі больш ваколіцаў Горадні. Вось фрагмент мініртэпартажу з Эйсмантаў: "Шляхта тутэйшай аколіцы, відаць, забылася ўжо сваёй прадзядоўскай мовы; а мо і ня ведае гэты цёмны народ, што даўней іх бацькі і дзяды ўжывалі толькі родную беларускую мову... Не забыліся за тое тутэйшыя людзі іншых старасвецкіх звычаёў: у аколіцы, хоць яна і не вялікая, ёсць ажно тры карчмы і, як надойдзе свята, шляхта наша цягне туды, як жураўлі ўвосень, і там за кварту гарэлкі можна купіць чалавека, як кажуць, з патрахамі... Ня дзіва, што тут беднасьць расселася як у сваёй хаці, бо а прасьвеці столькі ведаюць, колькі а жалезным ваўку"[6].

Цалкам іншую карціну ён назіраў у м.Сідра: "Ці то каталік, ці праваслаўны – кожны з іх прызнае сябе цяпер толькі беларусам, і кожны з іх горнецца да беларускай кніжкі, да роднай сваёй мовы. Вельмі любяць яны чытаць "Нашу Ніву", асабліва казкі і розныя апавяданьня... Кепска толькі, што школ ешчэ ў нас нехват для ўсіх тых, каторые хацелі-б там вучыцьца. Кепска і тое, што ў мястэчку ёсць карчма і стаіць яна – скуль-бы не ехаў – як раз на самай дарозі, – вось і трудна з ёй размінуцца..."[7].

Паводле інфармацыі таго ж карэспандэнта, "Нашу Ніву" і беларускія кнігі ў Горадні можна было набыць у кнігарнях Заморскай, Любіча і Тракеніцкай. Апроч таго "Нашу Ніву" прадаваў яшчэ хлопчык-газетчык[8].

(Варта адзначыць, што сёння "Нашу Ніву" у кнігарнях і ў "хлопчыкаў-газетчыкаў" ужо не набудзеш! Забаронены друк).

У траўні 1910 г. П.Аляксюк паведаміў, што ў Гарадзенскі Акруговы суд перададзены тэстамент Элізы Ажэшкі. Усе грошы і дом яна адпісала сваёй сяброўцы, не забылася і пра старых слуг[9].

Смерць Э.Ажэшкі была падзеяй, якая моцна ўсхвалявала гараджанаў. "Наша Ніва" адрэагавала на смерць пісьменніцы артыкулам "Эліза Ажэшка", падпісаным В.Л. (магчыма, Вацлаў Ластоўскі?). Аўтар адзначаў, што смерць Э.Ажэшкі, якая "старалася шырыць агульналюдскія ідэалы, міласць да чалавека", з'яўляецца стратай не толькі для Польшчы і

польскага народу, але для ўсяго культурнага свету. Паводле В.Л., "большая частка твораў Э.А., як і сама душа пісьменніцы, неразрыўна зьвязана з беларускай глебай... Праўдзівай бацькоўшчынай Ажэшковай была Беларуская зямля, каторая яе ўзгадавала; с Польшчай – апрача мовы і гісторычных перажыткоў – вялікая пісьменніца мела мала супольнаго. І ўсёж такі беларуская фантазія, беларуская казка, што рожэвай дымкай апавівала яе дзіцячыя думкі, ускалыхала вялікага духу пакойнай на славу чужым. Такая ўжо, відаць, доля нашага краю..."[10].

У лістападзе 1910 г. Гарадская дума пастанавіла ўшанаваць памяць Ажэшкі. Дзеля гэтага было прынята рашэнне "1) назваць Пясковую вуліцу, на якой яна жыла, яе іменем; 2) плаціць з гарадскіх сродкаў за навуку 5 бедным вучням; 3) даваць штогод на кожны з гарадскіх прытулкаў 100 руб.; 4) павесіць партрэт Ажэшкі ў зале паседжанняў гарадской думы[11].

Карэспандэнцыі Паўла Аляксюка пачалі з'яўляцца на старонках "Нашай Нівы" з кастрычніка 1909 г. Спачатку гэта былі кароткія паведамленні пра падзеі з жыцця Горадні, якія змяшчаліся ў рубрыцы "З Беларусі і Літвы". Пазней рэдакцыя пачала вылучаць іх асобна і з'явілася рубрыка "З Гродны". Паведамленні П.Аляксюка ствараюць даволі цікавы вобраз штодзённага жыцця гораду. Да найбольш характэрных гарадзенскіх сюжэтаў належалі праблема гігіены, асвятлення вуліц, крымінальныя здарэнні, гаспадарка і адукацыя:

Кастрычнік 1909 г.: "У горадзе халера, якой доўга не было. За тры тыдні памерла 30 чалавек... Зараз наводзіцца чысціня, але больш для вачэй. Калі гаспадар не хоча прыбіраць бруд, то ўсё так і застаецца. Калі паліцыя не будзе глядзець за чысцінёй, то халера будзе множыцца"[12].

Лістапад 1909 г.: "Горад наш губернскі, а парадкі не губернскія. На адной вуліцы шмат ліхтароў, а на іншых няма. Па некаторых завулках боязна хадзіць уначы, а яшчэ і злодзеі цягаюцца. Трэба ставіць ліхтары на пустых вуліцах;

цяпер набіраюць навабранцаў у войска. На вуліцы лепш не выходзіць: "Сядзі дома і не вытыкай носа"[13].

Снежань 1909 г.: "Судовая палата разглядала справу адваката Гілерсана, які на беластоцкім працэсе аб пагроме

казаў антыўрадавую прамову. "Шмат сабралося на гэта дзела адвакатаў з усёй Расеі, каб бараніць свайго таварыша". Аднак Судовая палата засудзіла яго на год у крэпасць"[14].

Люты 1910 г.: "У нашым горадзе ёсць такія падворкі, што як залезеш туды, то і ног з балота не выцягнеш: хоць па "скорую помач" пасылай. Ёсць і іншыя парадкі: на Саборнай, напрыклад, столькі таўчэцца народу, не маючы, відаць, нічога лепшага для работы, што калі патрэба здарыцца прайсьці, то і людзям і сабе паадбіваеш бакі. (Інфармацыю папярэджваў загаловак: "У нашым Гродне усё модне")"[15].

Сакавік 1910 г.: "Сярод бела дня вывозяць гарадскія бруды, ад якіх "аж насы рве". Калі-ж гэткім парадкам прыйдзе канец?"[16].

Красавік 1910 г.: "У горадзе "бруд, смурод; вечарамі такая цемь, што і прайсьці трудна. Тратуары паламаныя. Паліцыя, праўда, пішэ часам пратаколы; але з гэтым бывае ўсяляк…";

Фабрык у Горадні мала. Адна вялікая – тытунёвая І.Шэрашэўскага. Нядаўна ён звольніў 100 непатрэбных работнікаў, выплаціўшы ім 2 тыс. руб. Тыя за гэтыя грошы заснавалі ручную фабрыку тытуню. Тавар пайшоў добра. Шэрашэўскі нават знізіў цэны;

Тутэйшы гандаль апроч некалькіх багацейшых і 2-3 гуртовых крамаў у руках жыдоў;

Педагагічнае таварыства часта праводзіць публічныя лекцыі. Плата невялікая, а карысць вялізарная. Найбольш прыходзіць жыдоў, а наш брат "усё ззаду на хвасьце";

Да леташняга году горад быў падзелены Нёманам на дзве часткі. Багацейшыя трымаліся аднаго берагу, а бедакі, шукаючы таннае жыллё, перабіраліся на другі бераг. Летась збудавалі мост, і цэны выраўняліся: "І тут, і там дзяруць добра!" Пайшлі скаргі на домаўладальнікаў. Гарадская дума прызначыла камісію, каб спыніць рост цэнаў"[17].

Травень 1910 г.: "Гарадзенская санітарная камісія баіцца вяртання халеры. Шмат гамоняць з гэтай нагоды, "а тым часам на прыватных падворках такія бруды, што бадай і сама халера пасароміцца ўткнуць туды свой нос…"[18];

Гарадзенскія каталіцкія прытулкі для сірот бядуюць, што нашы дактары апрача аднаго Д-скага ня хочуць дарма ля-

чыць. Захварэў Д. і ніхто не згадзіўся памагчы бедным. Сорам!;

непарадак у Гарадзенскай публічнай бібліятэцы: кнігі выдаюцца неакуратна, а многія згінулі;

па горадзе цягаюцца кітайцы, якія выдаюць сябе за дактароў ад усіх хваробаў. Зайшлі да адной жанчыны, тая напалохалася (у жыцці не бачыла!), выбіла шыбу і пачала крычаць. Думала, што гэта чэрці прыйшлі па яе душу"[19].

Чэрвень 1910 г.: "Гарадзенская санітарная камісія рыхтуецца бараніць горад ад халеры… Трэба было б каб першнаперш санітарная камісія звярнула ўвагу на тые скрынкі, куды выліваюцца памыі і ўсялякія бруды; скрынкі гэтыя бываюць часта густа пад самымі вокнамі кватэр бедных жыцелёў[20].

Праблема здароўя гарадзенцаў хвалявала не толькі П.Аляксюка. Ужо згаданы Nemo ў артыкуле "Доктарская помач у Гродзенскай губ." адзначаў, што паводле забеспячэння меддапамогай Гродзенская губ. знаходзіцца на 56 месцы ў Расейскай імперыі (з 89 губ.): "Хваробы пануюць тутака страшэнныя, дый то найбольш тыя, аб каторых за граніцай мала чутно і каторые родзіць недаеданьне, дрэнны харч, гразь, вільгаць, нагул некультурнасць і беднасць". Па "брушному тыфу" – у 1904–1905 гг. Гродзенская губ. аказалася на трэцім месцы ў Расеі, па пнеўманіі – на чацвёртым (1904), па сыпному тыфу – на 5, па тэмпах змяншэння насельніцтва – на 7 месцы[21].

Актуальнай праблемай гарадзенскага жыцця было п'янства. Зрэшты, не толькі гарадзенскага. У студзені 1909 г. у невялікай заметцы Nemo "У гарадзенскіх дэпутатаў", дзе аўтар распавядаў пра сваю сустрэчу з дэпутатамі Дзяржаўнай думы, ён працытаваў прызнанне аднаго з іх: "…Па вёсках у нас пайшло такое пьянства, што, здаецца, ніколі так не пілі. Проста здурэлі людзі з нуды і бяды…"[22].

У крымінальнай хроніцы таксама неаднаразова фігуравала п'янства. У прыватнасці, у сакавіку 1910 г. п'яны салдат сярод белага дня смяротна параніў нажом у цэнтры горада палкоўніка Нікіціна. Вайсковы Акруговы суд прысудзіў салдата да смяротнага пакарання[23]. Трохі кур'ёзна выглядае паведамленне пра ўвядзенне Гарадской управай новых правіл для лодачнікаў-перавозчыкаў. Правілам № 1 было патрабаванне цвярозасці[24].

Высокую ацэнку карэспандэнтаў "Нашай Нівы" атрымала праца гарадзенскіх пажарнікаў: "Коні добрыя, машыны таксама; людзі шчыра працуюць і вялікая карысць і помач з іх для нашага гораду"[25]. Летам 1910 г. пажарнікі звярнуліся ў Гарадскую ўправу з просьбай набыць паравую пажарную машыну. П.Аляксюк, які паведаміў пра іх просьбу, дадаў: "Справа дужэ важная"[26].

Карэспандэнты "Нашай Нівы" звярталі ўвагу на дзейнасць Хаўрусу (Таварыства) рабочых Горадні, які ўзнік увесну 1910 г. Рабочыя сабралі пэўны капітал, "пааткрывалі пасьля свае крамы, пекарні; маюць цяпер ужо свайго доктара, сваю аптэку, кнігарню і іншыя карысныя рэчы; даюць падмогу грашмі беднейшым таварышам і гэтакім парадкам шмат дабра і карысьці робяць для сваіх братоў-працоўнікоў"[27]. Летам 1910 г. Таварыства ўжо планавала адчыніць некалькі крамаў, але сустрэла супраціў жыдоў, якія пагражалі збіць цэны. Рабочыя вырашылі адказаць байкотам жыдоўскіх гуртовых крамаў[28].

Невядомы гарадзенскі карэспандэнт "Нашай Нівы", які падпісаўся літарай X, вельмі пазітыўна ацаніў "маёўку" гарадзенскай моладзі, якая прыцягнула шмат людзей, стварыла святочны настрой і яднала гарадзенцаў у адну грамаду. На думку гэтага карэспандэнта, бядой Горадні з'яўлялася раз'яднанасць людзей, якая "дрэнна адбівалася на грамадскім жыцці".

Матэрыялы "Нашай Нівы" дазваляюць даволі панарамна ўявіць штодзённае жыццё нашага гораду на пачатку XX ст. Відавочна, што тагачасныя праблемы Горадні былі характэрныя для большасці беларускіх гарадоў. Гэта датычыць як бытавых аспектаў, так і палітычных, і нацыянальна-культурных.

Адначасна прагляд і чытанне "Нашай Нівы" стогадовай даўніны выклікалі сумныя думкі пра тое, што многія тагачасныя праблемы захавалі сваю актуальнасць. Гэта і раз'яднанасць гарадзенцаў, якая абарочваецца абыякавасцю і пасіўнасцю ў грамадскім жыцці, гэта п'янства, якое выразна па-

маладзела і пашырылася на жаночы пол, гэта зняважлівае стаўленне мясцовага чыноўніцтва і мясцовай гэтак званай "інтэлігенцыі" да беларускай мовы і культуры. Аналітычныя артыкулы "Нашай Нівы" 1906 – 1910 гг., прысвечаныя якраз нацыянальна-культурным аспектам беларускага руху, успрымаюцца як напісаныя сучаснымі аўтарамі.

### Спіс выкарыстаных крыніц


1. Наша Ніва. № 1 ад 10 лістапада 1906 г.
2. Тамсама. № 2 ад 11 лютага 1907 г.; № 8 ад 24 лютага 1907 г.
3. Тамсама. № 30 ад 28 верасня 1907 г.
4. Тамсама. № 1 ад 4 студзеня 1908 г.
5. Тамсама. № 13 ад 25 сакавіка 1910 г.
6. Тамсама. № 15 ад 8 красавіка 1910 г.
7. Тамсама.
8. Тамсама. № 25 ад 17 чэрвеня 1910 г.
9. Тамсама. № 22 ад 27 траўня 1910 г.
10. Тамсама. № 20 ад 13 траўня 1910 г.
11. Тамсама. № 46 ад 11 лістапада 1910 г.
12. Тамсама. № 42 ад 15 кастрычніка 1909 г.
13. Тамсама. № 48 ад 26 лістапада 1909 г.
14. Тамсама. № 49 ад 3 снежня 1909 г.
15. Тамсама. № 8 ад 18 лютага 1910 г.
16. Тамсама. № 11 ад 11 сакавіка 1910 г.
17. Тамсама. № 15 ад 8 красавіка 1910 г.
18. Тамсама. № 22 ад 10 траўня 1910 г.
19. Тамсама. № 19 ад 6 траўня 1910 г.
20. Тамсама. № 26 ад 24 чэрвеня 1910 г.
21. Тамсама. № 52 ад 3 снежня 1910 г.
22. Тамсама. № 1 ад 1 студзеня 1909 г.
23. Тамсама. № 14 ад 1 красавіка 1910 г.
24. Тамсама. № 22 ад 27 траўня 1910 г.
25. Тамсама. № 15 ад 8 красавіка 1910 г.
26. Тамсама. № 25 ад 17 чэрвеня 1910 г.
27. Тамсама. № 16-17 ад 15 красавіка 1910 г.
28. Тамсама. № 27 ад 1 ліпеня 1910 г.

**Амелька Уладзімір Паўлавіч,** *начальнік упраўлення ідэалагічнай работы Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта*

**Амелька Сяргей Уладзіміравіч,** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы"*

# ПЕРЫЯДЫЧНЫ ДРУК ГРОДЗЕНШЧЫНЫ Ў ГАДЫ СТАНАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ (1990-я – ПАЧАТАК 2000-х ГАДОЎ)

Распад СССР, ліквідацыя КПСС і наступіўшае затым утварэнне новых постсавецкіх дзяржаў, у тым ліку і Рэспублікі Беларусь, у значнай ступені прадвызначыла далейшы ход развіцця гісторыі. Істотныя змены адбыліся і на інфармацыйнай прасторы нашай краіны. Большасць перыядычных выданняў пазбавіліся сваіх заснавальнікаў, многія ўвогуле перасталі існаваць у атмасферы палітычнай і фінансавай нестабільнасці, няўпэўненасці і духоўнай інфантыльнасці.

У падобнай сітуацыі апынуліся і перыядычныя выданні Гродзеншчыны. Раённыя газеты, а яны заўсёды былі самымі масавымі, не толькі памянялі свой статус заснавальнікаў, але і падпісчыкаў. Не хапала грошай на іх выданне: закупку паперы, друкарскія выдаткі. Усе газеты мелі малы аб'ём, выходзілі толькі на чатырох старонках. Каб выжыць, рэдакцыйныя калектывы пачалі шукаць рэкламадаўцаў, амаль палову плошчы газеты аддавалі на рэкламу. Пачаўся адыход кваліфікаваных кадраў.

Безумоўна, гэта не магло не сказацца на аўтарытэце раённага друку, чытацкай аўдыторыі, і як вынік – тыражах і фінансавай залежнасці. Тыраж газет вобласці ў 1995 годзе зменшыўся ў параўнанні з 1990 годам на 32,3 тысячы экзэм-

пляраў, або на 35%. Акупляльнасць раённых газет складала 55%, у той жа час як у 1990 годзе – 84%. Больш-менш фінансава незалежнай заставалася абласная газета "Гродзенская праўда", заснавальнікамі якой выступалі Гродзенскі абласны і гарадскі саветы народных дэпутатаў, а таксама абласны і гарадскі выканаўчыя камітэты. Аднак колькасць падпісчыкаў, якая ў 1990 годзе была амаль самая высокая ў рэспубліцы – даходзіла да 90 тысяч, то праз 5 гадоў скарацілася на 40 тысяч.

У гэтых няпростых умовах новае кіраўніцтва краіны і асабіста Прэзідэнт Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка прынялі шэраг дакументаў, якія рэгламентавалі дзейнасць сродкаў масавай інфармацыі. Самым галоўным дасягненнем на шляху да дэмакратызацыі грамадскага жыцця, як лічылі многія даследчыкі ў той час, была адмена цэнзуры ў СМІ. У пачатку 1990-х гадоў былі зроблены першыя крокі ў гэтым накірунку, калі была спынена дзейнасць кантралюючага органа – Галоўліта – непасрэдна ў друкарнях. Усе газеты маглі свабодна выходзіць без пячаткі абліта, па так званаму даверальнаму прынцыпу.

Адметнай з'явай было прыняцце распараджэння Прэзідэнта ад 4 студзеня 1996 года № 3 "Аб некаторых пытаннях інфармацыйнай палітыкі". Выконваючы гэтае распараджэнне, аблвыканкам і райвыканкамы знайшлі магчымасць выдзеліць сродкі на камп'ютэрызацыю раённых газет, у выніку чаго наша вобласць першай у рэспубліцы перайшла ў 1997–1998 гг. на больш прагрэсіўны спосаб набору і вёрсткі газет, палепшылася іх мастацкае і паліграфічнае выкананне. Дарэчы, з гэтага перыяду пачалося, як адзначалася ў пастанове Гродзенскага аблвыканкама ад 26.04.1999 г. "Аб асвятленні ў сродках масавай інфармацыі работы мясцовых органаў улады, пытанняў дзяржаўнай унутранай і знешняй палітыкі", перавод усіх друкарняў на афсетны спосаб друку раённых газет, цэнтралізаванае забяспечванне газетнай паперай.

Сістэма дзяржаўных выданняў вобласці налічвала ў 1998 годзе 19 газет (2 абласныя і 17 раённых) з агульнай колькасці 58. Заснавальнікамі іх з'яўляліся мясцовыя органы вы-

канаўчай і прадстаўнічай улады, рэдакцыі газет. Разавы сумарны падпісны тыраж дзяржаўнай прэсы Гродзеншчыны ўзрос з 107,1 тыс. экз. у 1998 г. да 115,8 тыс. экз. у 1999 г. Найбольшы тыраж мелі "Гродзенская праўда" – 20742 экз., "Лідская газета" – 15395, "Міліцэйскі веснік" – 8083, "Наш час" (Ваўкавыск – 7255), "Іўеўскі край" – 6343экз. [1]

Для паляпшэння інфарміравання насельніцтва Лідская, Слонімская і Ваўкавыская раённыя газеты ў 1998 г. былі пераведзены на трохразовы выхад на тыдзень.

Рашаючым фактарам, які аказвае станоўчы ўплыў на эфектыўнасць і ўзровень творчай працы журналістаў, з'яўляецца фінансава-эканамічнае становішча. Так, за 1998 год рэдакцыямі газет атрымана 53,4 млрд. рублёў даходаў, у тым ліку 23,8 млрд. – раённымі газетамі і 29,6 млрд. – "Гродзенскай праўдай". Доля ўласных даходаў у сабекошце выданняў склала 106%. Акупляльнасць абласной газеты – 188%, а раёнак – 69%.

У пастанове аблвыканкама адзначалася, што "адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці рэдакцый з'яўляецца асвятленне работы мясцовых органаў улады. Газеты публікуюць афіцыйныя матэрыялы-рашэнні выканкамаў, сесій Саветаў дэпутатаў, выступленні і інтэрв'ю кіраўнікоў і спецыялістаў, віншаванні жыхароў вобласці, працоўных калектываў напярэдадні памятных дат". Яны змяшчаюцца пад рубрыкамі: "У выканкаме", "З сесіі Савета", "У калідорах улады", "Выканкам рашыў", "Што ў Савеце" і інш.

У "Слонімскім весніку" з'явіліся матэрыялы пад новымі рубрыкамі "Мясцовая ўлада – дзень сённяшні" і "Зваротная сувязь", у якіх расказваецца аб кіраўніках гарадской і раённай вертыкалі больш падрабязна – аб іх буднях, клопатах, чалавечых якасцях, тым самым падымаючы іх аўтарытэт перад людзьмі. У "Гродзенскай праўдзе" атрымалі прапіску інтэрв'ю з адказнымі работнікамі аблвыканкама і мясцовых органаў улады. Такія матэрыялы друкаваліся ў газетах "Новае жыццё" (Навагрудак), "Лідская газета", "Зара над Нёманам" (Масты), "Светлы шлях" (Смаргонь), "Іўеўскі край". Аблвыканкам адобрыў вопыт рэдакцый Бераставіцкай і Ма-

стоўскай газет па правядзенні і асвятленні "прамых ліній" з кіраўнікамі. Такую ж практыку хутка ўвялі ў сябе журналісты з Ашмян, Воранава, Астраўца і Ваўкавыску.

У Смаргоні рэгулярна праводзяцца сустрэчы старшыні райвыканкама, яго намеснікаў з журналістамі, на якіх абмяркоўваюцца актуальныя пытанні дзейнасці выканкама, газеты, аказанні рэдакцыі дапамогі ў эканамічным і інфармацыйным накірунку.

Добрым вынікам такога супрацоўніцтва з'явілася дапамога райвыканкама ў набыцці для рэдакцыі камп'ютарнай тэхнікі, легкавога аўтамабіля і новага памяшкання. Неабходна адзначыць плённае ўзаемадзеянне мясцовай улады і журналістаў у Слоніме, Мастах, Лідзе, Зельве, Бераставіцы.

Штомесячна для журналістаў праводзяцца прэс-канферэнцыі, вучоба кадраў.

Шчучынскі, Бераставіцкі райвыканкамы, Лідскі і Слонімскі гарвыканкамы заслухалі ў 1997–1998 гг. на сваіх пасяджэннях работу рэдакцый газет, а Мастоўскі райвыканкам выдзяліў сродкі на набыццё аўтамабіля для газеты "Зара над Нёманам".

У той жа час ускрыты шэраг недахопаў у рабоце перыядычных выданняў вобласці. Нярэдка матэрыялы аб дзейнасці ўлады падаюцца павярхоўна, яны вызначаюцца тэматычнай і жанравай аднабокасцю. Не ўсюды праводзяцца "прамыя лініі", не даецца аналіз падзей і недахопаў, адсутнічае крытыка. Гэта характэрна для Астравецкай і Шчучынскай газет. З рэдактарамі Бераставіцкай, Воранаўскай, Іўеўскай, Гродзенскай газет не былі заключаны кантракты, а рэдактары Шчучынскай, Воранаўскай, Лідскай і Ваўкавыскай газет не ўведзены ў склад выканкамаў, як гэта было прадугледжана распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Аб некаторых пытаннях інфармацыйнай палітыкі" ад 4 студзеня 1996 года № 3. Не сталі пакуль традыцыйнымі ў вобласці нарады, семінары, творчыя "лятучкі" для рэдактараў і супрацоўнікаў мясцовай прэсы па абмену вопытам, конкурсы для журналістаў і няштатных аўтараў.

Сапраўдным індыкатарам даверу чытачоў стала рэдакцыйная пошта. Работа з пісьмамі, зваротамі грамадзян з'яў-

ляецца дзейсным механізмам зваротнай сувязі дзяржаўных выданняў, іх заснавальнікаў – органаў мясцовай улады з насельніцтвам. Садзейнічаў гэтаму Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 снежня 1997 г. № 63 "Аб рэагаванні службовых асоб на крытычныя выступленні ў дзяржаўных сродках масавай інфармацыі". Колькасць пісем і крытычных матэрыялаў рэзка ўзрасла. Прасачыць за гэтым ростам можна на прыкладзе "Гродзенскай праўды". У 1998 годзе рэдакцыя атрымала 1521 пісьмо, апублікавана 566, адпраўлена на рэдагаванне 43 крытычныя артыкулы. "Лідская газета" апублікавала больш як 350 пісем, што значна больш, чым у папярэднія гады.

У той жа час у некаторых рэдакцыях мала крытычных матэрыялаў, некаторыя недахопы не ўскрываюцца, замоўчваюцца, што выклікае адмоўную рэакцыю ў людзей.

У 1998 годзе Міністэрства адукацыі падтрымала просьбу Гродзенскага аблвыканкама аб адкрыцці ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы спецыялізацыі "Літаратурная работа ў рэдакцыі". Набор на аддзяленне вырашана было ажыццяўляць па накірункам работы рэдакцый газет і тэлерадыёаб'яднання. У 1999 годзе правялі першы набор абітурыентаў. Прынята 10 чалавек. За 10 гадоў працы падрыхтавана каля 200 журналістаў, большасць якіх старанна працуе ў СМІ. Створана кафедра журналістыкі. Вучоба па спецыяльнасці "журналістыка" лічыцца вельмі прэстыжнай і зараз.

Вызначальным для прэсы вобласці з'явіліся 2000–2001 гады. Напярэдадні, 23 лютага 1999 года, выйшла распараджэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Аб дзяржаўнай падтрымцы мясцовага друку" №50-рп, якое з уздымам было ўспрынята журналістамі. Дзяржкамдрук і аблвыканкамы распрацавалі ў гэтай сувязі канкрэтныя праграмы па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы рэдакцый газет. У прыватнасці, ім выдзелена з рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў сродкі на набыццё 12 легкавых аўтамабіляў, 7 наборна-выдавецкіх сістэм, 18 лічбавых, 4 відэакамеры. Гэта паскорыла перавод рэдакцый на новыя формы набору, вёрсткі і друкавання газеты, павелічэння аб'ёму выданняў.

У лютым 2000 года аблвыканкам і раённыя выканаўчыя камітэты зноў вярнуліся да праблем выканання папярэдняга рашэння аб мясцовым друку. У рашэнні абвыканкама №76 ад 26 лютага 2000 года адзначалася, што за мінулы год павысілася роля мясцовай прэсы ў ідэалагічным, выхаваўчым уздзеянні на насельніцтва.

Дзятлаўскі райвыканкам заслухаў справаздачу рэдактара газеты "Перамога", Гродзенскі гарадскі выканаўчы камітэт – галоўнага рэдактара "Гродзенская праўда". Работу рэдакцыі "Лідскай газеты" заслухаў Лідскі гарвыканкам. З'явілася на старонках газет новая форма сумеснай работы з раённай "вертыкаллю" – дні адкрытага пісьма, выязныя прыёмныя газеты. Ініцыятарам быў Ашмянскі райвыканкам. [2]

У тры разы павялічыўся аб'ём вяшчання на абласным радыё і тэлебачанні, з'явіліся новыя праграмы "Студыя Гродна", "Вячэрні Гродна", упершыню ўкаранены "прамы эфір" на ТБ.

Адначасова аблвыканкам адзначыў, што на старонкі газет не заўсёды выносяцца самыя актуальныя праблемы, якія хвалююць людзей, прасочваецца ход рэалізацыі крытычных заўваг, якія выказваюцца ў ходзе сустрэчы кіраўніцтва з насельніцтвам, у тым ліку і ў абласной газеты. Не вызначаны статус раённага радыёвяшчання, слабая яго матэрыяльная база.

Нізкай заставалася выканальніцкая дысцыпліна з боку рэдактараў. Рэдакцыі абавязаны былі штоквартальна даваць справаздачу па рэагаванні на крытычныя выступленні да 4 чысла, аднак атрымлівалі іх на тыдзень-два пазней і то не ад усіх калектываў. Цэлы месяц падлічвалі рэагаванні ў "Гродзенскай праўдзе". Дзятлаўская, Гродзенская, Лідская і Воранаўская рэдакцыі са спазненнем даюць статыстычную справаздачу. [3]

Па дадзеных калегіі адзначалася, што не рыхтуюцца кадры рэзерву. У Мастах, Ашмянах, Ваўкавыску, Навагрудку, Гродзенскай раённай газеце старыя кадры, а маладых не выхоўваюць.

У 2000 годзе ў Лідскай друкарні пачала ўкараняцца камп'ютэрная сістэма перадачы газетных палос з рэдакцыі ў дру-

карню праз "мадэм". Піянерамі тут сталі карэліцкія і дзятлаўскія журналісты.

Праз год, на чарговай выніковай калегіі выказваліся зноў прэтэнзіі да шэрагу кіраўнікоў рэдакцый за ігнараванне справаздачнасці – Ашмянскай, Дзятлаўскай, Смаргонскай, Мастоўскай, Зэльвенскай, Астравецкай, Іўеўскай газет. Толькі пасля напамінання выслала справаздачу "Гродзенская праўда". [4].

18 лютага 2000 года ў Мінску адбыўся рэспубліканскі семінар-нарада з кіраўнікамі СМІ, удзельнікамі якога былі ўсе рэдактары. Аднак некаторыя пункты плана па выкананні яго рашэння не былі выкананы. Так, рэдактары Воранаўскай, Ваўкавыскай і Шчучынскай газет не ўключаны ў склад выканкамаў, не з усімі заключаны кантракты. На калегіі ў лютым 2001 года адзначалася канфліктная сітуацыя ў Свіслачы паміж старшынёй райвыканкама і рэдактарам, якая была звольнена з-за надуманых да яе прэтэнзій.

У 2000 годзе пры ўпраўленні грамадска-палітычнай інфармацыі створаны прэс-цэнтр аблвыканкама – першы і адзіны ў рэспубліцы. Праведзены 23 прэс-канферэнцыі па найбольш актуальных праблемах, практыкуюцца выязныя сустрэчы журналістаў, якія прайшлі ў Цэнтры здароўя, Доме дзіцяці, зале Вялікай Перамогі Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея.

Добра зарэкамендавала сябе школа маладога журналіста пры абкаме БПСМ – адзіная ў той час такая школа ў рэспубліцы. Заняткі ў ёй вядуць Святлана Мурына і супрацоўнікі "Гродзенскай праўды". Такія школы створаны ў кожнай рэдакцыі газеты.

Сярод галоўных і прыярытэтных тэм, якія асвятлялі журналісты ў 2001 годзе – гэта падрыхтоўка і правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Адзначым, што журналісты вобласці дастойна вытрымалі гэты экзамен – дадзеная тэматыка была разнабакова раскрыта ў матэрыялах газет, на радыё і тэлебачанні і атрымала станоўчы водгук у людзей. Вопыт, набыты мясцовымі журналістамі ў арганізацыі і асвятленні такіх буйных гра-

мадска-палітычных кампаній быў удала выкарыстаны падчас іншых мерапрыемстваў.

На працягу разглядаемага перыяду адначасова з дзяржаўнымі існавалі недзяржаўныя перыядычныя выданні. Заснавальнікамі іх былі грамадскія аб'яднанні апазіцыйнай накіраванасці. Сярод іх трэба назваць газеты "Пагоня", "Біржа інфармацыі", "Газета Слонімская". Кіраўніцтва вобласці не ўмешвалася ў творчы працэс іх рэдакцыйных калектываў, спрыяла ў размяшчэнні газет у друкарнях, распаўсюджванні. Журналісты запрашаліся на прэс-канферэнцыі, сустрэчы. На жаль, дзелавога супрацоўніцтва не атрымалася, так як рэдакцыі пайшлі на канфрантацыю і ганьбаванне без прычын дзеянняў улады. У верасні 2001 года за парушэнне Закона аб друку было прыпынена выданне газеты "Пагоня", якая неўзабаве была закрыта. У хуткім часе з-за фінансавых цяжкасцей перасталі выходзіць "Біржа інфармацыі", "Гродненская неделя" і шэраг іншых малатыражных газет.

На пачатак 2002 года ў вобласці выходзіла 58 перыядычных выданняў, агульным тыражом больш як 306 тысяч экзэмпляраў.

Перыядычныя выданні Гродзеншчыны займаюць пэўную нішу на інфармацыйнай прасторы нашай краіны і паспяхова выконваюць ускладзеную на іх місію – несці людзям праўдзівую і аб'ектыўную інфармацыю, радаваць цікавымі матэрыяламі, выхоўваць дабрыню, спагаду і веру ў шчаслівае будучае краіны.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Матэрыялы пасяджэння Гродзенскага аблвыканкама ад 26.04.1999 г.

2. Матэрыялы пасяджэння Гродзенскага аблвыканкама ад 22.02.2000 г.

3. Матэрыялы калегіі ўпраўлення грамадска-палітычнай інфармацыі і друку, люты 2000 г.

4. Матэрыялы калегіі ўпраўлення грамадска-палітычнай інфармацыі і друку, люты 2001 г.

**Береснева Елена Петровна,** *главный редактор областного унитарного информационно-рекламного предприятия "Редакция газеты "Гродненская правда"*

# "ГРОДНЕНСКАЯ ПРАВДА" – ГЛАВНАЯ ГАЗЕТА ОБЛАСТИ

Главной газете области "Гродзенскай праўдзе" недавно исполнилось 70. Это 70 томов истории Принеманского края. Это более 15 тысяч номеров и в каждом – новая строка истории региона.

В сентябре 1939 г., когда войска Красной Армии перешли советско-польскую границу и взяли под защиту жизнь и имущество населения Западной Белоруссии, на освобожденной территории во всех городах создавались временные управления, в деревнях и гминах (волостях) – сельские комитеты. В Белостоке начинает работу областное и городское временное управление и проводит социально-экономические преобразования. В связи с этим появилась необходимость иметь и свой печатный орган. Первый номер газеты "Освобожденный Белосток" вышел 9 октября 1939 г. Издание широко освещало подготовку, а затем и работу Народного собрания Западной Белоруссии, которое приняло декларацию об установлении Советской власти на всей ее территории, затем рассказывало своим читателям о законах, принятых III сессией Верховного Совета СССР о включении Западной Белоруссии в состав СССР. Редакция считала необходимым широко освещать преобразования, которые проходили в то время в белорусской деревне. Безземельным и малоземельным крестьянам было передано свыше 1 млн. гектаров земли, сообщала газета в одном из своих номеров. Значительные изменения происходили в духовно-культурной сфере – открывались белорусские школы, избы-читальни, дома культуры, создавались фельдшерско-акушерские пункты.

13 декабря 1939 г. бюро Белостокского обкома КП(б)Б решило переименовать областную газету "Освобожденный

Белосток" в "Вольную працу" как орган обкома КП(б)Б Белоруссии, горкома и облисполкома.

С января 1940 по июнь 1941 г. "Вольная праца" внесла определенный вклад в организацию новой власти, совершенствование ее работы. В передовых статьях и корреспонденциях широко освещались вопросы социалистического соревнования, агитационно-пропагандистской работы, подготовка и проведение выборов различных уровней.

На страницах газеты пропагандировался опыт предприятий Советского Союза с целью его применения в регионе.

22 июня началась Великая Отечественная война. С первого дня оккупации часть населения встала на путь борьбы против фашистов. Организаторами ее в начальном периоде были партийные, советские, комсомольские работники, оставшиеся воины и рядовые граждане. И уже в 1943 г. партизанское движение на Белосточчине набирает широкий размах; в июле начало формироваться Белостокское партизанское соединение. 15 апреля 1943 г. подпольный обком партии принимает решение об издании подпольной газеты "Вольная праца" на белорусском языке раз в декаду тиражом 5000 экземпляров. Позже было принято решение переименовать ее в "Белостокскую правду".

Первый номер "Белостокской правды" вышел 7 ноября 1943 г. и был посвящен 26-й годовщине Великого Октября. Газета выходила малым форматом на русском, частично белорусском и польском языках 1-2 раза в неделю. Известно всего 57 номеров.

Подпольную газету – орган обкома партии и областного Совета депутатов – редактировали Якуб Колас, Степан Майхрович, Филипп Пестрак, Сергей Притыцкий. Авторы публикаций – бойцы и командиры партизанских отрядов, коммунисты и комсомольцы, верные своему долгу защищать Родину. Заголовки материалов красноречивы: "Следы кровавого разбоя оккупантов", "Зверства гитлеровцев", "Не запугают народа", "Немецкая каторга хуже смерти".

В одном из ноябрьских номеров газеты публикуется текст нового гимна Советского Союза, повсеместное исполнение

которого вводится по всей стране с 15 марта 1944 г. Поскольку "Интернационал" уже не отражал коренных изменений, произошедших в стране, Совет Народных Комиссаров принял решение заменить текст. Слова написали Сергей Михалков и Габриэль Эль-Регистан, музыку – Александр Александров. Партизанам предлагается выучить песню, чтобы встретить ею всенародную победу, которая уже близко.

Последний номер "Белостокской правды" вышел 6 июня 1944 г., когда шло освобождение Беларуси от немецко-фашистских захватчиков.

20 сентября 1944 г. Президиум Верховного Совета СССР опубликовал Указ о создании Бобруйской, Гродненской и Полоцкой областей в составе Белорусской ССР. В октябре создаются местные партийные, советские и хозяйственные органы управления, работа их была очень напряженной. Восстановительные работы на завершающем этапе Великой Отечественной войны и в годы IV пятилетки осуществлялись в сложных общественно-политических условиях, вызванных активизацией антисоветских и националистических бандформирований. Ощущались результаты "хозяйствования" немецких оккупантов, которые уничтожили промышленные предприятия, все колхозы и совхозы, большинство медицинских учреждений, школ. Потери от оккупации составили более 2,3 млрд. рублей. Партийным и советским органам надо было поднять народ на борьбу с разрухой, вселить у людей веру в победу, в дальнейшую лучшую жизнь.

2 октября 1944 г. бюро Гродненского обкома КП(б)Б принимает решение "Об издании областной газеты". 22 октября 1944 г. вышел первый номер "Гродненской правды". Рядом с этим номером в скобках стояла цифра 508 – число, продолжавшее счет номеров вышедших газет "Освобожденный Белосток", "Вольная праца" и "Белостокская правда".

Первые номера молодой областной газеты были посвящены восстановительным работам. Ведь фашисты уничтожили 120 промышленных предприятий, все колхозы, совхозы и МТС, 86 медицинских учреждений, 348 школ. Почти полностью были разрушены Скидель, Сопоцкин, Порозово и другие

города и поселки, не говоря уже о деревнях. Все это надо было восстанавливать или строить заново. Газета на своих страницах уделяла много внимания борьбе трудящихся за восстановление народного хозяйства. Со страниц звучали уверенные голоса строителей, рабочих, колхозников о налаживании мирной жизни, стремлении преодолеть все трудности.

Страницы "Гродненской правды" первых послевоенных и 50-х годов были заполнены трудовыми рапортами со строительства новых предприятий, призывами сделать наши города и села культурными и благоустроенными. Например, в письме комсомольцев и молодежи Гродно (№ 79, 1946 г.) "Приведем наши дороги в образцовый порядок" содержался призыв крестьян дер. Дубичи Порозовского района (№ за 16 мая 1946 г.). В одном из номеров Г.Р.Ширма делится творческими планами ансамбля песни и танца БССР. Уже в апреле 1946 г. газета сообщала своим читателям, что в областном центре открывается зоопарк.

С 1 января 1948 г. областная газета "Гродненская правда" начинает выходить в двух изданиях – на белорусском и русском языках. Это стало большим событием в политической и культурной жизни области.

1949 г. для всей печати Белоруссии прошел под знаком широкого освещения соревнования по случаю 30–летия образования БССР. В майском и июньском номерах "Гродненская правда" печатает первые рассказы Василия Быкова "В тот день" и "В первом бою". Кстати, послевоенная газета "Гродненская правда" стала ступенькой к известности для писателей Михася Василька, Василия Быкова, Алексея Карпюка. Здесь плодотворно работали литераторы Анатолий Астрейко и Петр Макаль.

50-е годы – новый заметный этап советского строительства. На страницах "Гродненской правды" часто появляется рубрика "Чтобы скорее догнать Америку, я предлагаю...", а дальше идут предложения рядовых колхозников, руководителей хозяйств, специалистов. Где-то они серьезные, аргументированные, а временами мелкие или наивные.

"Гродненская правда" в эти годы проявляет хорошую инициативу о поддержке трудящихся Гродно создать вокруг

города зону садов. С таким призывом обратились садоводы–любители текстильного комбината. Горисполком выделил участки в районе реки Неман и Индурского шоссе. Инициативу горячо поддержали другие коллективы, а посаженные когда-то яблони и сегодня уже в обновленном виде украшают загородные микрорайоны.

Важнейшими политическими и хозяйственными событиями насыщен был 1959 г. 1 января "Гродненская правда" выходит с передовой статьей "Славное сорокалетие", посвященное годовщине образования Белорусской ССР.

Вместе с тем газета смело вскрывает изъяны общества, которые являются тормозом к движению вперед. 26 декабря 1954 г. на страницах "Гродненской правды" появляется новый раздел "Наш крокодил" – отдел сатиры и юмора. Именно отсюда начали существование все остальные – "Вожык", "Фома Метелкин".

18 октября 1961 г. открылся XXII съезд КПСС, который определил задачи хозяйственного и культурного строительства в стране. "Гродненская правда" ищет новые подходы к освещению злободневных вопросов и в то же время широко использует уже опробованные формы разговора со своими читателями. В одном из номеров в конце 1956 г. газета поместила целую полосу под заголовком "Почему отстает ваш колхоз?". Группа журналистов побывала в колхозе "Рассвет" Скидельского района и среди колхозников распространила анкету под таким названием. Получился интересный и заинтересованный разговор на злободневную тему.

Редакция "Гродненской правды" берет шефство над крупнейшими стройками – азотнотуковым заводом, химкомбинатом, прядильно-ниточным, Лидским лакокрасочным и др. Создаются рабселькоровские посты, выездные редакции, более разнообразной становится связь с читателем, регулярно проходят областные съезды рабочих и сельских корреспондентов. Значительно возросла роль отдела писем и массовой работы редакции. Газета "Гродненская правда" выходила не раз победителем Всесоюзного соревнования и удостаивалась высоких наград.

17 августа 1966 г. печатается Указ Президиума Верховного Совета СССР "О награждении Гродненской области Белорусской ССР орденом Ленина". В газете крупным шрифтом напечатано: "За активное участие в партизанском движении, мужество и героизм, проявленные трудящимися Гродненской области в борьбе с немецко-фашистскими захватчиками в период Великой Отечественной войны, и успехи, достигнутые в восстановлении и развитии народного хозяйства, наградить Гродненскую область Белорусской ССР орденом Ленина". 19 августа весь номер "Ликует орденоносная Гродненщина" посвящен этому событию.

Середина 80-х г. для советских людей ознаменовалась большим событием – в их общественную жизнь ворвалась перестройка, начался период перехода от тоталитарного однопартийного режима к цивилизованному демократическому правовому обществу.

В 70–80-ые г. газета не раз выходила победителем Республиканского и Всесоюзного соревнования, была участницей ВДНХ БССР и ВДНХ СССР. В 1982 г. газета награждена орденом Дружбы народов. К концу 80-х тираж областной газеты достигал до 100 тысяч экземпляров.

Новое дыхание получила газета в 2006 г. С этого времени обновленная внешне и по содержанию "Гродзенская праўда" – неоднократный победитель республиканских творческих конкурсов в различных номинациях.

**Турмасава Любоў Іванаўна,** *загадчык аддзела краязнаўства ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага"*

# ГРОДЗЕНСКАЯ АБЛАСНАЯ НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ Я.Ф.КАРСКАГА – АДЗІН З БУЙНЕЙШЫХ ФОНДАТРЫМАЛЬНІКАЎ ПАСЛЯВАЕННАГА ПЕРЫЯДЫЧНАГА ДРУКУ ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Адну з асноўных функцый абласной універсальнай бібліятэкі – фарміраванне максімальна поўнага збору краязнаўчых дакументаў – ажыццяўляе аддзел краязнаўства. Асаблівая ўвага ім надаецца фарміраванню калекцыі мясцовых выданняў. Неабходнасць выяўлення і збору гэтай калекцыі абумоўлена немагчымасцю на сённяшні дзень у НКПБ сабраць і ўлічыць усе мясцовыя выданні. У такім разе кожная АУНБ выконвае і архіўныя функцыі, функцыі кніжнай палаты. Акрамя гэтага, мясцовае выданне – гэта прадмет духоўнай і матэрыяльнай культуры, створаны на тэрыторыі краю. Многія мясцовыя выданні паступаюць у аддзел дзякуючы толькі ўласнай зацікаўленасці і пільнасці супрацоўнікаў аддзела, добрым стасункам з Гродзенскай абласной краязнаўчай асацыяцыяй, Гродзенскім навуковым таварыствам гісторыкаў медыцыны, Беларускім гістарычным таварыствам і бясконцаму энтузіязму нашых чытачоў. Нельга не адзначыць, што адносную паўнату камплектавання мясцовымі выданнямі забяспечвае абавязковы мясцовы асобнік, які мы атрымліваем згодна пастановы № 687 Кабінета Міністраў РБ ад 30 кастрычніка 1996 г. У аддзеле захоўваюцца мясцовыя дакументы, незалежна ад зместу, мовы і формы. Гэта – кнігі, брашуры, перыядычныя выданні, афішы, праграмы, плакаты, буклеты, календары і інш.

Аддзел валодае дастаткова багатай калекцыяй мясцовага перыядычнага друку пасляваеннага перыяду, якая налічвае

1696 адзінак захоўвання. У аддзеле знаходзяцца мясцовыя перыядычныя выданні: абласная газета "Гродзенская праўда" з 1945 г., раённыя газеты – з канца 50-х гадоў. У фондзе мясцовага перыядычнага друку захоўваюцца газеты скасаваных раёнаў: Скідзельскага, Жалудоцкага, Васілішкаўскага, Поразаўскага, Радунскага. У фондзе аддзела можна знайсці і выданне, якое на сённяшні дзень з'яўляецца бібліяграфічнай рэдкасцю. Гэта газета "Западная магистраль" за 1945–1946 гады, якая была органам упраўлення Дорпрофсожа Беластоцкай чыгункі. Мы ганарымся і калекцыяй факсімільных выданняў газет "Наша ніва" за 1906–1911 гг., "Наша доля" за 1906 г., на старонках якіх адлюстроўвалася тагачаснае жыццё на гродзенскіх землях. Факсімільнае выданне падпольных і партызанскіх газет, часопісаў, лістовак перыяду Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гадоў "І паўстаў народ..." уключае перыядычныя выданні Шчучынскага, Лідскага, Слонімскага, Навагрудскага, Скідзельскага, Юрацішкаўскага, Мірскага, Васілішкаўскага, Гродзенскага і іншых падпольных райкамаў КП(б) Беларусі.

У фондзе аддзела можна знайсці падшыўкі ведамасных газет: ААТ "ГроднаАзот" ("Гродненский химик"), ААТ "Гроднахімвалакно" ("Наша газета"), РУП "Смаргонскі завод аптычнага станкабудавання" ("Сморгонский станкостроитель"), ААТ "Мастоўдрэў" ("Мостовский деревообработчик "). У нас захоўваецца і абласная будаўнічая газета "Высота" за 1978–1997 гг. Нашы карыстальнікі маюць магчымасць пазнаёміцца з перыядычнымі выданнямі вядучых гродзенскіх ВНУ. Гэта – часопіс "Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы" ў дзвюх серыях і газета "Гродзенскі універсітэт" (ГрДУ імя Я.Купалы), "Журнал Гродненского государственного медицинского университета" і газета "Эскулап" (ГрДМУ), газета "Uniагро" (ГрДАУ).

1990-я гады адзначаны ўздымам перыядычнага друку на Гродзеншчыне. З 1998 г. мы пачалі атрымліваць інфармацыйна-публіцыстычны часопіс "Оникс", што выдаваўся ў Лідзе. З гэтага году мы атрымліваем навуковы гістарычны і краяз-

навучы часопіс "Гістарычны альманах". У 2001–2002 г. фонд аддзела папаўняўся навуковым беларускім геральдычным часопісам "Герольд Litherland". Пачалі выходзіць прыватныя грамадска-палітычныя газеты. Многія з іх знаходзяцца ў фондзе аддзела. Гэта – "Вести принеманские", "Лидский экспресс" і інш. На пачатку XXI ст. мы атрымлівалі інфармацыйны бюлетэнь гарадскога Савета дэпутатаў і гарадскога выканаўчага камітэта "Слонимские ведомости". Фонд дастаткова актыўна стаў папаўняцца рэлігійнымі перыядычнымі выданнямі. Сярод іх – газеты "Гродненские епархиальные ведомости", "Новогрудские епархиальные ведомости", "Православный вестник", "Жыровіцкая абіцель" нашых епархій, газета "Слова жыцця" Гродзенскай дыяцэзіі. У гэты перыяд мы пачалі атрымліваць перыядычныя выданні грамадскіх арганізацый. Гэта – газета "Glos znad Niemna" і часопіс "Magazyn Polski" Саюза палякаў на Беларусі, часопіс "Słowo Ojczyste" ГА "Польская Мацеж Школьная на Беларусі", часопіс "Міласэрнасць" дабрачыннага каталіцкага таварыства "Карытас" Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў Беларусі.

На апошняе дзесяцігоддзе мінулага стагоддзя прыпалі і гады росквіту краязнаўчага руху ў вобласці. Многія краязнаўчыя арганізацыі, асабліва маладзёжныя, пачалі выдаваць уласныя перыядычныя выданні. У сваіх фондах мы маем краязнаўчыя часопісы "Лідскі летапісец" і "Слонімскі край", "Краязнаўчую газету", таксама газеты "Дзядзінец", "Гурт". Дзякуючы зацікаўленасці нашых чытачоў мы набылі і школьныя газеты. Сярод іх – "Vivat, Gymnasia!" гімназіі № 1 г. Гродна, "Перапынак" Гродзенскай СШ № 29, "Alma mater" Шчучынскай СШ № 2 і інш. У аддзеле можна знайсці цікавыя і дастаткова рэдкія выданні не толькі для нашай вобласці, але і для іншых рэгіёнаў. Сярод іх – газета для аўтамабілістаў "Автостоп", інфармацыйны бюлетэнь ГА практычных псіхолагаў "Психологический вестник", газета "Саламея" для самастойных жанчын і інш.

У гэтым годзе аддзел атрымлівае 52 назвы перыядыч-

ных мясцовых выданняў, у т. л. – 6 часопісаў. Сярод іх – 2 абласныя і 17 раённых газет.

З вялікай адказнасцю і скрупулёзнасцю падыходзяць супрацоўнікі аддзела да выяўлення краязнаўчых матэрыялаў. Краязнаўчае аналітычнае бібліяграфаванне вядзецца, у тым ліку і па ўсіх перыядычных мясцовых выданнях, якія атрымлівае аддзел. Выяўленыя бібліяграфічныя запісы папаўняюць аўтаматызаваныя базы звестак "Гродзенская вобласць", "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага", традыцыйны картачны краязнаўчы каталог. Гэтыя ж бібліяграфічныя запісы выкарыстоўваюцца і для падрыхтоўкі бягучых і рэтраспектыўных навукова-дапаможных бібліяграфічных паказальнікаў.

Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат аддзела спрыяе якаснаму задавальненню запытаў нашых карыстальнікаў. Толькі з дапамогай артыкулаў, выяўленых з мясцовых перыядычных выданняў, мы змаглі задаволіць краязнаўчыя бібліяграфічныя даведкі па тэмах "Узровень развіцця пладаводства ў СВК "Кастрычнік" Гродзенскага раёна", "Развядзенне грыбоў на Гродзеншчыне", "Дзейнасць фінансавых органаў Гродзеншчыны", "Дзеці Парэцкай спецшколы-інтэрната на летнім адпачынку ў в.Рыбніца Гродзенскага раёна", "Асноўныя напрамкі і перспектывы развіцця знешнегандлёвых сувязей Гродзеншчыны", "Аб дзейнасці прафсаюза работнікаў культуры Гродзенскай вобласці", "Аграгарадкі ў вобласці" і інш.

Зусім нядаўна ў аддзеле працавалі навукоўцы Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАНБ па тэме "Традыцыйная культура татараў на Гродзеншчыне" і засталіся вельмі задаволеныя бібліяграфаваннем мясцовага перыядычнага друку. Ім удалося выявіць шэраг цікавых артыкулаў па іх тэме з мясцовых перыядычных выданняў.

Такім чынам, калекцыя мясцовага перыядычнага друку і дастаткова поўнае яго бібліяграфаванне, спадзяемся, будзе запатрабаванай і прынясе карысць не толькі сучаснікам, але і нашчадкам.

# ДРУГІЯ ГАРАДЗЕНСКІЯ ЧЫТАННІ

***да 880-годдзя горада Гродна***



Гродна, 2007

**Швед Вячаслаў Вітальевіч,** *доктар гістарычных навук, прафесар УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы"*

# КАЛІ НАРАДЗІЎСЯ ГОРАД ГРОДНА?

Многія гродзенцы на пастаўленае ў загалоўку артыкула пытанне адкажуць адзназначна: у 1128 годзе. У 2008 г. адзначылі 880-годдзе. Выпускаецца з гэтай датай сувенірная прадукцыя (паштоўкі, плакаты, значкі і да т.п.). Але не ўсе жадаюць прыслухоўвацца да вучоных і спецыялістаў. Дадзены артыкул, спадзяюся, дапаможа зрабіць гэта.

Вучонымі прызнана лічыць датай нараджэння горада першы пісьмовы ўспамін пра яго. Летапісы – адны з першых пісьмовых крыніц па гісторыі. Гродна ў летапісах узгадваецца 11 ці 14 жніўня 1127 года. Перш чым прывесці ў доказ сказанага летапісныя тэксты адзначым, што тоеснасць летапіснага Горадзена, Горадні, Горадна нёманскаму гораду Гродна даказаў яшчэ ў 1893 г. на IX археалагічным з'ездзе ў Вільні гродзенскі гісторык Я.Ф.Арлоўскі. Пазней у сваёй кнізе "Гродненская старина. Часть І. Гор. Гродна" (1910) ён паўтарыў сваю думку і прывёў пераканаўчыя довады ў яе падтрымку [8, с.14–20].

А цяпер працытуем тэксты з летапісаў, дзе называецца горад Гродна. Першая цытата з Іпац'еўскага летапісу, тэкст якога, відаць, і прывёў да блытаніны з гадамі: 1127 ці 1128. "6636 … Того же лета посла князь Мстиславъ с братьею своею многы кривичи четырьмя путьми. Вячеслава ис Турова, Андрея из Володимира. А Всеволодка из Городна. И Вячеслава Ярославича ис Клечска, тем повеле ити к Изяславлю... рек им день всим пустити на вороп мца августа 11 дня" [5, с. 38].

Наступная цытата з Радзівілаўскага летапісу: "В лето 6635… В тоже время посла князь Мстиславъ братию свою на кривичи четырми пути: Вячеславъ ис Турова, Андреа из Во-

лодимеря, а Всеволодка из Городна, и Вячеславъ Ярославича ис Кляцка. Тем повеле ити и ко Изяславлю ... рек им: Во один день всем пустити на вороп, августа 14" [9, с. 106]. Амаль тое ж самае напісана ў Лаўрэнцеўскім летапісе пад 6635 годам (на палях кнігі пазначаны 1127 г.) [10, с. 297].

Такім чынам, Радзівілаўскі і Лаўрэнцеўскі летапісы даюць звест-ку пра ўдзел у паходзе гарадзенскага князя Усеваладка пад 6635 годам, а Іпацеўскі – пад 6636 годам. Перавядзем старыя даты на сённяшні каляндар. Ад 6635 адымем прынятую вучонымі лічбу 5508 і атрымаем 1127 год. Ад 6636 трэба адымаць 5509, бо летапісец падаў дату па ультрасакавіцкаму каляндарнаму стылю. У такім выпадку ад старой даты адымаць трэба на год больш. У выніку маем той жа 1127 год.

Выдатны расійскі гісторык С.М.Салаўёў у "Гісторыі Расіі са старажытных часоў" (першае выданне ў 1893 г.) пра вышэй згаданы паход на князёў полацкіх піша: "Покончивши с черниговскими, в том же 1127 году Мстислав послал войско на князей полоцких: есть известие, что они не переставали опустошать пограничные волости Мономаховичей. Мстислав послал войска четырьмя путями: братьев – Вячеслава – из Турова, Андрея – из Владимира; сына Давыда Игоревича Всеволодка, зятя Мономахова, – из Городна, Вячеслава Ярославича – из Клецка; этим четверым князьям велел идти к Изяславлю..." [11, с. 401].

Узгаданы намі Арлоўскі ў кнізе "Гродненская старина" піша: "Летописные упоминания о г. Гродне под годами 1127, 1132, 1142, 1144, 1183 относятся къ городу Гродне – губернскому" [8, с. 20].

У савецкі час, відаць, з падачы Н.Вароніна ўмацавалася ў гісторыі Гродна яго дата нараджэння – 1128 год. Хаця ў кнізе "Древнее Гродно" ён сам, цытуючы вядомы нам летапісны тэкст, адназначна не піша пра гэтае: "Гродненские силы названы при этом на третьем месте после Владимира–Волынского и Турова. Следовательно, в это время Гродно уже существует. Есть и Гродненское княжество, представляющее

значительную военно-феодальную единицу, стоящую в ряду старых Волынских и Туровских княжеств. Очевидно, что Гродно – стольный горад Всеволодки. Однако источники молчат о времени появления этого русского форпоста на Немане" [1, с. 13].

Магчыма, потым падхапіў 1128 год Я.Н.Мараш – аўтар раздзела "Гродна – феадальны беларускі горад (XII – XVI стст.) у кнізе "Гродна", апублікаванай у 1960 і 1964 гадах пад рэдакцыяй З.Ю.Капыскага і Б.М.Фіха [4, с. 10].

У акадэмічнай, навуковай літаратуры, якая выйшла ў незалежнай Рэспубліцы Беларусь, 1127 год знайшоў сваё належнае месца. Рэдакцыя "Беларускай энцыклапедыі" прызнала гэты год у выданні "Ілюстраваная храналогія гісторыі Беларусі" [6, с. 29], у "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" [12, с. 147], у выданнях "Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя" [2, с. 514], "Города, местечки и замки Великого княжества Литовского: Энциклопедия" [3, с. 128]. Інстытут гісторыі АН Беларусі таксама прызнаў датай нараджэння Гродна 1127 год. Напрыклад, у "Нарысах гісторыі Беларусі" [7, с. 87, 101]. У дапаможніку для вучняў і настаўнікаў "Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі ў сярэднія вякі (VI – XV стст.)" чытаем летапісны ўрывак пра паход на Полацк з заўвагай рэдактара доктара гістарычных навук прафесара Г.В.Штыхава: "У год 6636 (1128)... (фактычна 1127). У той жа год паслаў князь Мсціслаў сваіх братоў на крывічоў..." [5, с. 38].

Акрамя даты 1127 год, можна гаварыць яшчэ пра адну дату нараджэння Гродна, бо ёсць ранейшы летапісны ўспамін. У Іпацеўскім летапісе чытаем: "6624 ...в се же лето преставися Мстиславъ внукъ Игоревъ. Томъ же лето Володимеръ отда дщерь свою Агафью за Всеволодка". Размова ідзе пра 1116 год, калі сын Давыда Ігаравіча Валынскага, праўнук Яраслава Мудрага, прапраўнук Уладзіміра Святога і Рагнеды Полацкай Усевалад ажаніўся з Агаф'яй – дачкой князя кіеўскага Уладзіміра Манамаха і англійскай прынцэсы Гіты, унучкай англійскага караля Гаральда, праўнучкай Яраслава Мудрага і візантыйскага імператара Канстанціна Манамаха, прапраўнучка Уладзіміра Святога і Рагнеды Полацкай.

Усевалад Давыдавіч быў першым гарадзенскім князем, які ўспамінаецца ў летапісе. А калі было Гарадзенскае княства, дык лагічна дапусціць, што быў і сам Горадзен (Гродна) – рэзідэнцыя князя. Горад дастаўся Усеваладу ў якасці пасагу, бо сам ён быў князем-ізгоем (не меў права на вотчынную зямлю). Зыходзячы з даты "1116 год", праз 5 гадоў мы можам адзначыць 900-годдзе Гродна на цалкам законных падставах.

Такім чынам, датай нараджэння Гродна могуць быць 1127 або 1116 год, але не ў якім разе не 1128 год, які памылкова доўгі час лічыўся годам народзінаў горада над Нёманам. Гарадзенскім уладам трэба пагадзіцца з навуковымі данымі і разаслаць ва ўсе органы кіравання сваё рашэнне лічыць адну з указанных намі дат (1127 ці 1116) за дзень нараджэння Гродна. І гэтым зацвердзіць гістарычную справядлівасць.

**Спіс крыніц і літаратуры:**


1. Воронин, Н.Н. Древнее Гродно / Н.Н.Воронин. – М.: АН СССР, 1954. – 239 с.
2. Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 2 т. Т.1. – Мн.: БелЭн, 2005. – 698 с.
3. Города, местечки и замки Великого княжества Литовского: энциклопедия. – Мн.: БелЭн., 2009. – 312 с.
4. Гродно: (ист. очерк), – 2-е изд., испр. и доп. – Мн., 1964. – 262 с.
5. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі ў сярэднія вякі (VI–XV стст.). – Мн.: Нар. асвета, 1998. – 191 с.
6. Ілюстраваная храналогія гісторыі Беларусі. – Мн.: Бел Эн, 1995. – 221 с.
7. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Ч.1. – Мн.: Беларусь, 1994. – 524 с.
8. Орловский, Е.Ф. Гродненская старина. Часть 1. Гор. Гродна / Е.Ф.Орловский. – Гродна, 1910. – 343 с.
9. Полное собрание русских летописей. – Т. 38: Радзивилловская летопись. – Л.: "Наука. Ленинградское отделение", 1989. – 178 с.
10. Полное собрание русских летописей. – Т. 1: Лаврентьевская летопись. – М.: Издательство восточной литературы, 1962. – С. 1–286.
11. Соловьев, С.М. Сочинения: в 18 кн. Кн.1. Т.1–2 / С.М.Соловьев. – М.: Мысль, 1988. – 797 с.
12. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі.: у 6 т. Т.3. – Мн.: БелЭн, 1996. – 527 с.

**Госцеў Алесь Пятровіч,** *краязнаўца, выкладчык ліцэя № 1 г.Гродна*

# ГРОДНА: НАЗВЫ ГОРАДА НА ПРАЦЯГУ 880-ГАДОВАЙ ГІСТОРЫІ

Назвы горада, імя горада... Хто надае іх, з якой нагоды і з якім сэнсам? Часцей за ўсё на гэтыя пытанні няма дакладнага адказу. Але, безумоўна, гарады, як і людзі, маюць не толькі ўласную няўміручую душу, але і ўласныя шматлікія і шматзначныя імёны. Імёны афіцыйныя і неафіцыйныя. Афіцыйныя – "зарэгістраваныя" ў першакрыніцах: летапісах, дзяржаўных дакументах накшталт Метрыкі ВКЛ, пастановах магістрата, гарадской думы ці гарвыканкама; адлюстраванне назвы на гарадскіх пячацях, на паштовых штэмплях, назвах паштовых, аўтобусных і чыгуначных станцый – падобна пасведчанню аб нараджэнні ці пашпарту чалавека. Неафіцыйныя – любімыя роднымі і сваякамі (у выпадку горада – гэта месцічы, суайчыннікі і госці) змяншальныя формы, мянушкі (ласкавыя і не вельмі) і нават далёкія з першага погляду ад афіцыйнай назвы, але вельмі трапныя "псеўданімы"... І чым прыкметней горад, тым багацейшай анамастычнай палітрай акружана яго гісторыя. Нават па аднаму пераліку можна меркаваць аб велічы, прыгажосці і значнасці таго ці іншага горада-места. Давайце выкладзем гэтакую "мазаіку імёнаў" для нашага горада-юбіляра проста ў алфавітным парадку – самай дэмакратычна-талерантнай з усіх існуючых формаў.

Гародня, Горадна, Горад над Нёманам, Горад на Нёмане, Горадня, Горад Стэфана Баторыя, Горад святога Губарта, Горадзен, Горадзень, Городень, Городенъ, Городец, Городно, Городок, Гродна, Гродно, Кгродно, Маленькі Парыж ("Наш Гродно – Маленький Париж..." – словы з папулярнай у 1960-я гг. песні), Немогардас, Онгрод (Эліза Ажэшка), Gartena (Garten, Garthen), Gardinas, Grodno, Horodno, Hrodno, Nemogardas (пецітам пазначаны назвы з літаратурных тво-

раў). Гэты пералік, безумоўна, не прэтэндуе на выключную паўнату і аўтар з удзячнасцю прыме любыя аргументаваныя дапаўненні.

Сёння наш горад мае адзіную афіцыйную назву Гродна (іншамоўныя варыянты: Гродно, Gardinas, Grodno) і неафіцыйныя – распаўсюджаныя ў быту, перыёдыцы і нават навуковых выданнях – Горадня, Гародня ці Горадна.

Калі зазірнуць у даведачныя крыніцы (энцыклапедыі, слоўнікі і да т.п.), то часцей за ўсё можна прачытаць, што летапісныя назвы Гродна – Городенъ, Городня, Городно. Летапісныя – значыць афіцыйныя. Значыць наш горад насамрэч з першага моманту свайго існавання і да XVI–XVII стагоддзяў ("верхняй мяжы" летапісання) карыстаўся гэтым наборам назваў. Ці так гэта? Вучні ліцэя №1 г. Гродна прагледзелі 58 крыніц [7] на прадмет вызначэння менавіта першаснай летапіснай назвы нашага горада.:

•Летапісы (11 выданняў; з іх Іпацьеўскі – 7 выданняў з 1843 па 2001 гг. / 2 пераклады: украінская і беларуская мовы /, Радзівілаўскі (2 выданні), Лаўрэнцеўскі (2 выданні);

•Энцыклапедыі (11), даведнікі (13), манаграфіі (6), даследаванні (5), эсэ (7), падручнікі (2), хрэстаматыі (3).

Пры гэтым было выяўлена 50 крыніц з наступнымі варыянтамі летапісных назваў (тут улічаны і назвы згодна геаграфічных паказальнікаў у выданнях першакрыніц):

• Городенъ
• Городенъ, Городень
• Городно, Городенъ
• Городен, Городно, Городня
• Городок
• Городен (Городок)
• Горадзен, Гародня, Горадня

Пры сінтэзаванні дадзеных розных навук, перш за ўсё летапісання, тапанімікі, гістарычнай лінгвістыкі і храналогіі нашы юныя краязнаўцы прыйшлі да высновы, што на працягу XII–XIII стст. (перыяд, які ахоплены старажытнарускімі летапісамі) наш горад згадваецца толькі як "Городенъ" (Іпац'еўскі летапіс па Пагодзінскаму спісу (1620-я гг.) дае яшчэ

варыянт "Городень"). Летапісны перыяд адносна нашых земляў падзяляецца на два перыяды: Старажытнарускі і Беларуска-Літоўскі. Амаль усе вядомыя летапісы гэтых перыядаў надрукаваны ў так званым Поўным зборы рускіх летапісаў (у арыгінале: Полное собрание русских летописей; афіцыйнае скарачэнне – ПСРЛ). Паглядзім, як падаецца назва сучаснага г. Гродна, які на мяжы 1560–1570-х гг. афіцыйна атрымаў яе замест назвы Городен. Калі мы гаворым пра першапачатковую назву горада, яго афіцыйнае імя, то гэта павінна быць назва, якая згадваецца ў самых ранніх пісьмовых крыніцах у назоўным склоне. Такім згадваннем, прычым адзіным за ўсё XII ст., з'яўляецца паведамленне Іпац'еўскага летапісу пад 1183 г.: "6692... Того же лета Городенъ погоре... ". Мноства разоў такая ж назва (з варыянтам яе змякчэння – Городень) і ў розных склонах згадваецца ў Старажытнарускіх (XIII ст.): Іпац'еўскім, Лаўрэнцеўскім і Радзівілаўскім і ранніх Беларуска-Літоўскіх (XV–XVI стст.) летапісах. Такім чынам, "Городенъ" – адзіная летапісная назва нашага горада, якая змяняецца на імя "Гродна" перад самым стварэннем Рэчы Паспалітай, у 1560-я гг. Па беларуску гэта гучыць як Горадзен і Гродна.

Факты гісторыі: – сучасны Гродна на Нёмане – гэта летапісны Горадзен XII–XVII стагоддзяў;

– крыжакі называлі наш горад "Гартэн" (Garthen,) або "Гартэна" (Garthena); у перакладзе з нямецкай мовы гартэн (garten) азначае сад;

– у дакументах на лацінскай мове горад называўся "Grodno" ці "Grodnae";

– Сёняшняя літоўская назва нашага гораду Gardinas (Гардзінас; гардас – па-літоўску – абгароджанае месца, загон, стойла);

– у польскіх крыніцах імя Grodno гучыць як "Гродно" і не скланяецца.

Што тычыцца імя "Гародня", "Горадна" ці "Горадня" (сёння іх можна чуць з вуснаў самых розных людзей адначасова), то гэтак называе наш горад народ. Гэта беларускае вымаўленне назвы Горадзен (Городен), якое адпавядае мілагучнасці беларускай мовы. Толькі адзін раз (1918 г.) назва "Горадня" афіцыйна ўжывалася пад час БНР і на будынку грод-

зенскага чыгуначнага вакзала мелася адпаведная назва. Назва Городен (варыянт Городень) у дачыненні да населеных пунктаў Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны – унікальна. Яе ніякім чынам нельга змешваць з назвамі Городно, Гарадня, Городок, якіх на акрэсленых абшарах сапраўды безліч.

Тлумачэнне летапіснай назвы горада. Гаворачы пра імя горада, немагчыма абыйсці яго сэнс. Успомнім філасофскае: Назваць нешта – вызначыць яго сутнасць. І літаратурнае: "Як вы лодку назавеце, так яна і паплыве". Адразу агаваруся, што нават аналізуючы адну назву горада, немагчыма адназначна вызначыцца з яе сэнсам. Да прыкладу, імя сталіцы Расіі "Масква" мае больш за сорак тлумачэнняў і ўсе яны маюць права на адначасовае існаванне. Мы абмяжуемся тут толькі асобнымі разважаннямі і прывядзем некаторыя з версійтлумачэнняў паходжання летапіснай назвы горада Гродна. Паспрабуйце суаднесці іх і зрабіць уласныя высновы. Для тлумачэння назвы кожнага населенага пункта нам нельга абыйсціся без пэўнага ведання паняццяў такіх фундаментальных навук, як лінгвістыка і этымалогія.

Паколькі дакументальна зафіксаваных тлумачэнняў летапіснага імя Гродна не маецца і адсутнічаюць старажытныя паданні, існуе шэраг версій на гэты конт. Кожная з версій мае права на існаванне, але толькі ў выпадку, калі яна не супярэчыць фактам гісторыі. Калі аўтар версіі абапіраецца пераважна на гістарычныя факты (адлюстраванне фактаў гісторыі ў разнастайных крыніцах), трэба ўспрымаць гэтыя версіі з пэўнай доляй крытыкі. Сёння няма патрэбы пераказваць усе існуючыя версіі, бо большасць з іх выкладзена ў выданнях апошніх гадоў (у тым ліку энцыклапедычных і даведачных), якія прысвечаны нашаму гораду. Згадаю тут толькі версію сучаснай літоўскай назвы Гродна – Gardinas (Гардзінас), якую прыводзіць літоўскі філолаг пачатку XX ст. Казімерас Буга. Назва Гардзінас паходзіць ад імя паганскага бога Гардуніціса (або Гарнітаса, Гардунціса), якога паважалі яцвягі (балцкае племя) за тое, што ён быў апякуном жывёлы. Згодна падання, каля Гродна быў гай Гардуніціса, вядомы ва ўсёй гістарычнай Літве (цяпер гэта Гродзеншчына, Брэстчына і частка Міншчыны). Тыя ж версіі, у якіх разглядаецца

назва "Городно", "Городна" ці "Гарадня", абапіраюцца на назвы, якія адсутнічаюць у афіцыйных крыніцах, – а гэта значыць: на недаставерныя назвы. І таму лічыць іх першапачатковымі, летапіснымі назвамі нашага горада некарэктна з навуковага пункту гледжання. Як падаюцца даставерныя назвы, глядзіце дадатак. Ніжэй прапануецца аўтарская версія, якая адпавядае ўсёй сукупнасці фактаў.

Вельмі праблематычна менавіта старажытнае, на ўзроўні XII стагоддзя, паходжанне літоўскай легенды пра Гардуніціса і яе непасрэдная сувязь з летапіснай назвай Гродна (нездарма гэтая легенда не прыжылася). Да таго ж "Гардзінас" не надта сугучна "Гардуніціс". У той жа самай ступені слова "Городен" не надта сугучна словам "Городна" і "Городно". Назва "Городенъ" складаецца з корня "Город" і суфікса "-енъ". Слова "Городъ" (горад) слоўнікі тлумачаць, як: 1) Буйны населены пункт, горад у сучасным разуменні; 2) Крэпасць, замацаванае месца; 3) Крэпасная сцяна, лінія ўмацаванняў. Археалагічныя знаходкі сцвярджаюць, што напачатку XII стагоддзя Горадзен быў рэзыдэнцыяй удзельнага князя, вакол якой сяліліся рамеснікі. Таму найбольш верагодна, што першапачатковы сэнс менавіта такі: замацованае месца, абарончая забудова, крэпасць. Успомнім, з якой мэтай будаваўся горад: з аднаго боку, галоўная мэта – стварыць перашкоду для ворага пры яго спробах захапіць краіну (абарона дзяржавы), а, з другога боку, абарона ўласных жыхароў. Такім чынам, як у вузкім, так і ў шырокім сэнсе слова "горад" (ад дзеяслова "гарадзіць") азначае абарону. "Городен" ніяк не можа азначаць проста "абгароджанае месца", бо суфікс "-енъ" адназначна надае слову "Городен" вялікі прасторавы сэнс, у той час, калі суфікс "-на" ці "-ня" указвае на лакальную, абмежаваную прастору (П.У.Сцяцко). Адсюль "Городенъ" – Абаронца сваёй краіны. Да тагож, сучасныя беларускія мовазнаўцы тлумачаць нямецкае "Гартэн" і літоўскае "Гардзінас" як дакладны пераклад старажытнарускага "Городенъ". Гэта тым больш слушна, што ў старажытнарускай мове не было слова "сад" – яго замяняла слова "огород". І вось з гэтым апошнім словам імя нашага горада "Городенъ" мае агульны корань "город". Таму звычайнае, шырока распаўсюджанае тлумачэнне назвы нашага горада, як "агароджанае мес-

ца" не толькі звужае сэнс, але не адпавядае лінгвістычнай сутнасці слова "Городенъ". Ёсць факт, які пацвярджае менавіта гэтую думку. Гэты факт захаваў для нас славуты літаратурны твор "Слова аб палку Ігаравым". У яго "залатой сярэдзіне", як перліна ў залатой аправе, знаходзіцца песня-плач пра князя Ізяслава Васількавіча. Нагадаем спачатку кароткі змест усяго твора. Ноўгарад-Северскі князь Ігар Святаслававіч насуперак грознаму прадвесцю (сонечнаму зацменню 1 мая 1185 года) патаемна ад кіеўскага князя Святаслава адправіўся ў паход на полаўцаў. Паход скончыўся паразай Ігарава войска і палонам Ігара. Русь апынулася пад пагрозай палавецкага нашэсця. Красамоўна і абгрунтавана апісвае гэтыя падзеі безыменны аўтар "Слова...". Болем і трывогай за родную зямлю напоўнена яго чулае сэрца. Гнеўна і мужна далучае ён свой голас у падтрымку "залатога слова" Святаслава і звяртае да ўсіх рускіх князёў палымяны заклік: "Загородите полю ворота своими острыми стрелами за землю рускую... Уже бо Сулла не течетъ сребреными струями къ граду Переяславлю и Двина болотомъ течетъ онымъ грознымъ полочаномъ под кликомъ поганыхъ. Единъ же Ізяславъ, сынъ Васильковъ позвони своими острыми мечы о шеломы литовския; притрепа славу дъду своему Всеславу, а самъ подъ чрълеными щиты на кровавъ травъ притерпанъ литовскими мечи и с хотию на кров, а тъи рекъ: "Дружину твою, княже, птицъ крилы приодъ, а звъри кровъ полизаша". Не бысь ту брата Брячяслава, ни другаго – Всеволода. Единъ же изрони жемчужну душу изъ храбра тъла чресъ злато ожерелие... Уныли голоси, пониче веселие, трубы трубятъ городенскіи".

Звярніце ўвагу на паразовы першай і апошняй фраз згаданага ўрыўка: "Загородите полю ворота... – трубы трубятъ городенскіи". На думку акадэміка Д.С.Ліхачова, "Слова..." наскрозь прасякнута так званымі "скрэпамі" – паэтычнымі перазовамі-метафарамі. Яны сцягваюць асобныя часткі гэтага мастацкага твора ў суцэльныя "блокі", якія арганічна ўзаемадзейнічаюць адно з адным і па сэнсу, і структурна, утвараючы ўвогуле цэласны паэтычны твор. Гэта тычыцца і згаданага перазова. А калі мы згадаем яшчэ шматзначнасць сімволікі сярэднявечча (у дадзеным выпадку тое, што "воро-

та" (брама) – сімвалізуе і горад, і краіну), то ўжыванне аўтарам "Слова..." выразу "Трубы трубять городзенскіи" ўспрымецца як умацаванне яго закліку "загородіте полю ворота своімі острымі стреламі" (абараніце краіну ад знешняга ворага – поля = качэўнікаў). А ўвесь урывак успрымаецца як дзівосны рэзанатар (накшталт збана-галасніка Барыса-Глебскай царквы ў Гродне), які шматразова ўзмацняе заклік аўтара "Слова..." да яднання князёў.

І на заканчэнне яшчэ адно, надта палемічнае, але і даволі такі прыгожае меркаванне. Калі звяртаць увагу на нямецкую назву Гродна – Garten, то ўзнікае спакуса паразважаць на прадмет таго, што нават першапачатковы сэнс назвы Городен азначае горад-сад (менавіта так перакладаецца нямецкае Garten на беларускую мову). Але гэта ўжо версія сучаснага разумення імя Гродна – згадаем яшчэ раз: у старажытнарускай мове няма слова "сад", яго замяняла слова "огород"...

Няхай віецца вакол жалезнай логікі фактаў срэбраная стужка фантазіі!

<u>Дадатак</u>

Крыніцы, у якіх сустракаецца назва "Городенъ" у розных склонах (родны склон – "...Городна"; у іншых склонах: "...Городноу" / "...Городну", "...Городне"):

"6636... Того же лета посла князь Мстиславъ с братьею своею многы кривичи четырьми путьми: Вячеслава ис Турова, Андрея из Володимеря, а Всеволодка из Городна... рекъ им динъ день всим пустити на вороп мца августа 11 дня..." (ПСРЛ. Т. 2. Ипатьевская летопись. – СПб, 1843. – С. 11).

"Лет (о) 6635... [В] то же время пасла князь Мстиславъ братию свою на кривичи четырми пути: Вячеславъ ис Турова, Андреа из Володимеря, а Всеволодка из Городна, и Вячеславъ Ярославича ис Кляцка. Тем повеле ити и ко Изяславлю... рек им: "Во одинъ день всем пустити на воропъ, августа 14". (ПСРЛ. Т.38. Радзивиловская летопись. – Л.: Наука, 1989. – С. 106).

"6635. В то же лето посла князь Мстиславъ братью свою на кривиче четырми пути. Вячеслава ис Турова, Андрея из

Володимеря. А Всеволодка из Городна И Вячеславъ Ярославича ис Клечьска..." (ПСРЛ. Т. 38. Лаврентьевская летопись. – М.: Наука, 1989. – С. 106).

ПСРЛ. Т. 2. Ипатьевская летопись. – М.: Языки славянской культуры, 2001. – 648 с.: Л.220: "Въ ле. (6691)… / Л.222: / …Того же ле Городенъ погоре всь. И цркы каменная. от блистания. Молние. и шибения грома".

Л.274 об.: "Въ ле. 6761 ...Данилъ ...Потом же посла с братом. И со снмъ Романомъ. Люди своя и взяста Городенъ".

Л.282 об.: "Въ ле. 6768 ... …потом же мысял ити на Городенъ …хотящоу емоу ити. К Городноу…".

Л.290 об.: "Въ ле. 6784 ...Придоша Проуси. ко Троиденеви. и своеи земли. неволею передъ Немци. Он же прия е к собе и посади часть и в Городне а часть ихъ посади во Вьслониме…".

ПСРЛ. Т.35. Белорусско-литовские летописи. – М.: Наука, 1980. – 305 с.:

Никифоровская летопись (XV в.)

С.33: 6923 (1415) "Городен"

Супрасльская летопись (XVI в.)

С.55: 6923 (1415) "Городенъ"

С.62: "Наидетъ в Городне… до Городна... из Городна… ко Городну…. к Городну"

С.63: "…оставить в Городне..."

С.64: "…бе… у Городне…".

Слуцкая (Уваровская) летопись (XVI в.)

С.68: "…поехал к Городну… наидетъ у Городне… до Городна… из Городна… поидет к Городну… к Городну…

…Кестутии сына своего великого князя Витовта оставить в Городке (так у тэксце летапісу – А.Г.)".

С.70: "…бе у Городне"

Виленская летопись (конец XV – начало XVI вв.; писана в Смоленске)

С.86: "Наидетъ у Городне… з Городна... поедетъ с Троков к Городну…. в Городне наидетъ… оставил у Городне… поиде из Городна"

С.88: "…Анна в Городне"

Летопись Археологического общества (XVI–XVII вв.)

С.91: "...з Городна"

С.98: "...поидетъ к Городну... оставит у Городне... поидет з Городна".

Академическая летопись (XVI в.)

С.111: "до Городна приехал... приженетъ из Городна".

С.112: "поидетъ... к Городну... к Городну... оставитъ у Городне... поидетъ из Городна".

С.114: "...бе тогда в Городне".

С.116: Краткая Волынская летопись (XVI в.)

С.125: "В лето 6999-е (1492) индикта 9 ...Преставися Казимир Якгеиловичъ, король польски и велики князъ литовскыи, месяца июня 7 день по Възнесении Христове, в четверок, рано въсходящу солнцу в граде Городне".

Летопись Красинского (XVI в.)

С.129: "...зарубил Городен город" Сравните: "...вчинил город..." на с.128.

С.130: "...выгнати ...з Городна".

С.134: "...знайдетъ в Городне... приженетъ з Городна... поеде к Городну... оставитъ в Городне... поидетъ з Городна".

С.136: "...Анна была... в Городне...".

Летопись Рачинского (конец XVI–XVII вв.)

С.146: "...И пошедшы з Новагародка и зарубил город Городно"

С.147: "...Выгнати ...з Городна".

С.155: "...знаидетъ ...у Городне... прибежать з Городна...".

С.156: "...поидетъ к Городну... бордзо к Городну приедетъ... оставитъ в Городне... поидетъ з Городна...".

С.166: "...лета Божого нарожэня 1492, июня 7 дня. Умер король польски и велики княз литовскыи Казимер Якгелонович у Городне пановавшы фортуне на королевстве Польском лет 45, а на великом княжэньи литовском лет 52 на 7 лет больше королевства своего...".

С.167: "1508... через рэку от места Городна... через место Городно...".

Ольшевская летопись (середина XVI в.)

С.194: "...и зарубил город Городен... выгнати з Городна...".

Румянцевская летопись (конец XVII в.)

С.203: "...знаидетъ в Городне ...прибежит з Городна ...поидет к Городну ...оставит в Городне ...поиде с Городна".

Евреиновская летопись (конец XVII в.)

С.216: "...Выгнати ...из Городка (И)". (И): так в рукописи; в других летописях Городна)".

С.224: "...нашол в Городне ...пригнал к Вилну з Городня...".

С.225: "...поиде к Городню ...скоро к Городню пришол ...оставил в Городне ...поиде з Городня...".

С.234: "1492... Потом король Андреи Казимер Якгаилович умер в Городне ...Того же лета князь Міхаіло Глінскоі Заберезынскаго убил в Городне...".

**Літаратура**

1. Соловьев, А.В. Новые раскопки в Гродне и их значение для русской истории / А.В.Соловьев // Записки русского научного института в Белграде. Вып.13. – Белград, 1936. – С.69-96.

2. Ермаловіч, М. Старажытная Беларусь. Полацкі і навагародскі перыяды / М.Ермаловіч. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1990.

3. Ермаловіч, М. Беларуская дзяржава Вялікае княства літоўскае / М.Ермаловіч. – Мн.: Беллітфонд, 2000. – 322 с.

4. Госцеў, А. Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116–1990) / А.Госцеў, В.Швед. – Гродна: НВК "Пергамент", 1993. – 320 с.

5. Госцеў, А.П. Імя горада // Швед, В.В. Горадзен. / Швед В.В., Госцеў А.П., Дабрыян А.В. – Гродна, 1996. – С.9-12.

6. Госцеў, А.П. Калі быў заснаваны горад Гродна і якое ён меў імя ў летапісны перыяд (матэрыялы да метадычнай распрацоўкі краязнаўчых заняткаў) / А.П.Госцеў // Мінулае Гродзеншчыны. Вып. 9. – Гродна: ІПК, 2002.

7. Бабок Дар'я (11 клас), Багдановіч Таісія, Ляўчук Аляксей, Сіпайла Кацярына, Цішко Таццяна (10 клас) Ліцэй №1 г. Гродна. Праблемныя пытанні рэгіянальнай гісторыі як аб'ект краязнаўчага доследу (на прыкладзе даты заснавання Гродна і летапіснага імя Гродна) / Навуковы кіраўнік Госцеў А.П. // Выступ на 2-й гарадской вучнёўскай навукова-практычнай канферэнцыі. – Гродна, 2007.

**Дабрыян Аляксандр Аляксандравіч,**
*старшы выкладчык УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы"*

# АРХЕАЛАГІЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ Ў ГРОДНА

Скупыя летапісныя звесткі аб Гародні выклікалі ў сярэдзіне XIX ст. спрэчкі паміж гісторыкамі аб яе месцазнаходжанні. Адны з іх, знакамітыя гісторыкі М.Карамзін, С.Салаўёў, Г.Лаўмянскі і гродзенскі краязнаўца Ю.Ядкоўскі, атаясамлівалі горад з мястэчкам Гародно ў Столінскім раёне. Другія, як З.Глогер, П.Баброўскі і настаўнік гродзенскай гімназіі Я.Арлоўскі, лічылі, што яна знаходзілася на Нёмане, на месцы сённяшняга Гродна. Апошні нават выступіў на IX Археалагічным з'ездзе ў 1893 годзе ў Вільні з рэфератам "Аб пачатку горада Гродна", у якім падрабязна апісаў помнікі старыны горада – Каложскую царкву, Стары замак з яго падземнымі хадамі, Новы замак і разваліны Сімяонаўскай царквы [1, с. 331]. На жаль, гэтая частка рэферата не друкавалася. У другой частцы выступлення Арлоўскі выказаўся аб тоеснасці летапіснага Гародно з Гродна на Нёмане, абгрунтаваўшы свой вывад трыма прычынамі: рэлігійнымі, мяркуючы, што тут знаходзілася старажытналітоўскае капішча Ромава; стратэгічнымі – зручны фарпост на мяжы з літоўскімі плямёнамі – і наяўнасцю ў горадзе Каложскай царквы. Арлоўскі лічыў, што город быў заснаваны падчас пахода на яцвягаў князя Уладзіміра ў 938 годзе ці Я.Мудрага ў 1038 годзе. Не ўсе прысутныя на з'ездзе пагадзіліся з Арлоўскім, у тым ліку і наш знакаміты зямляк Я.Карскі, які выступіў з крытыкай яго поглядаў.

Але ні прыхільнікі, ні апаненты не маглі прывесці пераканаўчых аргументаў у падтрымку сваёй пазіцыі. Вырашыць спрэчку можна было толькі з дапамогаю археалагічных даследаванняў, як у свой час Шліман даказаў існаванне Троі. Першую спробу прыцягнуць дадзеныя археалогіі зрабіў Я.Арлоўскі, які атрымаў дазвол на даследаванні на Старым зам-

ку ў Гродне і заклаў некалькі шурфоў, але вайскоўцы, якія ў тыя часы месціліся ў замку, забаранілі далейшыя раскопкі.

Пасля таго, як Гродна увайшоў ў склад Польшчы, улады і грамадскасць надавалі асаблівую ўвагу Старому замку, дзе некалі знаходзілася рэзідэнцыя вялікіх князёў літоўскіх і польскіх каралёў. Таму ў 1928 г. дзеля яго ўпарадкавання, навуковага даследавання, рэканструкцыі і аднаўлення быў створаны Камітэт адбудовы замка. Планавалася прывесці ў парадак яго тэрыторыю і панізіць ўзровень пляцоўкі двара Старога замка на 4,5 метры ў сувязі з тым, што раней двор замка меў узровень на два метра ніжэйшы за тагачасны. Зямля з дзядзінца павінна быць выкарыстана на падсыпку схілаў гары з боку р.Нёман. Кіраўніком земляных прац быў прызначаны дырэктар Гродзенскага музея Ю.Ядкоўскі. Падчас гэтых прац у 1932 г. былі адкапаны рэшткі пабудовы, складзенай з плінфы – тонкай цэглы, з якой была пабудавана вядомая на той час Каложская царква. Па меркаванні Ядкоўскага, гэта быў княжаскі церам і недзе побач з ім павінна была знаходзіцца царква, пошукі якой сталі асноўнаю мэтаю раскопак 1933 г. І сапраўды, на поўнач ад церама былі знойдзены рэшткі царквы, складзенай з плінфы. На яе рэштках знаходзіліся руіны іншай, больш позняй царквы, пабудаванай з брусковай цэглы. Абедзве царквы знаходзіліся на рознай глыбіні, зроблены з рознай цэглы і адпаведна датуюцца розным часам. Наяўнасць у адным месцы дзвюх пабудоў з плінфы – "княжскага церама" і Ніжняй царквы – дазволіла Ю.Ядкоўскаму выказаць думку, што яны адносяцца да візантыйскага тыпу і датуюцца XI ст. Менавіта ў гэты час, па яго меркаванні, варагамі быў заснавана Гродна. На жаль, Ядкоўскім было дапушчана шмат памылак, якія знізілі навуковую вартасць раскопак: зямля падчас раскопак амаль не праглядалася, а знаходкі не фіксаваліся. Больш таго, помнікі былі абкапаны з усіх бакоў і адрэзаны ад акружаючага культурнага слоя, што выключыла магчымасць вызначыць час іх будаўніцтва. Будучы, па яго асабістым прызнанні, не археолагам, а гісторыкам мастацтва, Ядкоўскі карыстаўся не археалагічнымі, а мастацтвазнаўчымі метадамі даследвання. Як

трапна адзначыў У.Галубовіч, "Звычайна адкрыццё руін гістарычных будынкаў, выкананае гісторыкам мастацтва, адбываецца, ігнаруючы культурныя слаі. Адкапыванне руін суправаджаецца іх аддзяленнем ад саміх культурных слаёў, у якіх яны знаходзяцца. Гісторык мастацтва шукае рэшткі муроў. Калі ён трапляе на іх, аддзяляе сцяну з аднаго ці двух бакоў, у залежнасці ад патрэбнасці. Затым ён капае ўздоўж сцен, запускаючы смела рыдлёўку ў зямлю, і не звяртае ўвагі на прылягаючыя да сцяны слаі, якія перакапвае. Вылучаная сцяна, матэрыял з якога яна зробленая, звязваючы росчын і спосаб кладкі, стыль даюць нам магчымасць вызначыць, да якога часу яна належыць, якія былі яе падмуркі. Калі гісторык культуры вызначыў вышэй пералічаныя асаблівасці, гэта значыць ён дасягнуў мэты сваіх даследванняў". Менавіта такою методыкай карыстаўся Ядкоўскі пры правядзенні раскопак на Старым замку [9, с. 138–139].

У 1933 г. у Гродна ў сувязі з набліжэннем 400-й гадавіны нараджэння С.Баторыя быў створаны Камітэт па ўшанаванні памяці караля, таму змянілася кіраўніцтва працамі на Старым замку. Па ініцыятыве камітэта Ядкоўскі быў у 1937 г. адхілены ад кіраўніцтва раскопкамі на Замкавай гары. Але ў 1935 г. ён паспеў правесці даследаванні Каложскай царквы, у сценах якой былі заўважаны новыя трэшчыны. Каб прадухіліць далейшае разбурэнне, набходна было вывучыць і ўмацаваць яе падмуркі. З гэтаю мэтаю ў кастрычніку 1935 года ўздоўж сцяны ад уваходу да сярэдняй апсіды быў закладзены раскоп. Адначасова вяліся працы ўнутры святыні. У выніку даследаванняў былі знойдзены рэшткі першапачатковай падлогі XII ст., якая складалася з квадратных, трохвугольных і фігурных плітак жоўтага, зялёнага і карычневага колераў і пахаванні XII–XIXстст., вызначаны асаблівасці падмуркаў царквы [10].

У 1937–1939 гадах раскопкі на Старым замку былі працягнуты археолагам З.Дурчэўскім, запрошаным з Варшавы Камітэтам па ўшанаванні памяці С.Баторыя. У адпаведнасці з патрабаваннямі тагачаснай методыкі, якая амаль не адрозніваецца ад сучаснай, ён правёў даследаванні на захад ад

Ніжняй царквы і выявіў рэшткі 23 драўляных пабудоў. Дурчэўскі вылучыў 2 перыяды ў развіцці горада: рускі горад канца XII – першай паловы XIII ст. і горад перыяду літоўскіх князёў XIII–XIV ст. Падзеі верасня 1939 г. перапынілі даследаванні і раскоп застаўся незавершаным [8].

У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ініцыятыва ў вывучэнні старажытнага Гродна належала створанаму ў 1945 г. Гродзенскаму дзяржаўнаму гісторыка-археалагічнаму музею (далей ГДГАМ). Па яго запрашэнні ў 1945–1946 гг. археолагі АН БССР У.Галубовіч і А.Цегак-Галубовіч з брыгадаю з чатырох чалавек зрабілі пашпартызацыю 11 тысяч раскіданых знаходак і навуковую апрацоўку матэрыялаў раскопак. Вынікі працы яны падсумавалі ў рукапісе "Новые материалы по истории Гродно", які быў падрыхтаваны да друку, але не выдадзены ў сувязі з выездам аўтараў на жыхарства ў Польшчу. Даследчыкі выказалі меркаванне, што адначасова з дзядзінцам была заселена і тэрыторыя Новага замка, і пляцоўкі на ўсход ад Старога замка, дзе знаходзіўся пасад. На падставе рэчавых матэрыялаў яны вызначылі некалькі перыядаў у гісторыі развіцця горада. На іх думку, самы першы датуецца другой паловай XI – пачаткам XII ст., калі паселішча з'яўлялася проста памежнай крэпасцю. Другі этап характарызуецца тым, што паселішча ператвараецца ў горад, які становіцца цэнтрам княства, аб чым сведчыць будаўніцтва княжацкага церама і каменных храмаў. Цягнуўся гэты перыяд з пачатку XII ст. да сярэдзіны XIII ст., калі развіццё горада было спынена нейкай катастрофай [3].

У сакавіку 1947 г. дырэктар музея В.Рэзенталь звярнулася ў Маскву, у Інстытут гісторыі матэрыяльнай культуры АН СССР (далей ІГМК) з просьбаю "командировать в Гродно квалифицированного археолога, желательно профессора Н.Н.Воронина для ознакомления с комплексом зданий русско-византийской архитектуры и консультаций по продолжению раскопок, представляющих большой исторический и политический интерес" [5, л. 1].

У сярэдзіне ліпеня 1947 г. Варонін прыехаў у Гродна. Ён азнаёміўся з вынікамі раскопак 1932–1939 гг. і склаў даклад-

ную запіску "О мероприятиях по охране территории раскопок в Старом замке Гродно и подготовке к возобновлению археологических исследований", у якой адзначалася, што "памятники и вся археологическая территория Старого Замка были получены нами в превосходном состоянии. В 1938 году были сделаны хорошие деревянные кровли над огромной площадью раскопа. С тех пор эти покрытия не ремонтировались и находятся в запущенном состоянии, грозя гибелью памятникам" [4, л.26–27]. Далей ён зазначыў, што пачатыя ў 1932–1939 гг. археалагічныя працы павінны быць адноўлены ў тых жа маштабах і на такім жа высокім навукова-тэхнічным узроўні, як работы 1937–1938 гадоў. Далей ён адзначыў навуковае і палітычнае значэнне гэтых даследаванняў, якія павінны былі ў "противовес тенденциозной позиции старой польской науки дать объективное освещение истории и культуры в культуре литовско-русского государства, теснейшую связь литовского и русского народа" [4, л. 26].

Пачатак раскопак планаваўся на другую палову 1948 г., але ўзгадненне дакументаў і падрыхтоўка заняла больш часу, чым планавалася. У канцы ліпеня 1949 г. СНК БССР зацвердзіў смету на правядзенне раскопак у памеры 128431 руб. 60 кап. [5, л. 9]. Падтрымку і дапамогу ў арганізацыі раскопак і забеспячэнні неабходнымі будаўнічымі матэрыяламі аказаў сакратар Гродзенскага абкама КП(б)Б С.В.Прыщыцкі [5, л. 18]. Да гэтага моманту музей атрымаў Адкрыты ліст на правядзенне раскопак на Старым замку на імя Вароніна. Непасрэдна даследаванні на Старым замку праходзілі з 31 жніўня па 28 кастрычніка. У іх удзельнічалі як вядомыя сёння расійскія археолагі Янін і Сядоў, Аляксееў, які ў тыя часы працаваў захавальнікам фондаў гродзенскага музея, так і супрацоўнікі музея. Адначасова па асобнай дамове з ГДГАМ брыгада Рэстаўрацыйных майстэрняў РСФСР займалася кансервацыяй архітэктурных помнікаў з раскопак 1932–1939 гг. Раскопкі былі праведзены ў сціслыя тэрміны сіламі мясцовых жыхароў і школьнікаў, і ўжо ў канцы 1949 г. Варонін перадаў у музей справаздачу аб выніках даследаванняў. Сістэматызацыя і навуковае вызначэнне 30000 костак, знойдзеных

падчас раскопак, ГДГАМ даручыў зрабіць прафесару Маскоўскага ўніверсітэта Цалкіну, і ў 1950 г. рукапіс "Фауна из раскопок 1949 г. в Гродно" была перададзена ў фонды музея [6, л. 3]. Хімічны аналіз шкляных вырабаў па дамове з ГДГАМ зрабіў прафесар Безбародаў. Вынікі працы былі надрукаваны ў выданні "Доклады АН СССР" за 1950 г. пад назвай "Русское стекло XII в." [5, л. 3]. Пазней вынікі раскопак 1949 г., як і матэрыялы папярэдніх даследчыкаў, Варонін абагульніў у працы "Древнее Гродно", у якой прааналізаваў гісторыю, гаспадарчае і культурнае жыццё горада [2]. Ён прыйшоў да высновы, што да будаўніцтва каменных пабудоў на Старым замку існавала старажытнае паселішча, якое загінула падчас пажара, а ў канцы XI – пачатку XII ст. на яго месцы ўзнікла крэпасць. Шмат увагі даследчык надаў аналізу помнікаў каменнага дойлідства. Ён не пагадзіўся з меркаваннем Ядкоўскага аб прызначэнні каменнай пабудовы, знойдзенай ў 1932 г., як княжацкага церама і выказаў меркаванне, што гэта рэшткі абарончай вежы. Вызначыўшы архітэктурныя асаблівасці мураваных помнікаў Гродна XII ст., Варонін зрабіў выснову аб існаванні самастойнай гродзенскай архітэктурнай школы.

Наступныя археалагічныя даследаванні Гродна пасля амаль 22-гадовага перапынку прадоўжылі беларускія археолагі. У 1971–1973 гадах Я.Звяруга пры раскопках на Каложскім плато знайшоў зямляначныя і паўзямляначныя жытлы і скарб сельскагаспадарчых прылад XIII ст. у адным з іх. У 1980 г. археолагамі І.Чарняўскім і М.Ткачовым на тэрыторыі манастыра базыльянак, насупраць Новага замка, былі знойдзены рэшткі захаваўшыхся на вышыню 1,6 м сцен Прачысценскай царквы XII ст., загінуўшай падчас пажара каля 1654 г.

У 1977–1981, 1985–1988 гадах даследаванні на Старым замку праводзіла архітэктурна-археалагічная экспедыцыя Беларускага рэстаўрацыйна-праектнага інстытута пад кіраўніцтвам А.Трусава пры удзеле М.Ткачова, П.Рапапорта і інш. [7, с. 5–6]. У выніку была даследавана плошча амаль 1000 кв.м пры глыбіні культурнага слоя 9,8 м ад сучаснай па-

верхні. У адрозненне ад папярэдніх даследчыкаў, якія абмяжоўваліся вывучэннем матэрыялаў XI–XIV ст., яны ўпершыню даследавалі культурныя слоі ад XI да XVIII ст. Аналіз здабытых імі археалагічных матэрыялаў сведчыць пра пераменлівую інтэнсіўнасць жыцця паселішча ў розныя часы. Найбольш інтэнсіўным яно было на працягу XII – пачатку XIII ст. За гэты час з-за частых войнаў і пажараў драўляная забудова на Старым замку аднаўлялася 15 разоў. У XIV ст., калі Гродна становіцца валоданнем Вітаўта, былі перароблены абарончыя збудаванні і пабудаваны палац, значна перабудаваны ў XVI ст. у часы праўлення Стэфана Баторыя. Па меркаванні даследчыкаў, атрыманы падчас раскопак матэрыял дазваляе сцвярджаць пра высокі еўрапейскі ўзровень жыцця і культуры тагачасных гараджан.

Даследаванні вакольнага горада і гандлёва-рамеснага пасада ў 80-х гадах мінулага стагоддзя праводзіў А.Краўцэвіч. Невялікія архітэктурна-археалагічныя даследаванні на тэрыторыі горада, у тым ліку на Новым замку, у 90-х гадах XX ст. правеў Р.Акінчыц. У апошнія гады археалагічныя даследаванні ў Гродна праводзяцца ў асноўным падчас будаўнічых работ у гістарычнай частцы горада. У 2006 г. пры рэканструкцыі плошчы Савецкай Г.Семянчук выявіў і даследаваў падмуркі палаца Радзівілаў, гарадской ратушы і іншых аб'ектаў. У апошнія гады ў гістарычнай частцы горада вядзецца масштабнае будаўніцтва і рэканструкцыя, але, на жаль, не заўсёды яны суправаджаюцца археалагічнымі даследаваннямі, якія маглі бы раскрыць яшчэ не адну старонку старажытнай гісторыі Гродна.

### Літаратура

1. Археологические известия и заметки, издаваемые императорским Московским археологическим обществом / под ред. И.В.-Орешникова. – Т.1. – № 1–12. – М.: Тип.Мамонтова, 1893. – 462 с.

2. Воронин, Н.Н. Древнее Гродно / Н.Н.Воронин. – М.: Изд. АН СССР, 1954. – 236 с.

3. Голубович, В.И. Новые материалы по истории Гродно в ранне-феодальную эпоху / В.И.Голубович, Е.А.Цегак–Голубович. – Архив Института истории НАН РБ, дело 44.

4. Государственный архив Гродненской области. – Ф.1269. – Оп.1. – Д.8.

5. Государственный архив Гродненской области. – Ф.1269. – Оп.1. – Д.20.

6. Государственный архив Гродненской области. – Ф.1269. – Оп.1. – Д.28.

7. Трусаў, А.А. Стары замак у Гродне XI–XVIII ст.: Гіст.–археал. нарыс / А.А.Трусаў, В.Е.Собаль, Н.И.Здановіч. – Мн.: Навука и тэхніка, 1993 – 152 с.

8. Durczewski, Z. Stary zamek w Grodnie w świetle wykopalisk dokonanych w latach 1937–1938. Wojewódzki Komitet uczczenia króla Stefana Batorego w Grodnie / Z.Durczewski. – Grodno, 1939. – Odbitka z czasopisma "Niemen". – №1. – 1939. – 16 s.

9. Hołubowicz, W. Studia nad metodami badań warstw kulturowych w prehistorii Polskiej. Tow. Naukowe w Toruniu. Prace przehistoryczne / W.Hołubowicz. – Toruń: Nakładem TN w T. Z zasiłku wydziału nauki Ministerstwa Oświaty, 1948. – 192 s.

10. Jodkowski, J. Swiątynia warówna na Kołoży w Grodnie w świetle badań archiwalnych i archeologicznych, dokonanych w 1935 r. / J.Jodkowski. – Grodno. – Prace i sprawozdania muzeum w Grodnie. – №1. – 1936. – 70 s.

**Куль-Сяльверстава Святлана Яўгенаўна,** *доктар гістарычных навук, прафесар УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы", Беластоцкай палітэхнічнай акадэміі*

# АД КАРАЛЕЎСКАГА ГОРАДА ДА ГУБЕРНСКАГА ЦЭНТРА: ГРОДНА НА МЯЖЫ XVIII – XIX СТСТ.

Перыяд 1794–1802 гг. у гісторыі Гродна пакуль што мала распрацаваны ў айчыннай і ў замежнай гістарыяграфіях. Даследчыкі часцей звяртаюць увагу на часы падзелаў, ці перыяд, калі Гродна ўжо быў губернскім горадам[1]. Аднак гэты час утрымлівае шмат значных падзей і з'яў, якія акрэслілі будучыню горада на Нёмане на некалькі дзесяцігоддзяў.

Праблема гарадоў на тэрыторыі трэццяга падзелу Рэчы Паспалітай паўстала перад расійскімі ўладамі ўжо тады, калі лёс дзяржавы яшчэ не быў канчаткова вызначаны. Першае распараджэнне Кацярыны II па гэтаму пытанню адбылося ўжо 30 кастрычніка 1794 г. У адпаведнасці з яе ўказам князю Рэпніну належала падзяліць Літву на тры часткі, цэнтрамі якіх прызначаны былі Вільня, Гродна і Кейданы[2].

Абранне гэтых гарадоў, як можна меркаваць, было абумоўлена іх роллю ў эканамічным, палітычным і культурным жыцці края, а таксама ўсёй Рэчы Паспалітай. Значэнне Гродна як важнага цэнтра, а таксама аднаго з каралеўскіх гарадоў падкрэслена было ў час так званага "разбору гарадоў", калі ў перыяд рэформаў у Рэчы Паспалітай была праведзена класіфікацыя гарадоў паводле колькасці дымоў у іх, а таксама па развіцці гандлю і прамысловасці. Гродна побач з Вільняй, Слуцкам, Мінскам і Брэстам быў аднесены да катэгорыі гарадоў першага класа, якія мелі не менш чым 400 дымоў[3].

Паводле вышэй званага ўказу Кацярыны II у Гродна павінна была размясціцца галоўная інстанцыя для кіравання

Літвой – Генеральнае праўленне на чале з генерал-губернатарам Мікалаем Рапніным. Яўстах Арлоўскі тлумачыў нежаданне расійскіх улад зрабіць сталіцай расійскай Літвы Вільню вялікай колькасцю каталіцкіх кляштараў і касцёлаў, гістарычных помнікаў, якія рабілі гэты горад сімвалам незалежнасці і гістарычнай памяці[4]. Сёння гэтую версію падтрымлівае малады гродзенскі гісторык С.Занеўскі [5]. Аднак, на маю думку, прыняцце рашэння на карысць Гродна было зроблена з прычыны наяўнасці тут вялікай дзяржаўнай ўласнасці. М.Рапнін паведамляў у Пецярбург, што ў Гродна многа палацаў і іншых будынкаў, якія належаць дзяржаве. У Вільні такіх пабудоў было значна менш. Такую колькасць дзяржаўных пабудоваў Гродна атрымала дзякуючы, найперш, інтэнсіўнаму будаўніцтву ў часы Антонія Тызенгаўза, які ўкладваў у свае праекты прыбыткі з каралеўскіх сталовых земляў [6]. Таму Гродна выглядала больш прывабным месцам размяшчэння ўладных структур – не паўставала пытанняў аб выкупе ці канфіскацыі прыватных палацаў, можна было кампактна ўладкаваць усе адміністрацыйныя органы ў тызенгаўзаўскіх пабудовах на Гарадніцы. Згодна з перапісам 1789 г. у Гродна пражывала 5653 чалавекі, а ў 1794 г. – 6431 жыхар [7].

Генеральнае праўленне Літвы мела чатыры аддзелы: Скарбовы, Крымінальны, Цывільны і Эканамічны. Кіраўнікамі гэтых аддзелаў былі адпаведна палкоўнік Іван Фрызель, брыгадзір Іван Русанаў, надворны саветнік Мікалай Волкаў і прэм'ер-маёр Літке [8]. Для працы ва ўстановах дазволена было прыцягваць мясцовых жыхароў, г.зв. экспедытараў. Галоўнымі крытэрыямі прыёма на службу былі няўдзел у паўстанні і добрае веданне сітуацыі на далучаных землях.

Рашэнне аб прызначэнні Гродна сталіцай Літвы было сфарміравана раней, чым Кацярына II падпісала адпаведны ўказ. Верагодна, не апошнюю ролю ў гэтым адыграў канцлер імперыі Безбародка, які сяброваў з Рапніным. Іх карэспандэнцыя, таксама як і рэляцыі, якія генерал-губернатар Літвы дасылаў у Пецярбург, кідаюць святло на некаторыя эпізоды побыту Рапніна ў Гродне. Князь прыехаў у новую

сталіцу літоўскіх губерняў 16 лістапада 1794 г. "Сёння прадставіліся мне мясцовыя жыхары, – пісаў ён імператрыцы на наступны дзень. – Паміж імі многа прадстаўнікоў заможных фамілій. Перадаў ім добразычлівае стаўленне вашай вялікасці, але пры гэтым прыпомніў караючую кожную здраду руку Бога, і што пільна за тым наглядаць будзем... каб кожны атрымаў, што яму належыць. Прынялі гэта з удзячнасцю падданых, а маё напамінанне з належнай паслухмянасцю" [9]. Між іншым, Рапнін прыгадвае, што ў Гродна сустрэўся з падскарбіем Дзяконьскім, якога ведаў здаўна і які быў расійскай крэатурай яшчэ ў часы Вялікага сейму. Напэўна, менавіта Дзяконьскі параіў Рапніну дамагацца вяртання ў Гродна архіва Гродзенскай скарбовай камісіі, які быў вывезены ў Варшаву ў час паўстання [10].

20 лістапада 1794 г. жыхары Гродна склалі прысягу на вернасць Кацярыне II. Гэтая ўрачыстасць адбылася на цэнтральнай плошчы горада, у езуіцкім касцёле (сёння – Кафедральны) і ў праваслаўнай царкве [11]. Тэкст прысягі абавязваў захоўваць вернасць асабіста расійскай імператрыцы і яе нашчадкам, а не расійскай дзяржаве [12]. Складанне прысягі на вернасць чужаземнаму манарху ў час, калі Рэч Паспалітая яшчэ не знікла з палітычнай карты, а Станіслаў Аўгуст Панятоўскі быў легітымным манархам, фармальна з'яўлялася здрадай. Але пад пагрозай зброі гарадзенцы вымушаны былі падпарадкавацца новай уладзе.

У гэты перыяд расійскім урадам была абрана тактыка захавання на новадалучанай тэрыторыі большасці элементаў ладу Рэчы Паспалітай. Абранне гэтай лініі належала Мікалаю Рапніну і канцлеру Безбародку. "У новых землях не толькі права, але таксама добрыя звычаі трэба пакінуць непарушнымі, – пісаў канцлер Рапнін ў лістападзе 1794 г. – Людзі да даўніны вельмі прывязаны. Любы падатак для іх не так цяжкі, як страта даўніх прывілеяў". Менавіта зыходзячы з гэтых меркаванняў, Рапнін і Безбародка ініцыявалі захаванне Статута 1588 г. на беларуска-літоўскіх землях [13].

Абраная расійскімі ўладамі палітыка замірэння новадалучаных тэрыторый прадвызначыла месца Гродна ў сістэме

падаткаабкладання і суда ў першы год пасля паўстання. Паводле ўказу Кацярыны II ад 30 кастрычніка 1794 г., Рапнін павінен быў зрабіць рэвізію ўсёй скарбовай уласнасці і высветліць памер падаткаў і мыта, якія збіраў скарб у часы Рэчы Паспалітай. Усе гэтыя фінансы належала зноў збіраць і фундаваць у Гродна. З іх павінен быў утрымлівацца адміністрацыйны апарат новай улады[14]. "Ёсць тут эканоміі, засталося іх да 30 тыс. душ, некалькі староства і іншыя скарбовыя вёскі. Усё разам – да 40 тыс. душ, якія можна раздаць", – пісаў у Пецярбург М.Рапнін[15]. Ролю Гродна, як цэнтра скарбовых фінансавых сродкаў, узмацніў указ Кацярыны II, падпісаны 14 снежня 1794 г., які ўвёў у абарачэнне на тэрыторыі Літвы расійскія папяровыя грошы. Рапніну было загадана сабраць у Гродна адпаведны капітал у польскіх злотых, якія ўносіліся ў скарбовую касу, каб утрымаць курс расійскіх асігнацый пры абмене[16].

Намінальна дэкларуючы легітымнасць даўняга літоўскага права, расійскія ўлады фактычна пераўладкавалі ўсё судаводства на далучаных тэрыторыях. Апошняй інстанцыяй, дзе адбывалася канфірмацыя прыгавораў і судовых рашэнняў, з'яўлялася паводле ўказа ад 30 кастрычніка 1794 г. Генеральнае праўленне Літвы ў Гродна. Такім чынам, судовая справа губляла самую важную сваю рысу, якой ганарыліся літвіны, – незалежнасць ад улады. Разбурэнне даўніх традыцый судаводства і непавага да законаў з боку расійскай адміністрацыі адзначалася сучаснікамі[17]. Значэнне Гродна з прычыны змен у судовай сістэме значна ўзрастала – цяпер сюды, а не да Вільні ці Наваградка, як гэта было ў часы Літоўскага Трыбунала, павінна была прыязджаць мясцовая шляхта, каб хадайнічаць аб справядлівым вырашэнні судовых спраў.

Вынікам трэццяга падзелу былі змены ў геапалітычным становішчы Гродна: упершыню з часоў Сярэднявечча[18] горад стаў прымежным цэнтрам. Мяжа з Прусіяй не была канчаткова сфармавана да жніўня 1795 г., але ўжо ў канцы 1795 г. была ўладкавана памежная стража[19]. Вынікам узнікнення мяжы было хуткае і актыўнае развіццё новага промыслу, які

затым стаў звычайным для памежнага Гродна, – кантрабанды.

У 1795 г. Гродна зноў стала каралеўскім горадам, але ўжо ў іншым сэнсе. 9 студзеня гэтага года апошні кароль Рэчы Паспалітай атрымаў загад ад пераможцаў выехаць з Варшавы ў Гродна пад нагляд Рапніна. У Гродна Станіслаў Аўгуст атрымаў у карыстанне тры палацы – акрамя Новага замку палацы ў Панямуні і Аўгустоўскі. Трэцюю каралеўскую рэзідэнцыю, Станіслававова, атрымаў у падарунак ад Кацярыны ІІ ірландзец О'Брыен дэ Ласі[20]. Рапніну было прадпісана ставіцца да караля, як да прыватнай асобы, не дазваляць яму кіраваць краем, наглядаць за яго карэспандэнцыяй, абмяжоўваць кантакты з падуладнымі без дазволу расійскіх уладаў[21].

На працягу 1795 г. Гродна фактычна знаходзілася ў становішчы акупаванага горада. Да канчатковага ўладкавання памежных справаў з Берлінам і Венай расійскі ўрад не змяняў правілаў і прадпісанняў ваеннага становішча. Нават каляндар на гэтых тэрыторыях не быў заменены – па-ранейшаму карысталіся грыгарыянскім календаром, а не юльянскім, афіцыйна прынятым у Імперыі. Змены пачаліся з моманту падпісання ў Пецярбургу 13 (25) снежня 1795 г. трактата аб трэццім падзеле Рэчы Паспалітай. На наступны дзень Кацярына ІІ падпісала ўказ " Аб далучэнні да Расійскай імперыі ўсёй часткі Вялікага Княства Літоўскага". Паводле яго на гэтай тэрыторыі ствараліся дзве губерні: Віленская і Слонімская, адміністрацыйнае ўладкаванне якіх адпавядала "Усталяванню аб губернях" 1775 г.[22]. Цэнтрамі гэтых губерній прызначаліся Вільня і Слонім. Дадатак да ўказу быў выдадзены ў жніўні 1776 г. Пакідаючы галоўнымі гарадамі Вільню і Слонім, губерні пераўтвораны былі ў намесніцтвы, якія падзяляліся на ўезды. У гэтым адміністрацыйным падзеле Гродна прызначана была роля ўезднага горада у Слонімскім намесніцтве.

Чаму ў гэты час не Гродна – буйнейшы горад у намесніцтве, які меў, як вышэй паказана, найбольш шансаў стаць цэнтрам края, а менавіта Слонім абралі ў якасці сталіцы новай адміністрацыйнай адзінкі? Слонім не быў маленькім го-

радам, у канцы XVIII ст. тут жыло каля 4,5 тыс. чалавек[23]. Але з'яўляўся прыватнаўласніцкім – здаўна належаў Агінскім. Будынкаў, якія падыходзілі бы для размяшчэння расійскай адміністрацыі, тут хапала: М.К.Агінскі збудаваў тут прыгожую і вялікую рэзідэнцыю. Але яе, таксама, як і ўвесь горад, трэба было выкупіць, што і было загадана ўказам Кацярыны II[24]. Апрача гэтых вялікіх выдаткаў, паўставала яшчэ адна праблема – ў Слоніме не мелася дастатковай колькасці асобаў, якія маглі бы працаваць у расійскіх адміністрацыйных установах – іх належала запрашаць з іншых гарадоў намесніцтва, у тым ліку з Гродна. Нягледзячы на ўсе гэтыя складанасці, Слоніму была аддадзена перавага ў параўнанні з Гродна. Як мне падаецца, усе прывабнасці Гродна зводзіліся на нішто ў сувязі з тым, што горад на Нёмане цяпер быў вязніцай апошняга караля Рэчы Паспалітай. 25 лістапада Станіслаў Аўгуст падпісаў ў Гродна абдыкацыю і жыў тут пад хатнім арыштам і наглядам Рапніна. Былы кароль не мог пакінуць горад, але не было яму забаронена наведваць свае рэзідэнцыі ў ваколіцах Гродна, выходзіць у горад. Кароль, хаця і былы, усё яшчэ заставаўся сімвалам страчанай незалежнасці, што расійскія ўлады добра разумелі. Прызначаць Гродна цэнтрам намесніцтва магло даць легальны повад мясцовай шляхце часта наведваць горад, які быў вязніцай для караля. Сярод гэтай шляхты яшчэ не памерла надзея на аднаўленне Рэчы Паспалітай, што магло прывесці да змовы аб вызваленні караля. Аб гэтых настроях, між іншым, сведчылі перлюстраваныя лісты, размовы, падслуханыя лаяльнымі ўладам асобамі, чуткі, якія хадзілі па гораду. "Няхай знешняя пакорлівасць займе месца вернасці і самааданасці, – пісаў гродзенскі жыхар у адным з перлюстраваных лістоў. – Належыць пад уяўнай паслухмянасцю падтрымліваць у сабе дух вольнасці"[25]. Яшчэ перад прыездам караля ў Гродна Рапнін папярэджваў Кацярыну II, што ў выпадку пражывання Станіслава Аўгуста ў горадзе значна ўзрастае магчымасць кантактаў апошняга з вернымі яму асобамі, цераз якіх Панятоўскі можа звязацца з еўрапейскімі дварамі, каб прасіць у іх дапамогі[26]. "Гэты край добра пільнаваць на-

лежыць!"[27] – папярэджваў Рапнін канцлера Безбародку і не памыляўся. Ужо ў красавіку 1796 г. у Гродна была адкрыта змова, якая сваёй мэтай ставіла забойства Рапніна і іншых расіян, якія жылі ў горадзе, і абвяшчэнне акта паўстання. На чале гэтай канспірацыі стаялі камердынер Дзяконскага шляхціч Любавецкі і шляхціч Снарскі. "Дазнанне адкрыла, што амаль увесь горад ведаў аб змове, але ніхто не прыйшоў паведаміць аб ёй да мяне або да каго-небудзь з рускіх начальнікаў", – пісаў Рапнін у лісце да Мікалая Ланскога[28]. Праўда, урэшце знайшоўся здраднік, нейкі шляхціч Хівоўскі[29] (так падаецца прозвішча ў дакументах), які за сваю здраду атрымаў ад Рапніна ўзнагароду ў памеры 200 рублёў золатам[30]. Пасля адкрыцця канспірацыі, каб не даць магчымасці ўдзельнікам змовы знянацку заспець расійскіх вайскоўцаў у горадзе і вынішчыць іх, як гэта было ў 1794 г., войскі, раскватараваныя ў Гродна, былі выведзены за горад. Снарскі, Любавецкі і яшчэ некалькі асобаў былі арыштаваны і перавезены ў Смаленск, дзе дзейнічала расійская камісія па разгляду віны паўстанцаў. Яны былі асуджаны да катаргі ў Сібіры[31]. Пакуль што след гродзенскіх канспіратараў губляецца. Ва ўсякім выпадку, у спісах тых, хто падлягаў амністыі, праведзенай Паўлам I, іх прозвішчаў няма. Фармальна яны не маглі быць амнісціраваны, паколькі ўжо прынеслі прысягу імператрыцы, а іх змова адбылася ўжо пасля задушэння паўстання.

1796 г. быў перыядам хуткай перабудовы палітычнага ладу анэксаваных тэрыторый. Амаль кожны месяц выдаваліся новыя распараджэнні і ўказы, якія датычылі розных сфер сацыяльнага і эканамічнага жыцця. У Гродна была адкрыта мытня, пасля – уездныя органы ўлады, пошта, хлебныя "магазіны" (склады)[32]. Паводле ўказу імператрыцы ад 8 жніўня 1796 г., на Віленскае і Слонімскае намесніцтвы распаўсюджвалася гарадское права, якое дзейнічала ў Расіі з 1785 г. У гарадах, згодна з усталяваннямі гэтага права, павінны былі ўладкоўвацца такія ж установы, што і ва ўсёй імперыі: дума, магістрат, гарадскі галава і інш. Гэты ўказ абвяшчаў таксама пачатак "разбору" месцічаў: усе яны павінны былі запі-

сацца да якога-небудзь саслоўя і плаціць адпаведныя падаткі[33]. Замест былога падымнага падатку цяпер уводзіўся падушавы, які быў значна большы.

Паведамленне аб знішчэнні Рэчы Паспалітай і новым палітычным ладзе выклікала адпаведную рэакцыю жыхароў горада. З аднаго боку, яны яшчэ верылі ў непарушнасць старых традыцый і звычаяў, з другога, – імкнуліся абараніць сябе ад свавольства новай улады, якая несла свае законы і адміністрацыйны лад. Як выдаецца, гарадзенцы яшчэ верылі ў моц былых прывілеяў, якія давалі на працягу стагоддзяў жыхарам горада вялікія князі і каралі. Апрача таго, згодна з прынятымі ў Вялікім княстве звычаямі, падмацаванымі гарадскім правам, пры замене манарха належала пацвердзіць былыя гарадскія вольнасці новым пацвяржальным прывілеем. Усё гэта, пэўна, прычынілася да складання Аляксандрам Фрызе 22 лютага 1796 г. у створаныя расійскімі ўладамі ўездныя органы ўсіх прывілеяў і іншых падобных дакументаў, якія давалі ільготы гарадзенцам яшчэ з часоў князя Аляксандра[34]. Падобныя спробы ўключэння прававых нормаў, якія дзейнічалі ў ВКЛ, у сістэму расійскага прэцэдэнтнага права для абароны сваіх інтарэсаў, назіраліся і раней. Яшчэ ў 1778 г. жыхары Полацка і Віцебска, імкнучыся абараніць сваю маёмасць і захаваць манаполію на мясцовым рынку, падалі ў расійскую адміністрацыю прашэнне з пералікам усіх прывілеяў на манапольны гандаль, якія яны мелі яшчэ ў часы ВКЛ. Расійскія чыноўнікі на працягу некалькіх месяцаў рабілі спробы ўзгадніць дзве сістэмы законаў, але так і не знайшлі кампрамісу. Урэшце ўся справа была адкладзена, а неўзабаве ў Расіі прынята было Усталяванне аб гарадах, якое ўвогуле перакрэслівала гэтую прававую калізію[35].

Пасля заключэння міру з Прусіяй і Аўстрыяй і ўзгаднення ўмоваў апошняга падзелу Рэчы Паспалітай Кацярына II зусім не збіралася на далучаных тэрыторыях клапаціцца аб захаванні былых традыцый ВКЛ, а мела намер дзейнічаць рашуча і гвалтоўна, праводзячы нівеліроўку мясцовага адміністрацыйнага і палітычнага ладу пад прынятыя ў імперыі парадкі. У сваім меркаванні яна мела магчымасць абаперціся

на думку М.Рапніна, які таксама настойліва рэкамендаваў імператрыцы дзейнічаць цяпер рашуча і бескампрамісна. "Належала бы хутка пасля падпісання міру ўвесці тут наш спосаб кіравання, паколькі сённяшні, палавінны, адразу і наш, і мясцовы, паміж сабой ўзгоднены быць не могуць", – пісаў у адным з лістоў літоўскі намеснік[36]. Аб тым, што пры "палавінным" прававым ладзе кіраваць даверанымі яму тэрыторыямі амаль немагчыма, М.Рапнін часта ўзгадвае ў прыватных лістах. "Патрэбных людзей няма ані тут, ані ва ўездах, а без іх – што вышэйшыя начальнікі могуць зрабіць... Божа, забяры мяне адсюль!" – пісаў ён у адным з прыватных лістоў[37].

Важным пытаннем для жыцця горада на Нёмане была дэмаркацыя мяжы. Гродна было абрана ў якасці пункта перамоваў у гэтай справе паміж Прусіяй і Расіяй. Лінія мяжы паводле падпісанага трактату павінна была цягнуцца па Нёмане і Ласасянцы і знаходзіцца ў некалькіх кіламетрах ад горада. Расійскія ўлады рабілі спробы адсунуць яе далей ад горада, пераводзячы войскі за Нёман на некалькі вёрст. Але гэта выклікала пратэст з боку Прусіі. Для ўзгаднення гэтых справаў у Гродна на працягу вясны 1796 г. адбываліся пасяджэнні пруска-расійскай камісіі. Урэшце 4 мая быў падпісаны сумесны пратакол, які вызначаў лінію мяжы. Ён быў ратыфікаваны ў жніўні гэтага ж года. З гэтага часу і да ліквідацыі мяжы ў 1850 г. Гродна было горадам памежным, а кантрабанда – звычайным заняткам гродзенскіх жыхароў, найперш, жыдоў.

Змена манарха ў канцы 1796 г. азначала радыкальную змену палітыкі ў адносінах да тэрыторыі былога ВКЛ. Пасля амністыі паўстанцам і вызвалення з няволі 29 лістапада 1796 г. Т.Касцюшкі[38] ўжо 12 снежня Павел I у спецыяльным указе дэклараваў аднаўленне былых прывілеяў і законаў і загадаў стварыць на тэрыторыі былога ВКЛ дзве губерні – Літоўскую і Беларускую[39]. Наступным крокам манарха было запрашэнне ў Пецярбург Станіслава Аўгуста. З 1797 г. – пасля ад'езду экс-караля – Гродна перастала быць каралеўскім

горадам. Было ім нават тады, калі ўжо не існавала самой дзяржавы – Рэчы Паспалітай; калі ўжо згубілі гэты статус іншыя каралеўскія гарады і знішчаны быў сам інстытут манарха. Падобны парадокс у гісторыі Гродна робіць унікальнай яго ролю і ў гісторыі Рэчы Паспалітай. Згубіўшы статус каралеўскага горада, Гродна адначасова перастала быць і каралеўскай вязніцай.

Паўла I менш, чым яго маці, цікавіла тэрыторыя былога Княства Літоўскага. Ва ўсякім выпадку, на парадак змяншаецца колькасць указаў і распараджэнняў, якія датычылі гэтых тэрыторый, пры тым, што агульная лічба разнастайных прававых актаў і іншых дакументаў у час яго кароткага царавання была велізарнай.

Ператварэнне Гродна ў губернскі цэнтр не было завершана ўказам Аляксандра I ад 21 (9) верасня 1801 г. аб стварэнні Гродзенскай губерні. На самай справе эвалюцыя ад каралеўскага горада да губернскага расцягнулася амаль на поўстагоддзя. У гэты перыяд тут захоўваліся рэшткі даўнейшага адміністрацыйнага і палітычнага ладу, элементы былога права і традыцый. Такімі з'яўляліся, да прыкладу, рамесныя цэхі, якія ліквідаваны былі толькі ў 1840-я гады; грамадзянскае судаводства паводле Статута 1588 г., сістэма мясцовых мер і вагаў, якая ўведзена была яшчэ пры Станіславе Аўгусце, і інш. Расійскія ўлады вымушаны былі ўносіць змены ў арганізацыю кіравання горадам, зважаючы на гэтыя асаблівасці. Так, у пачатку стагоддзя ў адміністрацыйныя ўстановы Гродзенскай губерні былі ўведзены дадатковыя штатныя пасады; не былі адкрыты ўправы дабрачыннасці, як у іншых губернскіх цэнтрах, у тым ліку – на ўсходзе Беларусі[40]. З-за шматмоўя дакументаў, якія абрачаліся ў горадзе і губерні і засталіся дзейснымі яшчэ з часоў Рэчы Паспалітай і прускага кіравання на Беласточчыне, у 1845 г. улады вымушаны былі ўвесці пасады тлумачоў з лацінскай, нямецкай і польскай моваў[41]. Падобныя прыклады можна працягваць. Гродна фактычна стаў больш-менш нагадваць "сярэднестатыстычны" расійскі губернскі горад толькі ў другой па-

лове XIX ст., але і тады змог захаваць рэшткі сваёй былой каралеўскай прыналежнасці, дзякуючы каралеўскім замкам і гістарычнай памяці сваіх жыхароў.

## Спіс выкарыстанных крыніц

1. Гостев, А.П., Швед, В.В. Кронон: летопись города на Немане. – Гродно, 1993; Анішчанка, Я. Інкарпарацыя. – Мінск, 2002; Швед, В.В. У час паўстання 1794 г. // Памяць. Гродна. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1999. – С.138-140; Швед, В.В. У складзе Расійскай імперыі // Тамсама. – С.143-145; Милютин, Д.М. Гродно в 1794, 1795 и 1796 гг. – Гродно, 1905; Żuwirska, M. Ostatnie lata życia króla Stanisława Augusta. – Warszawa, 1975; Гардзееў, Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Wrocław, 2007.

2. Полное собрание законов Российской империи (ПСЗРИ). – Т.23 – СПб, 1830 – № 17264. – С.572.

3. Bogucka, M., Samsonowicz, H. Dzieje miast i mieszczaństwa w Polsce przedrozbiorowej. – Wrocław-Warszawa-Kraków-Gdańsk-Łódź, 1986. – S.354.

4. Орловский, Е. Гродннская старина. Ч.1 – Гродно, 1910. – С.199.

5. Занеўскі, С. Гродна ў 1795-1802 гг. // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі. эканомікі, культуры. – Гродна, 2007. – С.158.

6. Кітурка, І. Месца і роля каралеўскіх гарадоў у эканамічных рэформах ВКЛ у другой палове XVIII века // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі. эканомікі, культуры. – Гродна, 2007. – С.75.

7. Гардзееў, Ю. Магдэбургская Гародня. – С.252.

8. ПСЗРИ. – Т.23. – СПб, 1830. – № 17264. – С.572.

9. Донесение князя Николая Васильевича Репнина Императрице Екатерине II от 17 ноября 1794 г. // Сборник Императорского Русского исторического общества. – Т.16. – СПб, 1875. – С.54.

10. Тамсама. – С.57.

11. Швед, В.В. У час паўстання 1794 г. // Памяць. Гродна. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1999. – С.140.

12. Тэкст прысягі быў наступным: «Ja niżej na podpisie wyrażony przysięgam wszechmogącemu panu bogu przed świętą ewangelię jego i obecuię się w tym iż chcę i powinien jestem Jej Impieratorskiej mości mojej Najmiłościwszej Pani Impieratorowej Katarzynie Alexiejownie Samowładnącey Całej Rosji, oraz Jej Impieratorskiej mości najukochańszemu Synu Panu Cesarzewiczowi i wielkiemu Kiążęciu Pawłu Piotrowiczowowi dziedzicznemu

Następcy Tronu calej Rosji wiernie i nieobłudnie służyć, j we wszystkim tyle być posłusznym, że do ostatniej kropli krwi j życia mego oszczędzać nie będę. Tak Panie Boże dopomóż mnie na duszy i ciele. A przy zawarciu tej mojej przysięgi całuje słowa i krzyż Zbawiciela mojego. Amen". // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ у Мінску). – Ф.2567. – Воп.1. – Спр.9. – Арк.11.

13. Письмо князя Безбородко князю Репнину от 25 ноября 1794 г. // Сборник Императорского Русского исторического общества. – Т.16. – СПб, 1875. – С.50.

14. ПСЗРИ. – Т.23. – СПб, 1830. – № 17264. – С.572.

15. Копия с письма Н.В.Репнина Д.П.Трощинскому от 3 сентября 1795 г. // Сборник Императорского Русского исторического общества. – Т.16. – СПб, 1875. – С.286.

16. ПСЗРИ. – Т.23. – СПб, 1830. – № 17279. – С.606.

17. Pamiętnik Franciszka Mickiewicza. Wyd. Józef Kallenbach. – Lwów-Warszawa-Kraków, 1923. – S.36.

18. Kamiński, A. Pogranicze polsko-rusko- jaćwieskie między Bebrzą a Narwią // Rocznik białostocki. – 1963. – Т.4. – S. 7, 28-30.

19. ПСЗРИ. – Т.23. – СПб, 1830. – № 17279. – С.606.

20. Гостев, А., Семенчук, А. Королевский город Гродно. – Минск, 2006. – С.40.

21. Занеўскі, С. Гродна ў 1795-1802 гг. // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі. эканомікі, культуры. – Гродна, 2007. – С.159.

22. ПСЗРИ. – Т.23. – СПб, 1830. – № 17418. – С.845.

23. Караткевіч, В.Б., Кулагін, А.М. Помнікі Слоніма. – Мінск, 1983. – С.17.

24. ПСЗРИ. – Т.23 – СПб, 1830. – № 17494. – С.847.

25. Письмо неизвестного поляка к сестре от 6 декабря 1794 г. // Сборник Императорского Русского исторического общества. – Т.16. – СПб, 1875. – С.69.

26. Занеўскі, С. Гродна ў 1795-1802 гг. // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі. эканомікі, культуры. – Гродна, 2007. – С.159-160.

27. Письмо князя Репнина князю Безбородко от 13 декабря 1794 г. // Сборник Императорского Русского исторического общества. – Т.16. – СПб, 1875. – С.69.

28. Письмо князя Репнина Н.С.Ланскому от 30 апреля 1796 г. // Сборник Императорского Русского исторического общества. – Т.16. – СПб, 1875. – С.435.

29. Государственный архив Российской Федерации (ГАРФ). – Ф.1165. – Оп.1. – Д.490. – Л.62.

30. Письмо князя Репнина Н.С.Ланскому от 30 апреля 1796 г. // Сборник Императорского Русского исторического общества. – Т.16. – СПб, 1875. – С.435.

31. ГАРФ. – Ф.1165. – Оп.1. – Д.490. – Л.62.

32. ПСЗРИ. – Т.23. – СПб, 1830. – № № 1719, 17494, 17525.

33. ПСЗРИ. – Т.23. – СПб, 1830. – № 17494.

34. Памяць. Гродна. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1999. – С.138-140.

35. Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ у Мінску). – Ф.2567. – Воп.1. – Спр. 12, 13.

36. Копия с письма Н.В.Репнина Д.П.Трощинскому от 3 сентября 1795 г. // Сборник Императорского Русского исторического общества. – Т.16. – СПб, 1875. – С.286.

37. Тамсама.

38. ПСЗРИ. – Т.24. – СПб, 1830. – № 17585.

39. ПСЗРИ. – Т.24. – СПб, 1830. – № 17634.

40. Указ Сенатский по Высочайше утвержденному докладу. О штатах двух Литовских губерний; Литовской и Гродненской // Гродненская губерния в законодательных актах Российской империи.(1801-1913 гг.). – Слоним, 2004. - С.19-20.

41. НГАБ у Гродна. – Ф.1. – Воп.27. – Спр.884.

**Карнялюк Віталь Рыгоравіч,** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы"*

## ГОРАД-МУЗЕЙ ГРОДНА БЕЗ ЭКСКУРСАВОДАЎ

Памятаеце ў Караткевіча: "Гародня стаяла на юру". Цяпер зноў тое ж. Толькі цяпер яна на "юру" ўвагі да таго, што робяць з яе гістарычным аблiччам. Дасюль Горадні шчасціла. Шчасціла, як толькі ўвогуле можа пашчасціць беларускаму гораду, дажыўшаму да пачатку XXI стагоддзя. Войны і чалавечае глупства, на дзіва, не наводмаш білі па яму і таму не ўшчэнт зруйнавалі яго забудову. Гісторыя пакінула сённяшнім гараджанам твар іх адметнага беларускага места. Пакінута гэта безумоўна і ўсім астатнім жыхарам краіны і яе гасцям.

А цяпер у модзе турызм. Турыстычныя фірмы ствараюцца адна за другой і прапануюць свае паслугі ахвочым да адпачынку тубыльцам і прыезжым. У Горадні наствараўся не адзін дзесятак турыстычных прадстаўніцтваў – агентстваў і тураператараў. Зададзімся пытаннямі: што могуць прапанаваць яны, прынамсі, пра наш жа горад? Як гатовы і здольны яны паказаць яго нам? З якога боку? Якімі сродкамі? Без сумніву, такімі аналагічнымі пытаннямі могуць задацца і ў Магілёве, і ў Берасці, і ў Віцебску, і ў Менску. Проста ў Горадні – горадзе-музеі – гэтыя пытанні найбольш напрошваюцца. Заўважым, што ўзняты мясцовымі ўладамі брэнд "горад-музей" адчувальна кантрастуе з падзеямі дзеючай цяпер "рэканструкцыі" Горадні, але пакуль мае права на існаванне – горад сапраўды вабіць да сябе аматараў нашай мінуўшчыны.

З вынікаў гутаркі з прадстаўнікамі вядомых гарадзенскіх структур турбізнесу і з уласнага вопыту асмелюся сцвярджаць: на сённяшні час традыцыйным відам турыстычнага прадукта пра горад з'яўляецца аглядная экскурсія альбо аг-

лядная экскурсія з наведваннем аквапарку, заапарку і гісторыка-археалагічнага музея. Самое па сабе – гэта вельмі важная форма знаёмства з горадам. Аглядны характар экскурсіі, якая традыцыйна пачынаецца з муроў Старога замку на Замкавай гары, дае магчымасць экскурсантам убачыць горад цэласна. Зрабіць гэта з улікам прасторавых адметнасцей і асаблівасцей гістарычных часоў, усвядоміць, уявіць і асэнсаваць той гістарычны, культурны, архітэктурны, урбаністычны феномен Беларусі, якім з'яўляецца наша Горадня. Правесці такую экскурсію якасна з адпаведнымі папраўкамі на тэрмін экскурсіі, склад экскурсантаў, іх падрыхтаванасць і іншыя акалічнасці, – справа няпростая, патрабуючая пэўнай, адпаведнай падрыхтоўкі. Ці ёсць такая падрыхтоўка ў абсалютнай большасці тых, хто водзіць зараз экскурсіі па гораду-музею? Не, па большасці, няма. Выключэнні, калі праяўлялі ўласную ініцыятыву і ў розныя гады незалежнасці (канец XX – пачатак XXI стст.) падхоплівалі і працягвалі экскурсійную справу (без выняткаў гэта навукоўцы і выкладчыкі: Алесь Краўцэвіч, Мікалай Беспамятных, Уладзімір Хільмановіч, Вітаўт Парфёненка, Святлана Словік, Алесь Смалянчук, Ігар Лапеха etc) толькі пацвярджаюць правіла. Бо пералічаныя і "іжэ з німі" асобы, усе без выключэння, – непрафесійныя экскурсаводы, хоць некаторыя і прайшлі экскурсійныя курсы. Гэтыя курсы, якія ладзіліся на прыканцы 80-х гг. XX ст., згадваюць некаторыя з ліку вопытных гарадзенскіх "чычэроне". Аднак, калі гэта было! Самавукаю, выкарыстоўваючы ўласны выкладчыцкі і настаўніцкі досвед і маючы асабістую ўнутраную зацікаўленнасць краем, гэтыя піянеры новай турыстычнай эпохі Гродна дэманструюць сваім прыкладам патрэбу новага, іншага функцыянавання экскурсійнай справы.

Падрыхтоўка новага пакалення прафесійных экскурсаводаў выцякае з цэлага шэрагу прычын. Прычыны гэтыя закранаюць розныя бакі стану сучаснай турыстыкі. І толькі комплексны, разнабаковы кірунак у вырашэнні сённяшніх праблем здолее змяніць становішча, пры якім зараз у горадзе вам фактычна ніхто (вынятак складаюць 2-3 тураператары) не прапануе ніводнай тэматычнай экскурсіі. Зразумела, што да-

лёка не кожны аспект гісторыі і сучаснасці горада магчыма прадставіць сродкамі экскурсіі. Таму нямала прычын: штосьці не захавалася, другое знаходзіцца ў карыстанні "закрытых" арганізацый. Так, вайскоўцы размяшчаюцца цяпер у будынках былой медыцынскай акадэміі Ж.-Э.Жылібера, сельскагаспадарчага банку і будынку Дома ўрача (А.Тальгейма), "эмчэсаўцы" валодаюць будынкам пажарнай вежы пачатку XX стагоддзя.

Але і тое, што можа стаць экспанатам і аб'ектам экскурсіі па пэўнай тэме, такім не становіцца. Эскурсанты Горадні не маюць магчымасці зараз атрымаць такую турыстычную паслугу як экскурсія "Літаратурная Горадня", а, значыць, іх не завядуць да тых куткоў горада, якія ўтрымліваюць памяць пра Васіля Быкава і Аляксея Карпюка, Уладзіміра Караткевіча і Максіма Багдановіча, Дануту Бічэль і Лейбу Найдуса, Элізу Ажэшка і Зоф'ю Налкоўскую, Міхася Васілька і Алеся Чобата.

Пазбаўлены жыхары і госці горада даведацца з вуснаў экскурсаводаў пра асобныя дэталі старажытнага і сярэднявечнага горада, падрабязна ўглядзецца ў эпоху Антонія Тызенгаўза і заўважыць, што гарадзенскія вуліцы захавалі памяць пра паўстанцаў, якія неаднаразова выступалі за волю супраць імперскай расійскай улады.

Пры шматлікім згадванні на ўсіх узроўнях аб падзеях апошняй вайны з фашызмам вам наўрад ці прапануюць экскурсію па старонках вайсковай гісторыі горада ў XX стагоддзі. Тое ж можна сказаць і пра ранейшыя старонкі баявой мінуўшчыны гарадзенцаў.

Горад на шчасце дэманструе архітэктурную разнастайнасць, але экскурсіі "Архітэктура горада" таксама няма ў прэйскуранце турыстычных паслуг. Паход у заапарк выглядае звычайным бадзяннем сярод самотных жывёл і птушак. І ніколі не выкарыстоўваецца патэнцыял працаўнікаў заапарка, каб тыя расказалі пра жыхароў адзінага да нядаўняга часу заапарка ў краіне.

Па-за ўвагаю тых, хто ўзяў за мэту паглыбіць свае веды пра горад, з-за адсутнасці тэматычных экскурсій найчасцей

застаюцца такія "дробязі" гарадскога інтэр'ера як каваныя і літыя балконы старых будынкаў, гісторыя каталіцкай царквы, яўрэйскі свет Горадні. Не мае тэматычнай ўвагі гісторыя гродзенскай тапанімікі – "мовы" кожнага населенага пункта. Горад мае гістарычныя часткі, такія як "Новы свет", "Гарадніца", "Занеманскі фарштадт", яго вуліцы "населены" гісторыяй, але тэму гісторыі вуліц і асобных раёнаў горада вам таксама не прапануюць. Ну можа быць, як вынятак, у межах агляднай экскурсіі, будзе арганізавана наведванне дома-музею М.Багдановіча або дома-музею Э.Ажэшкі. Як вялікая рэдкасць можа быць прапанавана аптэка-музей (якая месціцца ў самым цэнтры горада). Таямніцай застаецца для наведвальнікаў амаль заканспіраваны музей анатамічнага аддзялення гродзенскага медуніверсітэта. Яшчэ ёсць дом майстра на Гарадніцы; туды часам могуць завесці.

Пры такім гарадскім экскурсійным кругаглядзе застаюцца па-за ўвагаю: музей Васіля Быкава, музей Зоф'і Налкоўскай, увесь пералік школьных музеяў, сярод якіх, напэўна, варты ўвагі музейныя экспазіцыі першага гродзенскага ліцэя "Гісторыя педагогікі Гродзеншчыны", першай гродзенскай гімназіі імя акадэміка Я.Ф.Карскага "Музей Я.Карскага", СШ № 26 "Музей гісторыі вуліц", СШ № 23 "Музей мінералаў і карысных выкапняў", СШ № 15 "Народны музей генерала Дз.Карбышава", гімназіі № 4 "Музей каралеўскай рэзідэнцыі Аўгустовак", СШ № 35 "Музей гісторыі гродзенскага падполля ў Другой сусветнай вайне". У горадзе існуе вартая ўвагі прыватная экспазіцыя музычных інструментаў. Амаль ніколі не з'яўляюцца аб'ектамі экскурсій часовыя выставы, якія экспануюцца ў галерэі Тызенгаўза, у Сенатарскай зале Новага замка, галерэі "У майстра" або цэнтральнай выставачнай зале. Пра выставачны працэс тураператары горада пэўна не ведаюць і яго навіны не адсочваюць. Рэдкасцю з'яўляецца такі пункт турыстычнай праграмы, як наведванне тэатраў – драматычнага і лялечнага. Ніколі не разглядаліся ў якасці дадатковай турпаслугі магчымасці бібліятэкі рэдкай кнігі Гісторыка-археалагічнага музея з унікальнай калекцыяй друкаваных выданняў ад часоў інкунабул.

Аб'екты для наведвання экскурсантаў згодна са зместам агляднай экскурсіі адпавядаюць патрабаванням для такога кшталту экскурсій, але не ўключаюць шмат цікавых мясцін горада. Горад знаходзіцца на дзвюх берагах ракі і занёманская частка практычна ніколі не становіцца тэрыторыяй экскурсій. А, значыць, усё тое, што яна змяшчае, – рэшткі сядзіб Румлёва і Аўгустова, Францышканскі кляштар і касцёл, старыя яўрэйскія могілкі, каталіцкія могілкі і нават найноўшы афіцыёзны мемарыял савецкім пагранічнікам – усё гэтае застаецца па-за ўвагаю тых, хто паставіў задачу пазнаёміцца з горадам з дапамогаю прафесійных гідаў.

Ёсць, вядома, і выключэнні. Так, знакамітая гродзенская турфірма "Топ-Тур" гатова прапанаваць сваім кліентам такія дадатковыя элементы адпачынку ў горадзе, як наведванне арганнага канцэрта ў Фарным касцёле (па папярэдняй замове) або арганізаваць сустрэчу гасцей з прадстаўнікамі таго ці іншага нацыянальнага таварыства, якія дзейнічаюць у горадзе. У патэнцыяле гэтай фірмы ёсць і іншыя варыянты. Яшчэ раз нагадаем, што гэта, фактычна, вынятак.

Чаго не стае гарадскому турбізнесу, каб пералічанае вышэй стала сферай адпачынку і інтэлектуальнага развіцця гараджан і гасцей горада з дапамогаю розных форм турызма?

Вядома, што турызм – гэта ў дадзеным выпадку бізнэс, дзе сустракаюцца спажыўцы – жадаючыя культурна адпачыць і вытворцы-гандляры турыстычнага прадукта. Пры іх паразуменні мы маем тое, што называецца турыстычны бум. Карысці з гэтага буму можна назбіраць нямала.

Таму разгледзім уважліва абедзве часткі турбізнесу. Пачнем з патэнцыяльных кліентаў. У прынцыпе экскурсантам можа стаць кожны, калі, напрыклад, ваша прадпрыемства з-за турботаў аб культурным узроўні сваіх працаўнікоў замовіць знаёмства з родным горадам. Але ўсё ж большасць патэнцыяльных экскурсантаў – моладзь, вучні школ і іншых навучальных устаноў. Характар дзейнасці жа турыстычных фірм Горадні ў накірунку арганізацыі і прасоўвання да спажыўца такога турыстычнага прадукту, як знаёмства з

Горадняй, не адзначаецца такой сваёй адметнасцю, як накіраванасць на гэтыя, найбольш перспектыўныя групы магчымых экскурсантаў. Заклікаюць іх куды заўгодна – ад аквапарку ў гатэлю "Галембіеўскі", што ў Беластоку, да "Лініі Сталіна", але толькі не да грунтоўнага знаёмства са сваім родным местам. Не існуе ў прыродзе гродзенскага турбізнеса ніякіх прэцэдэнтаў супрацоўніцтва турфірм з абласным палацам творчасці дзяцей і моладзі. Паняцце маркетынгавых даследванняў у дачыненні да школьнага кантынгенту і студэнцтва выглядае толькі як успамін пра тэорыю маркетынга ў турызме. Цэлай нішаю рэгулярнага прытоку спажыўцоў адпаведнага турпрадукта бачыцца ўлік патрэб навучальнага працэсу. Гаворка ідзе пра экскурсійнае афармленне адпаведных курсаў Гродназнаўства і айчыннай гісторыі, якая літаральна засяродзілася між вуліц і будынкаў Горадні. Але гэтая ніша не ўжываецца турбізнесам горада.

У сувязі з гэтым трэба звярнуць увагу на амаль поўную адсутнасць рэкламы пра горад як аб'ект экскурсійнай увагі. Ад імя той ці іншай турыстычнай фірмы вы не знойдзеце ніякіх заклікаў наведаць каралеўскія замкі і Каложу, убачыць горад з новага боку скрозь прызму часоў Сярэднявечча альбо эпохі мадэрна ці канструктывізма. На шкле ў грамадскім транспарце вас не сустрэнуць выявы радасных дзяўчат і хлопцаў, якія б клікалі вас хутчэй пагрузіцца ў неверагодны свет гродзенскай мінуўшчыны. Ніякімі крокамі – ні праз паштовую рэкламу, ні праз прэсу, ні праз вонкавую рэкламу, таксама як і не з дапамогаю нерэкламных метадаў прасоўвання турпрадукта – сённяшні турбізнес не ідзе да патэнцыяльных спажыўцоў гродзенскай турпрадукцыі, "не лезе ў вочы" з пералікам прываблівасці сваіх паслуг, ні чым не стымулюе верагодных кліентаў. Можна было бы казаць пра вялікі дэфіцыт разнастайнай сімволікі – значкоў, сцяжкоў, вымпелаў, паштовак. Увогуле не існуюць такія распаўсюджаныя прадметы еўрапейскага калекцыянавання, як металічныя налепкі на тросці. Няма ў продажы ніякай вопраткі з сімволікай горада. Адсюль дадзенасць, што вучнёўская моладзь і іх настаўнікі збольшага не падрыхтаваны да ўжыван-

ня такога прадукту, як разнастайныя экскурсіі. Ім пра іх ніхто нічога не расказаў, не прадэманстраваў, да іх не прывабіў.

Чаму так адбываецца? Давайце паспрабуем вызначыць прычыны такога стану рэчаў і пашукаем кірункі выйсця з гэтага становішча. Сярод акалічнасцяў і ўмоў развіцця гродзенскага гарадскога рэцэпціўнага турбізнеса трэба бачыць тое, што выдатна ведаюць і самі турпрадпрымальнікі. Яны ж пра гэта і кажуць. Галоўнай імі адзначаецца адсутнасць падаткавай падтрымкі з боку дзяржавы. Сфера ўнутранага, уязднога турызму ў горадзе не абяцае вялікіх прыбыткаў адразу і істотна прайграе значна хутчэйшаму заробку грошай з дапамогаю тураў у цёплыя краіны і шоп-тураў. Са слоў аднаго з прафесійных вопытных гарадзенскіх турпрадрымальнікаў для ажыццяўлення актыўнай справы арганізацыі розных паслуг, звязаных са знаёмствам з Горадняй, яму патрэбны апантаны, дасведчаны, энергічны супрацоўнік. І для такога супрацоўніка згаданы накірунак турдзейнасці быў бы будучым "хлебам". І тады ён бы на конт гэтага круціўся. Аднак, у той жа фірме такога супрацоўніка няма і яго не шукаюць. Чаму, здавалася б? Значыць няма блізкай рэальнай выгоды.

Адсюль і намаганняў ў арганізацыі нават замоўленых экскурсій турфірмы прыкладаюць не шмат. Візіты ў знакамітыя гродзенскія касцёлы заўсёды ці найчасцей адбываюцца без узгаднення з настаяцелямі гэтых храмаў. І магчымасці больш даведацца пра гэтыя архітэктурныя жамчужыны Гародні пры такой арганізацыі экскурсіі значна страчваюцца. Ніколі не становяцца аб'ектам візітаў экскурсіі вайсковыя могілкі. Дарэчы галоўны аб'ект кожнага знаёмства з горадам – Каложская царква XII стагоддзя – часцяком бачыцца экскурсантамі на адлегласці зачыненага плоту. Бо невялікіх намаганняў, каб датэлефанавацца да яе святара, не робіцца. Без увагі застаецца тэрыторыя былой каралеўскай сядзібы ў Станіслалавова. Падарункам лёсу становіцца для экскурсантаў наведванне вялікай Гродзенскай сінагогі, бо з яе ахоўнікамі трэба папярэдне ўзгадніць візіт экскурсантаў. Дарэчы, ніводная ўстанова культа ніколі не адмаўляецца расказаць (і

прарэкламаваць, вядома) сябе. Горад толькі чакае калі-небудзь прапанаваных турфірмамі мастацкіх і фотапленэраў. Краявіды горада прыдатны для ажыццяўлення загадзя падрыхтаваных і ўзгодненых відовішчаў для экскурсантаў, як выступленні сяброў клубаў ваенна-гістарычнай рэканструкцыі. Такія шоў правабілі бы шмат аматараў даўніны.

Сюды трэба дадаць і гродзенскае наваколле. Яно цесна, непарыўна і арганічна звязана з горадам, яго гісторыяй, культурай і сучаснасцю. Бліжэйшае наваколле і горад разам робяць магчымасці ўласна гродзенскай экскурсіі ў разы лепшай, эфектнай, красамоўнай і карыснай. Адзіным збольшага распаўсюджаным варыянтам сувязі гродзенскай часткі экскурсіі і працягам яе на выездзе з'яўляецца расповяд пра жыццё і творчасць Элізы Ажэшкі. Гэтага не скажаш пра гісторыю Гродзенскай крэпасці – унікальнай фартэфікацыі часоў Першай сусветнай вайны. Бліжэйшы Свяцкі палац істотна дадаў бы да зместу аб архітэктуры XVIII стагоддзя. Сённяшняя вёска Жалудок была бы выдатным шматкроп'ем ў апавяданні пра Антонія Тызенгаўза і яго эпоху. Ваенная гісторыя горада часоў Другой сусветнай вайны незразумела і абстрактна без пагранічных застаў і лініі дотаў у раёне Сапоцкіна. Усё пералічанае – гэта той патэнцыял, які на сённяшні дзень фактычна не выкарыстоўваецца турфірмамі Горадні альбо гэта выкарыстанне не з'яўляецца правілам існавання гродзенскага турбізнесу.

Аднак сённяшняя невыгоднасць экскурсійнага рэцэпціўнага турбізнесу ў найлепшым чынам захаваным беларускім горадзе – гэта падстава падумаць аб шляху выпраўлення такога становішча. Прапануем тыя крокі, якія, на наш погляд, мелі бы стаць паваротам да зменаў.

Гісторыя горада з'яўляецца часткаю гісторыі краіны. Гэты труізм нагадвае нам пра тое, што большасць турпрадпрымальнікаў не мае адпаведных ведаў па айчыннай гісторыі, бо мае яшчэ савецкія – па-за беларускія веды. Каб выкарыстоўваць варыянты, звязаныя з магчымасцямі гарадской мінуўшчыны, трэба пра іх найперш ведаць. А палоханне перад ўласнай мінуўшчынай не стымулюе авалодання недастаю-

чымі ведамі дарослымі. Маўляў, сабе даражэй, яшчэ не тое, што трэба, прапануеш увазе кліентаў. Адсюль выснова – рост прафесіяналізму сённяшніх тураператараў – ён, у тым ліку ў росце іх ведаў пра гістарычную і культурную спадчыну краіны, краю і горада. Арганізацыя такога прафесійнага ўдасканалення цалкам у магчымасцях кіраўнікоў турызму ў краіне.

У гэтым кірунку разважанняў працэс не заўсёды прафесійнай і неабачлівай рэканструкцыі і "добраўпарадкавання" Горадні, які ў шырокім памеры пачаўся ў апошнія некалькіх гадоў, але выглядае ў выніку дэструктыўным. Таму што сярод іншых наступстваў, такое "добраўпарадкаванне" назаўсёды пазбаўляе горад таго подыху гісторыі, якое адчуваецца ад кожнай старой, але чароўнай ў сваіх рысах даўніны, пабудовы. Як той стары будынак вадзяного млыну на Гараднічанцы ля заапарку, які вабіў кожнага сваёй незвычайнай выяваю, але ўсё ж быў зруйнаваны без жалю. Кафэ, што побач, з назваю "Ля старога млына", засталося, а самога млыну няма. І смешна, і сумна. Такая "рэканструкцыя" адбірае ад будучых экскурсаводаў іх "хлеб", бо не шмат ахвотнікаў знойдзецца, каб сузі-раць найноўшую плітку Савецкай плошчы. (Адзін з эпітэтаў новастворанай Савецкай плошчы з вуснаў гродзенцаў – "музей сучаснай пліткі").

Адным з асноўных кірункаў выпраўлення становішча з экскурсійным абслугоўваннем ў Горадні становіцца справа падрыхтоўкі і арганізацыі эфектыўнай дзейнасці кваліфікаваных экскурсаводаў. Можа гэта быць адпаведная фірма тыпу "Экскурсійныя паслугі па гораду, наваколлю і вобласці" з адпаведнымі наладжанымі дамоўленасцямі з тураператарамі горада і іншых гарадоў краіны і замежжа. Гэтая фірма будзе фарміраваць тую частку турыстычнага прадукту, якая складаецца з усіх варыянтаў экскурсійнага абслугоўвання і гэты свой тавар прапаноўваць тураператарам. А каб з'явілася такая фірма, трэба каб самі тураператары заахвоціліся ёй. І тут без падтрымкі з боку гарадскіх уладаў не абыйсціся. Падтрымка гэта павінна быць комплекснай. Акрамя зразумелых пратэкцыяніcцкіх захадаў, гэта і развіццё краязнаўства ў навучальных і выхаваўчых установах горада, і ўсебаковае

культываванне вобраза горада, як адметнай малой бацькаўшчыны, як дыямента нашай гісторыі і цалкам перагляд падыходаў да добраўпарадкавання і рэстаўрацыйных прац у горадзе і наваколлі. Толькі адзіны прыклад магчымай, рознымі сродкамі скіраванай ўвагі гарадскіх уладаў – лесапарк Румлёва – былая шляхецкая сядзіба, найлепшым чынам захаваны да сённяшняга дня помнік садова-паркавага мастацтва Беларусі. Падкрэслім – адзіны ў горадзе помнік-прыроды мясцовага значэння. Але гэты лесапарк (або, як слушна паправіў выбітны наш знаўца такіх мясцін Анатоль Федарук – гэты ПАРК) нават не ўваходзіць ў гарадскую рысу.

Не трэба казаць, што кожны экскурсант, як спажывец турыстычнага прадукту, плаціць уласныя грошы не столькі за пэўную інфармацыю аб помніках дойлідства, а за камфортныя ўмовы знаходжання ў нашым горадзе, за той вобраз, які застанецца ў яго надалей у жыцці, за той непаўторны пах мінуўшчыны, які турбізнес павінен скіраваць на кожнага жадаючага атрымаць асалоду ад яго. "Genius loci" Горадні павінна стаць прадметам усебаковай увагі "бацькоў горада", калі жадаць, каб яна захавалася ў якасці таго няўлоўнага але адметнага, чым заўсёды прыцягвала гэтае места. На гэта працуе ўся інфраструктура, скіраваная на арганізацыю адпачынку. У гэтым кірунку дзейнасці можна пачаць з чаго заўгодна. Напрыклад, з прыбіральняў.

За апошнія некалькі год ужо нямала назваротных стратаў "дробязяў" мінуўшчыны: бардзюры былой Віленскай вуліцы з надпісам "Magistrat miasta Grodno", выкарчаваныя на радасць новай тратуарнай плітцы; будынкі, якія аказалася лягчэй знесці, чым даць ім новае жыццё; знойдзеныя археолагамі рэшткі радзівілаўскага палацу або фрагмент былога бруку на тэрыторыі сквера Савецкай плошчы, якія працей атрымалася засыпаць бульдозерам, чым зрабіць іх аб'ектам назірання турыстаў і гараджан. Сумна, але пэўна гэтаму спісу працяг яшчэ будзе. "Дробязь", якая засталася ад мінуўшчыны, сваёй аўтэнтычнасцю заўсёды скажа больш, чым шматслоўе экскурсавода. А калі прамова экскурсавода разумная і слушная, то гэтая "дробязь" стане выдатнай ілюстрацыяй гэ-

тых слоў. "Юныя аматары Аляксандра Дзюма (лёгка дададзім – Уладзіміра Караткевіча) – гэта пэўна будучыя гісторыкі, якім не хапае для гэтага адзінага – звычкі атрымліваць задавальненне ад сапраўднага", – пісаў вялікі гісторык Марк Блок. У Горадні гэтае сапраўднае – літаральна пад нагамі. Пакуль.

Ёсць яшчэ адзін абавязковы кірунак для з'яўлення ў горадзе-музеі Горадні шырокага спектру экскурсійных паслуг і стабільна высокага попыту да іх. І гэта не робіцца на ўзроўні аднаго, нават такога прапахлага гісторыяй горада, як Горадня. Гэты кірунак ў агульнадзяржаўным стаўленні да ўласнай, нацыянальнай гісторыі, як асобнай, вышэйшай культурнай каштоўнасці, як неад'емнай часткі фармавання грамадзян краіны. Здавалася б такі кірунак дзейнасці самы лёгкі, бо на яго скіраваны высілкі некалькіх міністэрстваў – асветы, культуры, прыродных рэсурсаў... Аднак, на жаль, не. Мінімізацыя гістарычнай адукацыі ў школе, новая хваля русіфікацыі працэсу выкладання айчыннай гісторыі, узнятая Міністрам адукацыі ў 2006 г., не спрыяе фарміраванню пазітыўнага стаўлення моладзі да гістарычнай інфармацыі пра сваю краіну, атаясамлення гэтых фактаў гісторыі, як чагосці сакральна важнага для разумення сябе ў сваім краі і сваёй краіне, сярод свайго народа. Гісторыя, як прадмет, ужо не першы год – "папялушка" ў нашай школьнай адукацыі, небяспечная сфера ведаў, "кавальня" іншадумства. Апошняя навіна для настаўнікаў ліцэяў і гімназій, дзе плануецца, або ўжо ідзе выкладанне курсаў па выбару пад агульнай назваю "Краязнаўства": Міністэрства адукацыі нарэшце прапанавала пералік афіцыйна зацверджаных назваў курсаў, і ...сярод іх няма гістарычнага краязнаўства ўвогуле. Іншае – ёсць: геаграфічнае, філалагічнае, але не гістарычнае.

Краіна, дзе размова на роднай мове асацыіруецца з палітычнай канфрантацыйнасцю ўладзе, павінна пачынаць справу здалёк. Аднак гэта проста неабходны і непазбежны крок для таго, каб са школ, тэхнікумаў і ВНУ выходзілі пакаленні свядомых спажыўцоў новага, якаснага турпрадукта пра свой горад (мястэчка, вёску, сяло). У зваротным выпадку наш рэцэпцыўны турбізнес так і будзе далей ратавацца ініцыятыў-

ным, накіраваным у вырай і супермаркеты ў ваколіцах Беластоку.

Падсумуем. Справа новай генерацыі экскурсаводаў абсалютна дасягальная. Яе дасягненне магчыма абавязкова пры руханні з усіх бакоў: прадпрымальніцкага, дзяржаўнага, спажывецкага. І рухацца трэба разам, бо другаснага ў гэтай справе няма. Вынікі створанага стануць набыткам для ўсіх трох бакоў. Таму безліч прыкладаў у турыстычных краінах свету, а ініцыятыўныя людзі заўсёды знойдуцца. І горад-музей Горадня стане са сваімі экскурсаводамі. А ці дрэнна быць прыкладам для іншых гарадоў Беларусі? І каму, як не гарадзенцам, ім стаць?

# ТРЭЦІЯ ГАРАДЗЕНСКІЯ ЧЫТАННІ

***"Гісторыя Гародні ў асобах"***



Гродна, 2008

**Швед Вячаслаў Вітальевіч,** *доктар гістарычных навук, прафесар УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы"*

# ДАВЫД ДАЎМОНТАВІЧ – АБАРОНЦА ЗЯМЛІ ГАРАДЗЕНСКАЙ

Шкада, што Бог не даў мне мастацкага таленту. А калі б ён быў, дык напісаў бы я для гродзенскага тэатра драматычную п'есу, дзе галоўным героем стаў таленавіты палкаводзец Сярэднявечча, які не прайграў ніводнай бітвы, Давыд Даўмонтавіч (каля 1287 г., па іншым дадзеным 1283 г. – 1326 г.), Давыд Гарадзенскі. Былі б у п'есе дзве сюжэтныя лініі: каханне да Радзімы – Вялікага княства Літоўскага і каханне да жанчыны, маці Давыдавых дзяцей.

На жаль, вельмі мала гістарычнага матэрыялу, крыніц, якія дазволілі б напісаць дастойную Давыда Гарадзенскага біяграфічную п'есу. А жыццё яго было такім драматычным, што і прыдумваць нічога не трэба.

Першая драма (магчымая сцэна спектакля) адбылася ў 1263 г., калі Міндоўг пасля смерці сваёй жонкі Марты забраў сабе жонку нальшчанскага князя Даўмонта. Апошні забіў Міндоўга і ўцёк з ВКЛ. Пазней ажаніўся на дачцы ноўгарадскага князя, унучцы Аляксандра Неўскага, Марыі Дзмітрыеўне. Ад гэтага шлюбу і нарадзіўся Давыд Даўмонтавіч. Жыў ён з бацькам, які стаў пскоўскім князем, і марыў пра вяртанне на Радзіму. Гэта адбылося пасля смерці Даўмонта (Цімафея), які, паміраючы, даў наказ сыну – ехаць у ВКЛ і служыць Радзіме. Так той і зрабіў.

Давыд Даўмонтавіч паступіў на службу да вялікага князя літоўскага Віценя. З асцярогай браў той сына апальнага князя, думаў, што Давыд будзе помсціць за бацьку. Але хутка гэтыя думкі прайшлі. Верная служба на пасадах гарадзенскага старосты (главы мясцовага кіравання) і кашталяна (каменданта) гарадзенскага Старога замка на працягу 25 гадоў

упэўніла вялікага князя ў адданасці Давыда да яго і да Вялікага княства Літоўскага.

У час кашталянства Давыда Даўмонтавіча (з 1300 г.) на Горадню шэсць разоў нападалі крыжакі, бо горад быў ключом да земляў беларуска-літоўскага Панямоння. Каля 20 нападаў на наш горад здзейснілі крыжакі Тэўтонскага ордэна. Хто толькі ні пабываў пад сценамі непрыступнага Старога замка! "Паход на Гартэн" лічыўся вышэйшай адзнакаю і гонарам рыцарства Германіі, Францыі, Швецыі, Галандыі, Даніі, Італіі, Іспаніі, Чэхіі і Англіі.

У 1305 г. Брандэнбургскі комтур Конрад Ліхтэнхаген дашчэнту разбурыў ваколіцы Горадзена, а замак выстаяў, і праз два дні вершнікі Віценя адкінулі ворага. У 1306 г. магістр Тэўтонскага ордэна Конрад Сак, атрымаўшы інфармацыю аб дрэннай абароне Горадзена і адсутнасці там князя Віценя, пасылае на яго захоп рыцара Альберта Гагеля на чале 400 воінаў. Набег аказаўся беспаспяховым. Такім жа быў у гэтым годзе наступны паход сотні ордэнскіх братоў і 6000 вершнікаў на чале з камандорам Кёнігсберга Эбергардам Вірненбургам. Крэпасць вытрымала штурм, які працягваўся з усходу сонца да палудня. Давыд Гарадзенскі вывеў дружыну з замку і адкінуў крыжакаў ад сцен. Ноччу яны вымушаны былі адысці, страціўшы шмат людзей.

У 1311 г. Горадзенам спрабаваў авалодаць комтур Ота фон Бертан на чале пяцёркі рыцараў і 400 вершнікаў. Скрытна, праз забалочаныя мясціны, прайшлі яны з дапамогаю праваднікa і напалі на прыгарад. Абрабаваўшы яго, са здабычай спешна адышлі, але хутка войска Віценя дагнала крыжакаў і пабіла іх. Другі раз сабраў супраць гарадзенцаў значныя сілы магістр Генрых фон Процкі (5000 вершнікаў і шмат рыцараў). Яму не пашанцавала, бо ў замку было войска Віценя. Крыжакі зноў паваявалі наваколлі і адышлі.

У 1314 г. ваярам Давыда Гарадзенскага Віцень даручыў дапамагчы Навагрудку. Гарадзенцы знішчылі запасы на шляху адступлення крыжакоў, захапілі іх лагер, дзе перабілі абарону, узялі баявых коней, правіянт і ваенны рыштунак, спалілі караблі ордэнскага флоту на Нёмане. У 1319 г. ваяры

Давыда Гарадзенскага захапілі шмат палонных і ваеннай здабычы ў Вогенштoрфе (Прусія). У 1322 і 1323 гадах войска Давыда па просьбе пскавічоў абараняла іх родны горад спачатку ад лівонскіх рыцараў, а пазней – ад дацкага войску.

Другая драма (магчымая сцэна спектакля) – сямейная. Сын Віценя Гедымін аддаў сваю дачку Біруту замуж за Давыда Гарадзенскага. Такім чынам, праз іншых дачок Гедыміна ён парадніўся з маскоўскім, цвярскім, галіцка-валынскім, мазавецкім князямі і з польскім каралём.

На пачатку сакавіка 1324 г., у Вялікі пост, тры рыцары і 600 воінаў з Натангіі (Прусія) зрабілі патаемны рэйд у ваколіцы Гродна. Яны напалі на маёнтак Давыда Гарадзенскага (Давыдзішкі ці Верцялішкі), спалілі яго, забілі яго жонку і двух сыноў і яшчэ 38 чалавек, забралі хатнюю жывёлу і 100 коней. У адказ Давыд здзейсніў набег на Мазовію, саюзніцу братоў-рыцараў, знішчыў г. Пултуск, спаліў 120 мястэчак і вёсак, зруйнаваў 30 касцёлаў і захапіў у палон 4000 чалавек.

Трэцяя драма (магчымая сцэна спектакля) – забойства абаронцы Горадзена. У 1326 г. Давыд Гарадзенскі на чале 1200 коннікаў і з атрадам польскага войску здзейсніў спусташальны рэйд на Брандэнбург. У час вяртання з паходу князь зрабіў у Мазовіі прывал – тут і сустрэла яго смерць. Падкуплены крыжакамі мазавецкі рыцар Анджэй Гост знянацку ззаду напаў на князя ў намёце і забіў яго дзідай. Можа гісторыя склалася б іначай, каб не смерць Давыда, – пакончылі бы з крыжакамі раней.

Цела Давыда ваяры прынеслі на шчытах у Горадзен і, паводле легенды, пахавалі ля сцен царквы Барыса і Глеба. Гарадзенцы насыпалі курган, ушаноўваючы ваенны талент славутага абаронцы Гарадзеншчыны. Цяпер шуміць на гэтым месцы вялізарны клён, а Нёман гамоніць з князем Давыдам:

*Над Гародняй праходзяць стагоддзі,*
*А ты спіш у кургане, князь любы!*
*Помніць вораг твой меч… Чуюць людзі –*
*Гудзяць гарадзенскія трубы.*

Побач з царквой Барыса і Глеба знаходзіцца памятны знак "Пагоня на Грунвальд". Ён напамінае нам пра 1410 г., калі вялікі князь літоўскі Вітаўт сабраў Гарадзенскую, Навагрудскую, Лідскую і Ваўкавыскую харугвы (палкі) ВКЛ і павёў іх на злучэнне з польскім войскам Ягайлы. Яны перамаглі крыжакаў і тыя больш не нападалі на Горадзен і іншыя гарады Панямоння. У 2003 г. недалёка ад храма ўзнік яшчэ адзін помнік нашаму герою – вялікі камень з надпісам "Давыду Гарадзенскаму (1287–1326) – славутаму абаронцу Гродна ад крыжацкай навалы. Ад удзячных нашчадкаў".

**Спіс крыніц і літаратуры:**


1. Патапенак, Г. Радавод Давыда Гарадзенскага / Патапенак Г. // Гродзенская праўда. – 1992. – 14 лістапада. – С.4.

2. Ткачёв, М. Князь Давыд – воевода Городенский / Ткачёв М., Бурдук Н., Каташкова А. // Гродненская правда. – 1987. – 3 января. – С.3.

3. Цыхун, А. Давыд Гарадзенскі / Цыхун А. // Гродзенская праўда. – 1992. – 1 жніўня. – С.4.

4. Чаропка, В. Меч і слава. Давыд Гарадзенскі / Чаропка В. // Чаропка, В. Імя ў летапісу / Чаропка В. – Мн.: Полымя, 1994. – С.149-156.

5. Швед, В.В. "Гудзяць гарадзенскія трубы" // Швед, В.В. Горадзен: аповяды з гісторыі горада (10 ст. – сярэдзіна 16 ст.) / Швед В.В., Госцеў А.П., Дабрыян А.А. – Гродна: Гродзен. абласная ўзбуйн. друкарня, 1996. – С.27–32.

**Марозава Святлана Валянцінаўна,** *доктар гістарычных навук, прафесар УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы"*

# СТЭФАН БАТОРЫЙ І ГРОДНА

Кандыдатура на трон Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя – князя Семіграддзя, нашчадка старажытнага венгерскага роду – разглядалася ўжо ў 1573 г. Аднак тады быў абраны Генрых Валуа. У час выбараў 1576 г. стаўку на Баторыя зрабіла шляхта, прапанаваўшы яму ажаніцца на Ганне Ягелонцы –апошняй прадстаўніцы дынастыі. Такім чынам стваралася бачнасць працягу праўлення Ягелонаў. 1 мая 1576 г. семіградскага князя з помпай каранавалі ў Кракаве, хоць элекцыя была двайной – сенат абраў каралём Максіміл'яна Габсбурга. Аднак той не спяшаўся ў сваю новую сталіцу, а ў хуткім часе – і памёр.

На трон Рэчы Паспалітай сеў сталы, адукаваны, з выразнымі поглядамі на ролю ўладара ў дзяржаве і на палітычную сітуацыю ў Еўропе чалавек, да таго ж вопытны палкаводзец і дасведчаны дыпламат.

Гародню Стэфан упершыню наведаў у 1579 г. Ён прыбыў сюды 3 лютага дзеля ўдзелу ў пашыранай нарадзе Сената разам з прадстаўнікамі шляхты. Ішла Лівонская вайна. Абмяркоўваўся далейшай ход вайны з Масквой і фінансавы ўклад у яе Вялікага княства Літоўскага. Гадавы падатак з усяго яго абшару мог прынесці толькі 150 тысяч злотых. Прысаромленыя станам сваёй арміі і фінансаў, ліцвінскія магнаты абавязаліся выставіць 10 тысяч жаўнераў. Свой абавязак зразумелі і дэлегаты павятовых соймікаў – склікаць паспалітае рушанне ва ўсім княстве – усё ж гэта больш іхняя вайна, чым Кароны. Вырашалі, на якую цвердзь, што адгароджвае Расію ад Інфлянтаў, ударыць: Полацк, Вялікія Лукі ці Пскоў. Ян Замойскі, зыходзячы са старога выслоўя "бяры, што бліжэй", раіў ісці на Полацк, які 17 год таму Масква адабрала ў княства.

Пасля нарады ў Гародні Баторый накіраваў пасла ў Маскву для прапаганды ідэі ўніі з Рэччу Паспалітай, для разведкі тамтэйшых настрояў. Гэта ідэя тады прыхільна ўспрымалася шляхецкай супольнасцю і часткай маскоўскага баярства.

2 сакавіка 1579 г. Баторый быў ужо ў сталіцы ВКЛ. Але з той нарады зрабіў Гародню сваёй прыватнай сталіцай. Неспакойны духам правіцель, які нідзе не мог доўга сядзець на адным месцы, найлепей адчуваў сябе тут, у сэрцы вялізных пушчаў, дзе мог уволю паляваць. Паляванне было яго любімым заняткам і найбольшай радасцю. Кароль паляваў усюды, дзе мог, і заўсёды, як толькі мог. 3 прыдворнай казны пастаянна выдаткоўвалі сродкі на паляўнічых сабак і сокалаў. А сам ён, напэўна, – самы рухлівы ўладар ВКЛ і Польшчы. Мала пушчаў і лясоў, якія б Стэфан сам не перамераў на кані ў час сваіх частых падарожжаў.

Стэфану спадабаўся Стары замак на высокім маляўнічым абрыве Нёмана, і ён загадаў яго перабудаваць. Дзеля гэтага ў Гародню былі выкліканы знакамітыя італьянскія архітэктары: Скота з Пармы і Антонія дэ Грэта. Як напісаў тагачасны храніст біскуп Павел Пясецкі, кароль часцей за ўсё жыў у Гародні пад выглядам найбольш зручнага для палявання месца, а на самай справе ён пазбягаў нямілага сужыцця са сваёй жонкай, каралевай Ганнай, старэйшай за яго на 10 гадоў. А яшчэ Баторый баяўся атруты ад жонкі, што, па чутках, унаследавала ад маці – Боны Сфорца – майстэрства атручвання.

Ганна не мела ўплыву на палітыку мужа, але пляла інтрыгі. Яна, напэўна, прагнула ўлады, але не мела ніякай гарантыі перажыць Стэфана. Яна пастаянна хварэла: да даўняй неўралгіі далучылася хвароба сэрца, пастаянна балелі вочы. Калі Ганне споўнілася 60 гадоў, яна пачала рыхтаваць сабе грабніцу на Вавелі ў Кракаве. Яна рыхтавала грабніцу толькі для сябе, бо разлічвала, што ў мужа яшчэ будзе час паклапаціцца аб месцы ўласнага пахавання. Многія былі перакананы, што Стэфан пераживе Ганну. Было б неасцярожна сцвярджаць, што так лічыў і сам кароль. Меў ён загадкавую

"любоў" да напісання завяшчанняў. У час праўлення ў Рэчы Паспалітай напісаў іх тры.

Мяркуюць, што ў Гародні кароль меў каханку – прыгожую дачку ляснічага, якая нарадзіла яму сына. Пазашлюбнага каралевіча звалі Княбоўскі, паводле іншай версіі, – Князёўскі. Ён меў у Гародні маёмасць. Пры Жыгімонце III удзельнічаў у вайне з Масковіяй з уласным атрадам у 12 коннікаў і прывёз з-пад Крамля сабе сяброўку. Праўда, яму адмаўлялі ў шляхецкім званні.

Другія сцвярджаюць, што ад той сувязі нарадзіўся будучы цар Дзмітрый I Самазванец. Іншыя лічаць усё гэта плёткамі, не пацверджанымі больш сур'ёзнымі крыніцамі: караля характарызавала нечуваная ў тую эпоху сексуальная ўстрыманасць, за якой магла хавацца нейкая таямніца. Існуе нават версія, што ён перанёс сіфіліс.

Затое Стэфан не цураўся віна, нягледзячы на папярэджанні і просьбы лекараў, каб хоць разбаўляў яго або запіваў вадой. Праўда, ніхто не бачыў яго моцна п'яным.

Кароль любіў Гародню. Тут ён, пазбавіўшыся прыдворных уплываў, мог праводзіць самастойную палітыку. Тут ён быў бліжэй да тэатра баявых дзеянняў Лівонскай вайны і ў той жа час не надта аддаляўся ад сталіцы. Налічваюць да 10 прыездаў Стэфана Баторыя ў наш горад. Неаднойчы ён збіраў тут войска, адсюль рушыў на пераможныя бітвы з маскоўскім царом Іванам. Стэфан лічыў Гародню наймілейшым горадам "і для часовага жыхарства, і для вечнага спачынку", як ён казаў езуіту Кампані.

Пасля шасці гадоў прабывання на троне Рэчы Паспалітай Баторый стаў адным з найбольш знакамітых манархаў Еўропы, з асобай якога каталіцкі свет звязваў вялікія надзеі. Паходам 1581–1582 г. на Пскоў ён аслабіў Маскоўскую дзяржаву, адсунуў яе на ўзбочыну еўрапейскай палітыкі і прыкладна на паўвека даў магчымасць Рэчы Паспалітай праводзіць сваю ўсходнюю палітыку. Без яго, сцвярджаюць, гісторыя Рэчы Паспалітай была б на некалькі дзесяцігоддзяў карацейшай. Весткі пра караля-ваяра, выдатнага стратэга, рэфарматара арміі пашыралі людзі пяра, яго канцылярысты, "ляту-

чыя лісткі" і ваенныя спецыялісты, якіх прыцягвала яго вайсковая слава.

Баторый пільна сачыў за палітычнымі падзеямі ў Еўропе. Смерць Івана Грознага зноў звярнула яго ўвагу на знясіленую апрычнінай Маскоўскую дзяржаву. Армія Рэчы Паспалітай мела тады перавагу перад рускім войскам ў полі, славілася яе конніца. Кароль Стэфан вырашыў выкарыстаць замяшанне ў Крамлі і нанесці Маскве апошні ўдар, каб потым, забяспечаны з тылу, ударыць на Канстанцінопаль і разбіць небяспечную для ўсяго хрысціянства турэцкую моц, атрымаць для Польшчы доступ да Чорнага мора, а потым аб'яднаць пад сваім скіпетрам падзеленую Венгрыю, вызваліўшы яе ад апякунства Габсбургаў.

На з'ездзе ў Любліне ў жніўні 1584 г. Баторый імкнуўся пераканаць сенатараў у неабходнасці барацьбы за шапку Манамаха. Ён накіраваў у Маскву пасла – мінскага кашталяна Гарабурду – з праектам уніі пад скіпетрам Баторыя. А калі тая не захоча прыстаць, тады нагадаць ёй пра Смаленск і Северскую зямлю. Маскоўскія паслы адмовіліся – дзверы для вайны былі адчыненыя. Але планы караля сустрэлі ў Польшчы апазіцыю. Не падтрымаў яго задумы і папа рымскі Грыгорый XIII, які аднак у красавіку 1585 г. памёр.

Тады Баторый узняў свой дзёрзкі план перад новым папам Сікстам V... і змог прыцягнуць яго на свой бок. Праз папскага нунцыя Вінцэнта Лаурэа ён паведамляў у Рым аб намеры ўдарыць на Смаленск і Маскву. Сікст V паабяцаў 25 тысяч скуда на падтрымку гэтых грандыёзных намераў. Пратэстанты распаўсюджвалі чуткі, што папа выставіў умовай фінансавай дапамогі Баторыю ў вайне з Масквой і Турцыяй знішчэнне пратэстантызму ў Рэчы Паспалітай.

У верасні 1585 г. кароль накіраваўся ў Вялікае княства Літоўскае, спадзеючыся, што ліцвінскія паны лягчэй дадуць схіліць сябе да вайны, чым польскія. 2 лістапада ён быў ужо ў Гародні. Цешыўся новым будынкам на Замкавай гары, з якога адкрываўся маляўнічы від на цёмназялёныя лясы, што шчыльна атулялі горад з усіх бакоў. Тут ён пражыў цэлы

год: паляваў, піў, абдумваў і рыхтаваў паход праз Маскву на Стамбул. У Гародні Баторый разгарнуў інтэнсіўную дыпламатычную дзейнасць, вёў шматлікую карэспандэнцыю, падрыхтоўваючы міжнародную глебу для паходу, вёў перамовы з Рымам, Масквой, а таксама з Рыгай, дзе тады абвастрылася каляндарнае пытанне; праз ганцоў падтрымліваў пастаянную сувязь з Кракавам і Вільняй. Раскручваў таксама машыну збору падаткаў.

У жніўні 1586 г. Баторый прымаў у Гародні пасольства рускага цара Фёдара. Пра ўнію цар гаварыць не хацеў, але дамагаўся толькі працягу мірных перагавораў і то з умовай тэрытарыяльных саступак на карысць Масквы. Гэта было абураючае і нават смешнае жаданне ў момант, калі Масква перажывала ўнутранае перасільванне, а Рэч Паспалітая ўжо ў думках злучала яе з сабой ці то шляхам дамовы, ці то сілай зброі. Перамовы былі перарваны.

Вайна ўжо вісела ў паветры. Значна аслабла апазіцыя батарыянскаму праекту ў Польшчы. Ужо шляхецкія соймікі па ваяводствах схіляліся да падтрымкі задум караля і ўхвалялі ўстанаўленне новага падатку на вайну. Ужо былі абраны дэпутаты, якія спрыялі палітыцы караля, на вальны сойм Рэчы Паспалітай, прызначаны на люты 1587 г. – той сойм павінен быў стаць трыумфам задум Баторыя. Ужо ў Рыме грузілі на падводы абяцаныя грошы... Калі раптам, як гром, разышлося па свеце нечаканае паведамленне, што памёр ініцыятар гэтых смелых планаў. 12 снежня 1586 г. манарх, чые спартанскія звычаі і нявыкарыстаная сіла здзіўлялі акружэнне, чый размах задум і энергія спраў зачароўвалі сучаснікаў, заснуў вечным сном у Гарадзенскім замку. Манарх, які так шмат зрабіў для нашага горада.

Аказваецца, тыя гіганцкія планы строіў чалавек, чыё жалезнае здароўе было міфам і, несумненна, палітычнай каштоўнасцю, ад якога залежала будучыня цэлай дзяржавы,

На самай справе ён усё сваё жыццё пакутаваў. Яшчэ ў маладосці Стэфана ўкусіў сабака, з таго часу ён меў на правай назе, ніжэй калена, пастаянна цякучую рану – эксудат, які ўвесь час дакучаў. Рану прыпальвалі агнём, рабілі

кровапусканне, забаранялі спажыванне моцных напояў – нічога не дапамагала. Медыкі Бляндрата і Бучэла вырашылі рану не загойваць, а, наадварот, пашырыць, каб даць выхад "злой матэрыі". На назе ўстанавілі прыстасаванне, якое пастаянна бярэдзіла рану, і, як ні дзіўна, з ім кароль адчуваў сябе лепей.

У спадчыну ад бацькі, які памёр ледзь за 50, Стэфану дастаўся яшчэ адзін дэфект – эпілепсія. Ужо ў Семігараддзі ў яго былі таямнічыя прыступы са стратай прытомнасці. Востры прыступ здарыўся з ім незадоўга да каранацыі. Тыя, хто былі да караля бліжэй, ведалі рэальны стан яго здароўя, заўважалі, як часам ён трывожна бляднеў. Але на паляваннях і войнах ён вёў сябе так, нібыта фізічныя недамаганні яго ніколі не турбавалі. Яго постаць і паводзіны не пакідалі сумневу ў жалезным здароўі.

Прыдворны медык Мікола Бучэла з Падуі, хоць і быў вялікім майстрам лекарскай справы, але, ведаючы стан здароўя свайго пацыента і баючыся адказнасці, у 1583 г. угаварыў Баторыя прыняць на двор вядомага лекара і філосафа Сімона Сімонія з Луккі. Адносіны паміж лекарамі, якія разыходзіліся ў дыягназе і, адпаведна, у метадах лячэння, складваліся па меры змены здароўя караля: пагаршаліся марудна, але безупынна. Бучэла нават хацеў пакінуць двор, але Баторый стрымаў яго наданнем новага маёнтка.

Хоць у лісце падканцлеру Льву Сапегу ад 23 красавіка 1583 г. Баторый пісаў: "Не думаю, што мне дадзена жыцця яшчэ 10 гадоў", ён, відаць, з усіх сіл адганяў думкі аб смерці. У той жа час фатальная хвароба стала істотным рухавіком пачынанняў і планаў Баторыя: ён павінен быў спяшацца, увесь час спяшацца...

Раптоўнае абвастрэнне хваробы наступіла ў час сойма 1585 г., і Стэфан ужо не мог цярпець: кідаўся то ў прыпадкі злосці, то ў апатыю. Нават быў вымушаны пакінуць пасяджэнне сената. Пра гэта даведаўся аўстрыйскі цэзар, які ўтрымліваў шпіёнаў у Рэчы Паспалітай. Пасля сойма лекар Мікола Бучэла выказаў каралю трывогу наконт яго здароўя – каб той меў доўга жыць. Больш смелы маршалак Апалінскі рэзка напомніў манарху, што ён, як чалавек смертны, павінен урэгуляваць справы наследавання і элекцыі.

Кароль, напэўна, прадчуваў свой канец. 12 мая 1585 г. напісаў тэстамент, у якім завяшчаў 96 тысяч злотых Семіграддзю, 30 тысяч – любімай Гародні, 20 тысяч – на шпіталь для старых салдат, закладзены ім у Варшаве. Баторый тады нават на некалькі месяцаў схаваўся ад надакучлівых вачэй у Непаломіцах (на тэрыторыі Польшчы). У канцы лета яму стала лепей, і ён 6 верасня выехаў з Непаломіц праз Корчын-Сандамір-Варшаву ў Гародню, якую ўжо больш не пакідаў.

Тут кароль Стэфан надалей лячыўся, як звычайна, на незлічоных паляваннях ветрам, марозам, launch ператамленнем, а таксама келіхам віна. Ён гартаваў на тых паляваннях сваё цела і задумы перад гіганцкім паходам, што меў змяніць карту Еўропы. Адно з іх, у лютым 1586 г., ледзь не скончылася трагічна. Пад каралеўскімі санямі праламаўся лёд. Цудам уратаваўся ад смерці. Крыкнуў прыдворным, каб ніхто не смеў рызыкаваць жыццём і ісці яму на дапамогу. Сам поўз па лёдзе да берага, каб той не зламаўся, пагружаючыся ў ледзяную ваду. Зноў зрабіў уражанне чалавека надзвычайнай моцы, спрытнасці, здароўя.

Дні з 25 лістапада па 7–8 снежня 1586 г. (паводле новага календара) былі на Гарадзеншчыне выключна марознымі, ветранымі, імглістымі, і нават мясцовыя жыхары гэта цяжка пераносілі. Але Баторыя непагадзь не пужала. Кожную раніцу, пасля сняданка, нягледзячы на забарону прыдворных лекараў, ён выязджаў на паляванне. Вяртаўся зацемна з закасцянелымі нагамі, прамарожаным целам і ледзь адаграваўся ля агню. 2 снежня выбраўся ў Кундзінскі лес – у 5-6 мілях ад Гародні – паляваць на дзікоў. 3 снежня выехаў туды ж на світанку і да прыцемкаў забіў да 20 дзікоў. Паляваў і ўвесь дзень 4 снежня.

З апошняга палявання кароль вярнуўся хворы, з ціскам у грудзях і прыступамі задышкі і на наступны дзень застаўся дома. Аднак у нядзелю, 7 снежня, пагрэбаваўшы перасцярогай медыка, зноў сеў на каня і паехаў у Фару Вітаўта на набажэнства. Не ведаў, што сядае на каня апошні раз. З 7 па

12 снежня – гэта ўжо была барацьба са смерцю. Баторый да канца захоўваў надзею на выздараўленне, але прырода аказалася мацнейшай за жалезную волю караля...

Апоўдні 7 снежня Баторый адчуў сябе дрэнна, адправіў прыдворных з пакоя і сеў за чарговае завяшчанне. Задышку і галаўны боль уціхамірваў віном. Заснуць не змог. Пайшоў у суседні пакой, дзе былі адчынены вокны. Хацеў ахаладзіцца, глытнуць свежага паветра. Але страціў прытомнасць, упаў і трохі параніўся – ударыўся аб лаву. На грукат прыбег прыдворны. Да ложка кароль вярнуўся сам. Казаць аб начным выпадку забараніў.

У аўторак, 9 снежня, пасля вячэры і змены павязак, Сімоній суцешыў манарха: "Будзь, ваша каралеўская міласць, спакойны, ніякай небяспекі няма". "Добра ведаю, што няма", – нецярпліва парываў кароль. Але тут жа аслупянеў, закаціў вочы, пачаў скрыгатаць зубамі. Абодва лекары і прыдворны Францішак Вясельны кінуліся прыводзіць яго ў прытомнасць: пырскалі на твар вадой, тузалі за валасы, нос і пальцы. Адкрыўшы вочы, Стэфан паглядзеў на іх са здзіўленнем. "Радзі Бога, што робіце?" – спытаўся, дыхаючы цяжка і глыбока.

Далей паміж прафесіяналамі не было аднадумства. Яны не маглі згадзіцца ні адносна дыягназу, ні ў метадах лячэння. Прыступы з сутаргамі і стратай прытомнасці, якія паўтараліся, адзін з іх прыпісваў астме, другі – эпілепсіі. Ссылаліся і на віно, якое пацыент пастаянна патрабаваў. Згадзіліся на лекі, якія не маглі пашкодзіць ніводнай з хвароб, – паставілі на плечы п'яўкі.

У перапынках паміж прыступамі кароль адчуваў сябе не блага. Стан яго здароўя медыкі павінны былі трымаць у тайне, і прысутныя ў Гародні сенатары не маглі падумаць нават, што манарх такі дрэнны, хоць і бачылі, што той слабее. 10 снежня ён прыняў кароннага падканцлера і пярэмышльскага біскупа. Назаўтра паклікаў да сябе літоўскага канцлера Астафея Валовіча разам з падканцлерам Львом Сапегам – саноўнікі пакінулі яго з упэўненасцю, што стан каралеўскага здароўя здавальняючы.

12 снежня медыкі заўважылі ў хворага змучаны выгляд і ліхаманкавы няроўны пульс, чаго раней не здаралася. Яго мучыла страшная смага – загадаў прынесці сабе віна. На ўцяшэнне медыкаў адказаў: "Ужо аддаўся ў рукі Бога, падрыхтаваны да смерці, не бярэ мяне яна; раз не гавару, гэта з-за таго, што мне гняце галаву і хацеў бы заснуць". Вырашыў назаўтра спавядацца і прыняць апошняе таінства.

Занепакоеныя прыдворныя, нягледзячы на каралеўскую забарону, паведамілі пра небяспеку абодвум канцлерам. Выкліканыя на крык сенатары прыбылі ў каралеўскія пакоі і пачалі выгаворваць прыдворным за ўтойванне праўды. Тыя не хацелі пусціць прыбыўшых далей, у спальню. А ў гэты час там ужо паміраў Стэфан Баторый. Заліты слязьмі Францішак Вясельны выйшаў да сенатараў і правёў іх да нежывога ўжо караля. Была шостая гадзіна вечара...

Назаўтра паведамленне пра смерць караля, нягледзячы на тое, што гэта ўтойвалі, хутка разышлося па Гародні. Яно зрабіла моцнае ўражанне. З усіх бакоў горада пачалі збягацца да каралеўскай рэзідэнцыі людзі, настойліва дапытваючыся пра праўдзівасць гэтай сумнай навіны.

У розныя канцы краіны пабеглі з Гародні кур'еры з данясеннем аб смерці: да Ганны Ягелонкі, кароннага канцлера і вялікага гетмана Яна Замойскага, да біскупаў і сенатараў. Сенатары, якія знаходзіліся на той час у Гародні, пісалі 13 снежня 1586 г. у Вільню, віленскаму ваяводзе і гетману літоўскаму Крыштафу Радзівілу пра тое, што Бог забраў свайго памазанніка. Не могучы без удзелу іншых сенатараў вырашыць найважнейшыя справы, яны прасілі іх як найхутчэй прыбыць да каралеўскага цела ці хаця б выказаць сваю думку адносна некаторых тэрміновых спраў: выплаты войску, што складалася з вялікай колькасці венграў, надворнаму войску, якога ў Гародні было каля 200 пешых. Венгры пасля смерці Баторыя засталіся як статак без пастыра. Яны пачалі патрабаваць жалаванне, каб хутчэй з'ехаць на радзіму.

Тым часам вестка аб смерці разнеслася па ўсёй Рэчы Паспалітай. Было шмат людзей, якія аддавалі справядлівасць Баторыю, разумелі памер панесенай страты і смуткавалі з

гэтай нагоды. Ян Замойскі, яго правая рука, пісаў, што ад здароўя манарха залежаў лёс Рэчы Паспалітай. Райнгольд Гейдэнштэйн пісаў: "Заслугі Стэфана Баторыя для Польшчы неацанімыя. Калі б не хуткая смерць, здзейсніліся бы намнога больш вялікія справы, якія ўжо ў думках падрыхтаваў". З'явіліся шматлікія "ляменты" і "льзы" (слёзы) на смерць караля. Але найбольш славілі караля езуіты, якія былі яму шмат чым абавязаны.

Не ўсіх аднак агарнулі смутак і жалоба. Пад канец панавання Баторый не быў любімым і ацэненым усёй шляхтай. Шмат для каго ён быў ненавісным. Незадаволеныя яго праўленнем, пакрыўджаныя цешыліся гэтай смерці. Карыстаючыся бескаралеўем, імкнуліся ўзнагародзіць свае крыўды – у ход пайшлі пасквілі, вершыкі і ўлёткі, якія ачарнялі гонар і славу нябожчыка.

Яшчэ большае ўражанне выклікала смерць Стэфана Баторыя за мяжой. У Рыме аплаквалі караля, бо з яго смерцю зноў гінула надзея на стварэнне антытурэцкай лігі. "Хрысціянская справа панесла вялікую страту", – пісаў папа да польскіх біскупаў. У адзін дзень Сікст выслаў з Рыму 17 лістоў у розныя бакі свету з інфармацыяй пра смутнае здарэнне. Удаве Стэфана ён паслаў Залатую Ружу – папскі сімвал з X ці нават VIII стагоддзя. Наколькі папулярным было імя Баторыя за мяжой, сведчыць перадрук пахавальнай прамовы каралеўскага сакратара Крыштафа Варшавіцкага ў шасці гарадах Заходняй Еўропы.

Затое цешыўся аўстрыйскі двор ды лікавала Масква: яна пазбавілася суперніка, які ў хуткім часе збіраўся прывесці яе да пагібелі. "Стэфан Баторый, – пісаў вядомы расійскі гісторык Мікалай Карамзін, – быў адным з найбольш знакамітых манархаў свету, адзін з самых небяспечных ворагаў Расіі, чыя смерць больш нас пацешыла, чым дзяржаве, у якой панаваў, смутку прынесла...".

Так адразу пасля смерці Баторыя адны палітыкі, пісьменнікі і гісторыкі адкрывалі дарогу залатой легендзе, другія – легендзе чорнай.

Хоць блізкае акружэнне караля і ведала пра яго хваробу, але вобраз уладара, моцнага і здаровага, у свядомасці

людзей яшчэ доўгі час не даваў многім паверыць у паведамленне аб яго смерці. Як пярун гэта вестка ўдарыла Рэч Паспалітую. Яго раптоўны адыход выклікаў найгоршыя чуткі. Маштабы намераў, энергічныя хады, якія далі яму больш ворагаў, чым прыяцеляў, адразу выклікалі плёткі аб яго атручванні. Успомнілі, што Баторый, хоць і не бярог здароўя, але баяўся атруты, у тым ліку з рук сваёй жонкі. Паўсюдна верылі ў гэту версію. Западозрывалі, што ён атручаны "сіламі пратэстанцкай Еўропы".

Толькі закрыў вочы Баторый, а ўжо над яшчэ непахаваным целам завязалася спрэчка аб прычынах смерці. Прыдворных лекараў абвінавачвалі не толькі ў нядбайным лячэнні, але нават у атручванні караля, нібыта па намове Збароўскіх. Западозрывалі ўсіх з блізкага акружэння нябожчыка. Вясельнага і наогул абвінавацілі ў тым, што не дапускаў прыдворных і сенатараў да каралеўскай асобы і што менавіта ён прычыніўся да смерці. Найбольш абвінавачвалі Сімонія, які, маўляў, сваёй лекарскай няздольнасцю загубіў манарха. Той хацеў выступіць на канвакацыйным сойме з апраўданнем, але яму не далі слова. Тады па парадзе літоўскага надворнага маршалка А.Радзівіла ён апублікаваў брашуру, у якой апісаў хваробу караля і яго апошнія хвіліны.

З трактоўкамі Сімонія не мог згадзіцца другі каралеўскі лекар, Мікола Бучэла, абвінавачаны ім ў няправільным лячэнні каранаванага пацыента. У сваю чаргу Бучэла ўсклаў усю віну на свайго калегу. Даўняя тайная ўзаемная непрыязнь, якая зыходзіла са спаборніцтва за ласкі і першынство ў манарха, знайшла цяпер шырокі выхад. Спрэчкі і падазрэнні пашыраліся. Для скідвання з сябе віны каралеўскай смерці медыкі не ашчаджалі адзін другога закідамі. Палеміка расцягнулася на 3 гады і вылілася на 1000 друкаваных старонак паперы. Так што апісанне хваробы Баторыя атрымалася вялікім, праўда, каламутным, і, хоць з'яўляецца важнай гістарычнай крыніцай, аднак на прычыну смерці святла не праліў.

Дзеля высвятлення ісціны, праз некалькі дзён пасля смерці, пасля адпаведных песень, заклінанняў і піцця віна, цела нябожчыка анатаміравалі. Прысутныя пры гэтым лека-

ры Якуб Гаслаўскі і Мікола Бучэла выявілі, што Баторый "меў ныркі надта вялікія, як валовыя". Але і пратакол ускрыцця не высветліў цалкам прычыну смерці, бо яно было зроблена хутчэй у мэтах бальзаміравання, чым у навуковых мэтах.

Скрозь стагоддзі дайшлі да нас тры версіі прычыны смерці Стэфана Баторыя: прыступ сэрца, атрута або ўрэмія. Дапускаюць і сіфіліс, што аднак для аднаго з найбольш сексуальна стрыманых уладароў Рэчы Паспалітай было бы горкай іроніяй лёсу і гісторыі. Паводле меркаванняў большасці медыкаў, і праз стагоддзі даследуючых праявы хваробы караля, гэтак жа адпадае і хвароба сэрца.

Ці смерць выклікана натуральнымі прычынамі, ці гэта забойства – адно з важнейшых пытанняў нашай гісторыі. Вось ўжо пятае стагоддзе трымаецца ўпартае падазрэнне, што кароль, апроч астатняга, быў атручаны. Ён памёр без споведзі і прычашчэння, бо не адчуваў сябе смяртэльна хворым. Яго згубіла не хвароба, але атрута, якую ён адчуў запозна і ўжо не меў часу падрыхтавацца да смерці па–хрысціянску. Усе сучаснікі Баторыя пішуць пра яго смерць як нечаканую, раптоўную.

Урач і гісторык-аматар Ц.Шэўрынг сабраў 13 прыкмет, якія сведчаць пра атручванне Баторыя па заказу магутных пратэстанцкіх колаў, што баяліся ўзмацнення каталіцызму пасля заваёвы ім Расіі. Дасягаючы сваёй палітычнай мэты, як сцвярджае даследчык, Баторый – хацеў ён таго ці не – натрапіў на барацьбу гігантаў. Спачатку меў зваду з Габсбургамі, якія карысталіся падтрымкай рымскага папы Грыгорыя XIII. Калі быў абраны каралём, яго галоўным праціўнікам стала Масква. Патэнцыйнай пагрозай для Рэчы Паспалітай была і Турцыя. Кароль Стэфан, на думку Шэўпынга, заплаціў жыццём за тое, што ўмацаваў свае пазіцыі ва ўнутранай палітыцы, а пазіцыі Рэчы Паспалітай – на міжнароднай арэне. Магутны ўладар, ініцыятар і арганізатар плана "праз Маскву на Царград", ён памёр напярэдадні ажыццяўлення вялікіх планаў, сярод ваеннай падрыхтоўкі, сярод разбуджаных самых смелых надзей. Польскія гісторыкі згаджа-

юцца, што гэта смерць была надта важнай падзеяй, ударам для народа. Калі б Баторыя не атруцілі, Рэч Паспалітая вырасла бы ў магутную дзяржаву і, напэўна, змагла бы ў наступных пакаленнях абараніцца перад паражэннем, якія на яе абрынуліся.

Так, Баторый меў шмат ворагаў, але прычынай яго заўчаснай смерці, хутчэй за ўсё, была ўрэмія. Ён не быў такім геркулесам, за якога сябе выдаваў. Умеў толькі сапраўды па–мужчынску пераносіць пакуты і таіць іх перад людзьмі. Ён сам неасцярожна прыспешваў смерць: мёрз і ператамляўся на паляваннях, лячыўся моцным напоем.

Вынікі анатаміравання, дакладна апісанага ў снежні 1586 г. і прааналізаванага кракаўскімі прафесарамі медыцыны ў 1934 г., не пакідаюць сумневу: ныркі. Яго арганізм не змог справіцца з атрутнымі і не выдзеляемымі прадуктамі абмену рэчываў. Баторыя забіла віно, моцнае венгерскае віно, ад якога, нягледзячы на перасцярогі прыдворных лекараў, ён так і не змог адрачыся. 51 бочка з венгерскім віном была знойдзена пасля смерці караля ў склепах гарадзенскага замку.

Цела Баторыя доўга спачывала ў Гародні, дзе ён завяшчаў сябе пахаваць. У Рэчы Паспалітай існаваў арыгінальны і не менш красамоўны звычай. Публічным коштам хавалі толькі тых манархаў, якіх шляхта прызнавала заслужанымі для краіны. Пахаванне іншых аплочвалі спадкаемцы з прыватнага скарбу роду. Стэфана пахавалі за публічны кошт. Пачаўся збор грошай на пабудову капліцы, якая была б дастойнай для вечнага захавання цела такога выдатнага манарха. Капліца Стэфана паўстала на Вавелі ў Кракаве.

23 мая 1588 г., у час каранацыйнага сойма Жыгімонта III, у Кракаве адбылося ўрачыстае перазахаванне астанкаў Баторыя. Паўтара гады чакання далі гісторыку-медыку Ц.Шэурынгу падставу сцвярджаць, што такім чынам – каб цела добра прагніло – хацелі схаваць сляды атруты.

Да 29 красавіка ў Гародню з'ехалася вялікая колькасць польскіх і ліцвінскіх сенатараў і ўраднікаў, прызначаных або запрошаных новым каралём на тую сумную ўрачыстасць. Наднёманскі люд развітваўся ў гэты дзень са сваім дастой-

ным жыхаром і апекуном. Пасля жалобнага набажэнства памясцілі труну на пахавальныя дрогі і прыкрылі аксамітным пакрывалам з срэбна-белым крыжом пасярэдзіне. Усе цэрквы жалобна білі ў званы. Працэсія рушыла праз мост на Нёмане з Гародні на стары тракт, які вёў да Варшавы.

Картэж адкрывала вялікая працэсія з духавенства ў белых комжах і беднякоў, апранутых у чорныя раздадзеныя ім накідкі, з запаленымі свечкамі ў руках. Потым на конях ехалі два харунжыя са сцягамі: каронным і літоўскім. За імі – рыцары, якія везлі зброю караля. Далей вялі яго каня, пакрытага чорным сукном з трызубным родавым гербам Баторыяў. Перад самым целам ехалі тры ваяводы, якія везлі карону і іншыя знакі каралеўскай годнасці. Далей – некалькі коней, накрытых пакрываламі з каралеўскімі гербамі, цягнулі катафалк. 12 прыбліжаных караля, аднолькава апранутых, ішлі з абодвух бакоў жалобнага возу, трымаючы ў адной руцэ аксаміт, які прыкрываў труну, у другой – запаленую свечку. Потым ішлі іншыя прыбліжаныя са свечкамі. Сенатары, шляхта, мяшчане замыкалі жалобны картэж.

Калі пахавальнае шэсце апынулася за горадам, усе, хто павінен быў прыняць удзел у пахавальнай цырымоніі ў Кракаве, селі на коней і павозкі і падаліся ў далёкую дарогу... Больш трох тыдняў працягвалася тое апошняе падарожжа Баторыя па зямлі беларускай і польскай. 3 дні потым доўжыліся пахавальныя ўрачыстасці ў Кракаве.

11 кароткіх, але інтэнсіўных гадоў панавання Баторыя моцна адбілася ў свядомасці народаў Рэчы Паспалітай, Венгрыі і ўсёй Еўропы. Яго палітыка паказала ліцвінска-польскай шляхце і Еўропе, на што здольная Рэч Паспалітая, хоць гэта была мяжа фінансавай і вайсковай магутнасці дзяржавы. Кароль стрымаў развіццё Расіі, зламаў яе растучую моц, што дазволіла ўтрымаць дзяржаўныя пазіцыі Рэчы Паспалітай і павялічыць яе бяспеку ў Еўропе.

З часам гэты кароль стаў сімвалам моцы Рэчы Паспалітай. Калі дзяржава пачала хіліцца да заняпаду, успамін аб энергічным манарху стаў для народа дарагім, а памяць пра яго паходы амаль святой. У XVIII ст. з'явілася легенда пра

астатняга караля–рэфарматара, які змог стварыць моцную дзяржаву і стрымаць яе ўнутраны распад.

"Стэфан Баторый перамог Івана Грознага: Памятай сваю гісторыю", – такі надпіс на гіганцкім плакаце, убачаны мной аднойчы ў цэнтры Варшавы, фарміруе гістарычную свядомасць сучаснага пакалення палякаў. А што ведаюць пра Баторыя сённяшнія беларусы?

### Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Besała, J. Stefan Batory. – Warszawa, 1992.
2. Grzybowski, S. Król i kanclerz. – Kraków, 1998.
3. Jankowski, T. Śmierć Stefana Batorego w Grodnie. – Grodno, 1930.
4. Jasienica, P. Ostatnia z rodu. – Warszawa, 1998.
5. Onesyfor Dziewoczka // Polski słownik biograficzny. – T.XXIV. – Wrocław-Warszawa-Kraków, 1979. – S.64-65.
6. Scheuring, Z., dr. medycyny. Czy królobójstwo? Krytyczne studium o śmierci króla Stefana Batorego. – Londyn, 1964.
7. 100 postaci, które miały największy wpływ na dzieje Polski / Konrad T. Naylor. – Londyn, 1996. – S.139-144.
8. Wielka Historia Polski. – T.4: Dzieje Polski i Litwy (1506–1648). – Krakow, 2000.
9. Ziembicki, W. Ostatnie łowy Batorego: W 350 rocznicę zgonu wielkiego króla (grudzień 1586 – grudzień 1936). – Lwów, 1937.

**Трусов Игорь Георгиевич,** *краевед*

# АРХИТЕКТОРЫ, КОТОРЫЕ РАБОТАЛИ В ГРОДНО В XVI ВЕКЕ

Среди архитектурных объектов Гродно, которые возникли в первой половине XVI века, наиболее известны такие, как городская ратуша на рыночной площади, костёл и шпиталь Святого Духа на улице Виленской (сейчас ул.Советская, 14), "Замковый двор". В специальной литературе никто пока не определил авторов архитектурных проектов этих объектов на основании архивных документов.

Здесь следует отметить, что ряд исследователей считает, что первая гродненская ратуша была деревянной. Так, во всяком случае, считал в 1985 году белорусский исследователь Ю.А.Якимович. Правда, в своей монографии 1991 года[1] он отказался от этой точки зрения. На основании многолетнего анализа гравюры Матеуса Цюндта, выполненной по рисункам Адельгаузера 1568 года,[2] автор пришёл к выводу, что первоначально – в самом начале XVI века и до конца 80-х годов этого века – гродненская ратуша была деревянной. Архитекторы и строители первой гродненской ратуши не установлены на основании архивных источников. Тем не менее можно предположить, что первую гродненскую деревянную ратушу строили скорее всего местные зодчие, которые к этому времени уже обладали огромным опытом. Ведь именно они возвели столетие тому назад "самый большой и красивый деревянный костёл в Великом княжестве Литовском", как писал в своем письме к провинциалу иезуитов Джиовани Паоло Кампано король Стефан Баторий[3].

По нашему мнению, как минимум до конца 80-х годов этого века гродненская ратуша была деревянной, хотя не исключено, что первый этаж и подвальные помещения были с самого начала каменными. Это вполне очевидно вытекает из архитектурного анализа изображения этого строения на гравюре Матеуса Цюндта по рисункам Адельгаузера 1568 года[4] и сравнения этого изображения с гравюрой Гродно 1600 года Томаша Маковского[5].



Ратуша на гравюре М.Цюндта по рисункам Адельгаузера 1568 года.

Чтобы завершить рассмотрение вопроса, связанного со зданием гродненской ратуши XVI века и возможными авторами его проекта, следует привести следующие соображения. Ни Е.Д.Квитницкая[6], ни Ю.А.Якимович в своей монографии,[7] ни Ю. Гордеев в своей статье[8] и монографии[9] не дают сравнительного архитектурного анализа изображений гродненской ратуши 1568 и 1600 годов.

В то же время на гравюре 1600 года изображено *совершенно иное здание* гродненской ратуши, с другим членением, меньшего объёма, другим расположением часовой башни. Это строение гораздо больше соответствует понятию каменное здание, чем изображенное на гравюре Цюндта/Адельгаузера.




Гродненская ратуша на гравюре Томаша Маковского 1600 года.

Здесь следует отметить, что и Адельгаузер и Маковский были очень точны в изображении деталей главных зданий города Гродно.

Кто же мог быть автором перестройки гродненской ратуши, как и когда это произошло? Во-первых, перестройка могла произойти только между 1568 и 1600 годами. Во-вторых, гродненский магистрат вряд ли бы нанял для работы дорогих итальянских архитекторов, как это делал король и магнаты. В-третьих, именно в этот период в Гродно работало несколько талантливых muratoris, то есть строителей из Восточной Пруссии, выполнявших и обязанности архитектора. Ими были: Фабиан Шорнштейн (Fabian Schornstein), Кристоф Ханнеманн (Christof Hannemann), Кристоф Аллер (Christof

Aller), Георг Шеллец (Georg Schellez), Конрад Н. (Konrad N)[10]. Все они сбежали в 1585 году из Пруссии в Гродно. Часть из них, очевидно, трудилась до 1586 года над возведением каменного костёла для короля Стефана Батория в Гродно. Например, Ф.Шорнштейн, К.Аллер и Г.Шеллец имели опыт возведения костела и арсенала в Мальборке[11]. Вряд ли до смерти короля Стефана Батория в декабре 1568 года они могли приступить к перестройке гродненской ратуши. Мы в своем исследовании по "Фаре Витовта" установили, что только после окончания строительства каменного костёла для Батория и отказа иезуитов от этого здания была разобрана и деревянная "Фара Витовта"[12]. Возможно, что с этой разборкой и вытекающей перепланировкой гродненского Рынка и было связано возведение новой каменной ратуши.

Другим объектом первой половины XVI века, "оставшимся без архитектора", является костёл и шпиталь Святого Духа по улице Виленской (сейчас – ул.Советская, 14), черты которого еще можно "прочитать" в здании администрации Ленинского района города Гродно. Е.Д.Квитницкая в 1962 году, основываясь на документе, опубликованном в "Teńe Wilenskiej"[13], приводит дату основания этого здания на 1553 год. Однако, этот документ и его рукописный оригинал[14] нельзя толковать однозначно. Позже, в своей статье "Малоизвестные зальные сооружения Белоруссии конца XV – начала XVI в."[15] Квитницкая всё же предположила, что костёл соответствует скорее архитектуре первой половины XVI в. Польский исследователь архитектуры доктор Ежи Лилейко из Варшавы полагает, что автора проекта гродненского костёла Св.Духа следует искать в кругу Яна Баптиста Четвертого (Jan Baptista Quadro)[16].

Ко времени правления Сигизмунта-Августа гродненский историк Юзеф Иодковский[17] относит строительство т.н. "Замкового двора", располагавшегося до 1944 года на месте современного Дворца культуры текстильщиков. В 1865 году его запечатлел на своей акварели Н.Орда.



"Замковый двор" на акварели Наполеона Орды.

Даже после перестройки в XVIII веке это здание сохраняло черты позднего Ренессанса. Доктор Ежи Лилейко полагал, что авторов проекта этого казённого здания (в нём была резиденция гродненского лантвойта) следует искать в кругу архитекторов ломбардско-венецианской школы, таких, как упомянутый выше Ян Баптист Четвертый (Jan Baptista Quadro) и Франческо Парио (Francesco Pario)[18]. Кстати, именно это здание, вслед за Ю.Иодковским, автор считает *настоящей* Баториевкой, то есть местом анатомического вскрытия тела короля Стефана Батория.

Наибольшее количество проблем с авторством возникло в XIX–XX веках с такими объектами как Старый Замок (перестройка в правление короля Стефана Батория) и т.н. "Фара Витовта" (каменный костёл, построенный Баторием для приглашенных в Гродно иезуитов).

После опубликования работ Ю.Иодковского, Ю.Войцеховского и В.Дурчевского[19] в специальной литературе вплоть до конца XX века автором проекта перестройки Старого замка для Батория считался архитектор Скотто из Пармы. Но ещё в 1969 году вышла книга А.Фишингера[20], в которой он привел весьма основательные аргументы в пользу того, что автором перестройки Старого замка в Гродно был итальянский архитектор Санкти Гуччи (Sanci (Xanti, Sankci) Gucci). Как, впрочем, автором проектов еще не менее трёх объектов в Гродно. Современные исследователи: доктор Ежи Лилейко из Варшавы, профессор ксёндз Ежи Пашенда из Кракова, научный руководитель проекта реставрации Старого замка минский архитектор Владимир Бачков и мы придерживаемся этой точки зрения. Авторские стилевые особенности маньеризма – позднего Ренессанса Санкти Гуччи хорошо видны на гравюре Томаша Маковского 1600 года.




Замок Батория на гравюре Томаша Маковского 1600 года.

Ниже мы приведём еще ряд аргументов в доказательство того, что автором перестройки Старого замка для Батория был Санкти Гуччи.

Не меньшее, если не большее, количество споров возникло и по поводу того, кто был автором законченного в 1587 году каменного костёла на Рынке в Гродно – т.н. "Фары Витовта". Наиболее горячая дискуссия по этому поводу развернулась в Варшаве в октябре 1989 года в кулуарах конференции "Художественная культура Великого княжества Литовского в эпохе барокко" между белорусской исследовательницей доктором Тамарой Габрусь, с одной стороны, и профессором ксендзом Ежи Пашендой и доктором Ежи Лилейко, с другой. Доктор Георгий Голенченко разыскал в 1984 году в отделе рукописей библиотеки АН Украины в Киеве папку с архивными архитектурными чертежами различных объектов Беларуси XVI – середины XVII, большая часть которых была составлена итальянским архитектором Джиованни Мария Бернардони (Giovanni Maria Bernardoni), которые позже проанализировал вместе с доктором Тамарой Габрусь. Среди них и обмерный чертёж плана каменного костёла в Гродно на Рынке, который, по их мнению, был проектным. Доктор Ежи Лилейко и профессор ксёндз Ежи Пашенда настаивали на том, что автором проекта каменного костёла на гродненском Рынке был Санкти Гуччи, и что чертёж Бернардони был обмерным, составленным по заданию иезуитов. Автор в 1990 году лично работал с указанными документами в Киеве и пришёл к выводу, что чертёж Бернардони является *обмерным,* и этот архитектор никакого отношения к строительству этого костёла не имеет. Об этом свидетельствуют и авторские черты, присущие Санкти Гуччи, а отнюдь не Джиованни Мария Бернардони, отражённые в изображении костёла на гравюре Томаша Маковского.

К творческому наследию Санкти Гуччи в Гродно А.Фишингер, а затем и доктор Е.Лилейко относили разрушенное в




Гродненский фарный костёл на гравюре Т.Маковского 1600 года.

1944 году дворовое каменное двухэтажное крыло здания на Советской площади, которое по традиции в Гродно называют "Баториевка". А.Фишингер до войны работал с его обмерами. Доктор Е.Лилейко[21] и вовсе предположительно приписал строительство всей "Баториевки" Санкти Гуччи. Автор много раз заявлял ему о своём частичном несогласии с этим. Ведь только архитектурные черты дворового крыла этого объекта, несомненно, несут на себе авторские черты этого архитектора.

Еще один объект – каменное здание главной Гродненской синагоги, построенное между 1576 и 1578 годами. Оно также до сих пор не получило в специальной литературе правильной датировки и привязки к автору первоначального проекта. В белорусской специальной литературе конца XX – начала XXI века оно по-прежнему числится как здание, постро-



Синагога на акварели Н. Орды 1867 года.

енное в конце XIX – начале XX века в стиле модерн. Но ещё в 1998 году в газетной статье[22] мы обратили внимание на тот факт, что это здание было построено в период правления Стефана Батория, и именно по проекту архитектора Санкти Гуччи. После пожара 1617 года синагога была перестроена в стиле барокко, какой её и запечатлел в 1867 году Н.Орда. После недавней реставрации главный зал гродненской синагоги является единственным в Гродно помещением, где в интерьере присутствуют ярко выраженные черты позднего Ренессанса – маньеризма, воплощенные в натуре архитектором Санкти Гуччи. Видный петербургский востоковед середины XIX века Михаил Гаркави (родом из Новогрудка) опубликовал в весьма редком издании "Восход" цикл статей о синагогах Северо-Западного края[23]. В одной из них он приводит надпись на мемориальной доске, которая находилась в главном зале гродненской синагоги, примерно такого содержания: "Все-

мирно известный гродненский раввин Иосиф Бен-Иоффе по прозвищу "Левуш" во время пребывания в Италии познакомился с архитектором по имени Санти Гуччи, пригласил его для постройки каменной синагоги в Гродно. Когда строительство было закончено, здание так понравилось королю Стефану, что он пригласил этого архитектора перестроить ему замок".

В специальной литературе начало строительства (закладку краеугольного камня) гродненского бернардинского костёла относят к 1602 году[24], а окончание строительства костёла к 1617 году. Это вступает в очевидное противоречие с такими фактами как стилевые особенности основного объема (это скорее поздняя готика) и тем, что костёл изображен на гравюре Томаша Маковского 1600 года как каменный.

То есть, совершенно очевидно, что гродненский бернардинский костёл был построен до 1600 года, а даты 1602 и 1617 относятся к закладке и окончанию строительства каменных монастырских корпусов. Кто был автором проекта постройки гродненского бернардинского костёла в конце XVI века, ещё предстоит установить.

В XVI веке дважды серьезно ремонтировалась Коложская церковь. Первый ремонт произошел, скорее всего, между 1500 и 1520 годами[25]. Здание храма тогда приобрело вид, отражённый на гравюре Цюндта по рисункам Адельгаузера. Автора проекта перестройки нам установить не удалось. Второй серьезный ремонт Коложи произошёл между 1591 и 1600 годами[26], когда храм получил позднеренессансный вид, отраженный на гравюре Томаша Маковского. Архитектора нам также не удалось установить, но мы считаем, что он происходит из круга архитекторов, работавших над созданием церквей в Супрасли и Мурованке (Маломожейковской).

Безусловно, дальнейшие исследования позволят сделать уточнения к изложенному выше материалу, введут в научный оборот новые имена.




Бернардинский костёл на гравюре Томаша Маковского 1600 года.

### Список использованных источников

1. Якимович, Ю.А. Зодчество Белоруссии XVI – середины XVII в. – Минск, 1991. – С.104.

2. Niewodniczański, T. GRODNO – BEMERKUNGEN ZUR PANORAMA – VEDUTE VON ADELHAUZER-ZÜNDT 1568. Lüneburger beiträge vedutenforschung. – Lüneburg, 1983. – P.103-130.

3. Трусаў, І.Г. Гісторыка-архіўныя і бібліяграфічныя даследаванні па аб'екце "Фара Вітаўта щ Гродне": рукапіс у складе праекта рэстаўрацыі. – Гродна, 1988. – С.4.

4. Niewodniczański, T. GRODNO – BEMERKUNGEN ZUR PANORAMA – VEDUTE VON ADELHAUZER-ZÜNDT 1568. Lüneburger beiträge vedutenforschung. – Lüneburg, 1983. – P.103-130.

5. Маковский, Т. Панорама Гродно 1600 года. Фотоархив Института Искусствоведения Польской Академии Наук в Варшаве.

6. Квитницкая Е.Д. Планировка Гродно в XVI-XVIII вв. // Архитектурное наследство. 1964. №17. С.25.

7. Якимович Ю.А. Зодчество Белоруссии XVI – средины XVII в. Минск, 1991. С.104.

8. Гардзееў, Ю. Гродна магдэбургскае. Сімвал горада. // Биржи информации. 1998. 12 марта.

9. Гардзееў, Ю. Магдэбургская Гародня. Гародня-Wrociaw. 2008.
10. Ehrenberg, H. Die Kunst am Hofe der Herzöge von Preussen. – Leipzig-Berlin, 1899. – Nr/617.
11. Łoza, S. Architekci i budowniczowie w Polsce. – Warszawa, 1954. – S.274.
12. Трусаў, І.Г. Гісторыка-архіўныя і бібліяграфічныя даследаванні па аб'екце "Фара Вітаўта у Гродне": рукапіс у складе праекта рэстаўрацыі. – Гродна, 1988. – С.12.
13. Квитницкая, Е.Д. Планировка Гродно в XVI-XVIII вв. // Архитектурное наследство. – 1964. – №17. – С.25.
14. Библиотека Вильнюсского университета. Отдел рукописей. A-2210.
15. Квитницкая, Е.Д. Малоизвестные зальные сооружения Белоруссии конца XV – начала XVI в. // Архитектурное наследство. – 1967. – №16. – С.5.
16. Информация получена в частной беседе в 1998 году.
17. Jodkowski, J. Grodno. – Wilno, MDCCCCXXIII.
18. Информация получена в частной беседе в 1998 году.
19. Sprawozdanie z prac ną Starym Zamku w Grodnie 1933-1937. – Grodno, 1938; Durczewski, W. Stary Zamek w Grodnie w świetle wykopalisk dokonanych w latach 1937-1938 // Niemen. – 1939. – Nr 1; Wojcechowski, J. Stary Zamek w Grodnie // Biuletyn Historii Sztuki. R.VII.
20. Fichinger, A. Santi Gucci architekt i rzeźbiarz królewski XVI wieku/ - Kraków, 1969.
21. Lilejko, J. Przebudowa grodzieńskich pałaców Batoriańskiego i Sapieżyńskiego na gmach sejmowy w 1717-1718 roku // Między Padwą a Zamościem. Studia z historii sztuki i kultury ofiarowane Profesorowi Jerzemu Kowalczykowowi. – Warszawa, 1993.
22. Трусаў, І.Г. ,Вуліца Вялікая Траецкая // Биржа информации. – 1998. – 18 июня.
23. Автору не удалось пока разыскать это издание, правда, в Варшаве в 1994 году в частной беседе с супругами Пехотко (Институт Искусствоведения АН Польши) нам любезно предоставили выписку из статьи с текстом мемориальной доски в зале гродненской главной синагоги.
24. Klasztory bernardyńskie w Polsce w jej granicach historycznych. Red. Hieronim Wyczawski // Kalwaria Zebrzydowska, 1985. – S.79.
25. Трусов, И.Г. Православные храмы Гродно. – Минск-Гродно, 2008. – С.57.
26. Там же. – С.58.

**Занеўскі Сяргей Віктаравіч,**
*магістр гістарычных навук*

# АСОБА МАРЦІНА ПАЧОБУТА-АДЛЯНІЦКАГА Ў ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ

Гэты чалавек зрабіў значны ўклад не толькі ў гісторыю беларускіх зямель, але і ўсёй сусветнай астранамічнай навукі. Вучоны з сусветным імем, дзеяч культуры і адукацыі Літвы і Беларусі, ролю якога цяжка пераацаніць, Марцін Пачобут-Адляніцкі нарадзіўся 19 (30) верасня 1728 года ў збяднелай шляхецкай сям'і крайчага Казіміра Пачобут-Адляніцкага ў вёсцы Саломенка, што ў 20 кіламетрах на поўдзень ад Гродна.

Сярод даследчыкаў няма адзінага пункту гледжання адносна часу, калі будучы прызнаны астраном зацікавіўся даследаваннем зорак. А.Цыхун, а за ім і А.Марціневіч сцвярджаюць, што "яшчэ з маленства гэтыя нябесныя свяцілы вабілі Марціна сваёй таямнічасцю" [8, с.55; 5, с.201]. Даследчыца дзейнасці на беларускіх землях езуітаў Т.Блінова ўказвае, што вялікую цікавасць да астраніміі Пачобут-Адляніцкі праявіў падчас працы ў Віленскай акадэміі ў 1753–1754 гг.: "Гэтаму новаму захапленню садзейнічаў прафесар матэматыкі і філасофіі, астраном Томаш Жэброўскі, які ахвотна падзяляўся сваімі ведамі ў вобласці дакладных навук з пытлівым юнаком" [1, с.6]. З апошняй версіяй згодны і даследчык В.Чаропка [9, с.329].

На працягу 1740–1743 гг. Марцін вучыўся ў Гродзенскім езуіцкім калегіуме (сучасная вуліца Савецкая, дом 6). Ужо тут праявіў ён свае выдатныя здольнасці да навук. Мабыць таму таленавіты юнак вырашыў працягнуць вучобу. У гэты час перад ім паўстала нялёгкая праблема выбару: шляхціцы яго ўзросту звычайна паступалі на вайсковую службу або займалі пасады чыноўнікаў. Пачобут-Адляніцкі, аднак, марыў аб іншым. Працягнуць займацца навукай і асветай магчыма было толькі пры адной умове – уступіць у ордэн езуі-

таў. Гэта азначала і іншае – назаўсёды адмовіцца ад свецкага жыцця. І вось 15 жніўня 1745 г. насуперак волі сваіх бацькоў Марцін уступае ў Таварыства Ісуса [13, с.429]. У далейшым, калі будучы знакаміты вучоны займаўся даследаваннем нябесных свяціл, кафрантацыя са сваімі братамі-манахамі, хаця яна і не будзе праяўляцца адкрыта, у значнай ступені абмяжоўвала яго дзейнасць. Тэалагічная адукацыя не дазваляла яму адкрыта выказваць свае меркаванні. Як адзначыў В.Чаропка, "афіцыйнае становішча і духоўны сан прымушалі яго глядзець на сусвет вачыма царквы" [9, с.339].

На працягу наступных двух гадоў пасля пасвячэння ў езуіты Марцін пражываў у Вільне, дзе адбываў навіцыят. Потым была вучоба ў Слуцкай педагагічнай семінарыі (1747–1748 гг.), Полацкім езуіцкім калегіуме (1749–1752 гг.), дзе ён сумяшчаў заняткі па граматыцы і тэалогіі з наведваннем лекцый па філасофіі. Юнак вельмі зацікавіўся вывучэннем грэчаскай мовы, у якой меў вялікія поспехі, – у далейшым ён валодаў ёй таксама свабодна, як, напрыклад, лацінскай ці польскай. Сваімі незвычайнымі здольнасцямі ён звярнуў на сябе ўвагу кіраўніцтва правінцыі. Яны ацанілі яго заслугі і накіравалі Марціна працягваць вучобу ў Віленскай езуіцкай акадэміі. Менавіта тут няспыннага юнака зацікавіла новая навука пра зоркі.

Але ладзіў Марцін не толькі з навукай, шанцавала яму і з людзьмі, якія бачылі ў ім вялікі талент. Так вядомы мецэнат навук і канцлер ВКЛ Міхал Фрэдэрык Чартарыйскі прапанаваў юнаку стыпендыю на вучобу ў замежным Пражскім універсітэце, а ў 1753 г. Альжбета Агінская з Пузыняў [2, с.112] дала грошы на адкрыццё абсерваторыі [9, с.329; 12, с.327–339].

Марціну не сядзелася на месцы. Не паспеў ён вярнуцца на Радзіму ў 1756 г., як зноў накіраваўся за мяжу. Мара пра даследаванне зорак ахапіла яго цалкам, але прафесійных астраномаў у Вільні не было, бо навука гэтая ў Вялікім Княстве Літоўскім была тады зусім новая, невядомая. Астранамічную практыку Марцін Пачобут-Адляніцкі праходзіў у абсерваторыях Марселя, Авін'ёна і Неапаля. Вынікі яго першых

астранамічных назіранняў былі часткова надрукаваны ў 1763 г. французскім астраномам Э.Пілянам у кнізе "Мірны дагавор паміж Дэкартам і Ньютонам". Езуіты заўсёды лічыліся самым передавым манаскім ордэнам, які заўжды крочыў у ногу з часам. Таму не дзіва, што яны "жадалі мець у Літоўскай правінцыі добра адукаванага астранома" [1, с.6] і ў значнай ступені не перашкаджалі яго астранамічным назіранням. Нават пасля таго, як у 1760 г. Пачобут-Адляніцкі стаў святаром, а 27 студзеня 1761 г. – доктарам тэалогіі, ён не збіраўся адмаўляцца ад сваёй любімай справы.

Пасля вяртання ў Вільню ў 1764 г. Марцін атрымаў тытул магістра філасофіі і вольных навук. Акрамя таго, ён стаў арганізатарам і першым дырэктарам (на працягу 1765–1807 гг.) Віленскай астранамічнай абсерваторыі. З восені таго ж года Пачобут-Адляніцкі выкладаў матэматыку і астраномію ў Віленскай езуіцкай акадэміі, якую ў 1780 г. рэарганізаваў у Галоўную школу Вялікага княства Літоўскага і з'яўляўся да 1803 г. яе нязменным рэктарам.

Пад яго кіраўніцтвам у астранамічнай абсерваторыі на працягу больш як 30 гадоў вяліся даследаванні ў галіне астранамічнай навукі і практыкі, у тым ліку назіранні за зоркамі і планетамі Сонечнай сістэмы. Пачобут-Адляніцкі стаў заснавальнікам навуковай школы, у якую ўваходзілі аб'яднаныя вакол Віленскай абсерваторыі вучоныя-астраномы Я.Снядэцкі, А.Стжэцкі, М.Глушневіч, П.Смыслоў, В.Карчэўскі і інш. Прадстаўнікі гэтай школы прызнавалі аб'ектыўнасць навакольнага свету і магчымасць яго ўсебаковага вывучэння і пазнання. Вялікае значэнне яны надавалі эмпірычным і рацыянальным метадам даследавання, лічылі асвету і авалоданне ведамі асноўнымі сродкамі прагрэсу чалавецтва. Пачобут-Адляніцкі выказваўся за неабходнасць далейшага пранікнення ў таямніцы Сусвету, якія могуць быць раскрыты аб'яднанымі намаганнямі многіх людзей. Ён падтрымліваў ідэю існавання мноства сусветаў, падзяляючы гіпотэзу аб іх планетарнай будове. Зыходзячы з прызнання руху як неад'емнай уласнасці Сусвету, вучоны імкнуўся выявіць і прааналізаваць фізічную прыроду рэальных працэсаў, ператварыць кож-

ную прызнаную гіпотэзу ў стройную тэорыю, закон. Ён падкрэсліваў, што новая ідэя ці гіпотэза павінна быць пацверджана практыкай, а для ўстанаўлення сапраўднай прычыны руху Сонечнай сістэмы адносна іншых сусветаў патрэбны сістэматычныя і працяглыя назіранні. Нягледзячы на адсутнасць у яго працах канкрэтных выказванняў наконт вучэння М.Каперніка, Пачобут-Адляніцкі фактычна лічыў правільнай распрацаваную ім геліяцэнтрычную сістэму будовы Сусвету.

Як выглядала на пачатку XIX стагодзя Віленская абсерваторыя можна уявіць па запісам В.М.Севергіна, які падарожнічаў у той час па Беларусі і пабываў, у тым ліку, і ў сталіцы былога Вялікага княства. "Астрономическая обсерватория отличается первая между заведениями сего училища. Она состоит из двух отделений, из коих одно есть пространная зала, где находятся некоторые астрономические орудия и небольшая библиотека, до сего предмета касающаяся. Другое отделение есть круглая довольно пространная башня со всех сторон, даже в самом куполе с отверстиями, кои запираются тонкими ставнями из листового железа сделанными. Сии ставни учреждены так, что сам наблюдатель без помощи другого каждой ставень удобно отворять и запирать может. Сверх того верхняя часть башни подвижна и может обращаться кругом. В сей башне, кроме других астрономических орудий, повешен также большой квадрант на белой цельной мраморной стене почти в аршин шириною, и твердо укрепленной. Сия стена состоит в середине башни так, что кругом ее ходить можно. Обсерватория сия имела бы великие удобства, если бы ей не застила к югу другая башня сего монастыря. Престарелый Почобут, почтенный знаниями и трудолюбием астроном с сожалением упоминал о сем обстоятельстве" [7, с.50–51] (глядзі дадатак 3).

Вынікі даследаванняў, якія праводзіліся ў Віленскай абсерваторыі на працягу 1772–1806 гг., адлюстроўваліся ў спецыяльных рукапісных журналах назіранняў, якія склалі ў выніку 34 тамы. Гэта сведчыць аб вялізнай працаздольнасці Марціна Пачобут-Адляніцкага, яго адданасці выбранай спра-

ве. Штодзённа ў гэтых журналах ён і яго памочнікі фіксавалі становішча планет Сонечнай сістэмы, Месяца, удакладнялі элементы руху нябесных цел, становішча сузор'яў, аналізавалі даныя комплексных даследаванняў многіх праблем (напрыклад, адначасовае вызначэнне розныміназіральнікамі каардынат Вільні, Гродна, Кракава). Створаныя выдатным астраномам "Журналы назіранняў" старанна захоўвалі яго паслядоўнікі: Я.Снядэцкі, М.Глушневіч і інш. У 1832 г., пасля закрыцця Віленскага ўніверсітэта, запісы назіранняў былі вывезены ў Пецярбург у Пулкаўскую астранамічную абсерваторыю. Адтуль у 1941 г. яны былі перададзены ў архіў Акадэміі навук СССР. У тым жа будынку іх можна знайсці і зараз [8, с.56].

Пасля наведвання ў 1768–1769 гг. абсерваторый Англіі, Даніі, Германіі, Галандыі і Францыі Пачобут-Адляніцкі арганізаваў даследаванні сонечных плям, спрабаваў вызначыць дакладную адлегласць ад Зямлі і Сонца, выкарыстаўшы пры гэтым надзвычай рэдкую з'яву, – праходжанне Венеры паўз Сонца (на жаль, гэтаму перашкодзіла дрэннае надвор'е). Ён вёў назіранні сонечных і месячных зацьменняў, даследаваў перамяшчэнне камет, вывучаў зацьменні кольцаў Сатурна і спадарожнікаў іншых планет, значную ўвагу надаваў вывучэнню сузор'яў Быка і Скарпіёна, а таксама астэроідаў, працягваў працу па вызначэнні і ўдакладненні геаграфічных каардынат розных мясцін. 14 (24) лютага 1766 г. Марцін правёў даследаванне Месяца, вынікам чаго стала яго невялічкая, на чатырнаццаць старонак, праца (глядзі дадатак 2) [15]. Імем нашага земляка нават названы адзін з кратэраў на зваротным баку Месяца. У час тых жа даследаванняў Марцін устанавіў дакладныя геаграфічныя каардынаты Вільні, вылічыў геаграфічную даўгату, на якой ляжыць Гродна, а таксама ўдакладніў даўгату Вільні. Паводле літоўскага даследчыка А.Бумблаускаса, 5 жніўня 1793 г., падчас праходжання ў Гродна апошняга сойма Рэчы Паспалітай, кароль польскі Станіслаў Аўгуст накіраваўся разам з Пачобутам-Адляніцкім і расійскім паслом Я.Сіверсам у размешчаны непадалёк Аўгустаў назіраць сонечнае зацьменне. Падчас яго геаграфічныя

каардынаты Вільні былі яшчэ больш удакладнены, а таксама былі ўстаноўлены каардынаты Гродна [11, с.416]. У 1770 г. Каралеўская акадэмія навук у Лондане абрала Пачобут-Адляніцкага сваім ганаровым членам, прызнаючы тым самым яго вялікія дасягненні [4]. Але ўсё толькі пачыналася. Далейшыя адкрыцці, якія праводзіліся Віленскай астранамічнай абсерваторыяй, адбываліся ўжо з дапамогай буйнай калекцыі абсталявання, выпісанай з Англіі [1, с.7].

Найбольшы вынік далі спробы Марціна вызначыць размяшчэнне Меркурыя. Яно было ўстаноўлена вельмі дакладна, і гэта паслужыла вядомаму французскаму астраному Ж.Ж. Лаландэ матэрыялам для складання новых астранамічных табліц [6, с.271–274]. Дарэчы, Жозэф Жэром дэ Лаландэ з'яўляўся вялікім сябрам Пачобут-Адляніцкага на працягу ўсяго астатняга свайго жыцця. У калекцыі манускрыптаў Вільнюскай універсітэцкай бібліятэкі захоўваецца ліст вядомага французскага астранома да свайго сябра (глядзі дадатак 4), датаваны 25 жніўня 1789 г. з нагоды завяршэння будаўніцтва ў Вільні новай астранамічнай абсерваторыі (які дагэтуль яшчэ не друкаваўся).

Пра навуковую каштоўнасць даследаванняў Астранамічнай школы, якую ўзначальваў ужо сусветна вядомы астраном з Гродзеншчыны, французскі вучоны напісаў у сваёй кнізе "Астранамічная бібліяграфія разам з гісторыяй астраноміі ад 1781 да 1802". У прыватнасці, адзначыў адкрыццё Пачобут-Адляніцкім новага сузор'я – Цяльца Панятоўскіх. 9 жніўня 1773 г. кіраўнік Віленскай абсерваторыі разам са сваімі вучнямі Ю.Міцкевічам і А.Стжэцкім зафіксавалі адкрыццё новых 16 зорак. Паведамляючы пра дзесятак новых, "дастаткова прыгожых зорак", яны пісалі ў сваім "Журналеназіранняў": "Шчыт Сабескага, які ззяе побач з іншымі зоркамі, абуджае ў нас жаданне па прыкладзе вялікага польскага астранома аддаць належнае славе нашага гасудара" (адсюль і назва першай зоркі новага сузор'я – Цялец Каралеўскі) [16]. У 1777 г. гэтыя новыя зоркі былі аб'яднаны ў адно сузор'е – Цялец Панятоўскага. На атласе Іагана Бадэ дадзенае сузор'е размяшчалася паміж Змеяносцам і Арлом, улічваючы V-падоб-

ную групу зорак [3]. Марцін знаходзіў іх падобнымі на астэрызм Гіады ў Цяльцы, што дало повад да з'яўлення на небе другога Цяльца [18]. Між тым сузор'е Цялец Панятоўскага ў астранамічнай навуцы прынята не было. Адкрыццё Пачобут-Адляніцкім і яго аднадумцамі раней невядомых зорак было зацверджана Парыжскай акадэміяй навук і ў 1778 г. уключана ў вядомы каталог Фламстэда. Менавіта гэта падзея садзейнічала таму, што ў тым жа годзе Марцін Пачобут-Адляніцкі быў абраны членам-карэспандэнтам Французскай акадэміі навук.

Да значнай падзеі ў галіне маладой астранамічнай навукі Беларусі і Літвы, несумненна, адносілася і даследаванне 3 верасня 1793 г. сонечнага зацьмення, якое праводзілася аднačасова ў некалькіх пунктах зямнога шара, у тым ліку ў Вільні, Гродне, Варшаве і Кракаве. Марцін Пачобут-Адляніцкі рабіў адпаведныя падлікі разам са сваім любімым вучням Янам Снядэцкім. Вынікам гэтай працы стаў матэрыял пад назвай "Падлік гродзенскіх назіранняў зацьмення Сонца, які праводзіўся Пачобутам і Снядэцкім 3 верасня 1793 г.". Акрамя таго, ён напісаў шэраг спецыяльных прац, у якіх тлумачыў сонечныя зацьменні, рух планет [17], расказваў пра выкарыстанне матэматычных метадаў у астраноміі [14], шмат увагі надаваў практычнаму выкарыстанню дасягненняў навукі. Акрамя таго Пачобут-Адляніцкі займаўся картаграфіяй, геадэзіяй і інш. навукамі.

Прыкметны ўклад зрабіў Пачобут-Адляніцкі ў развіццё асветы ў родным краі, у папулярызацыю астранамічных і матэматычных ведаў. Як рэктар Віленскага універсітэта ён прымаў удзел у дзейнасці Адукацыйнай камісіі ў Беларусі і Літве, у ажыццяўленні мер па ўдасканаленні навучальнага працэсу і выхавання навучэнцаў, дамогся перамогі над прыхільнікамі рэарганізацыі Віленскага універсітэта ў народны ліцэй (з прычыны доўгай адсутнасці медыцынскага факультэта і нявялікіх кафедраў), арганізаваў ва універсітэце 2 аддзяленні – фізічнае (з факультэтамі матэматыкі, фізікі і медыцыны) і маральнае (з факультэтамі логікі і права), адкрыў 4-

гадовую школу падрыхтоўкі настаўнікаў. У 1773 г. Марцін Пачобут-Адляніцкі распрацаваў праект заснавання ў Вільні спецыяльнага Таварыства (накшталт акадэміі навук), які прадугледжваў развіццё як фундаментальных тэарэтычных канцэпцый так і канкрэтных ведаў у галіне геаметрыі, механікі, земляробства, анатоміі і інш. навук. У мэтах пашырэння навуковых ведаў сярод насельніцтва і больш эфектыўнага кантролю за выдавецкай дзейнасцю ён узначальваў універсітэцкую друкарню, якая ў 1775 г. была набыта падскарбіем надворным літоўскім, кнігавыдаўцом Антоніем Тызенгаўзам. Па прапанове Марціна на выкладчыцкую працу былі запрошаны вядомыя вучоныя Жан Жылібер, І.Страйноўскі, П.Галанскі, І.Багуслаўскі і інш. Менавіта з назначэннем у 1780 г. М.Пачобут-Адляніцкага на пасаду рэктара Галоўнай школы пачынаюцца яе значныя поспехі, Галоўная школа "ў самы кароткі час здабыла агульную павагу і давер грамадзян і заняла высокае месца ў шэрагу вышэйшых установ у Еўропе" [2, с.111].

Навуковая дзейнасць Марціна Пачобута-Адляніцкага была высока адзначана як у нашай краіне, так і за яе межамі. Апрача ўжо згаданых званняў ганаровага члена Каралеўскай акадэміі навук у Лондане і члена-карэспандэнта Французскай акадэміі навук таленавіты астраном з Гродзеншчыны ў 1800 г. стаў адным з першых членаў Варшаўскага таварыства аматараў навук. Двойчы ўзнагароджваў яго сам польскі кароль і вялікі князь літоўскі Станістлаў Аўгуст Панятоўскі: у 1785 г. – ордэнам Святога Станіслава, а праз восем год – ордэнам Белага Арла [1, с.8; 10, с.418-419].

Між тым, з цягам часу сілы ўжо немаладога даследчыка слабелі. У 1807 г. 78-гадовы вучоны-астраном з сусветным імем вымушаны быў пакінуць працу свайго жыцця. Кіраўніцтва абсерваторыяй ён перадаў Яну Снядэцкаму, а сам тайна пераехаў у Дынабург у езуіцкі кляштар, дзе правёў астатак свайго жыцця. Памёр Марцін Пачобут-Адляніцкі 8 лютага 1810 г.

## Літаратура:


1. Блинова, Т.Б. Выпускники иезуитских школ в Беларуси – известные деятели науки и культуры (1740–1773 гг.) / Т.Б.Блинова // Веснік ГрДУ. – 2003. – №3.

2. Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. – Т.3: Литовское и Белорусское Полесье. – Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 1994 (Репринтное воспроизведение издания 1882 года).

3. История созвездий [Электронны рэсурс]: www.astromyth.narod.ru/Additional/History.htm

4. Лазовский, Д. Путём Скорины и Симеона Полоцкого / Д.Лазовский // Родина. – 2007. – №7.

5. Марціновіч, А. Хто мы, адкуль мы: гістарычныя нарысы / А.Марціновіч. – Мн.: Полымя, 1996.

6. Рыбко, М.Я. Пачобут-Адляніцкі Марцін // Мысліцелі і асветнікі Беларусі. – Мн., 2001.

7. Севергин, В.М. Записки путешествия по Западным провинциям Российского государства / В.М. Севергин. – СПб., 1803.

8. Цыхун, А.П. Ураджэнец Гродзеншчыны Марцін Пачобут–Адляніцкі – адзін з заснавальнікаў медычнага факультэта ў Вільні // Дзеячы аховы здароўя і медыцынскай навукі Беларусі і Літвы на пераломе XVIII–XIX ст.: матэрыялы міжнар. навук.–практ. канф. – Гродна-Белавічы, 1992.

9. Чаропка, В. Лёсы ў гісторыі / В.Чаропка. – Мн.: Беларусь, 2005.

10. Bohush, M.X. Życie literackie Ks.Marcina Poczobuta / M.X.Bohush // Roczniki Towarzystwa Królewskiego Warszawskiego Przyjaciół Nauk. – Warszawa: W drukarni Księży Pijarów, 1812.

11. Bumblauskas, A. Senosios Lietuvos istorija. 1009–1795 / A.Bumblauskas. – Vilnius: R.Paknio leidykla, 2005.

12. Popłatek, J. Komisja Edukacji Narodowej. Udział byłych jezuitów w pracach Komisji Edukacji Narodowej / J.Popłatek. – Kraków: Wydawnictwo Apostolstwa Modlitwy, 1973.

13. Śniadecki, J. Żywot uczony i publiczny Marcina Odlanickiego Poczobuta / J.Śniadecki. – Wilno, 1810.


## Даследванні Марціна Пачобут-Адляніцкага:


14. Początki geometryi, dzieło Clairaut, przekład z francuskiego. – Wilno, 1772.

15. Calculus eclipseos lunaris, quae accidit die 14 Febr. 1766 pro observatorio Academiae Vilnensis. – Wilno, 1766.

16. Cahier des observations astronomiques faites a l'Observatoire royale de Vilno en 1773. – Wilno, 1777.

17. Î dawności Zodyjaku Egipskiego w Denderach. – Wilno, 1803.

18. Observations ad determinandam Positionen 16 stellarum, e quibus constellalio Viteli Poniatoviani formatur. – Wilno, 1785.

Дадатак 1.



Ю.Аляшкевіч. Партрэт Марціна Пачобута-Адляніцкага (Пачатак XIX ст.)



CALCULUS
ECLIPSEOS LUNARIS,
Quæ Accidet die 24. Februarii 1766.
Pro Observatorio Academico Vilnensi
Societatis JESU,
INSTITUTUS.

Першая старонка даследавання М.Пачобута-Адляніцкага аб зацьменнях Месяца: "Calculus eclipseos lunaris, quae accidit die 14 Febr. 1766 pro observatorio Academiae Vilnensis" (Wilno, 1766) захоўваецца ў гістарычнай калекцыі кніг XVI–XVIII стагоддзяў Бібліятэкі Вільнюскага універсітэта.



Астранамічная абсерваторыя ў Вільні. Выгляд сярэдзіны XIX ст.

Дадатак 4.



Віншавальны ліст ад французскага астранома Жозэфа Жэрома дэ Лаландэ да Марціна Пачобута-Адляніцкага з нагоды будаўніцтва новай абсерваторыі Віленскага універсітэта. Адпраўлены з Парыжа 25 жніўня 1789 г. Мова – французская. Памеры – 15,5 x 10 см. Друкуецца ўпершыню. Захоўваецца ў калекцыі манускрыптаў Вільнюскай універсітэцкай бібліятэкі.

**Кітурка Ірына Фёдараўна,** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы"*

# АНТОНІЙ ТЫЗЕНГАЎЗ У СПРАВЕ МАДЭРНІЗАЦЫІ ГАРАДЗЕНСКАЙ СТАЛОВАЙ ЭКАНОМІІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XVIII СТ.)

Наўрад ці ў гісторыі ВКЛ другой паловы XVIII ст. ёсць яшчэ адна такая асоба, як Антоній Тызенгаўз, якая б пры жыцці мела столькі прыхільнікаў і праціўнікаў, столькі сяброў і ворагаў, якая б за кароткі час зрабіла такую галавакружную кар'еру, палітычны крах якой выклікаў бы такі рэзананс у краіне, а даследчыкі яе дзейнасці падзяліліся на два супрацьлеглыя лагеры: адныя лічылі яго "геніям, якога нарадзілі літоўскія пушчы" [1, с.149], а другія апісвалі яго дзейнасць з мэтай, "каб прыкладу з гэтай асобы ніхто і ніколі не браў" [2, с.227].

Так ці інакш, неардынарнасць асобы А.Тызенгаўза была прызнана як яго сучаснікамі, так і яго нашчадкамі. На тэрыторыі ВКЛ з 1765 па 1780 гг. менавіта ў руках яго была засяроджана асноўная палітычная ўлада (ён з'яўляўся кіраўніком раялісцкай партыі і даверанай асобай караля), а таксама фінансы Княства, паколькі А.Тызенгаўз займаў пасаду надворнага падскарбія ВКЛ. Але ён не проста выконваў свае непасрэдныя функцыі, ускладзеныя на яго каралеўскай уладай. У гісторыю ВКЛ А.Тызенгаўз увайшоў як адзін з найбольш вядомых рэфарматараў эканамічнага і культурнага жыцця.

Сапраўды, цяжка вызначыць тую галіну жыцця ВКЛ у другой палове XVIII ст., якую абыйшоў бы сваёй увагай "геній" А.Тызенгаўза. Але, безумоўна, галоўным накірункам яго дзейнасці, пераўтварэннямі, ад якіх станоўчых вынікаў чакаў сам кароль, былі эканамічныя рэформы.

Абранне ў 1764 г. польскім каралём і вялікім князем літоўскім стаўленіка "Фаміліі" (магнацкай групоўкі, якую ўзначальвалі Чартарыйскія) Станіслава Панятоўскага дало Рэчы Паспалітай шанец стаць на шлях эканамічных, палітычных і культурных рэформ, неабходнасць якіх была прадыктавана як рэальнай сітуацыяй ў краіне, так і патрабаваннем часу з яго новай ідэалогіяй Асветніцтва.

Папярэдні другой палове XVIII ст. стогадовы перыяд у гісторыі ВКЛ слушна атрымаў назву "разбуральнага стагоддзя", што напрамую было звязана з войнамі сярэдзіны – другой паловы XVII і пачатку XVIII ст. (казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг., вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг., Паўночная вайна 1700–1721 гг.). Адносна гаспадарчага развіцця ВКЛ гэты перыяд можна назваць нават "страчаным стагоддзем", бо ў той час, калі ў Еўропе актыўна развівалася эканоміка, перш за ўсё мануфактурная вытворчасць, то гаспадарка Вялікага Княства фактычна не развівалася, а двойчы выключна аднаўлялася пасля ваенных разбурэнняў.

Другая палова XVIII ст. стала падыходзячым часам для рэфармавання: эканамічны падмурак, закладзены ў час гаспадарчага аднаўлення першай паловы XVIII ст., быў падмацаваны эканамічнымі тэорыямі перыяду Асветніцтва. Сярод прыярытэтаў Асветніцтва важнае месца займала рацыянальная эканоміка, заснаваная на ідэі эканамічнага прагрэсу.

У еўрапейскай эканамічнай думцы XVIII ст. панавалі дзве асноўныя тэорыі:

1) меркантылізм, які прапаведаваў культ прамысловасці і рыначнай экспансіі і даказваў, што дзяржаўная палітыка павінна арганізоўваць эканамічны лад і падтрымліваць індывідуальную гаспадарчую дзейнасць [3, с.83];

2) школа фізіякратаў, згодна з ідэямі якой "чысты прадукт" (прыбавачная вартасць) ствараецца толькі сельскагаспадарчай працай і знаходзіцца ў сферы сельскагаспадарчай вытворчасці [4, с.433].

У сувязі з гэтым, асноўныя эканамічныя рэформы ў Еўропе XVIII ст. заключаліся ў працэсе ўдасканалення сельскай гаспадаркі, у стварэнні дзяржаўных мануфактур і паляпшэнні гандлю.

У Рэчы Паспалітай для ўмацавання каралеўскай улады важным было памяншэнне яе фінансавай залежнасці ад сойма. Дасягнуць гэтага можна было, у першую чаргу, за кошт павелічэння прыбытковасці каралеўскіх сталовых эканомій – вялікіх дзяржаўных уладанняў, даход з якіх ішоў непасрэдна на ўтрыманне кіраўніка дзяржавы. У ВКЛ генератарам ідэй па рэфармаванню сталовых эканомій як раз і стаў А.Тызенгаўз.

Спецыяльным распараджэннем ад 8 сакавіка 1765 г. кароль прызначыў А. Тызенгаўза генеральным адміністратарам сталовых эканомій, даў яму шырокія паўнамоцтвы з дазволам рабіць усё для павелічэння прыбыткаў з гэтых уладанняў [5], і А. Тызенгаўз актыўна ўключыўся ў справу мадэрнізацыі каралеўскіх эканомій у ВКЛ.

Значэнне тэрміну "мадэрнізацыя" было распрацавана, у першую чаргу, у такіх навуках, як сацыялогія і культурная антрапалогія, дзе мадэрнізацыя набыла форму тэорыі. Гэтая тэорыя стала метадалагічнай падставай даследавання тых грамадстваў, якія знаходзяцца ў стадыі трансфармацыі, змяняюцца і прыстасоўваюцца да новых умоваў жыцця [6, с.5]. У падручніках па сацыялогіі адзначаецца, што паняцце мадэрнізацыі як правіла выкарыстоўваецца ў двух сэнсах: папершае, яно азначае працэс пераўтварэння традыцыйнага грамадства ў грамадства індустрыяльнае; па-другое, яно ўказвае на памкненні слабаразвітых краінаў дагнаць больш развітыя дзяржавы [7, с.399].

Сапраўды, у шырокім разуменні тэрмін "мадэрнізацыя" падразумявае значна большае, чым толькі эканамічнае развіццё. Ён азначае эвалюцыю ўсяго грамадства – палітычных, эканамічных, культурных, сацыяльных адносінаў. Аднак у рамках даіндустрыяльнага грамадства гэты тэрмін азначае інавацыйны працэс на аснове традыцыі, устойлівай асновы грамадства. У першую чаргу, гэта развіццё рынкавых адносінаў у сельскай гаспадарцы ў спалучэнні з элементамі гандлёвага капіталізму [8, с.5]. Часам такіх пераўтварэнняў у ВКЛ стала менавіта другая палова XVIII ст.

Эканамічныя пераўтварэнні, якія меў на мэце ажыццявіць А.Тызенгаўз, складаліся з трох арганічна звязаных паміж сабой частак: 1) аднаўленне ў эканоміях фальваркаў з паляпшэннем апрацоўкі зямлі і выкарыстаннем тагачаснай заходнееўрапейскай тэхнікі; 2) арганізацыя мануфактур, заснаваных на бясплатнай працы каралеўскіх сялян; 3) стварэнне разгалінаванай сістэмы шляхоў зносін для стымулявання ў краіне гандлю [9, с.22-23].

У адпаведнасці з аграрнай рэформай, якая пачалася ў сталовых эканоміях у 1765 г., у вёсках аднаўлялася фальваркавая сістэма з адпрацоўкай паншчыны па 2 дні ў тыдзень з асноўнага надзелу (асноўны надзел у адпаведнасці з рэформай быў вызначаны ў памеры ? часткі валокі), што было ў 4 разы вышэй, чым у час правядзення валочнай памеры сярэдзіны XVI ст., калі паншчына вызначалася ў памеры двух дзён у тыдзень з адной валокі. Пад фальваркавае ворыва забіралася і частка зямель, якія належалі гарадам і мястэчкам, а іх насельніцтва таксама павінна было адпрацоўваць паншчыну, выконваць шэраг ускосных павіннасцяў (гвалты, падарожчына, падводная павіннасць, камунальная і інш.).

Змяненне афіцыйнай эканамічнай палітыкі ад практыкі поўнага пераводу сялян каралеўскіх эканомій на грашовую рэнту да аднаўлення там фальваркава-паншчыннай сістэмы і рэарганізацыі сялянскага землеўладання ў іх дазволіла скарбу на некаторы час павялічыць даходы з гэтых уладанняў. За 12 год кіравання А.Тызенгаўзам сталовымі эканоміямі (1765–1777 гг.) скарб атрымліваў у сярэднім 1533485 польскіх злотых штогод, пры максімуме ў 1770 г. – 2015651 злотых і мінімуме ў 1772 г. – 1022683 у сувязі са стратай Магілёўскай эканоміі ў выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай [10, Т.ІІ, с.73]. Да гэтага часу найбольшая сума даходу з эканомій была ў 1764 г., пры трыманні іх Е.Флемінгам, і складала 900000 злотых. Аднак атрыманыя з эканомій даходы ад продажу збожжа не выкарыстоўваліся для ўдасканалення сельскай гаспадаркі ў іх, а накіроўваліся пераважна на ажыццяўленне "вялікага мануфактурнага плану", які быў галоўнай мэтай рэфарматарскай дзейнасці А.Тызенгаўза ў накірунку мадэрнізацыі эканомікі.

Дзякуючы заканадаўчым новаўвядзенням, стварэнню спецыяльнай сістэмы падтрымкі дзяржаўнай прамысловасці, своеасаблівай сістэмы "пратэкцыянізму", А.Тызенгаўз хацеў за невялікі тэрмін арганізаваць у аграрнай краіне развітую прамысловасць. Такія памкненні знайшлі сваё адлюстраванне, напрыклад, у інструкцыі, дадзенай паслам Гарадзенскага павета, якія былі абраны на сойм 1766 г. і адным са складальнікаў якой быў А.Тызенгаўз. Згодна з дакументам, паслы павінны былі дамагацца шырэйшых правоў для развіцця прыватных мануфактур, што садзейнічала б затрыманню такім чынам грошай у краіне, укладванню іх у развіццё ўласнай вытворчасці і памнажэнню, дзякуючы гэтаму, агульнага дабрабыту [11, с.354].

Рэч Паспалітая востра адчувала патрэбу ў высокаякаснай прамысловай прадукцыі, у першую чаргу для войска і флота, якая выпускалася на Захадзе. Акрамя таго, у заходніх краінах з'явілася мноства новых, модных тавараў і прадуктаў, якія былі прызначаныя для асабістага ўжытку ў асноўным прадстаўнікамі пануючага саслоўя. Гэтую прадукцыю даволі складана было набыць на тэрыторыі Княства і ўвогуле Рэчы Паспалітай з-за яе дарагавізны і недахопу сродкаў (як у дзяржавы, так і прыватных уласнікаў), ці ўвогуле з прычыны адсутнасці неабходных тавараў на ўнутраным рынку. Менавіта ў другой палове XVIII ст. неабходнасць заснавання мануфактур была ўсвядомлена на дзяржаўным узроўні, і менавіта дзяржаўная ўлада выступіла ў той час як ініцыятар іх стварэння.

Але працэс рэфармавання не ў аднолькавай ступені закрануў усе каралеўскія эканоміі ў ВКЛ. Бясспрэчным фаварытам у працэсе мадэрнізацыі стала Гарадзенская эканомія. Калі аграрная рэформа, якая з'яўлялася адной з самых важных крыніц папаўнення каралеўскага скарбу, праходзіла практычна ва ўсіх эканоміях ВКЛ, то "вялікі мануфактурны план", распрацаваны А.Тызенгаўзам, тычыўся пераважна Гарадзенскай і ў некаторай ступені Берасцейскай эканомій.

Менавіта Гародня і яго прадмесце Гарадніца сталі цэнтрам мануфактурнай вытворчасці ВКЛ у другой палове XVIII

ст. Месца было выбрана не выпадкова. Гародня была ў той час важным эканамічным і адміністрацыйна-палітычным цэнтрам ВКЛ і, галоўнае, горад ляжаў на вялікім тракце з Варшавы да Пецярбургу і карыстаўся ў тагачасным грамадстве "большай папулярнасцю", чым усе астатнія каралеўскія гарады ў ВКЛ [10, т.1, с.223].

Па сцвярджэнню Ст. Касцялкоўскага, усяго ў каралеўскіх эканоміях ВКЛ фактычна за 10 гадоў было створана больш за 20 розных мануфактур, з іх 16 – у Гародні. Спецыяльнай каралеўскай граматай ад 1777 г. яны перадаваліся пад адказнасць і клопат надворнага падскарбія; кароль дазваляў А.Тызенгаўзу наймаць майстроў і даваў поўную свабоду ўнутраннага кіравання і гандлю.

Асаблівасцю гэтага перыяду як для ВКЛ, так і для ўсёй Рэчы Паспалітай было тое, што шляхта ў большасці сваёй не стала інвестарам прамысловасці, як гэта было ў Нідэрландах і Англіі, а менавіта "інвестыцыйная інтэрвенцыя" мае выключнае значэнне для працэсу эканамічнага ўздыму і выйсця са стагнацыі [12, с.31]. Таму ў сваіх пачынаннях А.Тызенгаўз мог разлічваць толькі на дзяржаўныя пазыкі і крэдыты, а таксама на дармавую працу каралеўскіх сялян.

Аднак патрыятычныя памкненні А.Тызенгаўза па рэфармаванню краіны не вырашылі, а, наадварот, узмацнілі аграрную праблему ў сталовых эканоміях. У правядзенні і аграрнай, і мануфактурнай рэформ на тэрыторыі ВКЛ, відавочна, прасочваецца адна заканамернасць: іх ажыццяўленне сапраўды адбывалася, у першую чаргу, за кошт адміністрацыйнага рэсурсу – павелічэння падаткава-павіннаснага ціску як на сялян, так і на мяшчан. Сельскае насельніцтва каралеўскіх вёсак, як і жыхары пераважнай большасці вялікіх і малых каралеўскіх гарадоў і мястэчак ВКЛ, па сутнасці, з'яўляліся крыніцай фінансавання рэформ, ініцыяваных надворным падскарбіем ВКЛ. У 1775 г. вялікі гетман ВКЛ Міхал Агінскі даносіў каралю, што "па ўсіх літоўскіх эканоміях адбываецца разбурэнне сялянскіх хат і перасяленне некалькіх сем'яў да адной хаты, каб менш плаціць падаткаў" (падымнага – І.К.) [13]. А гэта прыносіла шмат стратаў вайсковай касе Рэчы Паспалітай.

Крытычнай кропкі гаспадарчае становішча ў сталовых эканоміях дасягнула ў 1777 г. Так, у Гарадзенскай эканоміі з 1765 г. па 1780 г. колькасць насельніцтва зменшылася прыкладна на 8%. Разам з тым, нічога не вядома пра якіясьці эпідэміі ці іншыя здарэнні такога кшталту на тэрыторыі Гарадзеншчыны ў гэты час. Напрыклад, у дакуменце аб стане Скідзельскага ключа гэтай эканоміі за 1777 г. насупраць значнай колькасці сялянскіх прозвішчаў адзначалася – "паншчыны эканамічнай не адпрацоўвае, пайшоў за хлебам" [14]. Сяляне збягалі з каралеўскіх уладанняў і найлмаліся на працу ў прыватныя шляхецкія маёнткі, дзе падаткаабкладанне было адчувальна меншым. У сувязі з гэтым вядомы польскі даследчык В.Куля назваў дзейнасць А. Тызенгаўза "антысялянскай" і "антыгарадской" [15, с.417, 421].

31 мая 1777 г. А.Тызенгаўз выдаў універсал, які па зместу і стылю напісання з'яўляўся хутчэй асабістым зваротам генеральнага адміністратара да сялянства эканомій, чым дзяржаўным дакументам. На пачатку ўніверсалу А.Тызенгаўз заўважыў, што з часу панавання Станіслава Аўгуста ўсе намаганні соймаў былі накіраваны на тое, каб увесці ў каралеўскіх эканоміях ВКЛ лепшае ўпарадкаванне і лепшае гаспадарства, "паколькі парадак ёсць душа ўсіх рэчаў... ён заахвочвае валашчан да працы, бароніць ад ляноты, ажыўляе прадпрымальніцтва ў гаспадарцы, ахоўвае ўласнасць кожнага, і сяляне становяцца больш здольнымі да выплаты скарбавых падаткаў" [16].

Ён нагадаў насельніцтву эканомій, што былыя арандатары дбалі не пра пратэкцыю і дапамогу для сялян, а думалі толькі пра ўласныя выгады, пры іх кіраўніцтве заняпалі скарбавыя двары, корчмы, млыны; зараслі грунты; дарогі, масты і паромы сталі не прыдатныя для ўжывання. А зараз перамер зямлі ўжо скончыўся, павіннасці вызначаны, парадак наведзены і засталося толькі спакойна жыць і працаваць.

Фразеалогія наступнага звароту генеральнага адміністратара да падданых эканомій з'яўляецца зусім нечаканай і нетыповай: "Улюбёныя сяляне (Kochane kmitkowie)! Толькі ўпартая ваша невядомасць колькі разоў зрывала і не давала

ходу маім стараннасцям, якія толькі дла вашага дабра ўводзіліся. Найгоршыя даўнія звычаі (па ўсёй верагоднасці, чынш – І.К.) былі для вас мілымі, а лепшыя мае навоваўвядзенні – прыкрымі".

Складваецца ўражанне, што гэты ўніверсал А.Тызенгаўза быў адрасаваны не столькі сялянам, колькі шырокай грамадскасці з мэтай нагадаць пра створаны ім адміністрацыйны парадак у эканоміях, у параўнанні з папярэднім перыядам, і падкрэсліць пры гэтым адсутнасць уласнай выгады, а толькі клопат пра інтарэсы каралеўскага скарбу.

Падводзячы вынікі, неабходна падкрэсліць, што, безумоўна, А.Тызенгаўз распачаў працэс мадэрнізацыі Гарадзенскай эканоміі. Аднак праведзеныя ім гаспадарчыя рэформы ішлі насуперак ідэям, якія прапагандаваліся эканамічнай літаратурай перыяду Асветніцтва: эканамічная свабода вытворцы, свабода гандлю, змяншэнне падаткаў і г.д. Прычына гэтага заключалася ў тым, што эканамічныя рэформы ў ВКЛ былі падпарадкаваны, у першую чаргу, палітычнай мэце – умацаванню каралеўскай улады і забеспячэнню яе фінансавай незалежнасці ад сойма любым коштам. У гэтым выпадку для А.Тызенгаўза ідэалогія Асветніцтва была толькі лозунгам, паколькі ажыццяўленне яго рэфарматарскіх праграм адбывалася з ужываннем прынцыпаў, далёкіх ад Асветніцтва.

Займаючыся ўнутранай гісторыяй Польшчы другой паловы XVIII ст., польскі гісторык Т.Корзан лічыў сябе абавязаным напісаць пра дзейнасць А.Тызенгаўза з мэтай, каб прыкладу з гэтай асобы "ніхто ніколі не браў". Назваўшы планы падскарбія "цудоўнымі і патрыятычнымі", Т.Корзан пры гэтым сцвярджаў, што брацца за выкананне падобных праектаў з такімі інтэлектуальнымі рэсурсамі, якімі валодаў А.Тызенгаўз, было вельмі смела (аўтар меў на ўвазе недахоп у рэфарматара спецыяльнай адукацыі і практычных навыкаў, у першую чаргу, для правядзення эканамічных рэформ). Гісторык вылучыў унутраную прыроду прычыны заняпаду рэформ А.Тызенгаўза. Згодна з яго думкай, галоўная памылка рэфарматара заключалася ў тым, што ён выступаў у фабрычнай ролі не як міністр, а як непасрэдны прадпрымальнік і

кіраўнік. У выніку непрадбачлівых мерапрыемстваў А.Тызенгаўза была створана вялікая колькасць розных мануфактур без забеспячэння іх матэрыяламі па даступных коштах, без адпаведных разлікаў, без тэхнічнага кантролю, з адной толькі крамай у Гародні для продажу разнастайнага асартыменту прамысловых тавараў. Такім чынам, паводле заўвагі даследчыка, выразы "геній" і "Антоній Тызенгаўз" не могуць спалучацца ў сцвярджальным сэнсе [2, с.253–257].

Але разам з тым, нягледзячы на ўсе крытычныя заўвагі адносна гаспадарчай і культурнай дзейнасці А.Тызенгаўза, якія выказваліся яго сучаснікамі, пазнейшымі даследчыкамі і выказваюцца сёння, station станоўчага ў яго працы на карысць Радзімы было таксама шмат. Чаго вартае толькі ўзвядзенне амаль на адзін узровень з прадпрыемствамі Англіі, Францыі і Чэхіі мануфактур, што былі створаныя ў Гародні! Не ўсё атрымлівалася, была складаная знешне і ўнутрыпалітычная абстаноўка, у краіне пераважала прыгонніцкая традыцыя, але ж і з імем А.Тызенгаўза звязана распаўсюджанне ў ВКЛ ідэй Асветніцтва. Патрыятычна настроеная эліта ВКЛ, якая валодала наватарскім мысленнем і верыла ў вялікую ролю рэформаў, шмат зрабіла для эканамічнага, палітычнага і культурнага ўздыму Радзімы, усталяванню больш шчыльных сувязяў з еўрапейскімі краінамі. Магчыма, самае галоўнае, што вынікае з аналізу грамадска-палітычнай і гаспадарчай дзейнасці А.Тызенгаўза, – гэта тое, што Вялікае княства Літоўскае зусім не было ў адсталасці, разгубленасці і заняпадзе, як тое сцвярджала савецкая і расійская гістарыяграфія. Краіна ішла наперад, у тым ліку і дзякуючы намаганням надворнага падскарбія ВКЛ Антонія Тызенгаўза.

**Літаратура і крыніцы**

1. Wybicki, J. Życie moje oraz Wspomnienia o Andrzeju i Konstancji Zamojskich. / J. Wybicki. – Kraków, 1927.

2. Korzon, T. Wewnętrzne dzieje Polski za Stanisława Augusta (1764–1794) / T. Korzon. – T. II. – Kraków, 1883.

3. Baszkiewicz, J. Władza. / J. Baszkiewicz. – Wrocław-Warszawa-Kraków, 1999.

4. Кенэ, Ф. Избранные экономические произведения. / Ф. Кенэ. – М., 1960.
5. Archiwum Główny Akt Dawnych (AGAD). Archiwum Tyzenhauzów (AT), sign. D+1, p. 3.
6. Gawłas, Sł. Polska Kazimerza Wielkiego a inne monarchie Europy Środkowej – możliwości i granice modernizacji władzy / Sl. Gawlas // Modernizacja struktur władzy w warunkach opóźnienia: Europa Środkowa i Wschodnia na przełomie średniowiecza i czasów nowożytnych. – Warszawa, 1999.
7. Филатова, О.Г. Социология: Учебник для вузов. / О.Г. Филатова. – СПб, 2002.
8. От аграрного общества к государству всеобщего благоденствия. Модернизация Западной Европы с XV в. до 1980–х гг. – М., 1998.
9. Похилевич, Д.Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы во второй половине XVIII века. / Д.Л. Похилевич – Вильнюс, 1966.
10. Kościałkowski, St. Antoni Tyzenhauz. Podskarbi Nadworny Litewski. / St. Kósciałkowski. – T. I.–... – Londyn, 1970–1971.
11. Акты, издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов: в 39 т. – Т. VII. – Вильно, 1874.
12. Topolski, J. Narodziny kapitalizmu w Europie XIV–XVII wieku. / J. Topolski. – Warszawa, 1965.
13. AGAD. Archiwum Kameralne (AK), sign. III/268, p. 17.
14. AGAD. AK, sign.III/166, p. 13.
15. Kula, W. Szkice o manufakturach w Polsce XVIII wieku. / W. Kula. – Warszawa, 1956.
16. AGAD. AT, sign D–25, арк. 68.

**Куль-Сяльвестрава Святлана Яўгенаўна,** *доктар гістарычных навук, прафесар УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы", Беластоцкай палітэхнічнай акадэміі*

# ЖАНЧЫНЫ Ў ТЭАТРАЛЬНЫМ ЖЫЦЦІ ГРОДНА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII-XIX СТСТ.

Тэатральнае мастацтва было адным з нямногіх галін творчай дзейнасці, дзе жанчыны маглі праявіць свой талент у час, калі працэс фемінізацыі культуры толькі пачынаўся, у эпоху Асветніцтва. Менавіта другая палова XVIII – пачатак XIX стст. стала перыядам, які паклаў пачатак працэсу сацыяльнага вызвалення жанчыны і актыўнаму далучэнню яе да грамадскага жыцця. Гэты працэс развіваўся паступова, а культура была адной з тых сфер, дзе ён ішоў найбольш хуткімі тэмпамі і быў найболей відавочны.

На беларускіх землях умовы працэсу фемінізацыі культуры былі своеасаблівымі, адрозніваючыся, да прыкладу, ад сітуацыі ў цэнтральных губернях Расійскай імперыі. Гэта было звязана, найперш, са статусам кабеты, які засвоены быў беларускім грамадствам з часоў Рэнесанса. Паводле Статута ВКЛ, жанчына-шляхцянка мела маёмасныя правы, былі абаронены яе жыццё і годнасць. Своеасаблівы статус кабеты адбіваўся і ў арганізацыі тэатральнага жыцця ў часы Рэнесанса і барока. Менавіта на беларускіх землях жанчыны, у адрозненні ад іх сёстраў з іншых еўрапейскіх краін, мелі доступ на паказы школьнага тэатра, праўда, для іх адводзілася спецыяльнае месца ў глядзельнай зале. Належыць з гэтай нагоды ўзгадаць і Уршулю Радзівіл, як арганізатарку і натхніцельку тэатральных паказаў, а таксама драматурга. Праўда, да часоў Асветніцтва жанчыне на беларускіх землях шлях на сцэну быў забаронены, жаночыя ролі на падмостках выконвалі выключна мужчыны. Толькі другая палова XVIII ст. адкрыла кабетам доступ да прафесіі актрысы і антрэпрынёркі. Пэўную ролю тут адыграў прыклад замежных труп, найперш,

французскіх і італьянскіх, якія часта наведвалі беларускія землі па запрашэнню караля і магнатаў. Прыклад сцэнічнай кар'еры давалі таксама жонкі мэтраў, якія прыязджалі разам з сужонкамі для працы ў тэатральных школах, капэлах і аркестрах, што масава ўзнікалі на беларускіх землях у часы Асветніцтва. Найбольш важкім фактарам з'яўлення жанчыны на сцэне была ў тыя часы новая ідэалогія, паводле якой жанчына набывала ролю выхавацелькі, натхніцелькі мужчын, а таксама стваральніцы прыгожага. Не меншую ролю адыграла ў з'яўленні постаці актрысы і антрэпрынёркі ў беларускім грамадстве, змена ролі тэатральнага мастацтва. Значэнне самаго тэатра ў культурным жыцці беларускіх земляў, асабліва заходняй і цэнтральнай іх частак, у гэтую эпоху становіцца надзвычай вялікім. Ён быў трыбунай для распаўсюджвання новай ідэалогіі, арэнай вострай палітычнай барацьбы. Захапленне тэатрам перажываюць у гэты час не толькі магнаты, але і шляхта. Другім фактарам, абумовіўшым аванс жанчын на тэатральных падмостках, было з'яўленне тэатра прыватнай антрэпрызы, дзе ў пераважнай большасці выступалі выхадцы са шляхты. Тэатр прыватнай антрэпрызы даваў прастор і для жаночай прадпрымальнасці.

Першыя мясцовыя ўраджэнкі з'яўляюцца на гродзенскай сцэне ў хуткім часе пасля заснавання ў Гродне трупы Антонія Тызенгаўза. Гэта былі выхаванкі тэатральна-балетнай школы, уладкаванай гродзенскім старастам на Гарадніцы. Як піша Б.Мамантовіч-Лоек, яшчэ ў час замежнага падарожжа Леона Сітанскага (ён быў даверанай асобай А.Тызенгаўза па справах тэатра, а таксама выдатным скрыпачом і капельмайстрам), гродзенскі стараста загадаў шукаць у падуладных яму мясцінах прыгожых дзяцей для будучай школы. Сярод іх павінны былі апынуцца і дзяўчаты. Адміністратар з Рэчыцы Антоні Толкач пісаў гаспадару ў 1773 г.: Дзяўчат і хлопцаў, прыгожых з аблічча, адсылаю да Гродна [8, 37]. У 1776 г. штатны расклад тэатра на Гарадніцы фіксуе, між іншым, 10 танцорак і 4 спявачак [8, 39]. У трупе Тызенгаўза танчылі Мар'янна Адамовіч, Разалія Лаўцэвіч, Людвіка Аўгуст, Марыя Харкевіч, Дарота Дарэўская, Апалонія Клаўзуб, Дарота

Пятровіч, Кацярына Сладковіч, Магдалена Вясельская і іншыя [8, 41.] Сярод спявачак найбольш адзначылася Магдалена Сітанская (дачка ці, па іншых звестках, сястра Лявона Сітанскага). Трупа Тызенгаўза адкрыла доступ на сцэну кабетам з непрывілеяваных варстваў насельніцтва, але не яны ў далейшым пераважалі ў тэатральных трупах на нашых землях. У канцы XVIII ст. на сцэнічныя падмосткі пайшлі шляхцянкі і панавалі тут да сярэдзіны XIX ст.

Першы нацыянальны тэатр прыватнай антрэпрызы з'явіўся ў Гродна дзякуючы Войцэху Багуслаўскаму. У Трупе Нацыянальнага тэатра, якая прыехала на гастролі ў горад на Нёмане на час сеймавых паседжанняў 1784 г., былі выдатныя актрысы – Трускаляская і Дзешнер і іншыя. Багуслаўскаму прыйшлося канкураваць з дзвюма італьянскімі трупамі, якія ў той час давалі тут паказы. Але патрыятычны настрой у краі, а таксама талент акцёраў і актрыс далі гэтай трупе перавагу над канкурэнтамі. Так упершыню дэбютавала ў Гродна Саламея Дзешнер.

Саламея Дзешнер нарадзілася ў 1759 г. у Беластоку ў сям'і прыдворнага шпалерніка гетмана Браніцкага Адама Цешнера і яго жонкі Людвікі. Прыгожая, спрытная дзяўчынка ў хуткім часе трапілася на вочы жонцы гетмана Ізабеле Браніцкай, якая ўзяла яе пад сваю апеку. Дзякуючы падтрымцы гетманшы Саламея атрымала выдатную на тыя часы адукацыю – яна валодала некалькімі замежнымі мовамі, добра танчыла, ведала прыдворны этыкет, была знаёма з пачаткамі навук, разбіралася ў літаратуры і мастацтве, іграла на некалькіх музычных інструментах. Найвялікшым багаццем Саламеі быў голас – высокае багатае сапрана крыху металічнага гучання, вельмі моцнае і мілагучнае.

Ізабэла Браніцкая была сястрой караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. У адзін з візітаў караля да сястры васемнаццацігадовая выхаванка гетманшы была яму прадстаўлена. Па пратэкцыі караля Дзешнер змагла паступіць у буйнейшую на той час у Рэчы Паспалітай трупу Нацыянальнага тэатра, якой кіраваў выдатны тэатральны дзеяч, спявак, драматург і мемуарыст Войцех Багуслаўскі. Ён стаў першым тэатральным педагогам Саламеі і яе біёграфам.

У хуткім часе Саламея Дзешнер стала адной з зорак варшаўскай сцэны. Яна выступала ў розных амплуа, але найлепей яе талент ззяў у амплуа субрэтак. Моцны, прыгожы голас развіўся, дзякуючы заняткам з лепшымі музыкантамі, якія супрацоўнічалі з трупай Нацыянальнага тэатра, а Войцэх Багуслаўскі навучыў яе сакрэтам драматычнага мастацтва.

З трупай В.Багуслаўскага Дзешнер выступала на многіх тэатральных пляцоўках Рэчы Паспалітай. З вялікім захапленнем яе сустракалі гледачы Любліна, Кракава, Вільні і іншых буйных тэатральных цэнтраў. Некалькі разоў у складзе трупы яна ў гэты час выступіла і ў Гродне.

У 1800 або 1801 годзе Саламея Дзешнер, маючы ўжо багаты вопыт тэатральнай дзейнасці, вырашыла заснаваць уласную трупу. Жанчыны-антрэпрынёркі былі ў той час звычайнымі постацямі ў тэатральнай справе. Выбар Дзешнер паў на Гродна – горад, блізкі да яе радзімы, які яна добра ведала. Галоўнае, што, пэўна, адыграла ролю ў выбары пляцоўкі для размяшчэння тэатральнай антрэпрызы, мураваны тэатральны будынак, пабудаваны яшчэ ў 1780-х гадах, а таксама звыклая да тэатральных паказаў публіка.

Адкрыць уласную справу пасярод тэатральнага сезона, не маючы трупы, было справай дастаткова цяжкай. Трэба было не толькі захапіць публіку, каб тэатр прыносіў даход, але яшчэ і адсунуць з камерцыйнага полю канкурэнтаў. З гэтым пачынаючая антрэпрынёрка справілася з, так бы мовіць, сваістым нямецкім разлікам. Яна не стала склікаць не занятых у іншых тэатрах акцёраў – як правіла, гэта былі людзі, якіх не вельмі добра прымала публіка. Не стала і вучыць моладзь. Разлічваючы, што вопытныя, вядомыя гледачу сваім талентам акцёры сваёй гульнёй акупяць панесеныя затраты, яна перакупіла лепшую частку трупы антрэпрынёра Навіцкага, які даваў паказы ў Беластоку, пры чым зрабіла гэта патаемна ад самаго Навіцкага. Скаргі пакрыўджанага беластоцкага губернатара не прынеслі карысці – кантракты з акцёрамі не былі заключаны, і фармальна яны маглі выбіраць месца ангажэмента. У хуткім часе Саламея ўладкавала ўзае-

маадносіны яшчэ з аднымі канкурэнтамі – Шыманскім і Тураўскім, якія дагэтуль звычайна прыязджалі ў Гродна на зімовы сезон і прэтэндавалі на тэатральны будынак. Вырашана было даваць паказы папераменна. Урэшце, гэтыя антрэпрынёры з'ехалі ў правінцыю, пакінуўшы Дзешнер гаспадыняй ў будынку тэатра ў Гродне.

Лёс гродзенскай антрэпрынёркі склаўся такім чынам, што на яе шляху сустрэлася яшчэ адна каранаваная асоба. У 1802 г. на святкаванне адкрыцця Гродзенскай губерніі ў горад над Нёманам завітаў расійскі імператар Аляксандр I. У праграме святкавання было выступленне трупы гродзенскіх акцёраў пад кіраўніцтвам С.Дзешнер. Пакуль што невядома, якую п'есу паказала трупа ў гэты дзень. Але можна меркаваць, што выступленне прайшло з вялікім поспехам. Пасля візіту ў Гродна імператара быў прадпрыняты капітальны рамонт тэатральнага будынку, а затым яго аддалі трупе Саламеі Дзешнер у бясплатнае карыстанне тэрмінам на дзесяць год. Апрача таго, гродзенскай антрэпрынёрцы была перададзена манапольнае права на выступленні ў Зэльве, калі там адбываюцца кірмашы. Зэльвенскі кірмаш – на той час буйнейшы не толькі на Гарадзеншчыне, але і ў Беларусі, даваў значныя даходы працуючым там тэатральным калектывам. Таму за права выступаць у Зэльве антрэпрынёры змагаліся зацята, не грэбуючы ўмешваць ў гэтую барацьбу мясцовыя і цэнтральныя ўлады. Дзешнер і тут выказала сваістыя ёй практыцызм і прадпрымальнасць. У барацьбе за Зэльву з буйнейшай трупай Віленскага тэатра, якой кіравала вядомая антрэпрынёрка Мараўская, меўшая да гэтага там манаполію, Саламея выкарыстала прыхільнасць імператара. Яна напісала яму асабісты ліст з просьбай падтрымаць яе ў справе манаполіі і атрымала ўхваленне сваіх захадаў.

Тэатр Саламеі Дзешнер працаваў у Гродне на працягу васьмі гадоў. Для тых часоў і для параўнальна невялікага горада гэта была нязвыклая справа. Нездарма трупу С.Дзешнер называюць сталым гродзенскім тэатрам, а сама антрэпрынёрка ўвайшла ў гісторыю як першая дырэктрыса гродзенскай сцэны. Выступаючы на золку тэатральнай кар'еры ў

ролях субрэтак і гераінь-каханак, у апошнія свае гады яна перайшла да характарных роляў, што было звычайна для тагачасных актрыс. Дзешнер, як можна лічыць па дайшоўшых да нас афішаў, рупілася аб высокамастацкім рэпертуары для свайго тэатра. Сярод іншых пастановак гродзенскай трупы ў гэтыя часы належыць узгадаць паказ п'есы Капніста "Паклёп" у перакладзе Бончы-Тамашэўскага. Гэта, пэўна, першая пастаноўка твору рускай драматургіі на гродзенскай сцэне.

Саламея Дзешнер была, па сведчанню сучаснікаў, вельмі сумленнай у разліках з акцёрамі, нават за кулісамі заставалася кабетай "з вышэйшага таварыства". Памерла актрыса і антрэпрынёрка ў 1806 г. у росквіце таленга і славы. Войцэх Юагуслаўскі адзначаў у сваіх успамінах, што ў апошні шлях знакамітую актрысу праважала ўсё тэатральнае Гродна, былі працаўнікі і аматары тэатра з іншых мясцін былой Рэчы Паспалітай. Пахавалі гродзенскую дырэктарку, хутчэй за ўсё, на лютэранскіх могілках, якія знішчылі ў 1950-я гады.

Лёс актрысы, як правіла, не быў лёгкім. Сцэнічная дзейнасць была несумяшчальнай з сямейным жыццём па-за тэатрам. Арганізацыя тэатральнага жыцця на беларускіх землях першай паловы XIX ст. была заснавана на выяздных тэатральных калектывах. Такая трупа звычайна абсталёўвалася ў буйным цэнтры, бяручы ў арэнду мясцовы тэатральны будынак. Летам, калі горад пакідалі патэнцыяльныя гледачы – шляхта, трупа пачынала аб'езд уездных цэнтраў, кірмашоў, а часам і буйных маёнткаў, дзе давала паказы. Восенню артысты зноў вярталіся ў губернскі цэнтр. Паколькі патэнцыяльных гледачоў было ў горадзе няшмат, толькі Вільня з'яўлялася тут выключэннем, трупа мусіла амаль штодня даваць прэм'еры, а калі рэпертуар быў вычарпаны, пакідала горад. Пры такім ладзе жыцця жанчыне-актрысе немагчыма было выйсці замуж за чалавека, не звязанага з тэатрам, і працягваць тэатральную кар'еру. Паказальным прыкладам была справа актрысы Паліны Дзянісавай. У 1826 г. яе муж фельдшар Дынабургскага шпіталя падаў прашэнне на імя Віленскага генерал-губернатара, патрабуючы вярнуць жонку, якая

ад'ехала на гастролі разам з трупай. Цыркуляр аб росшуку актрысы паведамілі грамадзянскім губернатарам. Паліну Дзянісаву адшукалі і адправілі ў Дынабург да мужа [1]. Сямейнае жыццё актрыс канцэнтравалася, такім чынам, у тэатральным свеце. Масавай з'явай ў гэты час становяцца шлюбы паміж акцёрамі. У антрэпрызах Навіцкага, Дзешнер, Навакоўскага, Мараўскай, Кажынскага, якія наведвалі Гродна ў першай палове XIX ст., ігралі сямейныя пары Фіялкоўскіх, Наймалоўскіх, Жукоўскіх, Рагоўскіх, Скібінскіх, Аснікоўскіх, Тарноўскіх, Здановічаў, Навакоўскіх, Бетляеўскіх і іншыя.

Шлях на сцэну для жанчыны пачынаўся звычайна з ранняга юнацтва, або дзяцінства, калі яна паходзіла з акцёрскай сям'і. У дзесяцігадовым узросце ў французскім балеце дэбютавала на віленскай сцэне Ізабэла Гурская [10, 29], у васемнаццаць гадоў прыйшла ў тэатр В.Багуслаўскага С.Дзешнер [9, 268], у трупе бацькі пачыналі сваю сцэнічную кар'еру сёстры Шмідкоф – спявачка і танцорка [1, 2], у ролі амурчыка дэбютавала на віленскай сцэне Паўліна Лявіцкая [7, 381]. Часам шлях на сцэну пачынаўся з выступлення ў аматарскіх калектывах. На беларускіх землях у першай палове XIX ст. не існавала спецыяльных навучальных установаў, якія бы рыхтавалі актрыс і акцёраў. Падобныя школы былі ў Варшаве – там у 1802 г. школу танцаўшчыкоў адкрыў былы балетмайстар гродзенскага тэатра Тызенгаўза Франсуа Ле Ду. Для драматычных акцёраў у Варшаве ў 1811 г. "бацькам польскага тэатра" Войцэхам Багуслаўскім таксама была створана школа, але яе выхаванцы неахвотна ехалі ў Беларусь і Літву, ва ўсялякім выпадку, з актрыс, якія выступалі на сцэнах Польшчы. Пасля тэатральнай рэформы 1845–1850 гг., каб тут выступаць, трэба было ведаць рускую мову, і актрысы з Варшавы ўвогуле абмінаюць літоўска-беларускія сцэны.

На працягу ўсяго жыцця жанчына-актрыса магла выступаць у некалькіх амплуа. Пачынаючы з амплуа травесты ці інжаню, яна затым іграла гераінь або субрэтак, а ў канцы жыцця – характарныя ролі. Тэатр быў адзінай крыніцай даходаў, знайсці работу па-за сцэнай для актрысы з'ўлялася справай амаль немагчымай. Заробак актрысы складаўся з

некалькіх частак: плата за ўдзел у спектаклях, бенефісы, а калі яна працавала ў таварыстве акцёраў і мела долю ў антрэпрызе, то і працэнт з унесенага капіталу. Прыбыткі ад тэатральных паказаў залежалі ад многіх прычын – кошту арэнды памяшкання і абавязковых выплат на дабрачыннасць, добрасумленнасці антрэпрынёра, статусу актрысы ў трупе, а найперш – ад заможнасці публікі і яе захаплення тэатрам. Большыя заробкі мелі, безумоўна, антрэпрынёршы. Так, да прыкладу, Мараўская, якая трымала найбольш выгодную антрэпрызу ў Вільні, магла за сезон зарабіць да 2000 руб. золатам [10, 32]. Але і гэтага не хапала, таму віленская трупа часта наведвала Гродна і Гродзеншчыну, каб павялічыць свае прыбыткі.

Да 1845 г. на сцэнах Беларусі і Літвы працавалі пераважна мясцовыя ўраджэнкі або актрысы з Польшы. Значную частку з іх складалі шляхцянкі, што падкрэслівалася напісаннем слова "пані" ці "панна" перад прозвішчам актрысы ў афішах. Пасля тэатральнай рэформы 1845–1850 гг. на ўсход Беларусі разам з расійскімі трупамі прыехалі і рускія актрысы. Пасля паўстання 1863 г., калі польская мова на тэатральных пляцоўках Беларусі і Літвы была забаронена, і ўлады пачалі актыўна падтрымліваць рускую сцэну, першыя расійскія актрысы з'яўляюцца і ў Гродне. Гэта ў пераважнай большасці былі прадстаўніцы трэцяга саслоўя або выхадцы з інтэлігенцкіх колаў. Рускія дваранкі надзвычай рэдка абіралі тэатральную кар'еру – прафесія актрысы не была шанаванай у Расіі ў той час.

У другой палове XIX ст. на гродзенскай сцэне паказалі сваё мастацтва некалькі знакамітых рускіх актрыс. У сезон 1866–1867 гг. у Гродне дала некалькі гастрольных выступленняў зорка рускай сцэны К.Б.Піўнова-Шмідкоф. Кацярыне Барысаўне ў той час было толькі дваццаць пяць гадоў, але яна ўжо мела багаты сцэнічны вопыт. Свае выступленні зорка рускага тэатра пачала ў Ніжнім Ноўгарадзе ў шасцігадовым узросце. Шасцігадовая "танцорка" і "акцёрка" ўдзельнічала ў паказах разам з бабуляй і бацькам. Бабуля Кацярыны Барысаўны, Настасся Іванаўна Піўнова была некалі першай

зоркай прыгоннага тэатра князя Шахаўскога, які даў ёй вольную. У 1856 г. К.Б.Піўнова-Шмідкоф закончыла Маскоўскае тэатральнае вучылішча і вярнулася ў Ніжні Ноўгарад, дзе была прынята ў трупу і ў хуткім часе стала адной з лепшых актрыс буйнога тэатра ў "вялікай тэатральнай правінцыі". Тут ёй выпала шчасце сустрэцца з карыфеем рускай сцэны Міхаілам Шчэпкіным, а таксама з выдатным украінскім паэтам і мастаком Тарасам Шаўчэнкам. Як ўзгадвала актрыса ў сваіх успамінах, М.Шчэпкін "у час свайго нядоўгага побыту ў Ніжнім кожны свабодны вечар бавіў са мной і Шаўчэнкам" [6, 49]. Знакаміты артыст "праходзіў" з ёй ролі Таццяны ("Маскаль-чараўнік" Катлярэўскага), Мірандаліны ("Мірандаліна або Гаспадыня гасцініцы" Гальдоні), вучыў яе з гонарам несці сваё акцёрскае званне. Гэта была разумная, працаздольная актрыса, якая валодала гнуткім, выразным голасам, умела па-майстэрску трымацца на сцэне і з поспехам выступала ў розных амплуа, выконваючы драматычныя, камедыйныя, вадэвільныя і гераічныя ролі. Але найбольш выдатна яна іграла ў камедыях.

Пасля выступленняў у Ніжнім Ноўгарадзе, Калузе і іншых правінцыйных гарадах Расіі Е.Б.Піўнова-Шмідкоф прыязжае ў Вільню. Беларусь была ёй блізкай – яе муж Максімільян быў сынам Карла-Вільгельма фон Шмідкофа. Ён працаваў у тэатрах "вялікай тэатральнай правінцыі" як музыкант і тэатральны дырыжор. У Гродна К.Б.Піўнова-Шмідкоф сыграла ў некалькіх спектаклях, выконваючы ролі Марыі Бернар (меладрама "Мацярынскае блаславенне або Беднасць і гонар" Някрасава); Дуняшы ("Летняя сцэна з рускага побыту" Стаховіча) і іншыя. Па сведчанню мясцовага рэцэнзента, ігра актрысы прышлася даспадобы гродзенскай публіцы. "Гаспажа Піўнова-Шмідкоф, – пісаў ён, – надзвычай спадабалася нашай публіцы... Ігру гэтай актрысы можна глядзець з вялікім задавальненнем. У апошні раз ёй паднесены быў кімсьці, праз пасрэдніцтва дырыжора, аб'ёмісты букет жывых кветак, выклікам і апладысментам не было канца" [4, 95]. Выступленні выдатнай маладой актрысы сталі значнай падзеяй у тэатральным жыцці Гродна.

У тэатральны сезон 1877/78 гг. у трупе Леонава ў якасці госця-гастралёра працавала А.Н.Мельнікава-Самойлава. Яна была вядучай актрысай Віленскага тэатра, дзе дэбютавала ў семнаццацігадовым узросце ў 1865 г. Некаторы час яна выступала ў Пецярбургу, а пасля зноў вярнулася ў Вільню. Сваёй працаздольнасцю, талентам і тактоўнасцю яна заслужыла прызнанне ў гледачоў і павагу ў калег па акцёрскаму цэху. З поспехам Мельнікава-Самойлава выступала ў камедыйных і драматычных ролях. "Гэта была вопытная і таленавітая актрыса, на якой трымаўся ўвесь рэпертуар Віленскага тэатра" [4, 96], – пісала аб ёй ва ўспамінах вядомая руская актрыса Г.Я.Глама-Мяшчэрская, якая працавала разам з Мельнікавай-Самойлавай. Адначасова з Мельнікавай-Самойлавай гэты сезон адыграў у Гродне Ф.П.Гораў – будучая зорка сталічнай рускай сцэны. "Выдатная ігра гэтых двух асобаў была прычынай вельмі руплівага наведвання тэатра публікай" [5], – пісаў у Пецярбург у справаздачы аб дзейнасці тэатра гродзенскі губернатар.

Гродзенская сцэна стала гасціннай і для буйнейшай зоркі расійскага тэатра – Марыі Савінай. Марыя Падраменцава (сапраўднае прозвішча актрысы) пачынала свой шлях у тэатры ў Беларусі, дзе ў другой палове XIX ст. іграў яе бацька (сцэнічны псеўданім – Страмлянаў). Між іншым, ён неаднойчы наведваў Гродна ў той час, калі яго дачка была ўжо знакамітасцю сталічнай сцэны. Марыя Гаўрылаўна наведала Гродна ў летні сезон 1898 г. Яна ў гэты сезон кіравала таварыствам сталічных акцёраў, якое рабіла вялікае турнэ па тэатральнай правінцыі. Гродна, дзякуючы свайму размяшчэнню – буйны чыгуначны вузел на шляху з Пецярбургу да Варшавы, а таксама наяўнасці добрага тэатральнага будынка неаднойчы ў той час прываблівала сталічных гастралёраў. У Гродна трупа М.Савінай дала некалькі паказаў і была надзвычай добра прынятая мясцовай публікай.

Тэатр быў адным з першых відаў мастацтва, дзе жанчыны маглі праявіць свае здольнасці, прадпрымальнасць і талент. На гродзенскай сцэне ў XVIII-XIX стст. выступалі дзесяткі кабет рознага сацыяльнага паходжання і ўзроўню сцэ-

нічнага майстэрства. Па-рознаму склаўся іх лёс, многія не змаглі рэалізаваць сябе з-за неспрыяльных умоваў, недахопу сродкаў і іншых прычын. Гэтыя жанчыны, за вельмі рэдкім выключэннем, былі нешчаслівымі ў асабістым жыцці, павінны былі адстойваць сваю жаночую і чалавечую годнасць, ламаючы ўстойлівыя стэрэатыпы "камедыянтак" і "актрысак", асабліва ў другой палове XIX ст. Але яны ўсе пакінулі след у тэатральным мастацтве, вартыя памяці і павагі.

**Літаратура**


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ) у Гродна. Ф. 1, воп. 2, спр. 1791.
2. НАРБ у Гродна. Ф. 1, воп. 1, спр. 1801, арк. 8 адв.
3. НАРБ у Мінску. Ф. 1297, воп. 1, спр. 20432, арк. 2, 19.
4. Пашкин, Ю.А. Русский драматический театр в Белоруссии XIX века. / Ю.А. Пашкин – Минск, 1980.
5. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (РДГА). Ф. 776, воп. 25, спр. 269, арк. 102.
6. Юшков, Н.Ф. К истории русской сцены. Е.Б. Пиунова–Шмидкоф в своих и чужих воспоминаниях. / Н.Ф. Юшков – Казань, 1889.
7. Deryng, E. Z pamiętników aktora wileńskiego.// Pamiętnik teatralny. – 1986. Z. 2–3 – S. 381
8. Mamontowicz–Łojek, B. Tancerze króla Stanisława Augusta. 1774–1798. – Warszawa, 2005.
9. Miller, A.Teatr polski i muzyka na Litwie jako strażnicy kultury Zachodu. – Wilno, 1936.
10. Rulikowski, M. Teatr polski na Litwie. 1784–1906. – Wilno, 1907.

**Госцеў Алесь Пятровіч,** *краязнаўца,*
*выкладчык ліцэя № 1 г.Гродна*

# ЯЎСТАФІ АРЛОЎСКІ – "ЧАЛАВЕК НАВУКІ" І "НАСТАЎНІК-ЧАЛАВЕК", ЧАЛАВЕК КУЛЬТУРЫ

Гісторыя горада – час, які ствараецца справай і думкамі яго жыхароў. У кантэксце гэтай (магчыма, далёка не бясспрэчнай думкі) адна з самых ключавых роляў у гісторыі як горада Гродна, так і Гродзеншчыны ўвогуле належыць Яўстафію Філарэтавічу Арлоўскаму. Настаўніку гісторыі і грэчаскай мовы па адукацыі, Краязнаўцу па стану душы, Гісторыку і Культуролагу па навуковаму складу розуму, Чалавеку – па ўсіх праявах жыцця.

Нарадзіўся Я.Ф. Арлоўскі 14 (26) красавіка 1863 г. у вёсцы Славенск Аршанскага павета Віленскай губерні (зараз вёска Валожынскага р-на Мінскай вобл.). Таму па факту нараджэння гарадзенцы не могуць лічыць яго земляком. Але ён стопрацэнтовы гарадзенец па свайму жыццёваму лёсу: з 50 гадоў 7 месяцаў і 8 дзён свайго жыцця пражыў непасрэдна ў Гродне – больш паловы (28 гадоў 4 месяцы і два дні).

Яўстафі ў вялікай сям'і вясковага святара быў чацвёртым па старшынству дзіцё і, па сведчанню сястры, з дзяцінства вылучаўся асаблівай дабрынёй, чуллівасцю і выключным высакародствам.

Дзед Іаан, бацька Філарэт і малодшы брат былі святарамі, а сам Яўстафі атрымаў грунтоўнае рэлігійнае выхаванне: акрамя сям'і (якая вылучалася выключна моцнай пасіянарнасцю), ён навучаўся ў Віленскім духоўным вучылішчы і ў 1–4 класах Літоўскай духоўнай семінарыі. Але вышэйшую адукацыю атрымаў у Санкт-Пецярбургскім гісторыка-філалагічным інстытуце на аддзяленні гісторыі (1881–1885 гг.) са спецыяльнасцю "настаўнік гісторыі і грэчаскай мовы". І ўжо 11 чэрвеня 1885 г. (тут і ў далейшым усе даты падаюцца па юліянскім календары) "предложением Г/осподина/ Управляющего Министерства народного просвещения назначен

в Гродненскую гимназию учителем греческого языка и истории" [13]. Да выканання службовых абавязкаў прыступіў 1 жніўня. Такім чынам, з'яўленне Яўстафія Філарэтавіча Арлоўскага ў Гродне адбылося адразу пасля вынішчальнага пажару 29 мая. Ён застаў горад у страшэнным стане. Пажар, які ўзнік на захадзе, у раёне Малой Траецкай вуліцы хутка пасунуўся на ўсход (у цэнтры горада большасць дамоў была драўлянай): "Сгорела значительная часть Соборной улицы, Купеческая, Полицейская, Гороховая, Почтовый переулок, Песочная, Жандармский переулок и др. и множество небольших переулков… После пожара оставалась огромная площадь, покрытая обломками стен, дымовых труб и печей. Район пожара распространился до полотна железной дороги и Скидельскаго предместья. Сгорело отделение Государственного банка (ценности и документы спасены), дворянское депутатское собрание (документы сгорели); Фарный костёл уцелел лишь благодаря тому обстоятельству, что гродненские каменщики явились к костёлу со своим строительным материалом и замуровали окна и др. отверстия со стороны огня… Сгорели несколько молитвенных домов (еврейских), еврейский детский приют, все гостиницы, депо земледельческих машин… Пожар этот в истории г.Гродна имел огромное значение. Он конечно "содействовал украшению" нашего города; но вместе с тем усилил дороговизну, подняв цены на квартиры; после пожара плацы застроились новыми каменными более обширными домами" [4, с.317–318]. Такім чынам, цэнтр Гродна аднаўляўся на вачах пачынаючага настаўніка і краязнаўцы, які знайшоў адпаведную сваёй пасадзе кватэру толькі на паўднёвым ускрайку горада, на Новым свеце, – Акцызная плошча, дом Круповіча (сёння гэта раён гімназіі №10 і гарадскога Дома культуры) – такі яго другі гродзенскі адрас. А першы, які вядомы з Памятнай кніжкі Гродзенскай губерні за 1886 г., – дом Барыса-Глебскага мужчынскага манастыра (вуліца Маставая, 9 – зараз на гэтым месцы Гродзенскі драматычны тэатр). У 1890 г. Яўстафі Філарэтавіч ненадоўга перасяляецца на вул. Палявую (зараз Карбышава, 10) у дом Вейсбрэма, а ўжо праз год (з 1892 г.) яго адрас

– побач з мужчынскай гімназіяй: вул. Саборная, дом Фіна (зараз вул.Савецкая, 21). У 1897 г. ён зноў "вяртаецца" на Новы свет, але ўжо на вул.Раздзельную (Батанічная), у дом Шчэрбы. У 1901 г. на нейкі год пасяляецца ў доме Орман на вул.Гараднічанскай, 19 і ўжо з 1902 г. да апошніх сваіх дзён жыве ў доме Гардона па вул. Іваноўскай (Тэльмана). Гэты апошні адрас падаюць Памятныя кніжкі. Але архіўныя звесткі іншыя: вул. Паштовая, дом Гардона (сёння не існуе – на гэтым месцы кветнік ля аўтастаянкі за Аблвыканкамам). Улічваючы тое, што па вядомым спісам домаўладальнікаў дом Гардона па вул. Іваноўскай не праходзіць зусім, ёсць падставы даверыцца архіўным звесткам.

Падобна на тое, што лёс Гродна і Гродзеншчыны адразу захапіў Яўстафі Філарэтавіча на ўсё астатняе жыццё, таму што вельмі хутка ён саступае выкладанне грэчаскай мовы іншым спецыялістам сваёй кафедры, але да гісторыі дадае геаграфію, мабыць, каб нішто з прафесійнага боку не адцягвала яго ад краязнаўчай працы. Затое ён паралельна з працай у мужчынскай гімназіі імя графа Тармасова выкладаў геаграфію ў жаночай Марыінскай гімназіі (1896–1904), а затым рускую і ўсеагульную гісторыі ў прыватнай жаночай 7–класнай яўрэйскай гімназіі (1909–1912) і вёў значную грамадскую працу: быў бібліятэкарам (і сябрам Праўлення) Гродзенскай публічнай бібліятэкі (1891–1913), агентам таварыства драматычных пісьменнікаў, ганаровым сябрам Гродзенскага праваслаўнага Сафійскага брацтва, сябрам царкоўна-археалагічнага камітэта, Гродзенскага педагагічнага таварыства і таварыства брацкай узаемадапамогі, актыўна супрацоўнічаў з рэдакцыяй "Гродненских губернских ведомостей" (з 1890 г. вёў аддзел крытыкі і бібліяграфіі па гісторыі Заходняй Русі, а са жніўня 1892 па 1894 г. – таксама агляд гістарычных часопісаў). Ва ўсіх без выключэння сферах сваёй як прафесійнай, так і грамадскай дзейнасці Яўстафі Філарэтавіч пакінуў адметны след. А ў большасці з іх з'явіўся нават піянерам. Асабліва гэта тычыцца яго працы як бібліёграфа (ён па праву можа лічыцца пачынальнікам беларускай бібліяграфіі) [7] і гісторыка-краязнаўцы Гродзеншчыны, дзе найбольш яскрава

праявіліся выдатныя здольнасці Яўстафія Філарэтавіча як навукоўца: адразу ўхопліваць сутнасць з'явы і разглядаць яе ў кантэксце ўсеагульнага. Менавіта гэтая якасць дазволіла Яўстафію Філарэтавічу ўжо ў 1889 г. (праз 3-4 гады яго дзейнасці ў Гродне) выйсці на абгрунтаванае атаесамленне летапіснага Горадзена і нёманскага Гродна, у 1893 г. шырока абвясціць аб сваім адкрыцці на IX археалагічным з'ездзе ў Вільні і замацаваць яго ў капітальнай працы "Гродненская старина. Часть 1. Гор. Гродна", якая пабачыла свет у 1910 годзе і дасюль з'яўляецца класічнай краязнаўчай працай. Але як сапраўдны навуковец Яўстафій Філарэтавіч інтуітыўна адчуваў, што Замкавая гара ў Гродне хавае дадатковыя факты на карысць яго адкрыцця. І ён атрымлівае "адкрыты ліст" на раскопкі. Толькі забарона вайсковага ведамства, якое на той час утрымлівала на сваім балансе Стары замак, не дазволіла яму і тут стаць піянерам. Але далейшыя падзеі даказалі вернасць памкненняў даследчыка. І нават тут (ужо пасмяротны) лёс Яўстафія Філарэтавіча аказаўся справядлівым: распачаць раскопкі на Замкавай гары давялося яго вучню і бліскучаму паслядоўніку на ніве гродзенскага краязнаўства Язэпу Ядкоўскаму (1890–1954).

Ці асэнсоўваў Яўстафі Філарэтавіч сам сябе краязнаўцам? А тым больш краязнаўцам школьным? Наконт гэтага няма ніякіх прамых сведчанняў. Але сама методыка працы Яўстафі Філарэтавіча і як краязнаўцы-навукоўца, і як краязнаўцы-настаўніка яскрава сведчыць аб тым, што ён свядома, з выключным веданнем краязнаўчай дзейнасці сваіх папярэднікаў, асабліва Жана Эмануэля Жылібера (які арганічна спалучаў уласную навукова-натуралістычную працу з далучэннем да яе сваіх вучняў і распачаў традыцыю экспедыцыйнага вывучэння роднага краю), працягваў і замацоўваў іх дасягненні. Разам з вучнямі ён рэгулярна ажыццяўляў пешыя экспедыцыі па наваколлю, у прыватнасці на Крэйдавыя горы, падчас якіх складалася калекцыя скамянеласцяў і першабытных прыладаў працы; потым гэта выкарыстоўвалася падчас урокаў. Вось чаму яго ўрокі "дыхалі гісторыяй". Нават азарт калекцыянера-нумізмата надаваў гэтаму баку дзейнасці Яўстафі Філарэтавіча яскравы эмацыйны каларыт [10, с. 159].

Генеалогія роду Арлоўскіх з Ашмяншчыны яшчэ не даследавана. Мы маем звесткі пра Іаана Арлоўскага (1798–1851), дзеда Яўстафія Філарэтавіча і ўніяцкага святара, які добраахвотна прыняў акт уз'яднання ўніятаў з праваслаўем і далучыў да яго дзве тысячы сваіх прыхажан (Славенская царква), а бацька Яўстафія Філарэтавіча (1851?) г. стаў таксама настаяцелям Славенскай царквы [6]. На падставе гэтых фактаў рызыкну сцвярджаць, што па сваіх каранях Яўстафій Філарэтавіч быў не проста чалавекам культуры спадкаёмцаў ВКЛ, але чалавекам русінскай культуры, што адбілася на яго цэласным стаўленні да праяў Беларускага Панямоння і асабліва дзейнасным удзеле ў краястварэнні – прыкладаў апошняга дастаткова. У прыватнасці, па просьбе гродзенскага губернатара Д.М.Бацюшкава Яўстафій Філарэтавіч апісаў гравюру Гогенберга (1572 г.) з выявай Гродна XVI ст., копію якой губернатар набыў для горада ў 1897 г.; у сваіх творах даследаваў ролю беларускага насельніцтва і беларускай культуры ў гісторыі ВКЛ; не абмінаў і палітычную дзейнасць (удзел ва ўладных структурах): быў гласным (1907) і кандыдатам у гласныя (1911) гарадской Думы. А калі яшчэ ўлічыць, што па сённяшняй класіфікацыі навук краязнаўства – гэта частка прыкладной культуралогіі, то сутнасныя краязнаўчыя напрацоўкі Яўстафія Філарэтавіча бездакорна робяць яго адметным культуролагам Гарадзеншчыны пачатку XX ст. Вось толькі адзін прыклад. Аналізуючы летапісныя звесткі, у якіх Горадзен згадваецца ўпершыню, Яўстафій Філарэтавіч вызначае 1128 год як год заснавання Гродна, бо так вынікае з Іпацьеўскага летапісу. Але цэласны падыход (на той час ён, можа, толькі-толькі нараджаўся), які для краязнаўчай дзейнасці канца XX – пачатку XXI стст. у прынцыпе самадастатковы, прымушаў яго пазначыць, што тая ж самая падзея, але пад 1127 г., зафіксавана ў Лаўрэнцьеўскім летапісе і што выдавец Іпацьеўскага летапісу, які супаставіў гэтыя запісы, лічыць што "вариант Лаврентьевской летописи вернее" [4, с.10]. Чаму Яўстафій Філарэтавіч пры гэтым, у асноўным тэксце, на той жа 10-й старонцы аддае перавагу Іпацьеўскаму летапісу і тым самым "маладзіць" Гродна на адзін год,

мы можам толькі здагадвацца: па часе стварэння Іпацьеўскі летапіс трохі старэйшы за Лаўрэнцьеўскі, больш "стары" – Радзівілаўскі летапіс – стаў вядомы шырокаму колу толькі ў 1978 г. Але падсвядома (ці інтуітыўна?) перавага (у рэшты рэшт) аддаецца 1127 г.: "Резюмируем выводы наших рассуждений о начале г.Гродны. 1). Летописные упоминания о г.Гродне под годами 1127 (падкрэслена мною – А.Г.), 1132, 1142, 1144, 1183 относятся к городу Гродне губернскому..." [4, с.20].

Пахаванне Яўстафія Філарэтавіча 4 снежня 1913 г. на праваслаўных могілках у Гродне пераўтварылася ў вялікую ўрачыстасць нябожчыка. На магілу было ўскладзена 24 вянкі. Для ўвекавечання памяці Яўстафія Філарэтавіча па прапанове яго прыхільнікаў было вырашана надрукаваць усе 11 прамоў, якія прагучалі над труной нябожчыка падчас пахавання (разам з некролагам). Такім чынам, мы маем выключную крыніцу-сведку чалавечых і прафесійных якасцяў Яўстафія Філарэтавіча. Вельмі добра, што ў Гродне нарэшце ёсць вуліца Яўстафія Арлоўскага. Але знаходзіцца яна не ў цэнтры горада і нават з боку ад тых сцяжынак, па якіх пастаянна вандраваў Яўстафій Філарэтавіч, адзін ці са сваімі вучнямі. Таму для сапраўднага ўвекавечання памяці гэтага яўна недастаткова. Тым больш, што магіла Яўстафія Філарэтавіча з цягам часу згубілася і няма куды нават ускласці кветкі ці проста прыйсці і моўчкі пакланіцца памятнаму месцу. А між тым будынак гімназіі, у якім з першага да апошняга дня свайго гарадзенскага жыцця працаваў Яўстафі Філарэтавіч, у цудоўным стане – на ім толькі не хапае мемарыяльных дошак у гонар выдатных асоб, якія звязаны з ім ці то па працы, ці то па вучобе. І першым у гэтым даволі вялікім спісе стаіць імя Яўстафія Філарэтавіча – такую думку неаднарозова ў сваіх публікацыях выказвалі гродзенскія навукоўцы. А ўсяго толькі і трэба, каб побач з барэльефным партрэтам быў лаканічны тэкст: "Тут са жніўня 1885 г. па снежань 1913 г. працаваў настаўнік гісторыі Яўстафій Філарэтавіч Арлоўскі, які атаясаміў летапісны Горадзен і нёманскі Гродна".

Дадатак. Вытрымкі з пахавальных прамоў 4 снежня 1913 года:

...Па службе адзін з самых акуратнейшых, да сваёй справы адносіўся надзвычай добрасумленна.

...Адметнай і самай прывабнай рысай яго была сціпласць [10, с.143].

...Ён быў працаўнік у навуцы, чалавек ў жыцці, таварыш у адносінах і ўсё гэта праяўляў у сябе ў такой меры і ступені, што кожны ў адносінах з ім адчуваў сябе яму роўным... Ён ніколі ні быў без справы, і адпачынак яго заключаўся толькі ў змене працы. Ён, напрыклад, на нашых педагагічных саветах заўсёды меў з сабою пра запас якую–небудзь кнігу ў якасці крыніцы для будучага твора і мноства аркушыкаў, куды і занатоўваў з крыніцы патрэбныя яму выпіскі, карыстаючыся тым часам, які не быў заняты яго ўдзелам у абмеркаванні бягучых спраў пасяджэння... Вылучаўся цікаўнасцю, ...імкнуўся ведаць усё, аб усім і пра ўсіх, і усё гэта назаўсёды захоўваў у сваёй выключнай памяці, а тое, што заслугоўвае найбольшай увагі і трактуемае ім як матэрыял для будучых прац, заносіў у свае шматлікія аркушыкі... У яго можна было даведацца наконт выхаду ў свет якой–небудзь капітальнай працы ці ўвогуле адметнай працы па розных напрамках ведаў. Яго так і лічылі... "хадзячай энцыклапедыяй"! ...Пры ўсіх сваіх шматлікіх настаўніцкіх і навуковых занятках ён не пазбягаў і сяброўскіх кампаній ...Яго вясёлы настрой весяліў і іншых... Ён заўсёды быў невычарпальны і цікавы, але ў прыўзнятым настроі размова вялася з адвольнай прастатой, з лірычным захапленнем і з больш скабрэзным гумарам ...Душа Яўстафія Філарэтавіча не двоілася: яна была аднародна і аднолькава высакародна пры ўсялякіх станах [10, с.143–144].

...усё свае жыццё быў настаўнікам і глашатам ведаў чалавечых [10, с.147].

...усё твае жыццё сведчыць, што ты не бедны і для вечнасці [10, с.154].

...у асобе Яўстафія Філарэтавіча мы бачылі чалавека ў лепшым сэнсе гэтага слова, чалавека праўдзівага, сумленна-

га, добразычлівага. Мы бачылі ў ім чалавека, які любіў людзей, асабліва вучняў, хоць некаторыя з іх не заўважалі гэтага і не цанілі... [10, с.155].

...28 гадоў прывіваў ты нашым маладым душам добратворнае насенне пазнання. З мяккай сардэчнасцю і растатой ставіўся ты да нас, сваіх выхаванцаў, з бацькоўскай любоўю адчыняў ты перад намі багатую невычарпальную крыніцу тваіх рознабаковых ведаў, натхняючы, выклікаючы жывую цікавасць да навук і асабліва да любімай табою гісторыі. Твае працы і ўсё тваё жыццё пакінулі пасля сябе светлы след. У душы кожнага з нас, тваіх вучняў, глыбока запалі твае словы; у кожным з нас назаўсёды адбілася твая кроткая, крыштальна чыстая душа, якая заўсёды імкнулася да пазнання ісціны, да дабра і справядлівасці [10, с.156].

...Выкладаў ты ня толькі з тонкім веданнем свайго прадмета, але і з захапленнем, якое ўплывала добратворна на нашу цікаўнасць, і адносіўся да нас настолькі добразычліва, што мы не можам прыпомніць выпадку, калі б хто-небудзь з нас, тваіх вучняў, хоць на імгненне лічыў бы сябе пакрыўджаным табою ...Можа хто запытаецца ў нас: "Каго вы страцілі?", мы таксама адкажам: "Настаўніка-чалавека" [10, с.157].

...Ты паміраў без жаху смерці. Дык няхай жа ўсе панесеныя табою ў жыцці пакуты будуць ачышчальнай ахвярай перад Вышэйшай чысцінёй, якую на сваім жыццёвым праяўленні адлюстроўвала душа твая, а прасявятленне твайго духа няхай будзе залогам тваіх адносін з тым святлом ісціны, дабра і прыгажосці, да якога імкнецца і аб якім сумуе кожная "жывая" чалавечая душа.

...Захапляўся сам і захапляў нас сваім прадметам [10, с.159].

...Яўстафі Філарэтавіч быў чалавекам навукі, вялікім знаўцам мясцовай гісторыі. Дзякуючы яму мы даведаліся пра мінулае свайго горада, дзякуючы яму мы зацікавіліся гэтым мінулым [10, с.162].

## Крыніцы

1. Госцеў, А.П. Арлоўскі Яўстафі Філарэтавіч / А.П. Госцеў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т.1. – Мн.: БелЭн, 1993. – С.152.

2. Госцеў, А.П. Арлоўскі Яўстафі Філарэтавіч / А.П. Госцеў // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т.1. – Мн.: БелЭн, 1996. – С.486.

3. Евстафий Филаретович Орловский // Историки Гродненщины (материал в помощь лектору) / сост. А.Н.Нечухрин. – Гродно, 1989. – С.19–20.

4. Орловский, Е. Гродненская старина. Ч.1. г. Гродна. / Е. Орловский. – Гродно: Губ. тип., 1910.

5. Орловский // Гостев А.П., Швед В.В. Кронон.: Летопись города на Немане (1116–1990). – Гродно: Пергамент, 1993. – С.193.

6. Освящение кладбищенской церкви и кладбища в м. Вишнев, Ошмянского уезда // Литовские Епархиальные ведомости. – 1873. – 23 декабря – С.412–415.

7. Пожарицкий, М. Люди библиотеки // www.sb.by /post/ 68155/fontsize/11/

8. Унбегаун Б.О. Русские фамилии. – М.: Прогресс, 1995. – 448 с. / "Галоўнае ў чалавеку – яго пачатак: ён патаемна кіруе усім яго жыццём" (Ігар Шклярэўскі). У гэтым кантэксце нават перадгісторыя жыцця Я.Ф.Арлоўскага надта сімвалічная. Нарадзіўся ён у вёсцы з красамоўным назовам Славенск у сям'і святара Філарэта Арлоўскага. Вось як тлумачыць паходжанне яго прозвішча расійскі даследчык Унбегаун: "Фамилии, образованные от названий животных. Фамилии этого типа на –ский можно уверенно определить как фамилии духовенства, например: …Орловский < орёл …Нужно иметь в виду, что голубь – христианский символ святого духа, а орёл – Иоанна Богослова" [С.175]. А калі яшчэ ведаць, што імя яго дзеда Іаан [6], то наканаванасць лёсу нашага героя становіцца відавочнай.

9. Чарапіца, В. М. Са скарбніцы кніжных паліц / В.Н. Чарапіца. – Мн., 1994. – С.41.

10. Черепица, В.Н. Гродненский православный некрополь / В.Н. Черепица. – Гродно: ГрГУ, 2001. – 201 с.

11. Швед, В.В. Летапісец Гродзеншчыны / В.В. Швед // Памяць: Гіст.–дак. хроніка горада Гродна. – Мн.: БелЭн, 1999. – С.262–264.

12. Гостев, А. Историк земли Гродненской / А. Гостев // Гродненская правда. – 1977. – 11 декабря. – С.4.

13. НГАБ в г. Гродно. Ф. 1186, воп. 1, спр. 5. Формуляр-

ный список о службе учителя истории и географии Гродненской мужской гимназии Евстафия Филаретовича Орловского 1 октября 1913 г. / "1890 г., 12 марта: утверждён в чине коллежского асессора со старшинством с ...1 августа 1885 г., – 10 декабря: произведен за выслугу лет в чин надворного советника со старшинством с ...1 авг. 1889 г.; 1893 г., 11 мая: Журнальным постановлением Гродненского губернского Статистического комитета избран в действительные члены сего комитета, – 5 июля: произведен за выслугу лет в чин коллежского советника со старшинством с ...1 авг. 1893 г.; 1898 г., 27 февраля: произведен за выслугу лет в чин статского советника со старшинством с 1 августа 1897 г.; 1910 г., – 10 ноября: вступил в законный брак; женат на вдове надворного советника Виктории Севериновне Смирновой, православного исповедания, 53 лет; детей не имеет.; 1912 г., 21 февраля: назначен членом в состав особой комиссии под председательством Гродненского Вице-Губернатора д.с.с. Столярова для разбора местного губернского архива с целью выявления дел, включающих в себе данные о минувшей военной старине".

14. НГАБ в г. Гродно. Ф. 1186, воп. 3, спр. 202. Протоколы заседаний педагогического совета за 1913 г. // Г./осподин/ Председатель предложил Педсовету обсудить поведение ученика 7 класса 2 отд. Левинсона Мойсея. Проступок его состоит в следующем. Во время урока физики (вместо урока истории, не бывшего в следствие болезни преподавателя) Левинсон производил шум и нарушил порядок, по всей видимости не довольный таким замещением уроков. Вследствие этого Л. по расп. Г. и.д. Инспектора был оставлен на два часа. Когда ему об этом сообщили, то он, Л., заявил, что не останется. На объяснение же классного наставника, что тогда он не м.б.учеником, раз он не хочет подчиняться школьной дисциплине, ответил, что "ВСЁ ТАКИ Я НЕ ОСТАНУСЬ". Вообще по заявлению классного наставника, поведение Л. не было дурным, в последнее же время за ним наблюдается стремление к протесту против порядка, гимназической дисциплины. Обсудив изложенный поступок, педсовет постановил оценить поведение Левинсона баллом "3" за 1-ю четверть и воспретить ему посещение гимназии временно, в течение 2х недель"".

15. НГАБ г. Гродно. Ф. 23, воп. 2, спр. 972. Формулярные списки преподавателей учебных заведений Гродненской губернии. 1911 г.

16. НГАБ г. Гродно. Ф. 23, воп. 2, спр. 981. Формулярные списки о службе учителей Гродненской мужской гимназии. 1913 г.

**Герасимович Татьяна Иосифовна,** *магистрант 2 курса факультета истории и социологии ГрГУ им. Я.Купалы*

# ЛИЧНОСТИ ГРОДНЕНСКИХ ГУБЕРНАТОРОВ В ИСТОРИИ ГРОДНО

В истории каждого города всегда найдется страница, посвященная людям, которые осуществляли здесь власть. Гродно являлся центром губернии, начальником (правителем) которой (главой исполнительной власти) являлся губернатор. Наделенные неограниченной властью и полномочиями губернаторы проводили в жизнь политику и волю монархического режима, твердо стояли на принципах защиты интересов и устоев монаршего трона.

Но не следует забывать, что губернаторы были также фигурами со всеми свойственными людям качествами: характерами, привычками, увлечениями, добродетелями и пороками, терпимостью и жестокостью, бездарностью и незаурядностью. Все это оказывало непосредственное влияние на проводимую ими политику.

Всего должность гродненского губернатора занимали 36 человек. Большинство из них – уроженцы российских губерний, только несколько белорусских: из Гродненской губ. – С.Ф.Урсын-Немцевич, М.Т.Бутовт-Андржейкович; из Витебской губ. – Ф.А.Зейн, М.Т.Бобятинский; из Минской губ. – К.Ф.Друцкий-Любецкий. Большинство гродненских губернаторов были православными. Урсын-Немцевич, Бутовт-Анджейкович и Яневич-Яневский были католиками; Ховен, Валь и Зейн – лютеране; крещеный еврей – И.А.Шпеер. Основная причина того, что лишь небольшое количество губернаторов имело местное происхождение и не являлись православными объясняется тем, что главной задачей губернаторов была русификация земель былого Великого княжества Литовского [1, с.15].

Кроме 36 официальных гродненских губернаторов и исполняющих их обязанности, эту должность занимали еще три человека, которые управляли губернией во время войны 1812 г.

Образование гродненских губернаторов было достаточно серьезным. Выпускниками Московского университета были М.Н.Муравьев и Д.Н.Батюшков. Петербургский университет в свое время закончили П.А.Столыпин, Н.А.Добровольский, П.М.Боярский, А.В.Бобринский. Н.П.Урусов являлся выпускником Александровского лицея, А.П.Потемкин – Ришельевского лицея. Кадетские корпуса закончили Ф.А.Зейн и И.А.Шпеер, Х.Х.Ховен, К.Ф.Друцкий-Любецкий. Пажеский корпус выпустил из своих стен А.Е.Зурова, В.Н.Шебеко, В.Д.Лишина, М.М.Осоргина, И.Н.Скворцова, Н.М.Цеймермана. Даже те, кто не назван, по обычаям того времени имели достаточно хорошее домашнее образование [1, с.6].

Некоторые из губернаторов являлись неплохими специалистами в определенных областях знаний: в экономике – Друцкий–Любецкий, в сельском хозяйстве – Столыпин. Ховен, Дрenякин, Осоргин оставили после себя дневники и мемуары. Добровольский являлся редактором пятитомного издания "Истории Сената". Бутовт-Анджейкович написал "Очерки Кавказа". Валь опубликовал статью "Наместник в Царстве Польском" и подготовил "Список руководящих деятелей восстания 1863–1864 гг." Лишкин занимался коллекционированием фракийских монет, и его коллекцию в 1909 году приобрёл Эрмитаж. Благодаря заинтересованности Доппельмайера и Боярского были проведены химические анализы Друскеникских минеральных вод и организован курорт, популярный не только среди жителей Гродненской губернии [1, с.16].

Своей деятельностью некоторые губернаторы заслужили звание почетных граждан Гродно – И.Н.Скворцов, Д.Н.Кропоткин, А.Е.Зуров. Трем губернаторам – П.А.Столыпину, Д.Н.Батюшкову и А.Е.Зурову – в учебных учреждениях Гродно были установлены именные стипендии.

Но некоторые губернаторы проявили себя с негативной стороны. Первый гродненский губернатор Д.Р.Кошелев был уволен с должности "за явное пособничество контрабанде", о

чем написал гродненский историк Е.Ф.Орловский. Против губернатора Анджейковича было возбуждено следственное дело за незаконное использование земских сумм. Галлер, по словам того же Орловского, "отличился наглостью, мошенничеством и воровством" [1, с.16].

Губернатор Ланской проявил себя как защитник православия. По его инициативе Фара Витовта была восстановлена после пожара и приспособлена под православный храм [1, с.24]. Выходец из древнего белорусского княжеского рода, участник итальянского и швейцарского походов Суворова, Ксаверий Францевич Друцкий-Любецкий был масоном. Вместе с Анджейковичем являлся членом гродненской масонской ложи "Приятели человечества".

Михаил Фадеевич Бутовт-Андржейкович приложил немало усилий к распространению в Гродно и в губернии ланкастерской системы образования, издал в Гродно брошюру на польском языке "О школе Ланкастера", открыл школу взаимного обучения по методу Ланкастера. Этот губернатор активно содействовал развитию благотворительности в губернии. В 1824 г. по его решению был составлен проект перестройки здания больницы Доминиканского монастыря под дом благотворительности. Анджейкович являлся первым президентом гродненского благотворительного общества. Кстати, в период его губернаторства было завершено строительство Августовского канала, ставшего впоследствии важнейшей транспортной артерией губернии [1, с.37]. В 1824 г. дворянство Гродненской губернии преподнесло Анджейковичу адрес с выражением признательности за "попечительное благоразумное управление губернией". В библиотеке Академии Наук Литвы в рукописной тетради хранятся "Очерки Кавказа", написанные губернатором на польском языке.

Михаил Трофимович Бобятинский содействовал в 1830 г. проведению анализа химического состава воды друскеникских минеральных источников. В этом же году по его инициативе была создана комиссия с целью организации в Гродно публичной библиотеки, для которой он согласился предоставить одну из комнат в занимаемом им доме. Однако Бобя-

тинскому так и не удалось открыть библиотеку в Гродно, даже несмотря на дважды сделанный запрос в Министерство внутренних дел.

Библиотека в губернском центре все же была открыта, но уже в годы губернаторства Михаила Николаевича Муравьева. Это весьма неординарная личность не только в истории России, но и в истории белорусских земель, где он проявил себя с разных сторон. Выходец из древнего дворянского рода, обладавший блестящим математическим складом ума, он достаточно быстро сделал себе карьеру. Своему продвижению по служебной лестнице он был обязан исключительно своим способностям и труду. Уже в возрасте 16 лет он участвовал в Бородинской битве, был тяжело ранен и едва не погиб. Своей деятельностью М.Муравьев снискал себе славу "истинно русского человека", истребляя все, что противоречило монаршим устоям Российской державы, беспощадно боролся с повстанцами в белорусских губерниях. Сохранились свидетельства князя П.В.Долгорукого о том, что приехавший в Гродно Муравьев (уже назначенный гродненским гражданским губернатором) узнал, что один из местных жителей спросил у одного из чиновников: "Наш новый губернатор родственник ли моему былому знакомому Сергею Муравьеву–Апостолу, который был повешен в 1826 году?". Муравьев вскипел гневом (кажется, было не из-за чего) и сказал: "Скажите этому ляху, что я не из тех Муравьевых, что были повешены, а из тех, которые вешают" [1, с.49].

Муравьев приложил максимум усилий для подавления восстания 1830–1831 гг. Так, он сослал в Сибирь князя Р.Е.-Сангушко, которого привели в губернаторский дом, где с него сорвали мундир, а губернатор плюнул ему в лицо. В "отдаленные местности империи" были сосланы организаторы беспорядков в Гродненской доминиканской гимназии, которая в конце концов по приказу губернатора была упразднена.

Тем не менее, Муравьев проявил себя и в совершенно другом качестве. В 1834 г. в присутствии губернатора произошло торжественное открытие Гродненской гимназии, куда учителями Муравьев, естественно, назначил лиц русского

происхождения. Кроме того, губернатор содействовал епископу Семашко в восстановлении иконостасов в униатских церквях. Благодаря его содействию в 1830-е годы в Коложской церкви стали совершаться православные обряды, дабы постепенно приучать униатское население к возвращению в лоно православной церкви. В 1834 г. после очередного обращения в МВД в Гродно была открыта публичная библиотека. Губернатор всю свою деятельность направил на "стирание следов полонизации края" и его русификацию [1, с.50].

Следующий губернатор Григорий Гаврилович Доппельмайер известен тем, что составил проект организации курорта в Друскениках. Проект был утверждён царём. Вскоре губернатор возглавил комитет, учрежденный специально для управления курортом. Один из минеральных источников, кстати, был назван в честь губернатора – Доппельмайерским [1, с.55]. Губернатору также принадлежит заслуга открытия при Гродненской гимназии природоведческого кабинета. Последний был открыт в связи с найденными случайно костями мамонта на берегу Лососянки. Позже эти находки были переданы в Виленский музей древностей. При Доппельмайере в Гродно начали выходить "Гродненские губернские ведомости".

Губернатор Федор Иванович Васьков отличился тем, что организовал передачу шкур и костей трех беловежских зубров для коллекций Парижского и Гамбургского музеев [2, л. 1]. Что же касается следующего гродненского губернатора, лютеранина по вероисповеданию, Ховена фон дер Христофора Христофоровича, то он один из первых высказал тревогу за судьбу древнейшего православного храма – Коложи, серьезно пострадавшего в результате очередного оползня. Однако конкретных и радикальных мер по сохранению древнейшего памятника культуры предпринято не было. Ховен, как впрочем и последующие губернаторы, ограничился лишь выделением денег на укрепление берега под церковью.

Ивану Абрамовичу Шпееру с занимаемой им должностью гродненского губернатора в преддверии восстания 1863–1864 гг. не повезло. Как человек, по свидетельству современников, он был весьма "почтенным и достойным", но вот в

качестве начальника губернии "он оказался вовсе не по тогдашним трудным обстоятельствам". Как отмечал историк Орловский "...дело доходило до того, что уличные манифестанты, образовавшие значительную толпу, подходили к губернаторскому дому, пели там патриотические гимны и разражались потоком брани по адресу правительства". Вероятно, за недостаточно решительные действия он был снят с должности. Его экипаж, покидавший Гродно, забросали песком и камнями [1, с.67].

С именем Александра Зурова в истории Гродно связано открытие первой повивальной школы в Беларуси. Губернатор долго не решался на это "из-за слишком больших материальных затрат", но в 1876 г. все же дал свое согласие на открытие школы вместе с приютом при ней [5, с.99]. При Зурове началось строительство Александро-Невской церкви. Губернатор лично выделил плац на Дворцовой (Губернаторской) площади [9, с.12]. Одним из первых он оказал помощь гродненцам, пострадавшим от пожара 1885 г. Зуров являлся почетным гражданином городов Гродно, Белостока, Соколки.

С историей Гродно связаны 9 месяцев жизни и деятельности Петра Аркадьевича Столыпина (с июня 1902 г. по март 1903 г.). Несмотря на столь короткий промежуток времени, он сделал много, о чем свидетельствует тот факт, что после смерти Петра Аркадьевича 15 июня 1914 г. в городе ему был установлен памятник-бюст [1, с.116.].

Будущий реформатор России родился в 1862 году в Германии в семье, принадлежавшей к старинному дворянскому роду. Окончив Петербургский университет, Столыпин служил в Министерстве финансов, а затем внутренних дел. Карьера его продвигалась успешно. 13 июня 1902 года Петр Аркадьевич был назначен исполняющим обязанности гродненского губернатора [1, с.113].

Уже осенью 1902 года по инициативе Столыпина в Гродно было открыты еврейское двухклассное народное училище, оборудованное всеми техническими приспособлениями, а также женское приходское училище с третьим профессиональным классом. В училище преподавались, кроме общепринятых

предметов, рисование, черчение и рукоделие. Училище такого типа стало первым для всей губернии. В 1903 году началась подписка на учреждение именных стипендий супругов Столыпиных для лучших учащихся Гродненской мужской гимназии [11, с.6].

Имя "Великого реформатора"еще при жизни стало легендарным. О его уме, деловитости, стойкости и мужестве говорили не только в правительственных сферах, но и в народных низах. Одна из легенд, отражающая любовь и привязанность Столыпина к городу Гродно, жива и поныне. Местные старожилы из поколения в поколение передают твердое убеждение, что если бы не бывший гродненский губернатор, то вряд ли нынешний гродненский Свято-Покровский храм находился бы на том месте, где он и ныне [11, с.6]. Столыпин один из первых поддержал гродненцев в их желании увековечить память о своих земляках, погибших на полях сражений в русско-японскую войну.

Вскоре после трагической гибели Петра Аркадьевича, 6 сентября 1911 года, в гродненском Софийском соборе состоялась панихида по убитому. Под председательством губернатора В.М.Борзенко был учрежден комитет для увековечивания памяти Столыпина (кстати, в течение первых месяцев после гибели бывшего гродненского губернатора по всей России начался сбор средств на строительство памятников ему в нескольких городах страны). В Гродно планировалось поставить Столыпину памятник-бюст на городской площади, напротив губернаторского дома. 15 июня 1914 года в торжественной обстановке состоялось открытие памятника, который находился в сквере с северной стороны Александро-Невской церкви [1, с.116]. К сожалению, памятник не сохранился; по некоторым сведениям в годы Первой мировой войны немецкие войска демонтировали памятник и отправили в Германию в качестве боевого трофея.

Губернатор Виктор Михайлович Борзенко стал известен, кроме прочего, разрешением действовать Обществу любителей драматического и музыкального искусства "Муза", которое играло заметную роль в культурной жизни губернского Гродно начала XX века. Общество было создано в 1907 году по инициативе представителей польской интеллигенции горо-

да [3, л.4]. Даже с началом Первой мировой войны "Муза" не прекратила своей деятельности. 7 января 1915 года губернатор Вадим Николаевич Шебеко разрешил провести большой вечер-концерт с целью оказания помощи пострадавшим от военных действий. Весь денежный сбор пошел в фонд помощи пострадавшим во время войны [10, с.330].

Деятельность "Музы" способствовала повышению уровня образованности и культуры жителей Гродно. "Муза" дала возможность проводить свободное время с пользой и удовольствием, и это привлекало к ней все большее количество желающих. Общество способствовало развитию драматического и музыкального искусства, приобщению гродненцев к достижениям мировой литературы, дало возможность многим открыть в себе талант.

Что же касается губернатора Шебеко, то сохранились сведения о том, что он запретил выступление В.Маяковского и других московских футуристов в Гродно и в Белостоке. Губернатор беспокоился, чтобы "поэзо-концерт", запланированный на 2 марта 1914 г., не вызвал волнений среди жителей губернии, так как события первой русской революции 1905–1907 гг. хорошо помнила власть. Поэтому неудивительно, что Шебеко просил московского градоначальника предоставить ему всю информацию о Маяковском [7, с.4]. Переписка между чиновниками затянулась, выступления московских футуристов в Гродно и Белостоке были сначала сорваны из-за затянувшейся переписки, а потом и вовсе отменены. Маяковский приехал в Гродно только после Октябрьской революции. А губернатор, главной задачей которого было сохранение спокойствия на подвластной ему территории, достиг своего, но не надолго. Через несколько месяцев началась война, которая изменила многое, если не сказать все, в жизни города над Неманом и всей Российской империи.

Таким образом, гродненские губернаторы своей деятельностью проводили, в первую очередь, ту политику, которая отвечала интересам российского самодержца. Русификация "возвращенных от Польши земель" порой проходила в очень жестком формате, о чем свидетельствует, например, политика Муравьева. Но это только одна из граней их деятельности. Жизнь, быт, который окружал их, влиял на принимаемые ими решения: отрыть школу, гимназию или нет; организовать

очередной сбор средств в помощь голодающим; отремонтировать церковь или организовать природоведческий музей; утвердить проект нового любительского общества или запретить выступление "подозрительного и политически неблагонадежного" поэта… А ведь это тоже – история Гродно, которая по-своему важна и интересна для всех, кто с любовью и трепетом относится к городу над Неманом.

**Список литературы и источников:**

1. Афанасьева, Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801–1917 гг.): документально-биографические очерки / Т.Ю.Афанасьева, Р.Ф.Горячева, В.В.Швед. – Гродно, 2007. – 168 с.

2. Дело о выдаче разрешения на убой трех зубров в Беловежской пуще с целью доставления кож и скелетов в Гамбургский и Парижский музеи 1846–1847 г. // НИАБ в г.Гродно. – Фонд 1. – Оп.5. – Д.734.

3. Дело о регистрации Гродненского Общества любителей драматического и музыкального искусства "Муза". // НИАБ в Гродно. – Фонд 103. – Оп.1. – Д.111.

4. Иващенко, Н.А. Александр Тальгейм и его "Муза" / Н.А. Иващенко // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі: матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі. – Гродна, 2008. – С.464-469.

5. Игнатович, Ф.И. Первая фельдшерская школа Беларуси и ее организатор врач Г.Ф.Лебедев (Гродно 1863–1869 гг.) / Ф.Игнатович // Журнал ГрГМУ, 2004. – №3. – С.98–100.

6. Орловский, Е.Ф. Граф М.Н.Муравьев, как деятель над укреплением прав русской народности в Гродненской губернии. 1831–1835 и 1863–1865 гг. / Е.Ф. Орловский – Гродна, 1898.

7. Орловский, Е.Ф. Гродненская старина. Ч.1: Гор. Гродно / Е.Ф. Орловский. – Гродна, 1910.

8. Стукало, А. Губернаторство настораживалось, или о том, почему не состоялось выступление Маяковского в Гродно: 1914 г. / А. Стукало // Гродненская правда. – 1982. – 6 февраля.

9. Трусов, И. Призраки Городницы: Между землей и небом. / И.Трусов, А. Чернякевич // Вечерний Гродно. – 2009. – 25 марта – С.12.

10. Черепица, В.Н. Город-крепость Гродно в годы Первой мировой войны / В.Н. Черепица. – Гродно. 2006.

11. Черепица, В.Н. Неизвестный Столыпин / В.Н. Черепица // Вечерний Гродно. – 2003. – 29 января

12. Швед, В.В. Губернскі Гродна: Аповяды з гісторыі горада (канец XVIII – пачатак XX ст.) / В. Швед. – Баранавічы, 2003. – 168 с.

**Ярмусік Эдмунд Станіслававіч,** *кандыдат гістарычных навук, дэкан факультэта гісторыі і сацыялогіі УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы"*

# КАТАЛІЦКІЯ СВЯТАРЫ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ – АХВЯРЫ СТАЛІНСКІХ РЭПРЭСІЙ

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў савецкая ўлада працягнула наступленне на Царкву. Пасляваеннае дзесяцігоддзе характарызуецца не толькі закрыццём касцёлаў, абмежаваннем дзейнасці рэлігійных арганізацый, масавай атэістычнай прапагандай, але і палітычнымі рэпрэсіямі супраць каталіцкага духавенства. Гэта быў адзін з бесчалавечных метадаў барацьбы з Касцёлам, бо ў выніку былі беспадстаўна абвінавачаны многія людзі, зламаны іх лёсы. Рэпрэсіі з'яўляліся вынікам рэалізацыі ідэі аб абвастрэнні класавай барацьбы і скіраваны супраць "ворагаў народа", да якіх былі залічаны сотні тысяч людзей.

Асаблівасцю рэпрэсій супраць каталіцкага духавенства было тое, што яны мелі ідэалагічную і палітычную аснову. Ідэалагічная заключалася ў непрымірымасці рэлігійнага і марксісцкага светапоглядаў, у барацьбе з рэлігіяй як з "перажыткам мінулага ў свядомасці людзей". Палітычная аснова рэпрэсій выцякала з асаблівага становішча Каталіцкага Касцёла ў СССР, які заўсёды разглядаўся як "адзіная легальна дзеючая арганізацыя, якой кіравалі з-за мяжы", а каталіцкае духавенства – як "агенты і стаўленікі Ватыкана". На працягу дзесяцігоддзяў гэты вобраз "ворага" не зведаў істотных зменаў [1, с.111–115].

Існавала адладжаная сістэма дзейнасці НКУС (МДБ) па "распрацоўцы" духавенства, якая ўключала збор інфармацыі, вярбоўку агентуры з атачэння ксяндза, тайныя назіранні, прагляд карэспандэнцыі, вызначэнне кола сведкаў і г.д. Арышты ксяндзоў праводзіліся мэтанакіравана. На кожнага з іх

збіралася значная колькасць доказаў для прад'яўлення абвінавачвання. Існавала пэўная паслядоўнасць ажыццяўлення арышту – не ўсіх адразу і не з адной мясцовасці, каб не выклікаць масавага незадавальнення вернікаў. Першымі былі арыштаваны ў 1944 годзе Вацлаў Нуркоўскі з Забалаці Воранаўскага раёна, затым Альбін Горба з Мяжэрычаў Зэльвенскага раёна, Чэслаў Штэйн з Радуні Воранаўскага раёна. У 1947 годзе арыштавалі ксяндзоў Міхаіла Шалкевіча з Падароска Поразаўскага раёна, Яна Мяноўскага з Рагозніцы і Іосіфа Маціеўскага з Заневіч Мастоўскага раёна, у 1948 – ксяндзоў Мечыслава Радзішэўскага, дэкана Лунненскага дэканату, Ігнація Альшанскага з Падароска Поразаўскага раёна, у 1949 годзе – ксяндзоў Яна Мароза з Ражанкі Шчучынскага раёна, Юльяна Барувко з Рэплі Ваўкавыскага раёна, Вацлава Драбба са Струбніцы Мастоўскага раёна, у 1950 – ксяндзоў Казіміра Арлоўскага з Адамавіч Гродзенскага раёна, Уладзіслава Мончка з Новага Двара Шчучынскага раёна, у 1951 – ксёндза Алойзы Тамковіча з Уснар Бераставіцкага раёна і шэраг іншых. Пры гэтым пік рэпрэсій, па падліках аўтара, прыходзіўся на 1949 год, калі ў цэлым па Беларусі было арыштавана 29 ксяндзоў (28,4%) ад усіх арыштаваных у 1944–1952 гадах [1, с.128].

Сведкаў на допытах вымушалі даваць паказанні такія, якія адпавядалі загадзя прадуманаму сцэнарыю аб "выкрыцці ворагаў" савецкага ладу. Следчыя так ставілі пытанні, каб падвесці дапытваемых да чаканага адказу. Асаблівая ўвага звярталася на змест казанняў у касцёлах і прыватныя размовы, бо ў іх, як правіла, ксяндзы выказвалі свае адносіны да палітыкі савецкай улады, да становішча сялянства, абцяжаранага непамернымі падаткамі, знішчэння рэлігіі, закрыцця касцёлаў і г.д. Выказвалі спадзяванні, што ўлада зменіцца, заклікалі не выязджаць у Польшу. Усё гэта разам узятае давала падставу следчым кваліфікаваць дзейнасць ксяндзоў як антысавецкую.

Так, яшчэ да арышту 3 сакавіка 1951 года ксяндза Анжадаўскага касцёла Ашмянскага раёна Каспера Іосіфавіча Валадкевіча, на яго быў сабраны адпаведны кампрамат. Свед-

ка Ч. на допыце 9 верасня 1949 года паказала: "Ксёндз Валадкевіч у адносінах да Савецкай улады настроены варожа. Калі я была ў касцёле, то неаднаразова чула, як ён выступаў з амбона перад веруючымі, гэтыя казанні былі супраць Савецкай улады. Прыкладна ў 1945 годзе Валадкевіч выступаў з казаннем, у якім заклікаў веруючых католікаў не пакідаць сваіх зямель, не выязджаць у Польшчу... у сакавіку 1947 г. у казаннях заклікаў веруючых не выдаваць адзін другога, бо так доўга не можа працягвацца, павінна быць перамена... У час правядзення кампаніі па падпісцы на дзяржаўныя пазыкі 6 мая 1948 года пачаў узводзіць антысавецкі паклёп, гаварыў са знявагай, што... у Савецкім Саюзе амаль нічога няма. У верасні 1948 года гаварыў, што савецкія законы абдзіраюць падаткамі мужыкоў, адбіраюць у іх апошнія капейкі...". Прыкладна такія "доказы злачыннай дзейнасці" ўтрымліваліся і ў паказаннях іншых сведкаў.

Відаць, хтосьці папярэдзіў ксяндза аб пагрозе яго арышту, і з пачатку 1950 года ён быў вымушаны хавацца. У яго адсутнасць нарсуд Ашмянскага раёна прыняў пастанову аб канфіскацыі маёмасці дзеля пагашэння падаходнага падатку.

Арыштавалі ксяндза К.І.Валадкевіча на хутары Антонішкі Безубгнянскага сельсавета Тракайскага раёна, што на Літве. Следства працягвалася да 20 чэрвеня 1951 года. Прысуд Маладзечанскага аблсуда быў суровым – 25 год зняволення і 5 год пазбаўлення правоў, хаця ксёнз не прызнаў сябе вінаватым у антысавецкай дзейнасці. Не задаволіў суд і заявы ксяндза выклікаць 25 чалавек з ліку прыхаджан, якія маглі б пасведчыць на яго карысць. Засталося ўсё без змен, нават пасля касацыйных скаргаў на несправядлівасць прысуду ў Вярхоўны суд БССР і Генеральную пракуратуру СССР.

Пакаранне ксёндз К.І.Валадкевіч адбываў у Краснадарскім краі, на станцыі Кача Краснаярскай чыгункі, паштовая скрынка УП–288/2. Быў вызвалены ў 1954 годзе. І толькі 13 жніўня 1998 года Пракуратура РБ направіла пратэст у Ваенную калегію Вярхоўнага Суда РБ, у якім было адзначана: "Прыгавор і наступныя азначэнні падлягаюць адмене па наступных падставах. Высновы суда не адпавядаюць фак-

тычным абставінам справы. Негатыўныя выказванні Валадкевіча неабгрунтавана інтэрпрэтаваліся судом як антысавецкія, яны не ўтрымліваюць заклікаў да звяржэння, падрыву або аслаблення савецкай улады або здзяйснення асобных контррэвалюцыйных злачынстваў" [2].

Гельмер Баляслаў, ксёндз Жупранскай парафіі Ашмянскага раёна Маладзечанскай вобласці быў арыштаваны 28 лютага 1951 года. У пастанове на арышт гаварылася, што ён "з'яўляецца польскім нацыяналістам, непрымірымым ворагам савецкай улады, сістэматычна праводзіць сярод веруючых католікаў антысавецкую работу, выхоўвае іх у духу варожасці да савецкага ладу, узбуджае ў іх нацыянальную рознь – варожасць да рускіх і беларусаў, распаўсюджвае антысавецкія выдумкі".

У чым жа быў вінаваты ксёндз? І ці быў вінаваты наогул? Паводле паказанняў сведак, якіх яшчэ да арышту ксяндза выклікалі на допыт, "ксёндз выступаў у касцёле з антысавецкай пропаведдзю летам 1948 года ў сувязі з тым, што дзяўчына (полька) вышла замуж за беларуса". У іншых казаннях быццам бы гаварыў, што "Саветы ненавідзяць і пераследуюць палякаў і каталіцкую рэлігію, а таму на касцёл накладзены вялікі падатак, каб закрыць яго". Адмаўляўся ксёндз і ад падпіскі на дзяржаўную пазыку, крытыкаваў улады за тое, што з насельніцтва бяруць непамерныя падаткі, з–за гэтага людзі жывуць у Савецкім Саюзе горш, чым у другіх краінах.

Па справе Б.Гельмера было дапытана 30 сведкаў, з 9 з іх была праведзена вочная стаўка. На допытах, якія працягваліся да 14 чэрвеня 1951 года, следчыя вымушалі ксяндза прызнаць сябе вінаватым у правядзенні антысавецкай агітацыі сярод насельніцтва, у распальванні нацыянальнай варожасці да рускіх і беларусаў, паклёпе на Савецкую ўладу. Але ксёндз рашуча адмаўляў усе абвінавачванні як несправядлівыя. 20 сакавіка яму была зачытана пастанова аб прад'яўленні абвінавачвання. У ёй гаварылася, што ксёндз Б.Гельмер "праводзіў сярод насельніцтва антысавецкую нацыяналістычную агітацыю, усхваляў жыццё пры былой панскай

Польшчы. Скажаў савецкія законы, паклёпнічаў на існуючы ў Савецкім Саюзе калгасны лад, ганьбаваў савецкіх работнікаў. У сваёй кватэры Гельмер захоўваў антысавецкую літаратуру. Апрача таго, летам 1948 года і летам 1949 года наладжваў зборышчы дзяцей малодшага школьнага ўзросту і прывіваў ім рэлігійныя звычаі".

Відавочна, што абвінавачванне, прад'яўленае ксяндзу ў якасці антыдзяржаўнага злачынства, у дэмакратычнай краіне не варта было б увагі. Але іншая справа ў СССР з яго тагачасным таталітарным рэжымам, які не прызнаваў ніякага іншадумства і крытыкі. 14 чэрвеня 1951 года Маладзечанскі абласны суд вынес суровы прысуд па справе ксяндза Б.Гельмера: на падставе артыкула 159 Крымінальнага Кодэксу БССР падвергнуць выпраўленча-працоўным работам на агульных асновах на 1 (адзін) год з утрыманнем 25% ад заробку ў месяц. Яго ж па арт.72 пункт "б" Крымінальнага Кодэксу і з санкцыі арт.64 КК БССР і з прымяненнем арт.2 Указа Прэзідыўма ВС СССР ад 26 мая 1947 года "Аб адмене смяротнага пакарання" заключыць у выпраўленча-працоўны лагер тэрмінам на 5 год з пазбаўленнем правоў па пунктах "а", "б", "в" арт.34 КК БССР з канфіскацыяй ўсёй маёмасці [3].

Смерць І.Сталіна пазбавіла ксёндза Б.Гельмера, як і многіх іншых ахвяраў сталінскіх рэпрэсій, адбывання поўнага тэрміну прысуду. У сакавіку 1956 года ён вярнуўся ў Жупраны і прадаўжаў сваю пастырскую дзейнасць да канца жыцця (памёр 28 снежня 1969 года). І толькі 25 верасня 1992 года быў рэабілітаваны [4, с.116].

Шэраг ксяндзоў былі арыштаваны за сувязь з удзельнікамі польскай Арміі Краёвай і антысавецкім падполлем, якое дзейнічала ў заходніх абласцях Беларусі. Але, як сведчаць архіўныя справы, гэтая сувязь заключалася ў большасці выпадкаў у тым, што ксяндзы спавядалі ўдзельнікаў АК, адпраўлялі для іх імшу, выступалі перад імі з казаннямі патрыятычнага характару. Да гэтага дадавалася яшчэ абвінавачванне ў "антысавецкай дзейнасці" – навучанні дзяцей катэхізісу, крытыцы праводзімай органамі ўлады палітыкі, у непа-

жаданых для ўлады выказваннях, наяўнасці літаратуры на польскай мове – і гэтага было дастаткова, каб падвергнуць ксяндза рэпрэсіям. На такіх падставах быў арыштаваны 15 студзеня 1951 года настаяцель Пелясскага касцёла Радунскага раёна Іван Алойзавіч Венажэндзіс. Паводле пастановы Асобай нарады пры МДБ СССР ад 1 верасня 1951 года, "за пасобніцтва антысавецкай нацыяналістычнай бандзе і антысавецкую агітацыю" ксяндза заключылі ў выпраўленча-працоўны лагер на 10 гадоў, а маёмасць канфіскавалі. Ён адбываў пакаранне ў Камышовым лагеры горада Омска, паштовая скрынка № 122-1. З лагера напісаў міністру ўнутраных спраў СССР пісьмо, у якім гаварыў аб несправядлівасці пакарання: "За час сваёй дзейнасці як ксёндз я ніколі не ўнікаў у палітыку і не займаўся ёю, строга прытрымліваўся Закона Божага і прапаведаваў яго сярод мясцовых жыхароў". Ён адмаўляў сувязь з польскім падполлем, сцвярджаў, што факты былі падтасаваны. Скаргай займалася следчае ўпраўленне КДБ пры СМ СССР, пракуратура СССР. Але прыгавор пакінулі ў сіле. І толькі 7 ліпеня 1956 года ксёндз быў вызвалены з лагеру са зняццем судзімасці. 30 лістапада 1989 года рэабілітаваны [5].

Іосіфа Іосіфавіча Грасевіча, настаяцеля касцёла ў вёсцы Новая Руда Скідзельскага раёна, арыштавалі 1 лістапада 1951 года. Матывы арышту заключаліся ў тым, што, "з'яўляючыся непрымірымым ворагам савецкай дзяржавы і выкарыстоўваючы сваё службовае становішча, устанавіў злачынную сувязь з удзельнікамі польскай антысавецкай арганізацыі "АК" і яе ўзброенымі тэрбандгрупамі. У красавіку 1946 г. выязджаў у тэрбандгрупу "Фаля", якая хавалася ў лясным масіве, дзе спавядаў каля 20 чалавек бандытаў, даваў ім духоўныя настаўленні, садзейнічаў рэалізацыі іх злачынных намераў і ўкрыццю слядоў злачыннай дзейнасці. На працягу многіх гадоў праводзіў сярод прыхаджан католікаў антысавецкую агітацыю і прапаганду, накіраваную на выхаванне ў духу нянавісці да савецкага ўраду і камуністычнай партыі дзяцей школьнага і дашкольнага ўзросту навучаў катэхізісу і прыцягваў іх да прыслужвання ў касцёле".

Такім чынам, галоўным фактарам арышту была сувязь ксяндза з Арміяй Краёвай, а дакладней тое, што па доўгу сваёй пастырскай дзейнасці ён спавядаў "акаўцаў". Гэтага следству паказалася недастаткова, таму 16 лістапада 1951 года ксяндзу прад'явілі дадатковыя абвінавачванні, што, "як служыцель рымска-каталіцкага культа, з 1936 па 1939 год з'яўляўся памочнікам сакратара цэнтра касцёльнай арганізацыі (Інстытут каталіцкіх акцый)", кіраўніком каталіцкага таварыства "Мар'янум" (сапр. "Садаліцыя Мар'янская" – Э.Я.), якое існавала ў Вільна і праводзіла актыўную антыкамуністычную контррэвалюцыйную дзейнасць. Асабіста ўзначальваў рэдакцыі шэрагу каталіцкіх рэакцыйных часопісаў. З 1944 года па заданню цэнтра рымска-каталіцкага культа займаўся місіянерскай дзейнасцю ў гарадах БССР. Займаўся апалячваннем беларусаў".

Ксёндз толькі часткова прызнаў сябе вінаватым – і толькі ў тым, што кіраваў каталіцкімі арганізацыямі, быў адказным рэдактарам часопіса "Каталіцкі нядзельнік", дырэктарам каталіцкага таварыства "Карытас".

31 снежня 1951 года следства была закончана. 23 студзеня 1952 года Ваенны Трыбунал войск МДБ Гродзенскай вобласці вынес прысуд: на падставе арт. 24–63-I КК БССР падвергнуць заключэнню ў выпраўленча-працоўны лагер тэрмінам на 25 гадоў, з канфіскацыяй усёй маёмасці, пазбаўленне правоў, прадугледжаных пунктамі "а", "б", "в" арт. 34 КК БССР на 5 год. Не рэабілітаваны [6].

Не ўсе ксяндзы вярнуліся з месцаў зняволення. Загінулі ў сталінскіх лагерах Дамінік Гайлучак з Беняконь і Вацлаў Нуркоўскі з Забалаці Воранаўскага раёна, Ян Мароз з Ражанкі Шчучынскага раёна і інш.

Пасля вяртання з лагераў ксяндзоў чакалі новыя выпрабаванні. Многія парафіі былі ў заняпадзе, касцёлы зачынены або выкарыстоўваліся пад склады, спортзалы, клубы. Шмат вернікаў выехалі ў Польшу. Негатыўна сказваліся працэсы секулярызацыі грамадства, атэістычная палітыка дзяржавы. Да таго ж ксяндзам адмаўлялі ў рэгістрацыі на права праводзіць богаслужэбную дзейнасць, а таксама ў прапісцы. Па

гэтай прычыне частка каталіцкага духавенства вымушана была пакінуць Беларусь.

Сталінскія рэпрэсіі пакінулі цяжкі след у гісторыі Каталіцкага Касцёла на Беларусі. Побач з пазбаўленнем нявінных людзей волі, грубейшым парушэннем правоў чалавека, яны прывялі да ўкаранення ў грамадстве жорсткасці, бяздушна, бездухоўнасці. Да таго ж у грамадстве панаваў страх, быў падарваны давер соцень тысяч людзей да ўлады.

## Літаратура


1. Ярмусик, Э.С. Католический Костёл в Беларуси в 1945–1990 годах / Э.С.Ярмусик. – Гродно: ГрГУ им. Я.Купалы, 2006.
2. Архіў Упраўлення КДБ па Гродзенскай вобласці. Архіўная справа 22736.
3. Архіў Упраўлення КДБ па Гродзенскай вобласці. Архіўная справа П-14940.
4. Маракоў, Л. Рэпрэсаваныя каталіцкія духоўныя, кансэкраваныя і свецкія асобы Беларусі. 1917 – 1964 / Л.Маракоў. – Мінск: "Смэлтак", 2009.
5. Архіў Упраўлення КДБ па Гродзенскай вобласці. Архіўная справа П-11076.
6. Архіў Упраўлення КДБ па Гродзенскай вобласці. Архіўная справа 3000.

# ЧАЦВЁРТЫЯ ГАРАДЗЕНСКІЯ ЧЫТАННІ

*да 240-годдзя*
*гродзенскага тэатра Тызенгаўза*



Гродна, 2009

**Кітурка Ірына Фёдараўна,** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы"*

# ГАРОДНЯ ЧАСОЎ АНТОНІЯ ТЫЗЕНГАЎЗА: ПАЛІТЫЧНЫ, ЭКАНАМІЧНЫ, КУЛЬТУРНЫ ЦЭНТР ВКЛ

У гісторыі кожнага народа, населенага пункта, пэўнай асобы ёсць такія лёсавырашальныя моманты, якія вызначаюць іх жыццё на доўгі перыяд. У гісторыі Гародні адным з такіх перыядаў стала другая палова XVIII ст., калі горад апынуўся ў самым цэнтры палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця ВКЛ. Гэта стала магчымым, у першую чаргу, дзякуючы актыўнай дзейнасці дзяржаўнага і палітычнага дзеяча, знакамітага рэфарматара і мецэната таго часу Антонія Тызенгаўза (1735–1785).

Нельга сказаць, што да А.Тызенгаўза Гародня займала другарадныя ролі ў дзяржаве: горад здаўна з'яўляўся рэзідэнцыяй Вялікіх князёў літоўскіх, пасля заключэння Люблінскай уніі належаў да ліку гарадоў "Яго Каралеўскай Вялікасці", на сойме 1673 г. было прынята рашэнне аб правядзенні ў Гародні кожнага трэцяга чарговага сойма, за выключэннем канвакацыйнага, каранацыйнага і элекцыйнага, для чаго ў 1737–1742 г. быў пабудаваны новы каралеўскі палац (да падзелаў Рэчы Паспалітай у Гродне адбыліся 11 соймаў [1, с.157–169]). Да таго ж, маючы статус павятовага горада, у Гародні адбываліся павятовыя соймікі. Так што тэмпература палітычнага жыцця ў горадзе была дастаткова высокай.

Абранне каралём Станіслава Панятоўскага і яго каранацыя выклікалі ў жыхароў Гародні энтузіязм і надзею на лепшае жыццё. У дзень каранацыі Станіслава Аўгуста ў Гародні адбыліся ўрачыстасці ў пышным барокавым стылі. Карэспандэнт "Літоўскага Кур'еру" 28 лістапада 1764 г. паведамляў, што прэзідэнт Гародні Юзэф Бадаракі арганізаваў у

ратушы вялікі прыём. Ратуша была ілюмінавана і аздоблена трыўмфальнымі брамамі і гербамі Яго Каралеўскай Вялікасці і ўсёй яго фаміліі. Да таго ж у Гародні цэлы дзень "салютавалі з гармат: у 5 гадзін раніцы сто разоў, столькі ж у поўдзень, а ўвечары разоў 500 пры няспынным рэзанансе звону біцця ў катлы" [2, с.229]. У некаторым сэнсе гэта было сімвалічна – з часу Канвакацыйнага сойма 1764 г. і абрання каралём Станіслава Аўгуста пачаўся сапраўдны фейерверк гарадзенскіх рэформ.

Адным з першых мерапрыемстваў дзяржаўнага характару, якое пры гэтым мела непасрэднае дачыненне да Гародні, было стварэнне рашэннем канвакацыйнага сойма Скарбавай камісіі ВКЛ ці Эканамічнай Рады Літоўскага скарбу. У тэксце соймавай канстытуцыі падкрэслівалася, што галоўнай мэтай стварэння гэтага спецыяльнага дзяржаўнага органа было жаданне ўладаў "як найлепей назаўсёды арганізаваць парадак Літоўскага скарбу і памножыць яго даходы праз увядзенне лепшага кіравання і гаспадарання на карысць Рэчы Паспалітай" [3, с.75]. У кампетэнцыі Скарбавай камісіі знаходзілася вырашэнне большасці асноўных гаспадарчых пытанняў: кантроль за фінансамі, размеркаванне і збор падаткаў, ажыццяўленне судовых функцый па фінансавых справах, прызначэнне скарбавых афіцыялістаў і зняцце з пасады тых, хто дрэнна выконваў свае абавязкі, нагляд за гандлем і ўвогуле за эканамічным становішчам у краіне.

Паколькі ўся праца камісараў Эканамічнай Рады Літоўскага скарбу павінна была садзейнічаць павелічэнню прыбыткаў дзяржаўнага скарбу, то ў абавязак ім таксама ставіўся разгляд любых прапаноў па рэфармаванню і ўдасканаленню эканомікі. У некаторых выпадках такія прапановы друкаваліся і выносіліся на шырокае абмеркаванне. Фактычна, улады запрашалі да дыскусіі ўсіх, хто меў якія-небудзь думкі наконт магчымасці паляпшэння вядзення гаспадаркі. Месцам пасяджэнняў Скарбавай камісіі ВКЛ быў прызначаны Гарадзенскі замак, дзе размяшчаўся і скарбавы архіў [3, с.76]. Так Гародня стала цэнтрам гаспадарча-фінансавага жыцця ВКЛ.

Больш за тое, у другой палове XVIII ст. Гародня стала месцам, дзе дзяржаўная ўлада ў асобе свайго прадстаўніка, надворнага падскарбія ВКЛ А.Тызенгаўза пачала пэўны эксперымент па рэфармаванню эканомікі, адукацыі, культуры. Эксперымент, аналагаў якому не было не толькі на землях ВКЛ, але і ва ўсёй Рэчы Паспалітай.

Цэнтрам гарадзенскіх пераўтварэнняў стала прадмесце Гарадніца, вядомае з XVI ст. як месца каралеўскага двара, якое аддзяляла ад горада толькі рэчка Гараднічанка. Практычна за 15 гадоў (1765–1780) Гарадніцаператварылася ў буйны прамыслова-жыллёва-культурны цэнтр, у якім былі пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю 85 будынкаў рознага прызначэння. Дамінантай быў палац Тызенгаўза. На паўночным баку плошчы знаходзіліся музычная і тэатральная, а на паўднёвым баку – гасцінная афіцыны. Ва ўсходняй частцы Гарадніцы вырас мануфактурны комплекс, а цэнтральная яе частка – вуліца Раскоша была прадумана як абслуговая частка гараднічанскага ансамбля з аўстэрыяй, кафенгаўзам і корчмамі, акрамя таго на ёй размясціліся 20 аднатыпных драўляных домікаў з мураваным фасадам для замежных майстроў [4, с.30].

Неабходна падкрэсліць, гараднічанскія мерапрыемствы аказалі вялікі ўплыў у першую чаргу на змены ў прафесійнай, сацыяльнай і канфесійнай структуры тагачаснай Гародні. Эканамічныя пераўтварэнні патрабавалі значнай колькасці адукаваных людзей: арганізатараў вытворчасці, майстроў, проста кваліфікаваных работнікаў. Паколькі сваіх спецыялістаў не хапала, то спачатку па заданню ўладаў іх вербавалі за мяжой пераважна паслы і дыпламаты Рэчы Паспалітай. Замежныя спецыялісты, на думку А.Тызенгаўза, павінны былі надаць гродзенскім мануфактурам большую вагу і, магчыма, давер з боку патэнцыяльных пакупнікоў, таму запрошаных майстроў-іншаземцаў было даволі многа.

Так, толькі ў Гродне працавалі каля 70 замежных майстроў у асноўным з Францыі, Швейцарыі і Прусіі. Гэта былі людзі рознай кваліфікацыі: цесляры, сталяры, фарбавальшчыкі сукна і шоўку, спецыялісты па апрацоўцы золата і срэбра,

піваварьі, аўчары і інш. [5, арк.264]. У архівах захаваліся кантракты, якія былі заключаны з некаторымі замежнымі майстрамі, напрыклад, з Мішэлем Розэ, аўчаром з Прусіі; Якабам Пільтзыкерам з г. Гумбіна, "майстрам цеслярскага мастацтва" Йоргам Кейзлігам, сталяром з Прусіі і інш. [5, арк.241-244].

Мінусам палітыкі запрашэння замежных спецыялістаў было тое, што самі вярбоўшчыкі былі мала знаёмыя з пытаннямі арганізацыі прамысловых прадпрыемстваў і працэсам вытворчасці той ці іншай прадукцыі і таму не заўсёды запрашалі менавіта патрэбных спецыялістаў. У выніку не абыйшлося без канфузаў. 13 снежня 1772 г. нейкі П.Бандэні (хутчэй за ўсё, чалавек А.Тызенгаўза ў Варшаве, які адказваў за адпраўку майстроў-іншаземцаў на тэрыторыю ВКЛ) напісаў А.Тызенгаўзу ліст, у якім паведаміў, што французы, якія ехалі да Гродна, на адным з прыстанкаў такі скандал учынілі паміж сабою, што "ледзь да забойства не дайшло". Акрамя таго, пачалі патрабаваць асобныя фурманкі, якія вельмі цяжка было дастаць на такую доўгую дарогу [5, арк.67].

Праз тры дні, 16 снежня 1772 г., П.Бандэні накіраваў А. Тызенгаўзу яшчэ адзін ліст з паведамленнем, што майстры-французы нарэшце паехалі далей, ("дай Божа шчасліва"), але пры гэтым ён выказаў сумненне наконт таго, да чаго гэтыя людзі будуць здатныя і чаго вартыя, калі яны так будуць рабіць і паводзіць сябе ў Гродне.

Яшчэ адной асаблівасцю было тое, што частку падарожжа замежныя майстры павінны былі здзяйсняць за ўласныя сродкі, якія ім потым вярталіся. Вельмі часта (ці не заўсёды?) сумы, прадстаўленыя для аплаты, былі значна вышэйшымі сапраўдных выдаткаў. Так, той жа П.Бандэні ў студзені 1773 г. у справаздачы А.Тызенгаўзу быў вельмі здзіўлены памерам той сумы, якую патрабавалі рамеснікі са Швейцарыі, "але працівіцца заключанаму кантракту не мог" і грошы выплаціў [5, арк.67 адв.].

Да таго ж, дакументы сведчаць, што іншаземцы не заўсёды выконвалі ўмовы кантракту. Больш за тое, атрымаўшы грошы (зварот за падарожжа і аванс), некаторыя з іх папрос-

ту пакідалі Гародню. Так, шліфоўшчык срэбра Фрэдэрык Форст на падставе кантракту, заключанага 4 мая 1772 г., павінен быў тры гады працаваць бясплатна за тое, што "дапамог уладкаваць уцёкі немцаў-майстроў" [5, арк.264]. Такім чынам, запрашэнне замежных спецыялістаў для працы на мануфактурах каштавала вялікіх сродкаў, якія не заўсёды былі апраўданы.

Але адно толькі будаўніцтва прамысловых прадпрыемстваў і вытворчасць на іх тавараў не з'яўляюцца дастатковымі для развіцця эканомікі любой краіны. Для арганізацыі поўнавартаснага гаспадарчага развіцця важную ролю таксама адыгрывае гандаль, без наяўнасці і развітасці якога прамысловасць губляе ўсялякі сэнс і не можа існаваць. Дзейнасць у накірунку паляпшэння шляхоў зносін, развіцця ўнутранага рынку і пашырэння знешняга гандлю была адной з важных састаўных частак прапанаваных А. Тызенгаўзам пераўтварэнняў.

Акрамя таго, з яго ініцыятывы ў Гародні была заснавана яшчэ адна эканамічная структура – Гандлёвая кантора, галоўнай задачай якой было спрыянне ў продажы тавараў, якія выраблялiся на мануфактурах Гродзенскай эканоміі. Існавалі філіялы гэтай канторы ў Берасці, Шаўлях, Пінску, Паставах. Зыходзячы са сваёй асноўнай мэты беспасярэдніцкага гандлю, Гандлёвая кантора мела розныя стасункі з галоўнымі гандлёвымі і банкаўскімі пунктамі Заходняй Еўропы – Амстэрдамам, Берлінам, Хемніцам, Гамбургам, Дрэздэнам, Парыжам, Прагай і інш. [6, т.I, С.353].

Але ў другой палове XVIII ст. Гародня стала яшчэ і адукацыйна-асветніцкім цэнтрам ВКЛ. У першую чаргу адукацыйныя мерапрыемствы непарыўна былі звязаны з эканамічнымі рэформамі. Менавіта ў гэты час сярод эліт ВКЛ магчыма ўпершыню ўзнікла разуменне таго, што эканоміка – гэта навука і ёй трэба вучыцца. Стала відавочна, што далейшае вядзенне сельскай гаспадаркі традыцыйнымі для феадалізму шляхамі, "дзедаўскім спосабам", у новых умовах немагчыма. Ажыццяўленне на практыцы планаў і ідэй А.Тызенгаўза патрабавала наяўнасці асобаў, якія мелі веды і во-

пыт у развіцці сельскай гаспадаркі, перамеру зямлі, стварэнні мануфактур, праблемах гідраўлікі, а таксама вялікай колькасці шэраговых выканаўцаў – афіцыялістаў,ураднікаў, рамеснікаў і інш. Таму натуральна, што разам з эканамічнымі пераўтварэннямі А.Тызенгаўз імкнуўся вырашыць і праблему адукацыйнага характару.

У Гародні быў створаны шэраг спецыяльных адукацыйных устаноў. Першымі школамі, якія былі адкрыты ўжо ў 1765 г., з'яўляліся будаўнічая, бухгалтарская і школа мернікаў. Менавіта такія адукацыйныя ўстановы былі неабходны для паспяховага правядзення ў сталовых эканоміях аграрнай рэформы і запланаванага А.Тызенгаўзам будаўніцтва мануфактур.

Пашырэнне асветы адбывалася не толькі праз спецыяльна створаныя навучальныя ўстановы. У некаторай ступені характар прафесійных школ у Гародні мелі і прамысловыя прадпрыемствы, якія ствараліся ў адпаведнасці з "вялікім мануфактурным планам" А.Тызенгаўза. Менавіта ў іх пад кіраўніцтвам, як правіла, замежных майстроў павінна была ажыццяўляцца падрыхтоўка добра кваліфікаваных работнікаў і майстроў з мясцовага насельніцтва. Ва ўсіх кантрактах, якія заключаліся з рамеснікамі і майстрамі, акрамя іх асноўных абавязкаў, звязаных непасрэдна з добрасумленнай працай у канкрэтнай галіне, стала і нязменна фігураваў адзін пункт, які разумеўся адміністрацыяй каралеўскіх эканомій як першаснае і найважнейшае заданне ўсіх кантрактных спецыялістаў, – аб'яднанне вакол сябе вучняў, увядзенне іх у таямніцы прафесійнага мастацтва, навучанне іх "належна і дасканала" для якаснай працы на мануфактурах [5, арк.75, 103, 235, 238–245 і інш.]. Найбольш вядомы даследчык дзейнасці А.Тызенгаўза польскі гісторык Ст.Касцялкоўскі лічыў, што такі выхаваўчы характар мануфактур надаваў ім істотны змест і значэнне і ў значнай ступені акупаў памылкі, якія былі дапушчаны надворным падскарбіем пры іх закладанні [7, с.35].

Але не толькі для забеспячэння гаспадарчых патрэб каралеўскіх эканомій імкнуўся іх генеральны адміністратар,

ствараючы вышэйпералічаныя школы. Далёка за межамі Гародні быў вядомы Гарадзенскі корпус кадэтаў або Рыцарская школа для шляхецкай моладзі Гарадзенскага павету. Першая згадка пра кадэцкі корпус у Гародні адносіцца да 1773 г. [6, Т.І, с.410]. Аднак, у бібліятэцы князёў Чартарыйскіх у Кракаве захоўваецца дакумент, у якім ёсць інфармацыя, што "ў 1766 г. з літоўскага скарбу на корпус кадэтаў было выдадзена 200.000 злотых" [8]. На жаль, дакумент дакладна не гаворыць, што гэтыя грошы прызначаліся менавіта для Гарадзенскага корпусу, але не выключана, што правядзенне далейшага даследавання дасць мажлівасць "пастарыць" час паўстання школы рыцарства ў Гародні. Гэта была адна з тых нешматлікіх ініцыятыў надворнага падскарбія, значная роля якой прызнавалася нават яго праціўнікамі пасля адхілення А.Тызенгаўза ад усіх пасадаў. Разам з іншымі навучальнымі ўстановамі яна садзейнічала таму, што за Гародняй у другой палове XVIII ст. замацаваўся імідж адукацыйнага цэнтра ВКЛ. Але пры гэтым пра корпус кадэтаў існуе вельмі мала звестак, і ён яшчэ чакае свайго даследчыка.

Сярод іншых навучальных устаноў значную вядомасць набыла медыцынская школа (акадэмія), стварэнне якой – непасрэдная заслуга французскага прафесара анатоміі, хірургіі і натуральнай гісторыі Жана Эмануіла Жылібера. Размяшчалася яна ў спецыяльна ўзведзеным трохпавярховым будынку і мела тры аддзяленні падрыхтоўкі: "сучасных лекараў для гарадоў" (10 чалавек), правінцыяльных лекараў і хірургаў (20 чалавек), акушэрак-павітух (спачатку 5, пазней 17 чалавек) [9]. З імёнамі Жылібера і Тызенгаўза звязана і стварэнне Каралеўскага батанічнага саду, разнастайнасць, колькасць і экзатычнасць экспанатаў якога была вельмі значнай.

Неабходна заўважыць, што ўсе пералічаныя пераўтварэнні адукацыйнага характару маглі паспяхова ажыццяўляцца толькі пры адпаведным грамадскім клімаце горада, у якім па-ранейшаму існавала традыцыйная талерантнасць, асабліва ў сітуацыі, калі значную частку насельніцтва Гародні складалі замежныя майстры і рабочыя, якія па веравызнанню ў большасці сваёй былі пратэстантамі.

Пашырэнню асветы павінна была садзейнічаць і створаная ў Гародні друкарня. Яе асновай стала Віленская акадэмічная друкарня, перавезеная надворным падскарбіем у Гародню пасля скасавання ў Рэчы Паспалітай ордэна езуітаў (1773 г.). Акрамя навуковай літаратуры ў ёй выдаваліся падручнікі, духоўныя кнігі, стараславянскія, польскія і лацінскія малітоўнікі, "Гаспадарчы каляндар", а таксама першае ў Беларусі перыядычнае выданне "Gazeta Grodzienska" (1776–1783). У 1776–1796 гг. Гарадзенская друкарня выдала каля 100 кніг на польскай, лацінскай, царкоўнаславянскай, французскай, нямецкай, яўрэйскай мовах. Большасць выданняў складалі матэрыялы сэсій сойма Рэчы Паспалітай і Трыбунала ВКЛ, выпускалася шмат навуковай літаратуры, мастацкія творы Вальтэра, Мальера, і інш. У 1793 г. тут была надрукавана лістоўка з вершамі Ясінскага "Аб сталасці", накіраваная супраць захопніцкіх памкненняў Расіі [10].

Генеральны адміністратар каралеўскіх эканомій у ВКЛ выступаў і як мецэнат мастацтва. Для надання вагі сваім пачынанням і проста як дасведчаны і высокаадукаваны чалавек, ён вёў перапіску са знакамітым французскім асветнікам і філосафам Ж.Ж.Русо. Двор А.Тызенгаўза ў Гародні быў не толькі дваром адміністрацыі каралеўскіх эканомій у ВКЛ, а і цэнтрам эканамічнага і палітычнага жыцця, галоўным асяродкам культуры і мастацтва.

А.Тызенгаўз прыклаў вялікія намаганні для стварэння ў Гародні тэатра. Біёграфы надворнага падскарбія адзначалі, што тэатру належала яго душа. Цікава, што першыя звесткі пра самога А.Тызенгаўза адносяцца да перыяду яго навучання – у 1747 г. імя будучага палітычнага, грамадскага і культурнага дзеяча ўпершыню было змешчана на тэатральнай афішы школьнага спектакля езуіцкага калегіўма ў Вільні [6, т.І, с.57]. У гарадзенскім тэатры працавалі замежныя артысты, балетмайстры, музыканты, спевакі і харэографы. Для падрыхтоўкі ўласных артыстаў з ліку прыгонных сялян па ініцыятыве гродзенскага старосты была адкрыта тэатральная школа. У школе вучыліся дзеці прыгонных сялян і мяшчан, якіх адбіралі пры наяўнасці музычных здольнасцяў [1, с.36–97].

Можна пагадзіцца з гісторыкамі, якія лічылі, што ў адносінах да тэатра найбольш яскрава праявіліся асветніцкія ідэі А.Тызенгаўза. У тэатры ён бачыў не крыніцу прыбыткаў, а сродак асветы, інструмент выпраўлення нораваў. Такія думкі аб выхаваўчай ролі тэатра былі сугучнымі палажэнням французскіх асветнікаў. Але пры гэтым ён лічыў, што тэатр існуе толькі для прывілеяванай часткі грамадства, а не для мяшчан, рамеснікаў і неадукаваных сялян. Таму тэатр А.Тызенгаўза не стаў агульнадаступным і агульнанацыянальным.

Як адзначалі даследчыкі жыцця надворнага падскарбія, энергічная дзейнасць А.Тызенгаўза была рознабаковай, але падобнай на феерверк, які хутка сканчваецца.

Стварэнне вялікай колькасці мануфактур у кароткі тэрмін патрабавала значных фінансавых сродкаў. 10-мільённы крэдыт, які Станіслаў Аўгуст узяў у Галандскім банку, хутка скончыўся, а мануфактуры патрабавалі капіталу не толькі падчас заснавання, але і на працягу ўсяго свайго існавання. Аграрная рэформа ў каралеўскіх сталовых эканоміях ВКЛ дазволіла павялічыць даходы скарбу за 1764–1770 гг. не менш, чым у тры разы [12, с.309]. Таму на першых парах прадпрыемствы мелі магчымасць штогод атрымоўваць субсідыі са скарбу ВКЛ пад вельмі невялікія працэнты – 3% гадавых. Але мануфактуры не толькі не былі прыбытковымі, а нават і самадастатковымі, маглі існаваць толькі дзякуючы фінансам, якія чэрпаліся з розных крыніц, у першую чаргу з сельскай гаспадаркі каралеўскіх эканомій, што не спрыяла яе развіццю, а, наадварот, паскарала разбурэнне. Пастаянных грашовых сродкаў для сваёй дзейнасці патрабавалі і розныя навучальныя ўстановы, створаныя А.Тызенгаўзам.

Такім чынам, надворны падскарбі стаў ствараць для каралеўскай улады пэўную праблему – абяцаючы Станіславу Аўгусту вялікія прыбыткі, ён для ажыццяўлення сваіх мерапрыемстваў сам пастаянна адчуваў патрэбу ў фінансах. Да таго ж, становішча А.Тызенгаўза ў дзяржаве на працягу 15 гадоў, яго асабістае сяброўства з каралём з'яўляліся прадметам пэўнай зайздрасці, таму, як толькі гэтае становішча пахі-

снулася, нядобразычліўцы прыклалі максімум намаганняў для таго, каб канчаткова зваліць надворнага падскарбія.

У 1780 г. А.Тызенгаўз быў пазбаўлены ўсіх пасад, а ў 1785 г. гарадзенскага рэфарматара не стала. Разам з ім пачалі адыходзіць і яго стварэнні. Па аб'ектыўных прычынах у Гародні засталіся толькі дзве мануфактуры – суконная і палатняная. У сярэдзіне 1790-х гадоў спыніла сваю дзейнасць Гарадзенская друкарня, яе абсталяванне паводле загаду віленскага біскупа І.Касакоўскага было перададзена Віленскай каталіцкай епархіі. Нядоўга дзейнічалі ў Гародні навучальныя ўстановы. Пасля адстаўкі надворнага падскарбія цікавасць у новага кіраўніцтва да іх прапаў. Паўстала пытанне аб пераносе корпуса кадэтаў і медыцынскай школы ў Вільню, дзе ў мэтах эканоміі быў скарочаны выкладчыцкі корпус, колькасць вучняў і ўвогуле ім не надавалася столькі ўвагі, як у Гародні. Магчыма, у гэтым можна заўважыць суб'ектыўны фактар пераемнікаў А.Тызенгаўза на пасадах надворнага падскарбія ВКЛ і генеральнага адміністратара каралеўскіх сталовых эканомій, якія хацелі паменшыць значэнне, а то і ўвогуле ліквідаваць створаныя іх папярэднікам установы, нават на шкоду інтарэсам дзяржавы.

Аднак, нягледзячы на гэта, другая палова XVIII ст. стала для Гародні дзякуючы А.Тызенгаўзу, часам, калі яна сапраўды набыла статус палітычнага, эканамічнага, культурнага і адукацыйнага цэнтра ВКЛ: у горадзе дзейнічалі розныя дзяржаўныя ўстановы (Скарбавая камісія ВКЛ, Асэсарскі суд, Літоўскі Трыбунал), пашырыліся яго межы, змяніўся яго знешні воблік, на вуліцах можна было пачуць розныя замежныя мовы, вабіў сваёй прыгажосцю батанічны сад, шляхетныя гарадзенцы і госці чакалі новых тэатральных пастановак. У пэўным сэнсе Гародня стала горадам еўрапейскага кшталту.

### Літаратура і крыніцы

1. Konopczyński, W. Chronologia sejmów polskich 1493–1793 / W. Konopczyński // Archiwum Komisji Historii Polskiej Akademii Umiejętności. – T.II. – Nr. 3. – Krakow, 1948.

2. Gordziejew, J. Próby reform miejskich w Grodnie w okresie

Oświecenia / J. Gordziejew // Rocznik Biblioteki Naukowej PAU i PAN w Krakowie. – Rok XLVI (2001). – Krakow, 2001.

3. Volumina legum. – T. VII. – Petersburg, 1860.

4. Гардзееў, Ю. Рамантык эпохі Асветніцтва: Антон Тызенгаўз / Юры Гардзееў. – Мінск: Тэхналогія, 2008. – 67 с.

5. AGAD, zes. Archiwum Tyzengauzow, sygn. D–3/XVI.

6. Kościałkowski, St. Antoni Tyzenhauz. Podskarbi Nadworny Litewski. /St.Kościałkowski. – T.I.–II. – Londyn, 1970–1971.

7. Koscialkowski, St. Studia i szkice przygodne / St.Kościałkowski. – Londyn. 1956.

8. Biblioteka Czartoryskich w Krakowie, zes. Teka Naruszewicza, sygn. IV 806, p. 211.

9. Цішчанка, Я. Гродзенская медыцынская акадэмія / Я. Цішчанка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6-ці т. – Т.3. – Мінск, 1996. – С.128.

10. Казуля, С. Гродзенская каралеўская друкарня / С. Казуля //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6–ці т. – Т.3. – Мінск, 1996. – С.126–127.

11. Momontowicz-Łojek, B. Szkoła artystyczno-teatralna Antoniego Tyzenchauza 1774–1785 / B.Momontowicz-Łojek // Rozprawy z dziejów oświaty. – T.II. – Wroclaw, 1968.

12. Kula, W. Szkice o manufakturach w Polsce XVIII wieku / W.Kula. – Warszawa, 1956.

**Швед Вячаслаў Вітальевіч,** *доктар гістарычных навук, прафесар УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы"*

# АНТОНІЙ ТЫЗЕНГАЎЗ І СУЧАСНЫ ГРОДНА

Не цяжка ўявіць, якім быў горад Гродна ў датызенгаўзаўскі перыяд. На захаваўшымся дрэздзенскім плане горада 1753 г. межы Гродна не перасякаюць на поўначы рэчкі Гарадніцы (Гараднічанкі). Менавіта там стаяла Віленская гарадская брама. Усе даследчыкі планіроўкі Гродна, думаю, пагадзіліся бы з думкай Ю.Н.Кішыка: "І толькі ў другой палове XVIII стагоддзя Гродна, нарэшце, "перакрочыў" праз малую раку, дзе вырас новы раён Гарадніца" [1, с.119].

Гэта адбылося дзякуючы рэформам Антонія Тызенгаўза (1733 – 31.03.1785 гг.), які ў 1765 г. стаў надворным падскарбіем літоўскім і гродзенскім старостаю. Ён задумаў у кароткі тэрмін стварыць у адсталай земляробчай краіне ўсе галіны прамысловасці, якія існуюць у іншых развітых дзяржавах Еўропы. Для гэтага ў яго былі ўлада, фінансы, неабмежаваны давер караля, а таксама паплечнікі. Тэрыторыя каралеўскага двара і вёскі Гарадніца сталі цэнтрам гаспадарчых і культурных рэформаў. З 1765 па 1780 г. Тызенгаўз пабудаваў тут 50 будынкаў. Прагрэсіўны польскі публіцыст Ю.Выбіцкі пісаў, што "Гарадніца магла бы знаходзіцца і ў Галандыі" [2, с.64].

Сёння мы бачым толькі рэшткі. Ужо на плане Гродна 1849 г. няма 30-ці пабудоў. У 1958 г. захоўвалася 20 будынкаў ансамбля XVIII ст., а ў 1988 г. – толькі 7. Пройдземся па плошчы Тызенгаўза і паглядзім на тыя помнікі гісторыі і культуры, якія з'яўляюцца важнымі турыстычнымі рэсурсамі Гродна.

Палац адміністратара Дзяконскага (1776–1778 гг.) знаходзіцца на вул.Горкага, 2/2, адпавядае стылю класіцызма з элементамі барока. З 1795 г. належаў графу М.Валіцкаму,

які свой капітал выйграў у карты. Ён дабудаваў у перыяд паміж 1785 і 1795 г. два флігелі, у якіх знаходзіліся памяшканні для абслугі і кухня ў адным, стайня і карэтная ў другім. За правым флігелем палаца быў рэгулярны парк. У 1842 г. палац купіла праваслаўнае ведамства і з гэтых часоў ён стаў рэзідэнцыяй мітрапаліта ("Архіерэйскі дом"). Цяпер тут знаходзіцца адзін з карпусоў медыцынскага універсітэта.

Дом лясной адміністрацыі пабудаваны ў 1770 г. па праекту архітэктара І.Мёзера ў стылі барока. У 1899–1915 г. уваходзіў у комплекс акруговай бальніцы. Пазней тут была беларуская школа. Цяпер знаходзіцца архітэктурны аддзел Гродзенскага гарвыканкама.

Казарма для кадэтаў знаходзілася ў сённяшнім доме № 5. Была пабудавана архітэктарамі І.Мёзерам і Дж.Сакка ў 1765–1785 г. У другой палове XIX ст. будынак быў перабудаваны для размяшчэння тут Кантрольнай палаты. У 1989 г. па праекту В.Барсукова адбылася рэстаўрацыя.

Музычны флігель (музычная школа, "крывая афіцына") пабудаваны ў 1780 г. па праекту Дж.Сака. Увесь першы паверх будынка займала аркадная галерэя. На другім паверсе знаходзіліся памяшканні для заняццяў балетнай і музычнай школаў. У мансардах жылі навучэнцы і абслуга. У другой палове XIX ст. гаспадар будынка Х.Стралец надбудаваў трэці паверх. За "польскім часам" у будынку знаходзілася паліцэйскае ўпраўленне.

Гандлёвы склад ці лямус стаіць недалёка ад тэатра па вул.Дзяржынскага, 1а. Пабудаваны ў другой палове XVIII ст. у стылі барока. Двухпавярховы, прускага фахверку прамавугольны ў плане будынак з вальмавым дахам і мансардамі. У 1939 г. пераабсталяваны ў жылы будынак. Цяпер тут размешчаны рэстаран "Стары лямус".

Тэатр пабудаваны каля 1763 г. Задуманы як працяг палаца Тызенгаўза і быў злучаны з яго левым крылом крытым пераходам. У часы рэформ Тызенгаўза выкарыстоўваўся як манеж, дзе выгульвалі каралеўскіх коней. Рэканструяваны ў 1859, 1940, 1970 гадах. У савецкі час тут месціўся гродзенскі абласны драматычны тэатр, а з 1984 г. – тэатр лялек.

Стары парк Гродна носіць імя Ж.Э.Жылібера – французскага вучонага, які стварыў медыцынскую школу, а пры ёй Батанічны сад у 1770-я гады. Тут вырошчваліся лекавыя расліны і тыя, якія ішлі на вытворчасць фарбы для суконных мануфактур, а таксама бразільская сасна, грэцкі і манчжурскі арэхі, воцатнае дрэва і іншыя. У першай палове XIX ст. сад быў далучаны да палаца губернатара, а ў другой палове XIX ст. стаў гарадскім (у 1875 г. яго плошча складала каля 3 га).

Дом віцэ-адміністратара ("гасцінная") пабудаваны ў 1780 г. па праекту Дж.Сакка. З'яўляецца помнікам архітэктуры пераходнага перыяду ад барока да класіцызму. Тут размяшчаліся канторы служачых, якія займаліся зборам падаткаў і павіннасцямі з прыгонных сялян. Рэстаўраваны ў 1992 г. Цяпер тут знаходзіцца Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне.

Музей "Гісторыя Гарадніцы" на вул.Ажэшкі, д.37 – адзін з былых "басняцкіх дамоў", у якіх жылі запрошаныя А.Тызенгаўзам на мануфактуры чужаземныя майстры. Дамы лічуць прыкладам першага тыповага будаўніцтва ў Беларусі.

Яшчэ адзін мануфактурны цэнтр склаўся ў прыгарадзе Гродна Ласосне. Пры ўпадзенні ракі Ласасянкі ў Нёман пабудавалі тры мануфактуры: палатняную (працавала ў 1779–1845 гг.), воўнавую (1766–1860 гг.), фарбавальную і тонкасуконную (1779–1860 гг.). Сёння гэтую частку горада мы называем Фолюш, што ў перакладзе з польскай мовы азначае сукнавальня, сукнавальная машына.

У будынку езуіцкай калегіі Тызенгаўз заснаваў у 1775 г. каралеўскую друкарню і быў да 1785 г. яе арэндатарам. Відаць, упершыню ў Рэчы Паспалітай запрасіў ён сюды людзей, якія маглі рабіць штампы на матрыцы і ліць літары. Адсюль бралі іх літоўскія і варшаўскія друкарні. У гродзенскай друкарні выдавалі падручнікі, малітоўнікі на польскай і лацінскай мовах, прамовы дэпутатаў гродзенскіх соймаў, бухгалтарскія кнігі, рэкламныя праспекты, афішы, аб'явы, бланкі. У 1776–1783 гг. выходзіла адна з першых на Беларусі газета "Газэта Гродзеньска" а ў 1776–1880 гг. – "Каляндар гаспа-

дарскі Літоўскі". Абодва выданні былі на польскай мове. Выдавалася таксама арыгінальная мастацкая і навукова–папулярная літаратура. Напрыклад, "Флора Літвы" Ж.Э.Жылібера (1781 г.), "Усходняя гісторыя аб Задзігу" Вальтэра (1776 г.), "Кароткі збор карфагенскай і егіпетскай гісторыі" Г.Барэцкага (1776 г.).

У касцёле святога Францішка Ксаверыя ёсць помнік Антонію Тызенгаўзу. З шэра-зялёнага мармуру зроблены пастамент, на якім устаноўлена бронзавая скульптура жанчыны ў самотнай позе, з пальмавай галінкаю ў руцэ. На абяліску – вялікі медальён з барэльефам Антонія Тызенгаўза, які напамінае нам вядомы скульптурны партрэт Вальтэра: голы чэрап, твар валявога чалавека, які ведае сабе цану. Пад медальёнам надпіс: "Антоні Тызенгаўз, староста Гродзенскі, казначэй Вялікага княства Літоўскага. 1733–1785".

Гісторыя ўзнікнення гэтага помніка даволі цікавая. Згодна з надпісам, яго паставіла графіня Марыя Аляксандраўна Пшэздзецкая з роду Тызенгаўза, выконваючы волю брата і бацькі. На самой справе гэта не зусім так. Дзякуючы знойдзенаму ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў г. Гродна прашэнню графа Канстанціна Аляксандравіча Пшэздзецкага ад 18 сакавіка 1893 г., вядома, што задумка паставіць помнік належала камер-юнкеру двара яго імператарскай высокасці графу Канстанціну Тызенгаўзу. Выканаць яе ён не паспеў, бо ў 1852 г. памёр. Духоўным тэстаментам абавязак пабудовы помніка быў ускладзены на ўнука Антонія Тызенгаўза, Райнольда. Але і гэты нашчадак, відаць, нічога не зрабіў. За справу ўзялася яго сястра Марыя Пшэздзецкая, народжаная Тызенгаўз. Яна замовіла помнік у львоўскага скульптара Тамаша Дукаса, але ў 1886 г. памерла. Яе сын Канстанцін жыў у Варшаве, па вуліцы Факзал, ва ўласным доме № 6, адкуль і паслаў прашэнне, у якім прасіў гродзенскага губернатара аб дазволе паставіць зроблены свайму прадзеду помнік у Фарным касцёле. Губернатар, даведаўшыся ад паліцмайстра, што "няма падставаў лічыць, што гэты помнік будуецца ў памяць падзей 1863 і 1864 гадоў", адказаў варшаўскаму паліцмайстру: "З майго боку перашкодаў не сустракаецца".

Адказ губернатара быў даведзены да Канстанціна Тызенгаўза, аб чым сведчыць яго распіска ад 27 красавіка 1893 г. Але спатрэбілася паменшыць алтар часоўні св. Міхаіла, дзе вырашылі паставіць помнік. Граф піша наступнае прашэнне ад 13 кастрычніка 1894 г. Віленская духоўная кансісторыя дае згоду. Здаецца, што ўжо нічога не стрымлівае, тым не менш у 1896 г. гродзенскі паліцмайстар даносіў губернатару, што помнік яшчэ не пастаўлены. Гродзенскі гісторык Ю. Гардзееў лічыць, што ён быў уладкаваны ў Фарным касцёле недзе ў 1896–1900 гг/ [3, с,21-23].

Імя Тызенгаўза ўвекавечана ў назве плошчы на Гарадніцы. Спачатку гэта было зроблена ў 1931 г., а потым – у 1991 г., калі гарадская тапанімічная камісія вырашыла назваць старую частку плошчы Леніна імем чалавека, які сваёй дзейнасцю спрыяў развіццю горада.

У паўночна-заходнім рагу Савецкай плошчы (былога Рынку) стаіць крама "Ратушная". Гэта былая камяніца з карчмою, якая ад Сангушак у 1778 г. перайшла ў валоданне да 1784 г. Антонію Тызенгаўзу [4, с, 116, 222]

Акрамя эканомікі, другой складанай часткай рэформаў Тызенгаўза, стала развіццё асветы і культуры. У 1765–1780 гг. у Гродне грала капэла – найбольш буйны і высокапрафесійны калектыў у ВКЛ. У 1779 г. яна налічвала 30 музыкантаў і 7 вучняў ("хлопцаў з капэлы"). У яе склад уваходзілі італьянскі кампазітар і капельмайстар К.Абатэ, чэхі Эндэрле і Геранім, мясцовыя музыканты: капельмайстар і першы скрыпач Л.Сітанскі, Т.Вежбаловіч, Д.Пташынскі, Я.Насулевіч, С.Швед і іншыя. У рэпертуары капэлы былі араторыі, сімфоніі, мессы, бытавая музыка (серанады, дывертысмент, танцы).

З мая 1992 г. існуе "Гродзенская капэла" ці " Капэла Тызенгаўза", у склад якой уваходзяць камерный аркестр, камерны хор, ансамбль салістаў, ансамбль старажытнай музыкі і салісты – вакалісты.

У рэпертуары аркестра болей 250 сачыненняў кампазітараў розных эпох, школ і стылістычных напрамкаў (Бах, Моцарт, Гайдн, Мендэльсон, Бріттен, Чайкоўскі, Шастаковіч, Шнітке, Пярт і інш.). Выканаўчае майстэрства аркестра адз-

начана ўдзелам у розных міжнародных фестывалях ("Еўрапейскія музыкальныя сустрэчы" ў Германіі, "Хрысціянская музыка" ў Нарвегіі, "Восеньская камерата" ў Польшчы, "Музыка Баха і Вівальдзі", "Музыка Баха і Венскія класікі" ў Расіі і інш.). У апошні час аркестр супрацоўнічае з нямецкімі харамі і ўдзельнічае ў выкананні кантатна-аратарыяльных твораў Гайдна, Моцарта, Мендэльсона.

У рэпертуарным спісе камернага хора вялікая колькасць высокіх узораў музычнага мастацтва – сачыненні старажытных і сучасных беларускіх кампазітараў, руская і заходнееўрапейская класіка XVII-XX ст., духоўная музыка, народныя песні і г.д. Усяго болей 300 твораў.

Ансамбль старажытнай музыкі быў створаны пры аддзеле культуры Гродзенскага гарвыканкама ў 1983 г. Валерыям Самуйлінам. Існаваў да 1989 г., а ў 1992 г. увайшоў у склад Гродзенскай капелы. У рэпертуары ансамбля музыка эпохі барока – творы нямецкіх, італьянскіх, англійскіх, французскіх кампазітараў, а таксама твораў рускага, беларускага і польскага барока.

Імя Тызенгаўза носіць адна з мастацкіх галярэй Гродна. Ідэя стварэння прыватнай галерэі ў будынку былой тэатральнай школы Тызенгаўза прыйшла гродзенскаму бізнесмэну Уладзіміру Радлінскаму ў 1995 г. Пасля рэстаўрацыі, якая дазволіла захаваць унікальны барочны інтэр'ер са сводчатымі перакрыжаваннямі і цудоўнай акустыкай, галерэя адчыніла свае залы для наведвальнікаў. Да 2000 г., калі з'явілася новая гаспадыня Галіна Сарока, адбываліся ў асноўным выставы гродзенскіх мастакоў. Цяпер выстаўляюцца не толькі яны, але і мастакі з іншых гарадоў Беларусі (Віцебск, Мінск, Полацк і інш..), з замежжа (Польшча, Літва, Латвія, Расія і інш.). Галерэя супрацоўнічае, як з добра вядомымі аўтарамі, так і з тымі, якія толькі пачынаюць свае крокі ў мастацтве. Акрамя актыўнай выставачнай дзейнасці (каля дзесяці праектаў у год), галерэя праводзіць камерныя канцэрты старажытнай музыкі, а таксама семінары па розным напрамкам культуры.

Такім чынам, мы можам сцвярджаць, што Антоній Тызенгаўз шмат зрабіў для развіцця Гродна, стаў па сутнасці

стваральнікам Гродна. І сёння ў гістарычным цэнтры горада мы сустракаем сляды яго дзейнасці. Яна паўплывала на гарадскую архітэктуру і планіроўку, пакінула нам культурную спадчыну. Не правы былі тыя, хто пісаў, што пасля смерці Тызенгаўза ўсё заняпала і ад яго працы нічога не засталося.

### Літаратура


1. Кишик, Ю.Н. Градостроительная культура Гродно / Ю.Н. Кишнк. – Мн.: Беларуская наука, 2007. – 304 с.: ил.
2. Брандыс, А. Племянник короля / А. Брандыс // Исторические повести. – Алма-АТА, 1975–1976.
3. Гардзееў, Ю. з гісторыі помніка Антонія Тызенгаўза ў Гродзенскім фарным / (паезуіцкім касцёле) / Юрась Гардзееў // Гарадзенскія запісы (старонкі гісторыі і культуры). Вып.1. – Гродна, 1993.
4. Гардзееў, Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня–Вроцлаў, 2008.
5. Гибянский, И.Г. Граф Антоний Тизенгауз и гродненские королевские мануфактуры. / И.Г. Гибянский – Пг., 1916. – 64 с.
6. Дадзіёмава, В.У. Гісторыя музычнай культуры Беларусі ад старажытнасці да канца ХУІІІ ст. / В.У. Дадзіёмава – Мн., 1994. – 96 с.
7. Квитницкая, Е.Д. Строительство Тизенгауза в Гродно / Е.Д. Квитницкая // Архитектурное наследство. – № 17. – С. 21–42.
8. Мілінкевіч, А. Гродзенская каралеўская медычная акадэмія / Аляксандр Мілінкевіч // Гарадзенскія запісы (Старонкі гісторыі і культуры). Вып.1. – Гародня, 1993. – С.15–20.
9. Пракопчык, Л. Трагедыя А. Тызенгаўза / Леанід Пракопчык // Пракопчык, Л. Дрэмле памятка дзён: краязнаўчыя нарысы. / Леанід Пракопчык. – Мп.: Полымя, 1994. – С.66–76.
10. Соніч, А. Панская забава / А. Соніч // Беларуская мінуўшчына. – 1966. – № 6. – С. 52–57.

**Куль-Сяльвестрава Святлана Яўгенаўна,** *доктар гістарычных навук, прафесар УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы", Беластоцкай палітэхнічнай акадэміі*

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII СТАГОДДЗЯ

Безумоўна, гаварыць аб існаванні ў Гродне ў другой палове XVIII ст. вышэйшай школы ў сучасным разуменні гэтага тэрміну было бы анахранізмам. Навучальныя ўстановы, якія працавалі ў той час у горадзе, не мелі статусу універсітэта, а калі і называліся акадэміяй, гэта зусім не пазначала, што яны цалкам адпавядалі сваёй назве па зместу і глыбіні навучальнай праграмы. Але ўсё такі вынесеная ў назву дадзенай работы праблема не з'яўляецца навуковай спекуляцыяй, а мае сваё ўвасабленне ў рэальных фактах, у той ролі, якую адыгрываў горад на Нёмане ў выхаванні чалавека эпохі Асветніцтва.

Другая чвэрць XVIII ст. у гісторыі Гродна пазначана дзейнасцю гродзенскага старосты падскарбія літоўскага Антонія Тызенгаўза. Менавіта яго ініцыятывы, планы і праграмы, у значнай ступені змяніўшыя жыццё горада, даюць нам сёння падставы разглядаць Гродна таго часу як вялікі Універсітэт, своеасаблівую эксперыментальную пляцоўку, дзе вучыліся не толькі працаваць і жыць, але і думаць па–новаму.

Да 1773 г. ролю галоўнай навучальнай установы ў Гродне адыгрываў езуіцкі калегіум. Яго гісторыя добра вывучана ў айчыннай гістарыяграфіі і не патрабуе, на маю думку, дадатковых грунтоўных архіўных росшукаў. Праграма навучання ў калегіуме адпавядала тагачасным поглядам на адукацыю – перавага аддавалася тэарэтычным ведам, найперш, гуманітарнага цыкла, мовам, тэалагічным дысцыплінам. Пасля скасавання ордэна езуітаў і ўтварэння Камісіі народнай асветы, якой урэшце перададзена была значная частка пае-

зуіцкіх фундушаў, рушыла кардынальная рэформа ўсёй сістэмы адукацыі Рэчы Паспалітай, меўшая сваю спецыфіку ў ВКЛ. У Гродне рэформа ўвасобілася, найперш, у стварэнні на базе былога калегіума ваяводскай (пазней яна атрымала назву акруговай) школы, якая мела сямігадовы тэрмін навучання і шэсць класаў (першы клас – два гады) [5, с.68-71]. Стварэнне свецкай навучальнай установы, падпарадкаванай таксама свецкай Галоўнай Літоўскай Школе ў Вільні (будучы Віленскі універсітэт), было пачаткам новага этапа ў сістэме адукацыі. Але, як выдаецца, не гэтая ваяводская школа акрэсліла феномен Гродна, як горада-універсітэта. Такія школы ствараліся па ўсёй тагачаснай тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Больш важным было фармаванне сістэмы прафесійнай адукацыі, распачатае Антоніем Тызенгаўзам па ўласнай ініцыятыве і з дапамогай высокаадукаваных спецыялістаў.

Стварэнне прафесійных школ, накіраваных на падрыхтоўку працаўнікоў для розных галін эканомікі, сацыяльнага жыцця і культуры, якое ініцыяваў гродзенскі староста, сваім ідэалагічным падмуркам мела, бясспрэчна, погляды асветнікаў на прызначэнне чалавека. У аснове гэтых поглядаў было перакананне, што кожны чалавек у сваім жыцці павінен прыносіць карысць не толькі сабе, але і грамадству, што асвета і адукацыя патрэбна ўсім, незалежна ад іх сацыяльнага статусу і прафесійных заняткаў. Да гэтых поглядаў далучалася і новае разуменне патрыятызму, новы погляд на сутнасць эканамічнага жыцця краіны і народа. У матэрыялах КНА давалася менавіта такое, новае тлумачэнне патрыятызму: "трэба яго шукаць пад стрэхамі сялян, у загонах добра апрацаванай раллі, у талентах гарадскіх жыхароў, у працы кросен і станкоў, у абарачэнні грошаў і тавараў..." [4, с.17]. Менавіта патрэбы грамадства ў прафесійна падрыхтаваных будаўніках, дактарах, землямерах і прадстаўніках іншых сацыяльна значымых прафесій выклікала адкрыццё гродзенскіх школ і медыцынскай акадэміі. Найбольш вядома сёння менавіта гродзенская медыцынская акадэмія.

Адкрыццё медыцынскай акадэміі ў Гродне, якое ініцыяваў А.Тызенгаўз, было актыўна падтрымана каралём [2, с.21].

Ужо ў 1775 г. у горад на Нёмане прыехаў Ж.Э.Жылібер – таленавіты малады медык і біёлаг. Пэўна, няма патрэбы распавядаць аб гісторыі гэтай навучальнай установы і яе стваральніку. У Гродна гэтае імя добра вядома і пазначана ў гарадской тапаніміцы. У Літве медыкаў павінен быў рыхтаваць медыцынскі факультэт Галоўнай Літоўскай школы. Але ў той час ён яшчэ знаходзіўся ў стадыі перафармавання – пасля закрыцця езуіцкай акадэміі ў ім амаль не засталося прафесараў, а тыя, што былі, не задавальнялі ўзроўнем сваёй адукацыі ўзрослыя патрэбы грамадства. Фактычна Гродзенская медыцынская акадэмія ўзяла на сябе функцыі медыцынскага факультэта, рыхтуючы не толькі дактароў, але і акушэрак. Яна магла добра ўпісацца ва універсітэцкую праграму. Нездарма пасля адстаўкі А.Тызенгаўза медыцынская акадэмія і частка батанічнага саду, створанага Ж.Э.Жылiберам, былі пераведзены ў Вільню і склалі аснову медыцынскага факультэта Галоўнай Літоўскай школы. Закладзены ў Гродне падмурак вышэйшай медыцынскай адукацыі на працягу многіх дзесяцігоддзяў дапамагаў развіццю медыцынскай навукі і падрыхтоўцы медыцынскіх кадраў у Літве і Беларусі, а затым, пасля пераводу медыцынскага факультэта ў Кіеў, – на Украіне.

Не менш значны след у гісторыі адукацыі і мастацкай культуры пакінула тэатральная школа, створаная па ініцыятыве А.Тызенгаўза. Калі ў выпадку Медыцынскай акадэміі гродзенскі староста ішоў ужо вядомым шляхам – медыцынская адукацыя на працягу стагоддзяў развівалася ў вышэйшых навучальных установах, то ў галіне тэатральнай і музычнай адукацыі яго дзейнасць можна лічыць па-сапраўднаму рэфарматарскай. Да гэтага часу падрыхтоўка акцёраў і тэатральных музыкантаў вялася пераважна пры тэатрах; дзеячы сцэны спасцігалі асновы тэатральнага мастацтва, спеву, авалодвалі музычнымі інструментамі пад кіраўніцтвам настаўнікаў з ліку больш вопытных калег. Спецыяльных навучальных установаў, дзе б рыхтавалі прафесіяналаў у гэтай галіне культуры, не было. Для фармавання тэатральнай трупы А.Тызенгаўз камандзіраваў за мяжу свайго даверанага чала-

века – вядомага музыканта, дырыжора і скрыпача шляхціча Лявона Сітанскага. Разам з іншымі замежнымі гасцямі ў Гродна былі запрошаны і педагогі, а некаторыя артысты таксама сталі выкладчыкамі. Тэатральна-балетная школа была размешчана на Гарадніцы ў спецыяльна дзеля гэтага ўзведзеным будынку, якое ў гарадзенцаў атрымала назву "музычная" або "крывая афіцына". Трохпавярховы будынак меў залы для рэпетыцый і заняткаў на другім паверсе, на трэцім, мансардным, знаходзіліся дартуары, дзе жылі настаўнікі і вучні. Будынак быў упрыгожаны пілястрамі, аблямоўкамі вокнаў і гарманічна ўпісваўся ў планіроўку палацавай плошчы. Магчыма, тут была і канцэртная зала, якая знікла пасля рамонту ў 1837 г., калі будынак быў прыстасаваны пад жылы дом і значна змяніўся [3, с.67].

Вучнямі школы сталі дзеці прыгонных з каралеўскіх эканомій, а таксама падлеткі з шляхецкіх сем'яў. Тут, між іншым, вучылася сястра Л.Сітанскага – выдатная спявачка Алена Сітанская. У школу набіралі дзяцей з васьмі гадоў. У праграму заняткаў уваходзіла ігра на некалькіх інструментах, спевы, танец, пісьмо, чытанне і арыфметыка, этыкет, для дзяўчынак – хатняе рукадзелле. Выкладалі ў школе як замежныя майстры, так і мясцовыя артысты, у тым ліку былыя выхаванцы тэатральна-балетнай школы Тызенгаўза. Настаўнікамі ў школе былі К. і Л.Пецінецці, Л.Сітанскі, ураджэнец Ігумена выдатны танцаўшчык Міхал Рымінскі, Д.Пташынскі, А.Тумін, Л.Шычкоўскі і іншыя. Праграма школы не засяроджвалася толькі на спецыяльных прадметах, але давала і агульную адукацыю. Такі падыход да адукацыі ішоў у рэчышчы ідэалогіі Асветніцтва, паводле якой асоба павінна быць усебакова адукаванай, каб мець магчымасць самаўдасканальвацца і развіваць талент. Аналагаў тэатральнай школы Тызенгаўза ў той час не было ні ў Рэчы Паспалітай, ні ў суседняй Расійскай імперыі. Толькі праз некалькі дзесяцігоддзяў падобная тэатральная школа ўзнікла ў Варшаве, а ў Расіі, калі не лічыць школы пры імператарскай дырэкцыі тэатраў, якая не мела шырокай агульнаадукацыйнай праграмы, – толькі ў другой палове XIX ст.

Новым для земляў Рэчы Паспалітай з'яўляўся парадак арганізацыі працы самой тэатральна-балетнай трупы Тызенгаўза. Гэта не быў, як часта пішуць аб ёй у навуковых працах, прыгонны тэатр. Сярод акцёраў і музыкантаў толькі частка паходзіла з прыгонных сялян каралеўскіх эканомій. Асноўнае ядро тэатра, найперш, калектыў спевакоў і музыкантаў, складалі вольныя асобы, у тым ліку шляхцічы і замежныя майстры. Апрача таго, дзейнасць трупы паступова набывала камерцыйны характар – паказы маглі наведваць не толькі госці гродзенскага старосты, але за асобную плату. А.Тызенгаўз апярэдзіў час амаль на два дзесяцігоддзі – толькі ў канцы 1780-х гадоў на нашых землях пачнуць дзейнічаць тэатры прыватнай антрэпрызы, дзейнасць якіх была пабудавана на камерцыйнай аснове.

Значэнне Гродна, як горада-універсітэта, дзе вучыліся думаць і працаваць па-новаму, не вычэрпваецца толькі стварэннем новых навучальных устаноў. Не менш важным быў эксперымент у галіне горадабудаўніцтва і архітэктуры.

Пабудова новага прадмесця, а дакладней новага раёна Гродна, нездарма запланавана была літоўскім падскарбіем на месцы невялікай вёсачкі Гарадніцы, якая знаходзілася за гарадскімі межамі. Безумоўна, выбар гродзенскага старосты не быў выпадковым. Адпаведную ролю тут адыграла тая акалічнасць, што фактычна будаваўся не сам горад, а адміністрацыйны цэнтр староства. Гродна быў горадам каралеўскім, але меў права на самакіраванне, і эксперыменты з яго перабудовай вельмі дорага абышліся бы скарбу: належала бы выкупаць частку гарадскіх пляцаў ці выменьваць іх на іншыя гарадскія плошчы, якія належалі кароне. Гарадніца ж была зямлёй, якая ўваходзіла ў склад эканоміі, і гродзенскага старосту тут ніхто не абмяжоўваў. Па-другое, як можна меркаваць, Тызенгаўз хацеў дабіцца "чысціні эксперыменту" – пачаць будаўніцтва новага горада на пустым месцы, не абцяжараным даўняй забудовай і традыцыямі. Гэты новы горад павінен быў адпавядаць тэарэтычным разважанням асветнікаў аб "ідэальным" месцы жыхарства для "ідэальнага" чалавека. У ім усё павінна быць рацыянальным і гарманічным. Між іншым, спробы пабудаваць "ідэальны" горад прадпрыма-

ліся ў эпоху Асветніцтва не толькі ў Рэчы Паспалітай. Падобная спроба была прадпрынята ў Расіі, дзе на месцы разбуранай вялізарным пажарам Цвяры закладзены быў новы горад з рэгулярнай забудовай; успомнім таксама забудову паўночнаамерыканскіх гарадоў, якая вялася па рэгулярнаму плану. Але, як думаецца, феномен забудовы Гарадніцы знаходзіцца не толькі ў яе рэгулярным характары. Тут быў выкарыстаны цэлы комплекс наватарскіх падыходаў да месца жыхарства і працы чалавека, пры чым улічваліся патрэбы ўсіх варстваў грамадства, уключаючы рамеснікаў і гандляроў. Да такіх наватарскіх ідэй належыць аднесці заніраванне паводле функцыянальнага прызначэння дадзенай часткі горада. Такім чынам былі вылучаны прамысловая, акадэмічная, адміністрацыйная, рэкрэацыяйная і жылая зоны. Сюды ж можна аднесці і шырокае ўжыванне тыпавых ці паўторных праектаў для пабудовы жылых дамоў ("басняцкія" дамы рамеснікаў).

Выкарыстанне новых падыходаў да гарадской забудовы было надзвычай удалым. Нездарма закладзеныя больш за дзвесце гадоў таму акцэнты ў планіроўцы Гарадніцы працягваюць працаваць яшчэ і сёння. Амаль у тым самым месцы, што і ў часы Тызенгаўза, знаходзіцца сёння адміністрацыйны цэнтр горада; па-ранейшаму канцэнтруюцца ў месцы, вылучаным пад акадэмічную зону, навучальныя ўстановы; таксама, як і дзве сотні гадоў таму, працуе рэкрэацыйная зона з паркам і тэатрам лялек. Ды і ўезд у сталіцу старства, які знаходзіўся на ўсходнім канцы вуліцы Раскоша, сёння пазначаны чыгуначным вакзалам – "варотамі" ў сучасны Гродна.

Эксперымент у галіне эканомікі не быў такім удалым, як у сферы культуры і горадабудаўніцтва. Заснаванне семнаццаці мануфактур у Гродне і Ласосне не мела пад сабой дэталёва прадуманай эканамічнай праграмы, таму хутка прывяло гродзенскага старосту да банкроцтва, да набліжэння якога прычыніліся і ворагі Тызенгаўза пры каралеўскім двары. Аддаючы належнае ідэі літоўскага падскарбія аб ператварэнні Гродна ў цэнтр новай прамысловасці, адзначым, што галіны вытворчасці, якія ён абраў для свайго эксперымента, і сёння паспяхова развіваюцца ў Гродне – выраб шкла, тканін, люстраў, транспартных сродкаў і інш.

У тым зародку новага горада, які ствараў Тызенгаўз на Гарадніцы, важнае месца адводзілася друкаванаму слову, як сродку захоўвання і перадачы ведаў. З Вільні была перавезена езуіцкая друкарня, якая лічылася каралеўскай, але была здадзена ў арэнду райцы гарадскога магістрата Яну Ясінскаму, атрымаўшаму афіцыйную пасаду інтэнданта каралеўскай друкарні [1, с.173]. З Аўстрыі быў запрошаны майстар па ліццю шрыфтоў (гісер) і тыпограф Нахім, праўда, прыехаў ён у горад ужо пасля адстаўкі Тызенгаўза. У Гродна пачала выдавацца першая на нашай тэрыторыі газета, і, дарэчы, упершыню была заснавана свецкая дзяржаўная цэнзура перыядычнага друку – пастаўлены ад караля цэнзар павінен быў праглядаць газету перад яе выхадам у свет, пільнуючы, каб у ёй не было вострых палітычных выказванняў.

Пачынанні Антонія Тызенгаўза па стварэнні ідэальнага горада, які б адпавядаў марам асветнікаў, не былі цалкам беспаспяховымі. Усё, што закладвалася ў той час, мела свой працяг, увасаблялася і развівалася праз дзесяцігоддзі ці нават стагоддзі. Сёння мы нездарма звяртаемя да тых часоў, шукаючы вытокі вышэйшай адукацыі, адметнасцяў гродзенскай планіроўкі і архітэктуры, музычнага і тэатральнага мастацтва, друку, прамысловасці. Можна сказаць, што ўрокі гродзенскага Універсітэта не прайшлі дарма.

**Літаратура**


1. Гардзееў, Ю. Магдэбургская Гародня. / Ю.Н. Гардзееў – Гародня-Wroclaw, 2007.

2. Игнатович, Ф. Гродненский ботанический сад и его судьба (к 225-летию со дня основания) / Ф.Игнатович // Садова-паркавае мастацтва Гродзеншчыны: гісторыя і сучаснасць / нав. рэд. С.Куль-Сяльверстава; склад. В.Карнялюк. – Гродна, 2001.

3. Квитницкая, Е.Д. Строительство А.Тизенгауза в Гродно / Е.Д.Квитницкая // Архитектурное наследство. 1961.

4. Kurdybacha, L. Powstanie i główne kierunki działalności Komisji Edukacji Narodowej / L.Kurdybacha. // Borelly J.A. Plan reformy nauczania elementarnego. – Warszawa, 1973.

5. Łukaszewicz, J. Historia szkół w Koronie i w Wielkim Księstwie Litewskim od najdawniejszych czasów aż do roku 1794 / J.Łukaszewicz. – T.IV. – Poznan, 1851.

**Лябецкі Уладзімір Сяргеевіч,** *выкладчык УА "Гродзенскі дзяржаўны музычны каледж", кіраўнік вучэбнай і выхаваўчай работы філіялаў кафедр УА "Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі"*

# НЕВЯДОМЫЯ СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ МУЗЫЧНАГА МАСТАЦТВА ГРОДНА: З РЭПЕТУАРУ ТЭАТРА АНТОНІЯ ТЫЗЕНГАЎЗА

Эпоха Класіцызму – час вялікіх і кардынальных зрухаў у эканамічным і духоўным жыцці Еўропы. Барочная напружанасць у мастацтве паступова пачынае знікаць, саступаючы месца ідэям Асветы. Айчынная музычная культура набывае новыя рысы, адпаведныя і разам з тым адметныя ў адносінах да агульнаеўрапейскага мастацкага руху. Нягледзячы на тое, што Беларусь па-ранейшаму застаецца поліканфесійным арэалам, найбольш моцны інавацыйны рух эпохі назіраецца ў сферы свецкага музычнага мастацтва і культуры. Музыка займае ўсе большае месца ў побыце розных слаёў насельніцтва беларускіх гарадоў, маёнткаў і мястэчак. Менавіта гэты час патрабаваў і адначасова спараджаў людзей, дзеянні і праца якіх закладвалі падмурак навукі, адукацыі і культуры на Гродзеншчыне.

Ключавой з'явай свецкага музычнага мастацтва Еўропы другой паловы XVIII стагоддзя стаў музычны тэатр, які, у сваю чаргу, аказаў уплыў на такія формы музычнай дзейнасці, як выканальніцтва, адукацыя і выхаванне. Менавіта музычны тэатр, які заняў вядучае становішча сярод іншых відаў тэатральнага мастацтва, "вызначаў характар тэатральнай культуры рэгіёна ўвогуле, ...з'яўляючыся адным з правадыроў" эпохі Асветы [1, с.156]. Укараненню музычнага тэатра на тэрыторыі Гродна спрыялі наступныя перадумовы: аб'ектыўным было ўзмацненне інтэграцыі ўсходняй і заходняй

культур у эпоху Асветы, а суб'ектыўнай – арыентацыя беларускіх магнатаў на заходнія ўзоры мастацкай творчасці, гэтакая своеасаблівая даніна модзе [2, с.25]. Самай распаўсюджанай у рэпертуары прыватнаўласніцкіх тэатраў становіцца заходнееўрапейская камічная опера, ці опера (–) буффа, эмацыянальна-вобразны змест якой адпавядае забаўляльнай скіраванасці палацава-арыстакратычнай культуры Беларусі. Аднак разам з пацешлівымі функцыямі опера садзейнічала ў распаўсюджванні перадавых ідэй філосафаў-асветнікаў. Па меркаванні Б.Асафьева, музычны тэатр актывізаваў вакол сябе сістэму "мастацкай гаспадаркі": творчасць, выканальніцтва, адукацыю і выхаванне. Для ажыццяўлення оперных пастановак запрашаюцца вядомыя заходнееўрапейскія кампазітары і выканаўцы, арганізоўваюцца школы для выхавання музыкантаў. У рэшце рэшт, ствараецца цэласная сістэма, якая змяшчае творчасць, выканальніцтва, музычную адукацыю і выхаванне.

Як вядома з гісторыі, у 1765 годзе Антоній Тызенгаўз быў прызначаны гродзенскім старастай. Менавіта з гэтага часу пачынаецца праца па стварэнні ўласнага тэатра, куды запрашаліся знакамітыя еўрапейскія музыканты-інструменталісты і, канешне, італьянскія спевакі. Тэатр падскарбія змяшчаў некалькі труп (оперную, балетную, драматычную, а таксама інструментальную капэлу і хор), у складзе якіх з часам пачынаюць адбывацца замены еўрапейскіх артыстаў на мясцовых, прыгонных, што спрыяе развіццю выканальніцтва [1, с.164]. Неабходнасць падрыхтоўкі сваіх музычных кадраў стымулюе ўзнікненне тэатральнай і музычнай школ. Пачынаецца стварэнне асноў прафесійнай музычнай адукацыі.

Найбольш любімым і галоўным жанрам у тэатры графа была опера. Перш за ўсё, аб гэтым сведчыць вялікая колькасць спевакоў, што былі на службе А.Тызенгаўза. У 1772 годзе ён накіраваў у мастацкія цэнтры Заходняй Еўропы свайго паверанага – капельмайстра і скрыпача Леона Сітаньскага з мэтай набыцця музычных інструментаў, а таксама рэкрутавання перапісчыка нот, музыкантаў і кампазітара для работы ў капэлле падскарбія ў Гродне [4, с.6–7]. У 1774

годзе Л.Сітаньскі прывёз у Гродна "...чатырох спевакоў–кастратаў, "тэнарыста", спявачку з мужам, балетмайстара (Гаэтана Пецінэцці) і маладога кампазітара Кампіле Аббатэ, які з гэтага моманту пачаў выконваць у Гродне таксама функцыі капельмайстара" [4, с.8]. Аб прыхільнасці А.Тызенгаўза да оперы ўскосна сведчаць і такія дакументы, як кантракты з музыкантамі. Напрыклад, спевак Алессандро Бароні згодна з кантрактам быў абавязаны выступаць ва ўсіх операх–буффа [4, с.23]. У 1775 годзе князь Міхал Панятоўскі праз ліст звяртаўся з просьбай да графа "...прыслаць музыкантаў і Хіблера (спевака), каб на прыезд караля прадставіць у Беластоку польскую оперу-буффа, якую мясцовыя камердынеры, што спяваюць, разам будуць выконваць" [4, с.22].

Партытуры опер замежных кампазітараў падскарбій набываў за грошы, пазычаў для перапісвання, а таксама рабіў заказы на стварэнне кампазітарам, таму варта выказаць меркаванне аб тым, што частку рэпертуару складалі творы мясцовых кампазітараў. Адным з пастаўшчыкоў партытур для музычнага тэатра графа быў Францішак Рыкс, які прысылаў з Варшавы ноты для перапісвання. Так, у 1774 годзе ён накіраваў А.Тызенгаўзу партытуры опер А.Саккіні "Уяўная ўтрапёнасць дзеля кахання", П.Гульельмі "Дакладная жонка" і П.Анфоссі "Пазнаная Мацільда", пасля чаго намерваўся даслаць новую оперу М.Піччынні "Рыбакі" [4, с.22–23]. У 1778 годзе А.Тызенгаўз пазычыў у Ф.Рыкса тэатральныя ўбранні для пастаноўкі оперы А.Грэтры "Пышны". У сваю чаргу, Францішак Рыкс яшчэ неаднаразова высылаў партытуры опер у Гродна, аб чым сведчыць яго перапіска з графам: "Оперы адпаведна новаму спісу высылаю неадкладна" ці "...буду рабіць намаганні, каб выслаць чаканыя дзве оперы" [4, с.24]. Знакамітая польская даследчыца гродзенскага тэатра А.Тызенгаўза А.Жураўска-Віткоўска мяркуе, што некаторыя італьянскія кампазітары падтрымлівалі прамыя кантакты з тэатрам падскарбія, у прыватнасці, Мікола Піччынні, з якім падчас замежнай камандзіроўкі непасрэдна кантактаваў Лявон Сітаньскі [4, с.26]. На гэтым, як лічыў знакаміты даследчык беларускага тэатра Гурый Барышаў, вычэрпваліся ўсе

звесткі аб рэпертуары тэатра Антонія Тызенгаўза [1, с.190]. Тым больш каштоўнымі падаюцца нядаўна знойдзеныя беларускім музыкантам Аляксеем Фраловым ў Галоўным архіве старадаўніх актаў (AGAD) у Варшаве нотныя матэрыялы, якія ён ласкава перадаў нам для даследавання. Гэтыя дакументы, якія раней не траплялі ў поле зроку даследчыкаў, належаць да Архіву Тызенгаўзаў і налічваюць 111 рукапісных нотных старонак (ад 328 да 385 аркуша Групы D). Яны складаюцца з некалькіх тыпалагічна розных частак. Пачатак збораў адкрываецца тытульным аркушам з назвай Меса (Missa). Следам ідуць старонкі двух фрагментаў (Largo і Largo Expressivo) – вакальная партыя са сціплым акампанементам. Тэкст вакальнай партыі прадстаўляе характэрны для XVIII стагоддзя оперны сюжэт. Выкарыстанне італьянскай мовы дае магчымасць выказаць здагадку аб прыналежнасці гэтых старонак да твора опернага жанру [3, с.242]. Аналіз оперы можна ажыццявіць па прадстаўленых у рукапісе асобным галасам і іх суадносінам. Так, партыя сапрана (аркуш 330) па сваім складзе набліжаецца да барочнага рэчытатыву, а некалькі гуллівая тэма ўступа створана ў класіцысцкай манеры, дзе мелодыя ў поўнай меры падпарадкоўваецца законам гарманічнай функцыянальнасці. Трэба дадаць, што ў час стварэння дадзенага ўзору практыкавалася ўжыванне ключоў "до" для вакальнага выканання. Як мы бачым, партыя сапрана выкладзеная ў сапранавым ключы. Паказальнымі з'яўляюцца матывы з паменшанай квартай, якія нагадваюць хады з кантаты № 21 І.С. Баха.

І.С. Бах



Ананім



Матыў з паменшанай квартай з'яўляецца звяном секвенцыі, мадуліруючай з до-мінора ў фа-мінор. Выкарыстанне мадуліруючых секвенцый – тыповы прыём як для стылю барока, так і для класіцызму (маюцца на ўвазе інтэрмедыі фуг і связуючыя партыі санатных формаў). Таксама агульным для двух эпох стаў цэлы шэраг акордавых сродкаў. Элемент, які паказвае на афектацыю, характэрную для двух эпох, – гэта гармонія паменшанага сэптакорда як знак трагізму і безвыходнасці (аркуш 332):



Матэрыял, прадстаўлены на аркушах 333–348, уяўляе сабою напрацоўкі оперных нумароў. Так, фрагмент Andante amoroso прадстаўлены ў выглядзе скрыпічнай партыі аркестравага ўступлення да арыі. У ім устойліва трымаецца танальнасць фа-мажор. Своеасаблівым "лейтпрыёмам" з'яўляюцца дыятанічныя і храматычныя прыгатаваныя затрыманні, распаўсюджаныя ў тэмах арый барочных кантат. Вядома, што ў музыцы Венскіх класікаў сфармавалася цэлая сістэма затрыманняў рознага роду, стаўшы знакавай рысай іх музыкі. Падзелы Allegro maestoso, Marcia andante – гэта выключна аркестравыя нумары. Тэхніка патройных нот, якая прадстаўлена ў тэксце, верагодна, размяркоўваецца па розных групах інструментаў.

Далей, з аркуша 349, калекцыя мяняе свой выгляд – яна ідзе на паперы альбомнага фармату (замест кніжнага, што ў вышэйапісаных фрагментах), і захавалася не толькі ў выглядзе партый (арк. 349–351), але (з арк. 352) і ў партытурным варыянце, у якім пазначана нумерацыя оперных сцэн (з 9 па 14) з тэкстам на італьянскай мове. Судзячы па характа-

ры афармлення музычнага тэксту – гэта ўжо іншы твор. У той жа час сваяцтва інтанацыйных абаротаў сведчыць аб тым, што гэтыя творы зроблены адным кампазітарам. Прыкметы таго, што гэта працоўны сшытак для натавання музычных думак і раптоўных творчых азарэнняў відавочныя – гэта адсутнасць на пачатку нотнага стану ключэй, ключавых знакаў. Між тым, ва ўсіх выпадках выразна прасочваецца логіка гарманічнай функцыянальнасці.

Такім чынам, аналізуючы як раней вядомыя звесткі па рэпертуары тэатра Антонія Тызенгаўза, так і новыя крыніцы, трэба падкрэсліць, што на сцэне гродзенскага тэатра ставіліся творы як заходнееўрапейскіх, так і мясцовых аўтараў. Пэўную частку складалі нядаўна створаныя оперы італьянскіх кампазітараў – у асноўным – оперы-буффа, у якіх новы яркі класічны стыль перагукаўся з уплывам яшчэ моцнага барокка і лёгкага стылю галант [3, с.243].

**Крыніцы:**


1. Барышев, Г.И. Частновладельческий музыкальный театр второй половины XVIII в. / Г.И.Барышев // Музыкальный театр Белоруссии: дооктябрьский период. – Минск: Навука і тэхніка, 1990. – С.155–244.

2. Дадиомова, О.В. Музыкальная культура городов Белоруссии в XVIII веке / О.В.Дадиомова. – Минск: Навука і тэхніка, 1992. – 207 с.

3. Фралоў, А. Новыя матэрыялы па гісторыі музыкі Беларусі з варшаўскіх сховішчаў / А.Фралоў // Музычная культура Беларусі і свету: да 100-годдзя Л.С.Мухарынскай / Навуковыя працы Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Вып. 12. Серыя 1. Беларуская музычная культура; склад. Т.С.Якіменка. – Мн.: УА "Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі", 2006. – С.228–247.

4. Zorawska-Witkowska, A. Kapela Antoniego Tyzenhauza w Grodnie / A.Zorawska-Witkowska // Muzyka. – 1977. – № 2. – S.30-35.

5. САККІНІ (Sacchini) Антоніо Марыя Гаспарэ (14.VI.1730, Фларэнцыя – 6 альбо 7.X.1786, Парыж) – італ. кампазітар. – [Музыкальная энциклопедия. Т.4. – С.819].

6. ГУЛЬЕЛЬМІ (Guglielmi) Пьетро Алессандро (9.XII.1728, Масса-Каррара – 18.XI.1804, Рым) – італ. кампазітар и капельмайстар. [Музыкальная энциклопедия. – Т.2. – С.102].

7.АНФУССІ (Anfossi) Паскуале (25.IV.1727, Таджа, каля Неапаля – люты. 1797, Рым) – італ. кампазітар [Музыкальная энциклопедия. – Т.1. – С.176].

8. ПІЧЧЫННІ (Piccinni) Міккола Вінчэнца (16.I.1728, Бары – 7.V.1800, Пассі, каля Парыжа) – італ. кампазітар [Музыкальная энциклопедия. – Т.4. – С.299)].

9. ГРЭТРЫ (Gretry) Андрэ Эрнэст Мадэст (8 ці 11.II.1741, Льеж – 24.IX.1813, Манмарансі, каля Парыжа) – франц. кампазітар, муз. пісьменнік [Музыкальная энциклопедия. – Т.2. – С.47].

10. Аркуш у нумарацыі AGAD – "карта".

11. Фрагмент тэксту ў перакладзе: "І вось я дасягнула канца апошняга шляху. Праз некалькі імгненняў я павінна памерці, і памерці бязвіннай. Няшчасны сын і няшчасны муж – цябе я больш не пабачу...о, Божа!... Душа ўзносіцца да зораў..." [3, С.242].

**Трусов Игорь Георгиевич,** *краевед*

# К ИСТОРИИ ЗДАНИЯ ТЕАТРА КУКОЛ В ГРОДНО

В энциклопедической и специальной справочной литературе здание современного Гродненского театра кукол описывается как специально построенное в 80-е годы XVIII века для театра Антония Тизенгауза [1, с.49, 50]. В тоже время анализ опубликованных архивных текстовых и иконографических источников позволяет сделать совершенно определенный вывод о том, что вплоть до 1780 года, то есть до момента отстранения Антония Тизенгауза от должности подскарбия Великого княжества Литовского, здания на месте современного тетра кукол вовсе не было.

[illegible]



"Проектный" план Городницы около 1780 года (по В.Калнину).

На т.н. "проектном плане" Городницы [2], который один из самых лучших исследователей истории архитектуры Беларуси Валентин Калнин датирует "около 1780 года" [3, с.35], какое-либо здание на месте современного театра кукол отсутствует. На его месте участок, выделенный под сад, а среди зданий Городницы примерно там, где сейчас располагается "Беларусбанк", на улице Ожешко под литерой "Д" в легенде обозначен "Оперхауз", т.е. оперный театр. Следует отметить, что здание оперного театра так и не было построено на этом месте, как, впрочем, и многие запроектированные здания на Городнице, например, вторая "Кривая официна".

На так называемом плане Гродно Юзефа Маркевича 1780–1783 годов [4] на месте современного здания Театра кукол также нет строения, а в легенде к плану нет упоминания о здании театра. Здесь следует отметить, что "План Маркевича" является фактически обмерным и в легенде к нему перечислены только существующие реально здания с их реальным на это время предназначением.



Городница на "плане Маркевича" 1780–1783 года.

Впервые здание на месте нынешнего Театра кукол появляется между 1783 и 1795 годом. Оно отображено на плане Гродно 1795 года [5]. О предназначении этого вытянутого каменного здания, примыкающего к хозяйственному крылу бывшего дворца Тизенгауза, сказать трудно. В библиотеке Варшавского университета, в собрании Кабинета гравюр хранится чертеж каменного манежа при дворце на Городнице [6]. Здесь следует отметить, что на Городнице, недалеко от дворца уже существовал, как минимум с 1780 года, деревянный манеж примерно на том месте, где сейчас находится Городской дом культуры. Видимо, по каким-то причинам он не удовлетворял короля, и было построено новое каменное здание манежа. Мы считаем, что оно и было "родоначальником" здания современного Театра кукол.



Городница на плане 1795 года.

На чертеже из собрания Кабинета гравюр библиотеки Варшавского университета есть немало деталей, как на фасаде, так и на разрезе, которые позволяют нам заключить, что изображенное на чертеже здание – часть объема здания современного Театра кукол. Во-первых, размеры здания в пла-

не совпадают с размерами в плане наиболее старой части Театра кукол. Во-вторых, во время работ по ремонту фасадов здания в конце 90-х годов XX века были сделаны архитектурные зондажи стен, посредством которых был выявлен строительный объем конца XVIII века, который в точности совпадает с объемом здания на чертеже из библиотеки Варшавского университета. Здание манежа было спроектировано "в два света", т.е. высота внутреннего помещения была немалой – около 7 метров. Многочисленные квадратные и полуциркульные окна давали достаточно естественного освещения. Это здание было несложно приспособить для проведения театральных представлений – было достаточно места для размещения небольшого зрительного зала и сцены, а в одноэтажных боковых каменных объёмах по бокам основного здания – помещения для актёров, гримерную и т.п.



Чертежи манежа из Кабинета Гравюр библиотеки Варшавского университета.

План Гродно Адама Тодта 1797 года [7] более точный, чем план Гродно 1795 года является дополнительным подтверждением вышеприведенных выводов. На этом плане форма здания полностью совпадает и по размерам, и по форме с чертежом манежа из Кабинета Гравюр библиотеки Варшавского университета.



Городница на плане 1797 года

Здесь встаёт вопрос – когда здание манежа было перестроено для размещения театра. Такой малоизвестный неопубликованный архивный источник как "Reestr dobr pokrolewskich w Grodnie 20/31 augusta 1795 roku" прямо указывает на то, что в списке бывших королевских зданий в Гродно нет театра, но есть манеж при дворце на Городнице [8]. Этот факт позволяет нам заключить, что до присоединения города Гродно к Российской империи специального здания для проведения театральных представлений в Гродно не было.

Первый документ о перестройке манежа в театр был нами найден в Российском государственном историческом архиве в Санкт-Петербурге. Это датируемый 1803 годом "План казённого здания для квартирования губернатора, в котором также размещен манеж с театром" [9]. Часть фразы

названия документа – связка слов "...манеж с театром" – говорит о существующем в 1803 году двойном назначении этого здания. В другом документе из этого архива за 1806 год есть "План театра на Городнице" [10], из которого следует, что здание бывшего манежа теперь осуществляет только функцию театрального.

Другой план из этого архива – 1816 года [11] – только подтверждает этот факт. На этом чертеже здание имеет такую же форму, как на плане 1797 года, а из этого следует, что серьёзной перестройке здание бывшего манежа не подвергалось. В легенде к этому плану прямо указано под литерой "С", что это здание "под театром".

На протяжении всего XIX века здание театра неоднократно ремонтировалось, ремонты эти в основном были мелкими. Серьезная перестройка была осуществлена в 1859 году, когда объём строения был увеличен, план приобрёл ассиметричную объёмно-пространственную композицию [12]. Именно после этого ремонта здание театра приобрело знакомые по старым фотографиям внешние формы.



План Городницы 1816 года.

Более сложным является вопрос устройства интерьера здания театра. Каких-то архивных материалов по устройству интерьера зрительного зала, сцены, других внутренних помещений театра нам пока разыскать не удалось.

Стилевые особенности сохранившихся деталей интерьера зрительного зала позволяют нам судить о том, что какой-то серьёзный ремонт производился в самом конце XIX–XX века.

В 1940 году был надстроен третий этаж, а в 1975 году была расширена сценическая коробка [13].

В конце 90-х годов XX века "Архитектурно-реставрационное бюро С.Шейко" провело комплексные научные исследования для проекта реставрации фасадов здания, на основании этих исследований было проведено несколько ремонтов.

Совершенно очевидно, что исследователям следует задуматься над такой проблемой, как определение места или мест, где проходили театральные представления во времена Антония Тизенгауза.



Здание театра в начале XX века

Есть сведения, что некоторые музыкальные концерты и представления проходили в конфискованном в 1773 году у иезуитов костёле [14]. В своё время, в Варшаве, во время анализа "проектного" плана Городницы из библиотеки Варшавского университета доктор Ежи Лилейко из Института искусствоведения ПАН выдвинул предположение о том, что некоторые спектакли летом могли проходить на свежем воздухе на площади перед дворцом Тизенгауза, а VIP – места для зрителей располагались в открытой галерее "Кривой официны". Не исключено, что часть представлений проходило для короля и узкого круга в Новом замке и, возможно, в Станиславово. Но вопрос остается открытым и ждёт своих исследователей.

**Список использованных источников**

1. Будынак тэатра Тызенгаўза // Збор помнікаў гісторыі і культуры. Гродзенская вобласць – Мінск, 1986.

2. Biblioteka Uniwersjtetu Warszawskiego. Zbiory Królewskie. P. 187. Nr.158.

3. Калнин, В.В. Городница – городской ансамбль XVIII века. // Строительство и архитектура Беларуси 1988 – № 4.

4. Российский государственный военно-исторический архив в Москве (РГВИА). – Фонд 846. – Оп.12. – Д.21873.

5. Российский государственный военно-исторический архив в Москве. – Фонд 846. – Оп.12. – Д.21875.

6. Biblioteka Uniwersjtetu Warszawskiego. Zbiory Królewskie, Gabinet Rycin. Nr. 112.

7. Politechnika Warszawska Zbiór pomiarów V-II-I.

8. Литовский государственный исторический архив в Вильнюсе. – Фонд 1219. – Опись 1. – Дело 415. – Лист 1.

9. Российский государственный исторический архив в Санкт-Петербурге. – Фонд 1488. – Опись 1. – Дело 935. – Лист 6.

10. Там же. Дело 942. – Лист 7.

11. Там же. Лист 12.

12. Национальный исторический архив РБ в г. Гродно. – Фонд 8. – Опись 1, – Дело 1112 и 1422.

13. Будынак тэатра Тызенгаўза // Збор помнікаў гісторыі і культуры. Гродзенская вобласць. – Мінск, 1986, – С. 49.

14. Литовский государственный исторический архив в Вильнюсе. – Фонд 1135. – Опись 2. – Дело 213. – Л. 12.

**Ярашук Марына Віктараўна,** *аспірант факультэта гісторыі і сацыялогіі УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы"*

# ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЕ ГРОДНА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТ. У МЕМУАРНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Заходнебеларускія землі, далучаныя да Расійскай імперыі ў выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай 1795 г., асабліва выразна сталі падвяргацца ўздзеянню расійскіх улад менавіта ў першай палове XIX ст. Разам з іншымі сферамі жыцця пераўтварэнні закранулі дзейнасць тэатра. Яго магчымасці адлюстроўваць вострыя праблемы тагачаснага жыцця і ўплываць на настроі публікі ўлады не маглі пакінуць па–за ўвагай і ўласным кантролем. Даследаванне тэатральнага жыцця Гродна дазваляе прасачыць, якім чынам гэтыя мерапрыемствы агульнадзяржаўнага маштабу рэалізоўваліся на мясцовым узроўні, якія мелі асаблівасці.

Ужо ў канцы XIX ст. пачалі з'яўляцца даследаванні па гісторыі польскага тэатра. Сярод іх вылучаюцца працы К.Эстрэйхера [1, с.80-87] і А.Мілера [2, с.217–219]. Беларускімі даследчыкамі былі створаны такія грунтоўныя працы, як "Гісторыя беларускага тэатра" [3, с.225–258] і энцыклапедыі "Тэатральная Беларусь" [4, с.3-5], "Памяць: Гіст.-дакум. хроніка горада Гродна" [5, с.237-242]. Яны ўтрымліваюць дастаткова фактаў аб дзейнасці гродзенскага тэатра першай паловы XIX ст. У названых працах разам з іншымі крыніцамі былі выкарыстаны ўспаміны сучаснікаў тых падзей, але асобнага даследавання гэтых успамінаў не праводзілася. Па гэтай прычыне актуальным прадстаўляецца вывучэнне менавіта пункту погляду сучаснікаў – аўтараў мемуараў на тэатральнае жыццё Гродна першай паловы XIX ст., а таксама аналіз інфарматыўнасці гэтых успамінаў, магчымасцей і асаблівасцей іх выкарыстання ў гістарычных даследаваннях такіх

сучасных накірункаў, як гісторыя паўсядзённасці і мікрагісторыя.

Мемуары тэатральных дзеячаў Войцэха Багуслаўскага [6, с.80-87] і Казіміра Скібінскага [7, с.80-87] адлюстроўваюць блізкую ім сферу дзейнасці – тэатр канца XVIII – першай паловы XIX стст. з унутранага боку праз уласны вопыт аўтараў, узаемаадносіны з калегамі і грамадскасцю. У прадмове да мемуараў К.Скібінскага выдавец М.Рулікоўскі адзначаў іх каштоўнасць як першачарговага новага матэрыялу аб звычаях той эпохі [7, с.V-VI]. Асобныя заўвагі, факты, што датычацца тэатра, утрымліваюць успаміны І.Ю.Крашэўскага [8, с.80-87] і Ф.Я.Міркавіча [9, с.80-87]. Яны могуць служыць для ўдакладнення агульнай карціны, параўнання дзейнасці тэатраў розных гарадоў для вылучэння асаблівых рысаў гродзенскага.

У пачатку XIX ст. у Гродне рабіліся першыя спробы дзейнасці сталага тэатра на камерцыйнай аснове, даступнага больш шырокай публіцы. У горадзе выступалі з гастролямі камерцыйныя трупы – антрэпрызы з Варшавы і Вільні, часам замежныя трупы. Такія наведванні, як успамінаў В.Багуслаўскі, сталі традыцыйнымі з канца XVIII ст., калі варшаўскія артысты, разлічваючы атрымаць добры заробак, рэгулярна прыязджалі ў Гродна пад час сеймаў, засяданняў літоўскага трыбунала [6, с.40-49]. Разам з віленскай антэрпрызай Бонч-Тамашэўскага ў 1803 г. упершыню ў Гродна прыехаў з выступленнямі малады К.Скібінскі [7, с.8–9].

Антрэпрыза – камерцыйны тэатр – паступова займаў месца прыватнаўласніцкага. Арганізоўваўся прадпрымальнікам-антрэпрынёрам, які на ўласныя сродкі наймаў акцёраў, забяспечваў падрыхтоўку выступленняў з мэтай атрымання прыбытку. Акторы маглі далучацца ў якасці акцыянераў. Выгаднай справай была арганізацыя абанемента для найму ложаў заможнымі абывацелямі на ўвесь сезон [7, с.47].

Паспяховасць тэатра залежала ад шэрагу ўмоў: унутраных – разнастайнасці і папулярнасці рэпертуару, хуткасці яго абнаўлення [7, с.48], гульні акцёраў, іх колькасці, матэрыяльнага забеспячэння (памяшканне тэатра, дэкарацыі, касцюмы, асвятленне і г.д.).

Размяшчэнне тэатра пэўным чынам магло ўплываць нават на колькасць і склад публікі. Так у Гродне тэатральныя выступленні з канца XVIII ст. стала праводзіліся на Гарадніцы ў памяшканні былога каралеўскага манежа [6, с.43; 7, с.204–205]. В.Багуслаўскі ўспамінаў, што "даждлівая пара года так надзвычайна заліла граззю мала яшчэ ў той час брукаваныя гродзенскія вуліцы, што з цяжкасцю нават экіпажам можна было даехаць да тэатра, размешчанага аж за горадам". Дазволіць сабе гэта змаглі толькі больш заможныя гараджане, што адмоўна паўплывала на даходы тэатра [6, с.45].

Знешнія ўмовы: наяўнасць у горадзе канкурэнтаў – іншага тэатра альбо відовішча, час выступлення таксама значна ўплывалі на дзейнасць тэатральных антрэпрыз. Найбольшы прыбытак прыносілі выступленні падчас кірмашоў, кантрактаў, выбараў, зімовых карнавалаў, калі ў горадзе збіраліся абывацелі з павета альбо цэлай губерні [7, с.55, 99, 210]. Такія абставіны вымушалі антрэпрынёраў арганізоўваць гастролі, каб пакрыць выдаткі і атрымаць прыбытак, так як пастаянна выступаючы ў адным горадзе, складана было разлічваць на гэта.

У 1801 г. Гродна стала цэнтрам губерніі, што дало штуршок да актывізацыі ў тым ліку і тэатральнага жыцця горада [5, с.143]. У 1803 г .(па іншым дадзеным у 1802 г. [4, с.85].) Таварыства гродзенскіх актораў раздзялілася на дзве антрэпрызы. Першую ўзначаліла Саламея Дэшнер (да 1806 г.) [5, с.238], а другую – Ян Шыманскі (да 1808 г.) [4, с.83-84]. Трупа С.Дэшнер пастаянна выступала ў Гродне, а Я.Шыманскі спалучаў сталыя прадстаўленні ў Гродне зімой з летнімі гастролямі па гарадах і мястэчках губерн [7, с.9-16]. Да апошняга далучыўся К.Скібінскі, менавіта яго ўспаміны даюць інфармацыю аб дзейнасці трупы Я.Шыманскага.

Складаючай поспеху выступленняў было іх матэрыяльнае забеспячэнне. К.Скібінскі адзначаў, што трупа Я.Шыманскага, гастралюючы па Гродзенскай губерні, мела такія бедныя дэкарацыі, што публіка не магла зразумець, якую п'есу прадстаўлялі акторы. Да таго ж яны згарэлі падчас пажару

ў Зэльве (1803 г.). Суадносячы веліч слонімскага тэатра, хаця і ў руінах, з тэатральнымі дэкарацыямі, К.Скібінскі пісаў, што "былі яны ліліпутамі пры тым гіганце" (1804 г.) [7, с.10, 14].

Калі гэта акалічнасць магла стаць прычынай няўдалых выступленняў у буйных гарадах, то публіка павятовых гарадоў і невялікіх мястэчак з задавальненнем наведвала выступленні гастралёраў. Так, слонімскія абывацелі, прагныя да відовішчаў, натоўпам з'язджаліся з ваколіц нават у нязвыклую для забаваў летнюю пару на прадстаўленні трупы Я. Шыманскага (1804 г.) [7, с.14]. Граф Вінцэнцій Тышкевіч, уладальнік Свіслачы, прадаставіў трупе заможны тэатр з дэкарацыямі і асвятленнем, а пасля гастролей заплаціў 50 дукатаў за сваю ложу (1803 г.) [7, с.10].

Выступленні гэтай трупы зімой 1804 г. у Гродне прайшлі паспяхова за кошт новых актораў з Варшавы. Павелічэнне колькасці актораў дазволіла паставіць новыя больш буйныя драмы "Пустэльнік на выспе Фарментэра", "Інэс дэ Кастра", "Смерць Авеля", оперу "Цуд уяўны, альбо горцы і кракаўцы" Багуслаўскага, а таксама некалькі вадэвіляў "Сем разоў адзін", "Білет на латарэю" Дмушэўскага [7, с.13].

Рэпертуары тэатральных труп асабліва не адрозніваліся. Часцей ставілі камедыі, у большасці замежныя ў перакладзе на польскую мову. Ігралі таксама творы Багуслаўскага, Заблоцкага, Дмушэўскага, Нямцэвіча, а пасля Фрэдры. У рэпертуар уваходзілі трагедыі Шылера, Карнеля, Вальтэра і Шэкспіра і інш., драмы, оперы і вадэвілі. [6, с.131, 137, 139, 154, 171]. Асаблівай папулярнасцю карысталіся буйныя п'есы і оперы [7, с.21, 46-47, 206-207, 238-239]. Наладжаныя адносіны паміж акторамі дазвалялі абменьвацца вопытам, новымі творамі для пастаноўкі. Так, у 1816 г. К.Скібінскі карыстаўся варшаўскай бібліятэкай В.Багуслаўскага для падрыхтоўкі новых п'ес. Ён пісаў, што "выбраў 50 твораў, паміж якімі некалькі операў і "Ядвіга" (музыка Курпінскага, словы Ю.У.Нямцэвіча), вельмі на той час славутая. Казаў намаляваць мастаку тэатра 4 новыя дэкарацыі, з іх 2 да "Ядвігі"... Вяртаючыся (у Гродна, дзе гастралявала трупа), вёз вялікі пакунак папераў... да 1000 аркушаў" [7, с.113, 116]. На жаль,

амаль усе яны загінулі ў пажары, што ахапіў Мінск у 1835 г." [7, с.234-236]. Можна меркаваць, што новыя п'есы даходзілі да беларускіх зямель з пэўным спазненнем.

К.Скібінскі пад 1810 г. адзначаў, што ў гэты час ужо дзейнічала расійская цэнзура, якая забараняла паказ некаторых народных п'есаў. Але літоўскі генерал-губернатар М.Кутузаў (1809–1812) спрыяў развіццю мастацтва, таму дазваляў іх прадстаўленне, толькі са змененымі назвамі [7, с.50-52].

Рэпертуар трупы фарміраваўся ў залежнасці ад складу, колькасці і здольнасцей актораў. Часцей за ўсе антрэпрызы ўключалі невялікую колькасць актораў. К.Скібінскі заўважыў, што ў трупу Я.Шыманскага ўваходзіла толькі некалькі асоб, а ў гастралюючую французскую трупу – усяго 8 [7, с.9,96]. Большыя трупы складаліся з 30–50 асоб [7, с.105, 206]. Невялікім антрэпрызам не пад сілу было паставіць вялі-кія п'есы, оперы, таму яны выступалі з аперэтамі, вадэвілямі, балецікамі і іншымі адносна простымі творамі. Значныя оперы, драмы і трагедыі патрабавалі шмат сродкаў, але звычайна прыносілі добрыя прыбыткі [7, с.206–210].

Акторы першай паловы XIX ст. паходзілі ў асноўным са шляхецкага асяроддзя, былі самавучкамі альбо навучаліся ў варшаўскай драматычнай школе [7, с.116]. Маладыя акторы праходзілі шлях ад больш простых выступленняў у балетах, камедыях да складаных опер, трагедый. Так паступова навучаўся акторскай прафесіі К.Скібінскі [7, с.8–10]. У выніку актор мог удзельнічаць у прадстаўленнях рознага характару, што было даволі выгадна для невялікіх тэатральных калектываў.

Антрэпрынер наймаў актораў на пэўных умовах, якія замацоўваліся кантрактам [6, с.158]. Заробак актора мог быць фіксаваным, раней вызначаным па дамоўленасці з прадпрымальнікам, а таксама нефіксаваным, у залежнасці ад паспяховасці выступленняў [6, с.123, 188, 190; 7, с.81]. Для фінансавай падтрымкі актораў праводзіліся бенефісы – прадстаўленні у гонар аднаго з актораў (напрыклад, як выказванне прызнання яго майстэрства). Прыбытак ад такіх выступлен-

няў цалкам паступаў на карысць гэтага чалавека – за выключэннем выдаткаў на спектакль [6, с.37, 187; 7, с.86].

Часам нават паспяховыя выступленні не маглі гарантаваць дастатковага заробку акторам, так як значная частка грошай ішла на аплату арэнды тэатра, кватэры актораў, іх харчавання, праезду і г.д. [6, с.180]. Многае залежала ад сумленнасці антрэпрынера. Так, на самым пачатку сваёй кар'еры актор К.Скібінскі сутыкнуўся з падманам: у 1803 г. Бонч-Тамашэўскі пакінуў сваіх выхаванцаў у Гродне падчас гастролей і не вярнуўся [7, с.8]. Пасля Я.Шыманскі не спяшаўся з выплатамі заробленых грошай. Актор не мог набыць сабе новага адзення, бо са старога ўжо вырас. Толькі заклапочаныя бацькі прыслалі новы кажух і боты і вельмі жадалі вярнуць К.Скібінскага дамоў [7, с.15–17]. (Нягледзячы на такія складанасці акторы рэгулярна давалі дабрачынныя спектаклі, увесь прыбытак ад якіх ішоў на карысць убогіх гараджан [7, с.208]).

Гэта былі не адзінкавыя выпадкі. Такое крытычнае становішча актораў штурхала іх на пошукі лепшых заробкаў. У першай палове XIX ст. частымі былі пераходы актораў ад аднаго прадпрымальніка да другога. Веданне польскай мовы, на якой адбываліся прадстаўленні, і рэпертуару садзейнічалі гэтаму. Так да гродзенскай трупы ў 1803 г. далучыліся варшаўскія акторы Фішар, Маркс, Такажэўская, а выхаванка В.Багуслаўскага С.Дэшнер сама арганізавала тэатр у Гродне [7, с.9, 11–12]. Не давяраючы свайму антрэпрынеру, акторы на ўласныя сумесныя сродкі маглі арганізоўваць трупы, размяркоўваючы абавязкі ўпраўлення паміж сабой.

Так адбылося ў 1816 г., калі незадаволеныя сквапнасцю антрэпрынера Мацея Кажынскага віленскія акторы стварылі антрэпрызу на аснове самакіравання. Гэта трупа наведвала Гродна падчас гастролей. У яе ўваходзіў К.Скібінскі, ужо знакаміты актор на той час [7, с.112–113]. Гастролі супалі з падрыхтоўкай вайскоўцамі Галоўнага штаба ўрачыстага агляду корпуса ў Скідзелі і прыездам Аляксандра I. У сувязі з гэтым у Гродне назіраўся наплыў публікі, што абяцала добрыя прыбыткі тэатральнай трупе [7, с.116–117]. У 1817 г. [7,

с.124] і 1819 г. [7, с.128] віленская антрэпрыза зноў прыязджала на гастролі ў Гродна. Пад 1827 г. К.Скібінскі ўспамінаў зусім збяднелую малую трупку Я.Шыманскага, якая на час гастроляў далучылася да віленскай трупы, каб зарабіць грошай [7, с.204–205]. У 1828 г. гастролі віленскай трупы расцягнуліся на тры тыдні [7, с.211].

Задумацца застаўляе крытычнае стаўленне І.Ю.Крашэўскага да дзейнасці віленскага тэатра ў 1830–1835 гг. На яго думку, гэты тэатр быў бедным і ўсяго толькі пасрэдным. Усе намаганні палепшыць становішча былі няўдалымі. Прычыну ен бачыў у невялікай колькасці публікі, каб мець добры пастаянны тэатр яе неабходна было павялічыць удвая [8, с.84–85]. Зыходзячы з гэтага, ці ж магло Гродна спрачацца з былой сталіцай Вялікага Княства Літоўскага ?

Расійскія ўлады не маглі пакінуць па-за ўвагай той факт, што асноўнай мовай тэатральных прадстаўленняў была польская. Адносна гэтага Ф.Я.Міркавіч, літоўскі генерал-губернатар занатаваў 16 мая 1845 г., што з дазволу імператара штогод адлічвалася 3 тыс.руб. серабром з даходаў Вільні для ўтрымання пры віленскім тэатры рускіх актораў. Неабходная іх колькасць была выпісана з тэатральнай школы Санкт-Пецярбурга. Улады спадзяваліся, што гэта дапаможа больш хуткаму распаўсюджванню праз пастаноўкі рускіх драматычных твораў на рускай мове і адпаведна – рускага ўплыву. Яны самі фарміравалі рэпертуар тэатра [9, с.299]. Можна меркаваць, што такія змены хутка распаўсюдзіліся і на тэатральнае жыццё Гродна пад час гастролей віленскага тэатра, а таксама праз распараджэнні ўладаў.

Такім чынам, мемуары сведчаць аб вялікай рухомасці тэатральнага жыцця Гродна першай паловы XIX ст., якое было цесна звязана з грамадскімі падзеямі, залежала ад разнастайных паўсядзённых абставін і хутка рэагавала на іх змены. З аднаго боку, назіралася дастаткова частае чаргаванне антрэпрызаў, а, з другога, – пэўнае пастаянства рэпертуару, а часам і актораў. Агульная культурна-моўная прастора садзейнічала сталым сувязям паміж тэатрамі Гродна, Вільні і

Варшавы. Паступова ў тэатральную дзейнасць уваходзіла руская мова, пашырыліся кантакты з тэатральнымі трупамі Санкт-Пецярбурга і Масквы.

Мемуары тэатральных дзеячоў К.Скібінскага і В.Багуслаўскага прадстаўляюць вялікую каштоўнасць для разумення прынцыпу дзейнасці антрэпрызаў, ладу жыцця актораў, іх праблемаў і клопатаў. Асаблівасцю іх з'яўляецца адлюстраванне тагачаснага грамадства праз усведамленне аўтараў, праз падзеі іх жыцця. Акторы часта змянялі месца выступленняў, таму цэласнай карціны тэатральнага жыцця Гродна першай паловы XIX ст. не ўтрымліваюць, але дазваляюць вылучыць яго новыя яркія рысы. Дадзеныя мемуары могуць быць шырока выкарыстаны ў гістарычных даследаваннях з улікам іх суб'ектыўнага характару.

## Літаратура


1. Estreicher, K. Teatry w Polsce /K. Estreicher //. Tom I. – Krakow, 1873 // http://www.pbi.edu.pl/book_reader.php?p=17397

2. Miller, A. Teatr w Polsce i muzyka na Litwie jako strażnice kultury Zachodu (1745–1865) / A. Miller. – Wilno, 1936.

3. Гісторыя беларускага тэатра: у 3 т. Т. 1: Беларускі тэатр ад вытокаў да кастрычніка 1917 г. Мн., 1983.

4. Тэатральная Беларусь: энцыклапедыя: у 2 т. Т. 1. / пад рэд. А.В.Сабалеўскага. – Мн., 2002.

5. Памяць: Гіст.–дак. хроніка горада Гродна / Бел. Энцыкл.; рэд. кал.: Г.П.Пашкоў, Я.М.Жабрун, І.П.Крэнь і інш. – Мн., 1999.

6. Bogusławski, W. Dzieje teatru narodowego w Polsce / W.Bogusławski // Cz. . Przemysł, 1884 // www.polona.pl:8737

7. Skibiński, K. Pamiętnik aktora (1786–1858). Oprac. ł wyd. M.Rulikowski / K.Skibiński. – Warszawa. 1912.

8. Kraszewski, I.J. Obrazy z życia i podróży/I.J. Kraszewski. – T. 2. – Wilno, 1842 // http://www.pbi.edu.pl/book_reader.php?p=41467

9. Миркович, Ф.Я. 1789–1866: Его жизнеописание, составленное по собственным его запискам, воспоминаниям близких людей и подлинным документам / Ф.Я.Миркович. – СПб., 1889.

**Шарэнда Ганна Паўлаўна,** *магістр педагагічных навук, бібліятэкар II катэгорыі аддзела краязнаўства ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага"*

# РЭПЕРТУАР ГРОДЗЕНСКАГА ТЭАТРА XIX СТАГОДДЗЯ

Рэпертуар тэатраў Беларусі XIX ст. змяняўся ў залежнасці ад змен у сацыяльна-эканамічным і палітычным жыцці ў краіне.

У XIX ст. прафесійнае тэатральнае мастацтва прадстаўлялі трупы, якія працавалі пераважна на польскай мове. Крыху пазней асобныя тэатры сталі паказваць спектаклі на дзвюх мовах – рускай і польскай. З сярэдзіны XIX ст. з'явіліся гастрольныя рускія тэатры.

Яркай з'явай былі гастролі Віленскага тэатра пад кіраўніцтвам Шмітгофа ў 1841 і 1843 гг. Так, віленская трупа К.Шмітгофа 8 верасня 1841 г. выступіла на гродзенскай сцэне з прэм'ерай вадэвіля С.Манюшкі "Апошняя варшаўская латэрэя". Аўтарам п'есы быў пісьменнік-аматар А.Корвін-Мілеўскі [1, с.251]. Трупа тады іграла толькі на польскай мове і з'яўлялася, па сутнасці, оперна-драматычным калектывам.

Рэпертуар кантраляваўся з боку ўлад. Пасля абнародавання так званага "Статута пра цэнзуру" (1804 г.) гродзенскі губернатар прадпісаў гараднічым і павятовым начальнікам паліцыі: "по случаю бывающих по городам и местечкам контрактов и ярмарок, на которые нередко приезжают и актёры для театральных представлений, предписываю вам не иначе дозволять такие представления, как по рассмотрению вами лично прежде каждой пьесы, дабы не заключалось в них чего-либо предосудительного или неприличного, а особенно в политическом смысле, и чтобы афиши были писаны или печатаны непременно пополам по-русски и по-польски…" [Ф.1, воп.1,

спр.1520, арк.20]. Так, указанне А.Бенкендорфа 13 студзеня 1832 г. патрабавала ад губернатараў кожны тыдзень дастаўляць у Трэцяе аддзяленне афішы спектакляў, што паказваліся на сцэнах Беларусі.

У фарміраванні рэпертуару польска-рускія тэатральныя калектывы, з аднаго боку, паўтаралі польскім тэатрам Варшавы і іншых вялікіх гарадоў Польшчы. З другога боку, рускі рэпертуар меў шмат агульнага з "рэпертуарам тэатраў цэнтральнай Расіі" [3, с.21].

Змест рэпертуару быў неаднародны. Так, у рамках афіцыйнай кансерватыўна-абарончай ідэалогіі знаходзіліся салонныя камедыі і вадэвілі Н.І.Хмяльніцкага, бытавыя камедыі А.А.Шахоўскага і М.М.Загоскіна, рамантычныя драмы М.А.-Палявога, Р.М.Зотава, рамантычныя меладрамы М.В.Кукальніка, П.Г.Абадоўскага і іншых рускіх аўтараў. Шырокае распаўсюжванне на сцэне тэатраў атрымаў вадэвіль. У рэпертуары перавагу мелі вадэвілі такіх аўтараў як П.Г.Грыгор'еў, П.С.Фёдараў, М.І.Кулікаў, М.А.Кароўкін і інш. [3, с.23].

Значнае месца ў рэпертуары польска-рускіх тэатраў займалі творы заходнееўрапейскіх аўтараў – камедыі і вадэвілі, драмы, трагедыі, меладрамы. Прычына была простай – нацыянальных польскіх тэатраў тады яшчэ не было. Так былі пастаўлены творы "Гамлет", "Кароль Лір", "Атэла" У.Шэкспіра, "Дон-Жуан" Ж.-Б.Мальера, "Слуга двух гаспадароў" К.Гальдоні, "Разбойнікі", "Марыя Сцюарт" Ф.Шылера, "Сялянін-мільянер" і "Кароль Альп, ці Чалавеканенавіснік" Ф.Раймунда, "Анжэла", "Эсмеральда" (па раману "Сабор Парыжскай богамацеры" В.Гюго). У рэпертуары прыезжых труп побач з польскімі драматычнымі і опернымі творамі былі п'есы У.Шэкспіра "Утаймаванне свавольніцы" і "Гамлет", Ж.Мальера "Мешчанін у дваранах", А.Дзюма "Кін", опера-вадэвіль С.Манюшкі "Апошняя варшаўская латарэя", А.Фрэдра "Помста" і інш.

У пачатку XIX ст. вялікай папулярнасцю карысталіся камедыі і італьянскія оперы-буфа, дзе спалучаліся спевы з гутарковымі дыялогамі ў выкананні трупы гродзенскага тэатра С.Дэшнер. Тут упершыню дэбютаваў як балетны танцор Ю.Здановіч – пазней выдатны драматычны акцёр [4, с.242].

У 1843 г. быў падпісаны кантракт з трупай пад кіраўніцтвам артысткі Лінкоўскай. Састаў трупы, якая складалася з 12 акцёраў і 4 актрыс, залежаў ад збораў і складваўся на дамове акцёраў з дырэктрысай [5, с.90]. Трупа складвалася з добрых акцёраў: Лінкоўская, Лаверне, Чыж, Карчэўская.

У тым жа годзе гродзенскім аматарскім гуртком былі паказаны два спектаклі і чатыры маскарады, у доме Любецкага і іншых вялікіх памяшканнях. Гастрольнымі артыстамі даваліся канцэрты, праводзіліся іншыя культурныя мерапрыемствы: сямейныя танцавальныя вечары ў Высакародным сходзе, якія праводзіліся па суботах, карнавалы з катаннем за горадам [5, с.90].

Так, зімні сезон 1864–1865 гг. быў вельмі насычаны: звыш 70 назваў драматычных твораў. Рэпертуар залежаў ад камерцыйнасці пастаўленых твораў. Так, у "Гродзенскіх губернскіх ведамасцях" рэцэнзент пісаў: "...дают какую-нибудь французскую чушь – театр полон, а когда ставятся на сцену комедии Островского..., – глядишь, ложи пусты, кресла заняты едва ли наполовину!..." [6].

Фарс, аперэта, меладрама, ці як яшчэ яе называлі "слёзная камедыя", большая колькасць вадэвіляў, якія насілі забаўляльны характар, прываблівалі ў тэатр афіцэраў, дваран, чыноўнікаў, заможную мясцовую моладзь.

Ставілася ў асноўным французская драматургія, якая насіла забаўляльны характар. Напрыклад, ставіліся творы Л.Галеві, Ш.Дэкурселя, Е.Гранжа, А.Лефрана, А.Дэлакруа, Ж.Сент-Амана і інш. [3, с.53].

Так, руская драматычная трупа Леонава ў 1878 г. ставіла "Хоць памры, а знайдзі дачцэ мужа" і "Горцы на гарышчы". Італьянская оперная трупа Кроцці на суд гродзенскага гледача прапанавала "Трубадур", "Фаварытка", "Севільскі цырульнік" [Ф.1, воп.16, спр.1399].

Праблемна-бытавыя камедыі і драмы збіралі інтэлігенцыю, служачых, нейкую частку адукаванага купецтва.

Класіка і лепшае з сучаснай драматургіі ставілася ў асноўным з разлікам на інтэлігенцыю, маламаёмасных разначынцаў, моладзь.

Напрыклад, у 1874 г. ставіліся творы А.Пушкіна "Барышня-крестьянка", "Станционный смотритель". Была пастаўлена народная драма Пісемскога "Горкі лёс" трупай Л.Я.Нікольскага [3, с.62].

Шырокай папулярнасцю карысталіся меладрама "Мацярынскае благаслаўленне, ці Беднасць і гонар", вадэвілі "Акцёр", "Шыла ў мяшку не схаваеш" Някрасава [3, с.61].

Значнае месца ў рэпертуары гродзенскага тэатра ў 1865-1866 гг. займалі п'есы "Даходнае месца" і "Бедная нявеста" М.Астроўскага. "Гродзенскія губернскія ведамасці" даюць наступную ацэнку спектаклю "Бедная невеста" гродзенскай трупы П.П.Паўлава: "...Богаство и достинство содержания самих произведений чересчур много сами по себе говорят душе зрителя, даже при не вполне хорошей игре. Но мы должны сказать, что... наши артисты, за немногим исключением, исполняли своё дело более чем удовлетворительно. С замечательным искусством, с редким пониманием самых тонких душевных движений передана была г-жою Павловой роль бедной невесты Марии Андреевны" [3, с.67].

Папулярнасць драматычных твораў Астроўскага ў Беларусі была вялікай. Толькі ў Гродна ў 1874 г. было пастаўлена 10 яго драм і камедый.

У лютым 1867 г. у Гродна з гастролямі прыехаў Віленскі тэатр, і гледачы "имели удовольствие видеть на нашей сцене г-жу Пиунову-Шмиткоф..." [8]. Яна іграла Марыю Бернард у меладраме Някрасава "Мацярынскае благаславенне, ці Беднасць і гонар", Дуняшу ў "Летняй сцэне з рускага быта" М.Стаховіча і іншыя ролі.

Віленскі тэатр А.М.Мельнікава-Самойлава і Ф.П.Горава з гастролямі прыязджаў у Гродна на сезон 1878–1879 гг. [3, с.96].

Асабліва часта ў гэтым сезоне прыязджаў Ф.П.Гораў, які аддаваў перавагу героіка-рамантычнаму напрамку ў сцэнічным мастацтве [3, с.96].

Зімні сезон 1878–1879 гг. на сцэне Гродзенскага тэатра парадаваў гледачоў "Блукаючымі агнямі" Антропава, "Старым барынам" Пальма, "Каварства і каханне" Шылера і іншымі творамі айчынных і замежных аўтараў [3, с.97].

Рэпертуар у 80–90-я гг. XIX ст. быў стракатым. Ставіліся п'есы самай рознай ідэйна-мастацкай вартасці.

Сезон 1880–1881 гг. гродзенска-віленскай трупы А.А.Неўскага адкрыў яркі талент Н.П.Аненкавай-Бернар. Зімні сезон 1881–1882 гг. увазе гледачоў прадставіў "Апошнюю ахвяру" Астроўскага.

У 1883 г. у Гродне было створана Літаратурна-музычнае таварыства [9, с.316]. Яно давала канцэрты і драматычныя спектаклі, арганізоўвала літаратурныя чытанні і музычныя вечары.

У 1884 г. былі пастаўлены камедыя-жарт Аляксандрава "Лакамны кавалак" і камедыя Пляшчэева "Старое старится, молодое растёт" [Ф.1, воп.18, спр.197].

Гродзенскі летні сезон 1892 г. быў адкрыты драмай Ул-.А.Аляксандрава "У няроўнай барацьбе", дзе іграў вельмі папулярны на той час П.Арленеў.

У зімовы сезон 1897–1898 гг. "не безынтересны итоги антрепризы Р.А.Крамеса: по ближайшим сведениям он, что редкость для Гродны, не прогорел" [3, с.39]. У лютым 1897 г. гродзенцы маглі паглядзець "Анну Карэніну" Л. Талстога.

Летам 1899 г. у Гродне адбыліся гастрольныя выступленні Таварыства артыстаў пад кіраўніцтвам акцёра Александрынскага тэатра, драматурга, тэатральнага дзеяча П.Д.Ленскага [3, с.161]. Гродзенскаму гледачу ставіўся спектакль "Цар Фёдар Іаанавіч" А.Талстога з П.А.Арленевым у галоўнай ролі.

Вясною 1900 г. у Гродне са сваёй трупай гастраляваў акцёр Г.Г.Ге, які ставіў Шэкспіра, А.Талстога "Смерць Івана Грознага" і іншы класічны рэпертуар.

Такім чынам, рэпертуар Гродзенскага тэатра XIX ст. з'яўляўся выразнікам самых розных ідэйна-эстэтычных поглядаў людзей.

Рэпертуар складаўся з класічнай драматургіі (айчыннай і замежнай) і "лёгкага жанру" (аперэты, камедыі, меладрамы). Значнай з'явай стала арганізацыя драматычных, музычных, харавых калектываў у буйныя аматарскія аб'яднанні. Напрыклад, Гродзенскае літаратурна-музычнае таварыства (1883 г.).

Кожны жанр знаходзіў свайго ўдзячнага гледача. Драматычная прадукцыя даходзіла як да "простага" гледача, так і да прывілігаванага парцера, вузкага кола гледачоў.

**Спіс выкарыстанай літаратуры:**


1. Рудинский, В. Монюшко / Витольд Рудинский. – М., 1960. – С.251.

2. ЦДІА г.Гродна. – Ф.1, оп.1, д.1520.

3. Пашкин, Ю.А. Русский драматический театр в Белоруссии XIX века / Ю.А.Пашкин. – Минск : Наука и техника, 1980. – 215 с.

4. Гісторыя беларускага тэатра: у 3 т. / Акадэмія навук БССР. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – Т.1: Беларускі тэатр ад вытокаў да кастрычніка 1917 г. – 496 с.

5. Лисневский, И.Е. В театр иду, как в храм: страницы театральной Беларуси / И.Е.Лисневский. – Минск, 1997. – 167 с.

6. Гродненские губернские ведомости. – 1866. – № 2.

7. ЦДГА ў Гродна. – Ф.1, оп.16, ед. хр.1399.

8. Гродненские губернские ведомости. – 1867. – № 7.

9. Орловский, Е. Гродненская старина / Е.Орловский. – Гродна : Губ. Типография, 1910. – Ч.1: Гор. Гродна. – 343 с.

10. ЦДГА ў Гродна. – Ф.1, оп.18, ед. хр.197.

**Пятроўская Святлана Георгіеўна,** *вядучы рэдактар ДУК "Гродзенскі абласны драматычны тэатр"*

# ГРОДЗЕНСКІ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны ў абласных цэнтрах БССР адзін за адным ствараліся абласныя тэатры.

Улетку 1946 года вельмі добрае ўражанне ў гледачоў Гродна пакінулі гастролі Бабруйскага абласнога драматычнага тэатра, арганізаванага ў 1945 годзе буйным тэатральным дзеячам Мікалаем Кавязіным. Гэта адыграла важную ролю ў лёсе станаўлення абласнога тэатра ў Гродне. У той час у нашым горадзе часова працаваў Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР, гатовы да пераезду ў сталіцу рэспублікі. Калі памяшканне для яго было гатова, тэатр у 1947 годзе пераехаў з Гродна ў Мінск. На яго месца па патрабаванні гарадскіх улад і са згоды Упраўлення па справах мастацтва пры Савеце Міністраў БССР быў пераведзены калектыў Бабруйскага абласнога тэатра.

20 кастрычніка 1947 года Гродзенскі абласны драматычны тэатр абвясціў аб сваім адкрыцці спектаклем "Праўда добра, а шчасце лепш" А.Астроўскага. Працаваць калектыў пачаў у памяшканні былога тэатра Антонія Тызенгаўза, пабудаваным у XVIII стагоддзі. Сустрэчы з гродзенцамі пачаліся спектаклямі, якія ўжо былі ў рэпертуры на Бабруйскіх афішах: "Памятныя сустрэчы", "Лісічкі", "Дама-невідзімка", рэжысёра М.Кавязіна. Безумоўна, кожны з гэтых спектакляў быў нанова адрэпеціраваны, з аднаўленымі дэкарацыямі. Рэакцыя глядзельнай залы засведчыла, што гродзенцы прынялі тэатр і з надзеяй сочаць за яго развіццём.

Высокая тэатральная культура, творчыя традыцыі Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра былі закладзены яго заснавальнікам – заслужаным артыстам БССР Мікалаем Аляксандравічам Кавязіным, чалавекам багатага рэжысёрс-

ка–педагагічнага дару, які здолеў стварыць у тэатры атмасферу творчай несупакоенасці і пастаяннага пошуку. Асноўныя намаганні ён накіраваў на стварэнне новых спектакляў, праводзячы рэпертуарную палітыку двума генеральнымі рысамі: класічная драматургія і сучасная драматургія на актуальныя тэмы. У Гродне М.Кавязін паставіў дзевяць спектакляў, сярод іх – "Вялікая сіла" Б.Рамашова, "Жылі тры сябры" А.Успенскага, "Свае людзі – паладзім" А.Астроўскага, "На дне" М.Горкага. На афішы тэатра тых гадоў з'яўляліся спектаклі другіх рэжысёраў, але асноўны напрамак тэатра, яго галоўныя дасягненні вызначалі спектаклі мастацкага кіраўніка. Увогуле творчы рух абумовіўся менавіта і, у першую чаргу, удалай працай М.Кавязіна з акцёрам у працэсе пастановак п'ес.

Безумоўна, у рэжысёрскай практыцы М.Кавязіна былі і так званыя прахадныя спектаклі, якія не з'яўляліся здабыткамі ні для гледача, ні для тэатра. Звычайна гэта было звязана са зваротам да п'ес, пастаўленых вымушана, як актуальныя і злабадзённыя, нягледзячы на тое, што яны знаходзіліся не на высокім, а часам нават нізкім мастацкім ўзроўні. Аднак падобная карціна была знакавай для тэатральнага жыцця ўсёй савецкай эпохі. Да гонару мастацкага кіраўніка – у Гродзенскім аблдрамтэатры такія спектаклі былі хутчэй выключэннем.

У тыя гады у тэатры любілі і ахвотна ставілі класіку. Гэта былі яркія, святочныя спектаклі па творах А.Астроўскага, К.Гальдоні, П.Кальдэрона, Ф.Шылера, О.Голдсміта. Большасць з іх вынаходліва і дасціпна аформіў мастак А.Марыкс. Усё ж надзённыя сучасныя п'есы займалі асноўнае месца ў рэпертуары. Знакавым сярод іх быў спектакль "Шчасце" паводле П.Паўленкі.

Няшмат часу адвёў лёс М.Кавязіну на працу у гродзенскім тэатры – усяго каля двух з паловай год. Але ён паспеў зрабіць для тэатра шмат карыснага, што добратворна адбілася на далейшым жыцці і дзейнасці творчага калектыву.

Газета "ЛіМ" у тыя гады выказвала агульную думку і гледачоў, і тэатральнага асяроддзя рэспублікі, называючы

Гродзенскі абласны драматычны тэатр "лепшым абласным тэатрам у рэспубліцы".

З 1950 года тэатр цесна супрацоўнічаў з беларускімі драматургамі. Першай ластаўкай стаў спектакль "Калі зацвітаюць сады" па п'есе В.Палескага. У 1951 годзе пастаўлены спектакль "Пяюць жаваранкі" К.Крапівы. Сярод прац гэтага перыяду – спектакль "Гэта было ў Мінску" А.Кучара (1952).

Спектаклі пачатку 50-х гадоў прываблівалі яркімі акцёрскімі працамі Л.Федчанка ("Машачка" А.Афінагенава), Г.Панкрат і дэбютанта Ю.Сідарава ("Свеціць, ды не грэе" А.Астроўскага), М.Астанкавай ("Гаспадыня гасцініцы" К.Гальдоні), М.Кавязінай ("Васа Жалязнова" М.Горкага і асабліва "Марыя Цюдор" В.Гюго), В.Шрамчанкі ("Яўгенія Грандэ" паводле А.Бальзака).

У тэатры выпрабоўвалі свае сілы ў рэжысуры і акцёры. Ставілі спектаклі Я.Зубоўскі, Ю.Сідараў, Г.Глінаецкі.

Неаднаразова і паспяхова звярталіся да драматургіі Горкага. Ішлі "На дне", "Васа Жалязнова", "Апошнія".

Перыяд, калі тэатр узначальваў Іосіф Папоў, вызначаецца пошукамі цікавай адметнай драматургіі. У рэпертуары з'явіліся п'есы М.Лермантава і А.Астроўскага, П.Бамаршэ і П.Когаўта, Лопэ дэ Вегі, Г.Запольскай, Дж.Флетчэра, Б.Нушыча, Х.Вуаліёкі, Э.М.Рэмарка і інш. У пэўнай ступені гэтаму спрыялі і пошукі чарговага рэжысёра А.Геранбурга. У якасці прыкладаў можна назваць яго пастаноўкі "Іспанцы" М.Лермантава (1955), "Дзень цудоўных падманаў" Р.Шэрыдана і "Дрэвы паміраюць стоячы" А.Касоны (1956), "Апошні прыпынак" Э.М.Рэмарка (1957). Глыбінёй рэжысёрскага вырашэння, сцэнічнай культурай, стылёвым адзінствам, пераканаўчасцю характараў, уменнем даследаваць найтанчэйшыя нюансы чалавечай душы вылучаліся ажыццёўленыя І.Паповым пастаноўкі буйных твораў: "Каменны валадар" Л.Украінкі, "Дачнікі" М.Горкага, "Улада цемры" Л.Талстога, "Тры сястры" А.Чэхава. Ставіў ён і творы сучасных аўтараў: "Салдаты" В.Шаўрына, "Сябры і гады" Л.Зорына, "Пяць вечароў" А.Валодзіна, "Перад вячэрай" В.Розава і іншыя. У ролях прывабных хлапчукоў вылучаўся Вітольд Грачынскі, заслужаны

артыст Беларусі, які на ўсё жыццё застаўся верным Гродзенскаму тэатру.

Почырк галоўнага рэжысёра вызначае накірунак і адметнасць тэатра. У час, калі галоўным рэжысёрам працаваў А.Струнін, на гродзенскай сцэне паказваліся эпічныя палотны, з вялікай колькасцю дзеючых асоб, насычаныя ўзнёслым грамадзянскім пафасам. Найбольш значныя сярод іх спектаклі – эпапея "Порт-Артур" паводле А.Сцяпанава (1963), "Дачка Расіі" П.Чараднічэнкі (1965), "Перабежчык" А. і П.Тур (1965), "Паміж ліўнямі" А.Штэйна (1966), "Алека Дундзіч" М.Каца і А.Ржашэўскага (1968). За ўдзел у шэрагу з гэтых спектакляў акцёр Якаў Кімберг першым у тэатры атрымаў званне народнага артыста Беларусі. Высокім мастацкім узроўнем вызначаўся спектакль "Варвары" М.Горкага (1966), "Палата" (1963) і "Дыпламат" (1967) С.Алёшына, "Салдацкая ўдава" (1973) М.Анкілава. Адметнымі акцёрскімі працамі прыцягвалі ўвагу і пастаноўкі класічных твораў "Антоній і Клеапатра" У.Шэкспіра (1964 г., у галоўнай ролі Л.Сторажава), "Навальніца" А.Астроўскага (1971 г., у ролі Кацярыны Т.Нікалаева), "Багна" А.Астроўскага і "Прымакі" Янкі Купалы (1974 г., працы У.Мішчанчука). Акрамя таго на сцэне выступалі заслужаныя артысты – А.Панкрат, М.Ковязіна, Л.Сторажава, П.Філіпаў, В.Грачынскі, А.Бірычэўскі, А.Цароў, С.Аляксандраў, В.Смачнеў – трупа моцная, здольная вырашыць найскладанейшыя задачы драматургіі. У гэты перыяд трупа тэатра перажывае "залаты час".

Актыўна асвойваў тэатр беларускую драматургію. У пачатку 70-х гадоў у рэпертуары было шмат беларускіх п'ес: "Адкуль грэх" А.Петрашкевіча, "Амністыя" М.Матукоўскага, "Трыбунал" А.Макаёнка, "Апошні шанц" В.Быкава і іншыя. Асэнсаванне мінулага і сучаснасці ў святле перамен, што адбываліся ў грамадстве, адлюстраваны ў інсцэнізацыі рамана І.Шамякіна "Сэрца на далоні" (1965 г., у ролі Зосі Савіч арт. І.Пратапопава), пастаўленай на гродзенскай сцэне ўпершыню ў рэспубліцы. Ішлі спектаклі: "Трывога" (1975); "Францыск Скарына" ("Напісанае застаецца") А.Петрашкевіча (1978), "Мілы чалавек" К.Крапівы (1976; рэж. В.Караткевіч),

"Паўлінка" Я.Купалы (1979; рэж. А.Ушацкі і У.М.Мішчанчук), "Несцерка" В.Вольскага (1980; рэж. В.Сімакін) і інш. Значны ўклад у стварэнне суладнага акцёрскага ансамбля ўнеслі заслужаныя артысты Беларусі В.Смірноў, Т.Нікалаева, В.Мішчанчук, Л.Дзяменцьева, Н.Караткевіч, Ю.Нікіцін.

Гродзенскаму тэатру шанцавала на галоўных рэжысёраў. А.Міронскі, І.Папоў, А.Струнін былі сапраўднымі майстрамі сваёй справы, людзьмі высокаадукаванымі. Яны любілі і ўмелі працаваць з акцёрамі, запрашалі ў трупу таленавітых асоб, шмат шчыравалі над удасканаленнем сцэнічнай культуры, над стварэннем мастацкага і творчага ансамбля.

Разам з тым ішлі і даволі шэрыя, эклектычныя спектаклі, пастаўленыя па слабых п'есах: "Я прысягаў Радзіме" А.Струніна, "Захавай маю тайну" В.Сабко. У рэпертуары з'яўляецца шэраг так званых касавых спектакляў, відавочныя рэжысёрскія і акцёрскія штампы. Станоўчыя зрухі адбыліся ў творчасці тэатра ў другой палове 70-х гадоў, калі яго ўзначаліў У.Караткевіч.

Тады павысілася агульная пастановачная культура спектакляў, вызначальнымі сталі яркасць і выразнасць формы, вострае выяўленне стылявых і жанравых асаблівасцей твораў. Праграмным стаў спектакль У.Караткевіча "Тэмп-29" (1976), створаны паводле ранніх п'ес М.Пагодзіна. У ім арганічна спалучаліся музыка, сцэнаграфія і тэмпераментнае, эмацыянальнае акцёрскае выкананне (у галоўнай ролі – артыст С.Кліменка).

Ажыццяўляецца маштабная, насычаная жыццясцвярджальным пафасам і разам з тым, паэтычная пастаноўка "Аптымістычнай трагедыі" У. Вішнеўскага. Ставяцца лепшыя п'есы маральна-этычнай праблематыкі А.Вампілава, І.Друцэ, А.Арбузава, А.Сакаловай, А.Казанцава, інсцэніроўкі твораў В.Распуціна і У.Цендракова. Непаўторны каларыт спектаклям надавала праца маладой таленавітай мастачкі Л.Трубецкай. Яе афармленне спектакляў "Чайка" А.Чэхава і "Слон" А.Капкова – сапраўдныя ўзоры сцэнаграфіі.

Сцэнічнай культурай, зладжанасцю акцёрскага ансамбля, цікавымі характарамі вызначаўся спектакль "Зыкавы"

М.Горкага (1979), нечаканым рэжысёрскім вырашэннем – "Беспасажніца" А.Астроўскага (1976) і "Каліна чырвоная" (1981 г., рэжысёр М.Гавядзінаў).

У 1979 годзе ў тэатры адкрылася малая сцэна: спектаклем "Спыніце Малахава!" А.Аграноўскага пачаў працаваць тэатр у фае.

80-я гады мінулага стагоддзя пазначаны для тэатра нестабільнасцю мастацкага кіраўніцтва (А.Шалыгін), што адбілася на творчасці тэатра. На асобныя пастаноўкі запрашаліся вядомыя рэжысёры: Я.Сіманаў ("Тры ўзросты Казановы" Марыны Цвятаевай), З.Карагодскі ("Бдым" С.Злотнікава), У.Аглоблін ("Мая прафесія – сеньёр з вышэйшага грамадства" Д.Скарначы і Р.Тарабузі). Але спектаклі не сталі з'явай у тэатральным жыцці горада.

З 1982–1984 г. творчы састаў узначаліў А.Шалыгін, якому выпала місія пераезду ў новы будынак.

Першы спектакль на новай сцэне – "Вечна жывыя" В.Розава. З гэтага моманту калектыў працуе ў новым будынку (архітэктар А.Мачульскі). Ён стаіць на ўзвышшы, складаецца з 6-граннага асноўнага аб'ёму (галоўная глядзельная зала, вестыбюль і фае) і П-падобнага трохпавярховага адміністрацыйна-службовага корпуса (на першым паверсе малая глядзельная зала на 216 месцаў). Ля цэнтральнага ўвахода з пластычна выгнутымі сценкамі – трохфігурная скульптурная кампазіцыя: Паэт, Крылаты Пегас і Муза (скульптар – Л.Зільбер). Галоўная глядзельная зала на 665 месцаў вырашана амфітэатрам з балконам.

Фае ўпрыгожваюць аб'ёмнае скульптурнае пано на тэатральныя тэмы (мастакі І.Пчэльнікаў і І.Лаўрова), 5 кампазіцый з гісторыі развіцця тэатра, бюсты А.Пушкіна, У.Шэкспіра і Ж.Б.Мальера на пастаментах, а паміж імі выявы дзеячаў беларускай культуры Міколы Гусоўскага, Францыска Скарыны, Янкі Купалы і Якуба Коласа. На сценах кулуараў і над уваходамі ў партэр – таксама скульптурна-жывапісныя кампазіцыі на тэатральныя тэмы. У цокальным паверсе знаходзяцца: рэпетыцыйная зала, грыміравальныя пакоі, апаратная, склады аб'ёмных дэкарацый. Будынак упрыгожваюць

дэкаратыўныя ліхтары, падпорныя сценкі, каскады лесвіц і басейн з фантанам.

Тэатральны крытык Мая Гарэцкая вельмі паэтычна напісала ў часопісе "Мастацтва" (2005 № 5,): "Люблю Гродзенскі тэатр. Люблю высокі размах яго фае, дзе люстры нёманскага шкла нібыта разам з промнямі святла ліюцца паміж этажамі да ўзорыстага паркету. І белы гмах з Паэтам і Музай на франтоне здаецца мне падобным на белы карабель, што ўзняўся на кручы над Нёманам. Але больш за ўсё я люблю акцёраў Гродзенскага тэатра. Жанчыны заўсёды здаваліся мне самымі прыгожымі, вытанчанымі і стыльнымі. Мужчыны – разумнымі і інтэлігентнымі."

У розны час у тэатры працавалі народныя артысты Беларусі В.Клебановіч, Ю.Сідараў, Г.Дубаў, заслужаныя артысты Беларусі З.Асмалоўская, Т.Шашкіна, заслужаныя артысты Расіі А.Лявонаў, Н.Меліхава, Л.Рудой, заслужаны артыст Малдавіі І.Таран, акцёры А.Акчурын, Н.Нячаева, С.Кліменка, І.Праваторава, А.Салаўёва, Ю.Свірын, У.Шакала.

Значны ўклад у стварэнне творчага аблічча тэатра зрабілі народны артыст Беларусі Я.Кімберг, заслужаныя артысты С.Аляксандраў, М.Астанкава, А.Бірычэўскі, Г.Глінаецкі, В.Грачынскі, Л.Дзяменцьева, С.Іванова, М.Кавязіна, Н.Караткевіч, У.Мішчанчук, Ю.Нікіцін, Т.Нікалаева, Г.Панкрат, Л.Старажава, В.Смачнеў, П.Філіпаў, А.Цароў, А.Гайдуліс.

У розныя гады галоўнымі мастакамі працавалі А.Марыкс (1953, 1957), Б.Малкін (1955–1956), М.Гафт (1959–1965), М.Якунін (1966–1984), К.Чэмекаў (1985–1988), Ф.Розаў (1991–2000), Т.Сакалоўская (Мацевіч).

У другой палове 80-х гадоў больш цікава працавалі чарговыя рэжысёры Мадэст Абрамаў (адметныя яго пастаноўкі "Экспромт-фантазія" Вікторыі Токаравай (1985), "Заўтра была вайна" паводле Барыса Васільева і "Стары" Максіма Горкага (1986) і Б.Мартынаў ("Хто баіцца Вірджыніі Вульф?" Э.Олбі і "Лепш застанься мёртвым" К.Вітлінгера (1985), "З Новым годам" М.Варфаламеева (1986). Значнымі атрымаліся спектаклі "Спартыўныя сцэны 1981 года", "Жыццё і незвычайныя прыгоды салдата Івана Чонкіна".

Вялікую цікавасць выклікалі пастаноўкі на тэму гісторыі беларускага народа "Князь Навагрудскі" Л.Пракопчыка і

Д.Кальчанкі (рэжысёр І.Пятроўскі, 1987 г.) і нацыянальнай класікі "Пінская шляхта" В.Дуніна-Марцінкевіча (1988).

У 1990 годзе рэжысёр М.Разцоў паставіў "Лаліту" Э.Олбі паводле У.Набокава, "Змову імператрыцы" А.Талстога і П.Шчогалева (1991). Але далей у новых складаных умовах тэатр усё роўна як разгубіўся, ставіў шэраг касавых спектакляў невысокага густу: "Французскія жартачкі" Ж.Брыкера і М.Ласега. Бадай, адзінай удалай пастаноўкай гэтых гадоў можна лічыць "Нору" Генрыха Ібсена (1993 г., рэж. В.Баркоўскі).

На Рэспубліканскім фестывалі "Маладзечанскія сакавіцы-96" за выкананне ролі Норы актрыса Людміла Волкава адзначана прызам за лепшую жаночую ролю года.

Рэжысёру Генадзю Мушперту, які узначальваў калектыў з 1994 па 1998 гады, давялося прыкласці вялікія намаганні, каб вярнуць калектыву былы высокі ўзровень, якім на працягу большасці гадоў вылучаўся тэатр.

Ставіцца шэраг спектакляў, у якіх даследуюцца чалавечыя каштоўнасці: "Дацкая гісторыя" А.Шапіры паводле Г.Х.Андэрсена і "Дарагая Памела" Дж.Патрыка (1994), "Камедыя пра нешчаслівага селяніна, яго жонку Маланку, жыда Давіда і Чорта, які страціў сэнс існавання" Уладзіміра Рудава (1994), "Кароль, дама, валет" У.Набокава, "Разбойнік" К.Чапека (1996). Гледача прывабілі пастаноўкі Мадэста Абрамава "Здурнелы Журдэн" М.Булгакава (1995) і глыбокая філасофская драма "Салемскія ведзьмы" А.Мілера (1996).

Вялікай цікавасцю гледачоў карысталіся спектаклі сучасных беларускіх драматургаў у пастаноўцы заслужанага дзеяча Рэспублікі Беларусь Валерыя Мазынскага па п'есах Аляксея Дударава "Рагнеда і Уладзімір" і "Чорная панна". Цікавымі былі рэжысёрскія працы мастацкіх кіраўнікоў тэатра С.Палешчанкава – "Сабакі" А.Палешчанкавай (2000 г.), спектаклі А.Жугжды – "Навука кахання" С.Кавалёва (2001) і "П'емонцкі звер" (2002) А.Курэйчыка.

У спектаклях вельмі цікава працавалі акцёры: Сяргей Курыленка, Святлана Літвінёнак, Алена Гайдуліс, Аляксандр Шалкаплясаў.

З 1996 года пры тэатры створаны танц-тэатр "Галерэя" (кіраўнік харэограф-пастаноўшчык А. Цебянькоў) – неаднаразовы ўдзельнік міжнародных фестываляў сучаснай харэаг-

рафіі ў Гомелі, Віцебску, Польшчы, ЗША, Манака, Літве, Эстоніі, Расіі.

Зараз у тэатры плённа працуюць заслужаныя артысты Рэспублікі Беларусь – Людміла Волкава, Мікалай Емельянаў, Сяргей Курыленка, Аляксандр Шалкаплясаў, акцёры – Святлана Завадская, Уладзімір Капранаў, Алена Красікава, Валянціна Лунёва, Святлана Літвінёнак (Марэцкая), Алла Лук'янава, Аляксандр Луцэнка, Валянціна Харытонава, Таццяна Харламава, Аляксандр Глотаў, Ганна Іванова, Аксана Плікус і інш.

Калектыў тэатра працуе ў справе выхавання свайго гледача. Пры тэатры наладжаны тэатральны ўніверсітэт для моладзі, навучэнцаў тэхнікумаў і каледжаў, студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, у якім выкладаецца адна з важнейшых дысцыплін – мастацтва быць гледачом. Серыя спектакляў, паказаных на працягу сезона, знаёміць моладзь з творчымі імкненнямі тэатра, з разнастайнай драматургіяй, шматкаляровай палітрай рэжысёрскай і акцёрскай прафесіі. Перад кожным спектаклем праводзіцца гутарка аб аўтары, драматургіі і стылістыцы сцэнічнага матэрыялу.

З сярэдзіны 90-х гадоў у Гродзенскім вучылішчы мастацтваў набіраецца група навучэнцаў па спецыяльнасці "Майстэрства акцёра", дзе выкладаюць рэжысёры і акцёры тэатра. Высокакваліфікаваныя спецыялісты даюць студэнтам магчымасць навучацца ў лепшых традыцыях тэатральнага мастацтва. Ужо зараз многія выпускнікі акцёрскага аддзялення бліскуча выконваюць ролі ў спектаклях бягучага рэпертуру. Многія з выпускнікоў працуюць у іншых тэатрах рэспублікі.

Гродзенскі абласны тэатр паспяхова гастраляваў па Беларусі і за мяжой: у Расіі, Польшчы, Балгарыі, Украіне. З поспехам прадстаўляў свае спектаклі на прэстыжных тэатральных фестывалях.

Так, на V Міждзяржаўным фестывалі "Мастацтва за садружнасць славянскіх народаў" (1990) быў адзначаны спектакль "Лаліта" паводле У.Набокова, дзе роля Лаліты, у выкананні С.Завадскай, была прызнаная лепшай жаночай роляй года.

У 2001 годзе артыстка А.Плікус атрымала Дыплом II Рэспубліканскага фестывалю творчай моладзі "Надзея" за

выкананне ролі Машы Клягінай у спектаклі "Рок-канцэрт" (рэжысёр Г.Мушперт), а мастак тэатра Т.Мацэвіч (Сакалоўская) атрымала прыз за ўдалы творчы дэбют, сцэнаграфію да спектакля "Сабакі" А.Палешчанкавай (паводле аповесці К.Сергіенкі "Да пабачэння, яр!").

Прыз за лепшую рэжысуру на Рэспубліканскім фестывалі нацыянальнай драматургіі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў 2001 годзе атрымаў рэжысёр Алег Жугжда ў спектаклі С.Кавалёва "Навука Кахання" і прыз за лепшую жаночую ролю атрымала заслужаная артыстка РБ А.Луцэнка-Гайдуліс у спектаклі С.Кавалёва "Навука кахання."

Тэатр з'яўляецца нязменным удзельнікам Міжнароднага фэсту "Сустрэчы ў Расіі" (Санкт-Петербург). У 2003 годзе спектакль "Рок-концерт з Рыгорам Горыным" па творах Р.Горына (пастаноўка Генадзія Мушперта) вырабіў сапраўдны фурор.

У 2004 годзе на IV Маскоўскім Міжнародным тэлевізійна-тэатральным фестывалі "Ажыўшая казка" былі адзначаны два спектаклі: прыз атрымаў спектакль "Гуляем у Маршака" С. Маршака, прыз і прэмію імя І.Смактуноўскага атрымала Таццяна Мацевіч (Сакалоўская) за лепшую сцэнаграфію да спектакля "Чароўны дар" (рэжысёр В.Сакалоўскі).

У красавіку гродзенская трупа зноў атрымала запрашэнне на фэст у Санкт-Пецярбург, дзе з поспехам прайшоў прем'ерны спектакль "Адзінокі захад" М.Мак-Донага. У 2007 годзе спектакль "Хлопчык і Маргарыта" стаў адным са значных падзей фэстывалю і выклікаў вялікую цікавасць публікі і прафесіяналаў.

Улетку 2006 года на Міжнародным фестывалі антычнага мастацтва "Баспорскія агоны" (г.Керч, Украіна) спектакль "Рок-канцэрт з Рыгорам Горыным" перамог у дзвюх намінацыях з чатырох: артыст А.Шалкаплясаў атрымаў прыз за лепшую мужчынскую ролю, а прыз за лепшую рэжысуру дастаўся Г.Мушперту. У 2007 годзе на гэтым фестывалі ў г.Еўпаторыя, які праходзіў без намінацыяў, спектакль "Адзінокі захад" атрымаў высокую адзнаку як у глядацкай аўдыторыі, так і ў журы фэстывалю.

На сёняшні дзень, як даводзяць гастролі ў Мінску, Гомелі, Брэсце, Магілёве, – Гродзенскі абласны драматычны тэатр з'яўляецца адным з самых папулярных тэатральных калектываў рэспублікі. Спектаклі тэатра пацвярджаюць прафесійную сталасць і творчы энтузіязм калектыва. Ён мае шматгадовы досвед у падрыхтоўцы творчай моладзі, атрымаў шырокае прызнанне за мяжой. Тэатр мае шэраг узнагарод: дыпломаў і ганаровых грамат ЦК прафсаюза работнікаў культуры СССР, Міністэрства культуры БССР, Чарнавіцкага, Цярнопальскага, Палтаўскага, Валынскага абкамаў КП Украінскай ССР, Пскоўскага, Калінінградскага, Бранскага гарвыканкамаў, Прэзідыума Вярхоўнага Савета Абхазскай АССР, Унутраных спраў БССР, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта.

Творчыя дасягненні калектыва з'яўляюцца здабыткам нацыянальнай культуры і спрыяюць развіццю сучаснага тэатральнага мастацтва, што робіць Гродзенскі абласны драматычны тэатр годным і прывабным сярод абласных тэатраў рэспублікі.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Тэатральная Беларусь: энцыклапедыя: у 2 т. Т. 1, 2.
2. Стэльмах, Д. Гродна тэатральны / Д. Стэльмах // Тэатральная творчасць. Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 2002– 2003. – 1997. № 5. – С.15.
3. Нефёд, В.И. Николай Ковязин. Жизнь и творчество / В.И. Нефёд, – Мінск. 1990.
4. Мастацтва. – 2005. – № 5.
5. Мальцаў, У. Ці патрэбны опіум / У. Мальцаў // Мастацтва. – 1995. – № 5. – С.22.
6. Мальцаў, У. Беларускі тэатр і ягоныя гісторыі / У. Мальцаў // Мастацтва. – 1995. – № 10. – С.10.
7. Ратабыльская, Т. Сталенне / Т. Ратабыльская // Мастацтва Беларусі – 1990 – № 7. – С.52.
8. Ратабыльская, Т. У марах пра тэатр / Т. Ратабыльская // Мастацтва. – 1989. – № 5. – С. 18.
9. Ратабыльская, Т. Эстэтычныя рысы беларускай тэатральнай школы / Т. Рабытальская // Культура – 1996. – № 3-4.
10. Лісneўскі, І. Гродна, Брэст, Беласток – тэатральныя / І.Лісneўскі // Тэатральная Беларусь. – 1995. – № 1. – С.55-59.

**Данильчик Марина Емельяновна,** *редактор литературный ГУК "Гродненский областной театр кукол"*

# ВОЛШЕБНЫЙ МИР ТЕАТРА КУКОЛ: ИСТОРИЯ И СОВРЕМЕННОСТЬ

Кому посчастливилось побывать в белорусском городе Гродно, смогли заметить в парке им. Жилибера необычное здание. Это Гродненский областной театр кукол – здание с большой театральной историей и даже со своим привидением.

Гродненский областной театр кукол был основан в 1980 году по решению Гродненского областного исполнительского комитета, но имеются данные из Государственного архива общественных объединений о том, что театр кукол в Гродно появился гораздо раньше. Об этом говорится в Постановлении №125 Совета Народных Комиссаров БССР от 2 февраля 1940 года "Об организации учреждений и органов искусства в западных областях БССР". К сожалению, мало есть информации о театре кукол в это время. Известно, что возглавлял его режиссёр Ю.К.Антонов и художник Козловский. Первыми постановками были спектакли "Слонёнок" и "Дед Мороз". Так же в архиве есть упоминание о том, что в 1939 году Гродно посетил Центральный театр кукол Советского Союза под руководством заслуженного артиста РСФСР Сергея Образцова.

Ведущий советский кукольный, театральный коллектив тогда целый месяц при полных залах показывал как маленьким, так и взрослым спектакли "Конёк Горбунок", "Лесная тайна", "Наш цирк". Гастроли проходили в зале городского театра, того самого, где сейчас ставит свои спектакли Гродненский театр кукол.

В 1980 году театр возглавил молодой режиссёр Сергей Фёдорович Юркевич, выпускник Ленинградского института театра, музыки и кино им. Н.Черкасова (сейчас Санкт-Петербургская академия искусств) и старейший художник бело-

русского театра кукол Леонид Михайлович Быков, который оформил более 100 спектаклей в Беларуси.

Труппа формировалась из дипломников Белорусского государственного театрально-художественного института, Ленинградского института музыки и кино и выпускников Гродненского училища культуры.

Первым премьерным спектаклем, которым театр открылся 25 мая 1981 года, был "Людвиг и Тутта" В.Богача и С.Христовского по книге Я.Экхольма в постановке С.Ф.Юркевича и сценографии Л.М.Быкова.

Первые репетиции и спектакли тогда проходили в небольшом помещении Дома Народного творчества по ул.Советской, 8. Некоторое время театр работал, как разъездной, давая представления в Домах культуры, школах и детских садах.

В 1986 году для театра кукол начался новый период. Он переехал в здание драматического театра, старейшее театральное здание Беларуси (заложено гродненским старостой графом Антонием Тизенгаузом около 1769 г.), расположенное в исторической части города. К великой радости кукольников здание стало вскоре им родным домом.

Несомненно, рождение нового творческого коллектива всегда в конечном итоге обусловлено определёнными причинами. Театр кукол в Гродно в 80-годы – это всё возрастающая популярность искусства играющих кукол в республике и признание его роли в эстетическом воспитании детей. Репертуар театра, в первую очередь, составили произведения мировой сказочной литературы и пьесы белорусских драматургов для детей. Спектакли "Василиса Прекрасная" Е.Черняк, "Синдбад-Мореход" Ю.Фридмана и В.Шульжика, "Золушка" Е.Шварца стали настоящей классикой Гродненского театра кукол; по сегодняшний день живут на сцене, радуя уже третье поколение зрителей.

В 1987 году с приходом на должность главного режиссёра Николая Николаевича Андреева (тоже выпускника Ленинградского театра музыки и кино) театр значительно изменил своё лицо. Театр кукол стал адресоваться как детям, так и

взрослым. Днём его зрительный зал заполнялся малышами, а вечером сюда спешили их родители. В репертуаре появились спектакли, поставленные как с куклами, так и в живом плане. В это время директором театра был Николай Иванович Бардыга.

Один из лучших спектаклей – "Тутэйшыя" Н.Н.Андреева по пьесе Я.Купалы. Он прочно удерживается в репертуаре, звучит по-прежнему остро и современно.

Проба современных выразительных средств в спектаклях "Самоубийца" по пьесе Н.Эрдмана, "Лекарь поневоле" по Ж.Б.Мольеру, "Кароль-Стриптиз" С.Мроожека, "Пришелец" М.Эйроля изменили отношение зрителей к Гродненскому театру кукол, как к театру для детей. Театр стал настоящей площадкой для эксперимента, творческого поиска и новых форм. С 1998 года театр возглавляет директор Александр Васильевич Игнатенко.

К 20-й годовщине Гродненского областного театра кукол в 2000 году совпал приход в театр режиссёра Олега Олеговича Жюгжды и художника Ларисы Анатольевны Микиной-Прободяк, значительно изменивших подход к эстетическому, нравственному и философскому качеству спектаклей для детей. Более вдумчивый и серьёзный репертуар, многоплановость и глубина сценического прочтения, использование всей палитры выразительных средств современного театра позволили создать ряд ярких, незаурядных спектаклей для семейного просмотра. Постановки, созданные ими, дали новый творческий импульс, заинтересовали зрителей своей новизной и тонким художественным вкусом, привлекли к театру новых поклонников, стали настоящим художественным событием в республике и за её пределами.

Спектакли, созданные по известным сказкам "Морозко" М.Шуриновой, "Красавица и Чудовище" по Мари Лепренс де Бомон, "Дорога в Вифлеем", "Пiлiпка i Ведзьма" С.Ковалёва, сразу же пришлись по душе и детям, и их родителям.

В театре появляется первая белорусская кукольная опера для детей – "Кузуркиана" композитора П.Кондрусевича по либретто С.Климковича. В последующем осуществляется по-

становка оперы-буфф "Красная Шапочка" О.Жюгжды, музыка П.Кандрусевича. Спектакль, пронизанный лёгким оттенком пародийности, вводит юного зрителя в мир музыкальности. Поставленный в лучших традициях кукольного циркового шоу "Невероятный иллюзион" О.Жюгжды был с успехом представлен на гастролях и фестивалях. С большим трепетом в душе зрители смотрят спектакли "Кошкин Дом" С.Маршака, "Золотой ключик" О.Жюгжды, "Подлинная история Дюймовочки" О.Жюгжды.

Куклы... Они могут многое. Могут потрясать глубиной и объёмностью характеров, могут очаровывать тонким лиризмом и ошеломлять бурным проявлением страстей, могут выступать в ролях, полных патетики и трагизма.

Зрители не перестают удивляться таланту наших актёров, мастеров сцены: Л.Павловской. Т.Корневой, Г.Закревской, Ю.Менько, Л.Микулич, В.Прободяка, Ю.Буракова, Светланы и Александра Бабровских. В театре появилась молодёжь, которая играет в новых спектаклях, вводится в прежние постановки. Театр стремится воспитывать не только универсального актёра, виртуозно владеющего своей профессией, но и незаурядную человеческую личность.

Постоянный поиск, открытие новых выразительных средств, расширение жанровых и тематических границ кукольной сцены, богатая фантазия – вот что отличает коллектив театра кукол, вот что привлекает к его спектаклям зрителей, критиков, профессионалов-кукольников.

Театр работал и продолжает увлечённо и плодотворно работать для взрослого зрителя. Шекспировская "трилогия" "Трагедия о Макбете", "Сон в летнюю ночь", "Зимняя сказка", пластически-визуальный артефакт "Поэма без слов" по мотивам произведений Я.Купалы, кукольное кабаре "Чай на двоих" О.Жюгжды получили горячее признание не только у гродненской публики, но и за рубежом, регулярно собирая на различных Международных театральных фестивалях "урожай" наград.

Нужно особенно отметить спектакль "Трагедия о Макбете" У.Шекспира, поставленный О.Жюгждой и с успехом пред-

ставивший белорусское искусство более чем на 15-ти Международных фестивалях, на которых взял множество дипломов.

Начиная с 2001 года и по наше время, театр побывал более чем на 50-и международных фестивалях, не считая дружеских визитов и гастролей. Используя своё приграничное положение, театр успешно сотрудничает с различными польскими и литовскими театрами, активно расширяет свою гастрольную карту, представляя белорусское кукольное искусство в соседних европейских странах.

Только за последние девять лет театр побывал на гастролях и фестивалях в Польше (Торунь, Ломжа, Варшава, Вроцлав, Краков, Гданьск, Белосток, Люблин), России (Рязань, Москва, Санкт-Петербург, Калининград, Дзержинск), Украине (Ужгород), Хорватии (Загреб), Франции (Лимож, Люссере), Литве (Вильнюс, Каунас, Алитус, Панивежис), Чехии (Прага, Острава), Венгрии (Печ), Румынии (Альба-Юлия), Болгария (Пловдив), Голландии (Лимбург).

Театр – участник и лауреат не только многих международных фестивалей театров кукол, но и таких крупных драматических фестивалей, как "Встречи в России" (Санкт-Петербург), Шекспировский фестиваль (Гданьск, Польша), "Театральная конфронтация" (Люблин, Польша), "Контакт" (Торунь, Польша).

В 2003 году творческий коллектив театра был отмечен специальной премией Президента Республики Беларусь А.Г.Лукашенко "За вклад в развитие международных культурных связей Республики Беларусь".

Гродненский театр кукол показывает свои спектакли на стационаре, выезжает в сельскую местность. За год играется более 400 спектаклей.

В постановках широко используется весь арсенал выразительных средств современного театра кукол: маски, подвижные детали костюмов и декораций, работа актёров в драматическом плане. Прекрасный актёрский ансамбль, изысканная и изящная сценография, современная концептуальная режиссура, глубоко гуманистические и философские спектакли

делают Гродненский театр кукол одним из интереснейших театров Беларуси и близлежащего европейского региона.

Театр кукол – волшебный мир. Куклы на сцене живые и правдивые. Во время спектакля иногда удаётся полностью поддаться этой иллюзии. В такие моменты рождается искусство – между человеком и куклой, возникает гармония и неизвестно, кто более реален, ведь кукла не умеет лгать.

### Список литературы

1. Гродненщина накануне и в годы Великой Отечественной войны (1939–1945): (по документам гродн. архивов.): к 60-летию Великой Победы / сост.: Г.А. Андросенко и др.; управление делами Гродн. обл. исполн. комитета и др. – Гродно, 2005, – 599 с.

2. Тэатральная Беларусь: энцыклапедыя: у 2 т. Т.1 / пад рэд. А.В. Сабалеўскага, – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2002, – 568 с.: іл.

3. Материалы Государственного архива Гродненской области.

**Рабцава Аліцыя Людвікаўна,** *вядучы метадыст ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"*

# РАЗВІЦЦЁ АМАТАРСКАГА ТЭАТРА НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XX – ПАЧАТКУ XXI СТСТ.

Другая палова XX ст. прыходзіцца на пасляваенныя гады. На нашай Гродзенскай зямлі, якая славілася і славіцца сваімі тэатральнымі традыцыямі, з'яўляліся, адраджаліся самадзейныя тэатральныя калектывы. У 1944 годзе быў створаны Гродзенскі абласны Дом народнай творчасці, які аказваў метадычную дапамогу калектывам мастацкай самадзейнасці. У гэтыя гады пачынаюць працаваць тэатральныя калектывы: электрастанцыі г.Гродна, кіраўнік – Шабардзін (А.Чэхаў "Зламыснік", Н.Гогаль "Жаніцьба"); саўхоза "Рось" Ваўкавыскага раёна, кіраўнік – Мароз (А.Астроўскі "Без віны вінаватыя"); сельгастэхнікума Шчучынскага раёна, кіраўнік – Ільіна (К.Крапіва "Валодзін гальштук"); Грандзіцкай хаты-чытальні Гродзенскага раёна, кіраўнік – Арцём'ева (Т.Новікава "Абноўка"), хаты-чытальні Хамонтаўскага с/с Бераставіцкага раёна, кіраўнік – Нікаць (К.Крапіва "Валодзін гальштук"); хаты–чытальні Астрына Васілішкаўскага раёна, кіраўнік – Харытонаў (М.Алігер "Сказка аб праўдзе"); у Адэльску, Вярцілішках, Скідзелі і інш. На пачатак 1950 года ў Гродзенскай вобласці дзейнічала каля 40 драматычных калектываў: раённых – 22, гарадскіх – 16.[2; 4]

За першыя пасляваенныя гады беларуская тэатральная самадзейнасць прайшла вялікі шлях ад прымітыўных гурткоў да моцных тэатральных калектываў. У пасляваенныя часы арганізуюцца новыя тэатральныя гурткі пры раённых, гарадскіх Дамах культуры. Самымі знакамітымі тэатральнымі калектывамі, якія існуюць і сёння, з'яўляюцца калектывы пры Слонімскім РДК, Ашмянскім РДК, Лідскім РДК, Астрынскім ГДК Шчучынскага раёна.

У 1948 годзе ў Слонімскім Доме культуры арганізаваны драматычны калектыў, які ўзначальваў амаль 20 год рэжысёр М.Фрыдман. У рэпертуары – творы рускіх, беларускіх, украінскіх і замежных аўтараў. Асноўнымі вяхамі ў плённай працы гуртка былі пастаноўкі п'ес "Шляхі-дарогі" Г.Фёдарава, "Зялёная вуліца" А.Сурава, "Жаніцьба Бялугіна" А.Астроўскага і М.Салаўёва, "Любоў Яравая" К.Транёва, "У добры час" В.Розава, "Барабаншчыца" А.Салынскага і інш. У 1951 годзе на рэспубліканскім аглядзе сельскай самадзейнасці калектыў атрымаў першае месца. Ён паказалў "Вяселле з пасагам" М.Дзяканава. Высокую адзнаку атрымала пастаноўка "Нячыстая сіла" Г.Стэфанскага ў 1958 г. На рэспубліканскім аглядзе народнай творчасці, прысвечаным 40-годдзю БССР, пастаноўка "Нячыстая сіла" была паказана ў Мінску і заняла першае месца. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў тэатральны калектыў граматай. У ліку першых у рэспубліцы ў 1959 г. яму было прысвоена ганаровае званне Народнага тэатра. У 1968 г. Слонімскі народны тэатр узначаліў малады рэжысёр М.Ф.Варвашэвіч. Высокую адзнаку спецыялістаў атрымалі спектаклі: "Паўлінка" Я.Купалы, "Ганка" В.Галубка, "Васса Жэлязнова" М.Горкага, "Халімон камандуе парадам" У.Сауліча. 30 снежня 1989 года тэатр-студыя Слонімскага раённага Дома культуры атрымала статус прафесійнага тэатра [1; 3].

У 1947 г. у Ашмянскім раённым Доме культуры ўзнік драматычны тэатр (кіраўнік А.Я.Фамін). Пад яго кіраўніцтвам было пастаўлена звыш 39 п'ес: "Прапанова" і "Вішнёвы сад" А.П.Чэхава, "Свае людзі, злічымся" А.Астроўскага, "Чалавек з ружжом" М.Пагодзіна, "Любоў Яравая" К.Трэнёва, "Хто смяецца апошнім" К.Крапівы і інш. У ліпені 1959 г. на рэспубліканскім аглядзе, прысвечаным 40-годдзю БССР, драмкалектыву Ашмянскага РДК за спектакль "Аб асабістым" У.Пісталенкі было прысвоена ганаровае званне Народны тэатр. У канцы 1960 г. у Мінску на рэспубліканскім аглядзе за спектакль "Паўлінка" Я.Купалы калектыву быў прысуджаны Дыплом першай ступені. У 1965 г. на рэспубліканскім конкурсе народных тэатраў па п'есе В.Вольскага "Несцерка" быў узнагароджаны Дыпломам трэцяй ступені. У 1968 г. на абласным аглядзе спектакль па п'есе І.Шамякіна "Не верце цішыні"

атрымаў Дыплом другой ступені. У 1977 г. народны тэатр стаў лаўрэатам Першага Усесаюзнага фестывалю самадзейнай творчасці працоўных за пастаноўку спектакля "Брама неўміручасці" па п'есе К.Крапівы (рэжысёр Л.Спірыдонава). Спірыдонава працавала ў народным тэатры з 1977 па 1982 гг. Вялікую адзнаку спецыялістаў і грамадства атрымалі спектаклі "Бабін бунт" па апавяданнях М.Шолахава, "Святы і грэшны" М.Варфаламеева. З 1986 па 1989 гг. народны тэатр узначальвала малады рэжысёр А.Курневіч, якая за 3 гады ажыццявіла пастаноўкі спектакляў па п'есах А.Дударава "Радавыя", М.Матукоўскага "Мудрамер". З 1989 г. па сенняшні дзень калектывам кіруе рэжысёр Л.Спірыдонава. Сёння тэатр прадстаўляе вялікую творчую сілу, з'яўляецца Лаўрэатам і Дыпламантам абласных фестываляў "Лідскія тэатральныя сустрэчы".

Тэатральны калектыў Астрынскага ГДК Шчучынскага раёна пачаў працаваць з 1947 г. Стварыў і 25 гадоў кіраваў ім аматар тэатральнай самадзейнасці, бухгалтар лясніцтва П.К.Дзем'яновіч. У рэпертуары калектыву былі п'есы Я.Купалы "Прымакі", "Паўлінка" і "Раскіданае гняздо", К.Крапівы "Партызаны" і "Хто смяецца апошнім", В.Вольскага "Несцерка". На абласным аглядзе ў 1973 г. за спектакль "Трыбунал" па п'есе А.Макаёнка калектыву было прысвоена ганаровае званне "народны". З 1972 па 1975 гг. рэжысёрам працаваў А.Барысевіч. З 1981 па 1989 гг. народным тэатрам кіраваў прафесійны рэжысёр М.Прыёмка. За гэтыя гады рэпертуар тэатра склалі сцэнічныя работы "Верачка" А.Макаёнка, "Гапон і Любка" М.Гарэцкага, "Шчаслівы дзень" А.Астроўскага і інш. З 1993 г. народны тэатр узначальвае рэжысёр І.Шыдлоўская, а пасля – Н.Лукіна. Рэпертуар тэатра ў апошнія гады склалі п'есы У.Галубка "Ганка" і "Ветрагоны", У.Рудава "Камедыя пра нешчаслівага селяніна, яго жонку Маланку, жыда Давіда і Чорта, які страціў сэнс існавання", У.Ткачова "Слуп", А.Дударава "Люці" і інш. Народны тэатр Астрынскага ГДК пастаянны ўдзельнік абласных фестываляў, конкурсаў, аглядаў.

Першы самадзейны тэатр у Лідзе пры РДК з'явіўся ў 1948 годзе, кіраўнік – І.М.Шолк. Пад яго кіраўніцтвам былі пастаўлены п'есы А.Арбузава "Шасцёра каханых", А.Астроўскага "Без віны вінаватыя", К.Крапівы "Хто смяецца

апошнім". За пастаноўку п'есы А.Астроўскага "Лес" калектыў атрымаў рэспубліканскую прэмію. У 1961–1962 гг. калектывам кіравалі Л.Калабенін і П.Паварга. Тэатр перайшоў на пастаноўку малых форм. З прыходам у тэатр рэжысёра П.Дакука ажыццявіліся пастаноўкі па п'есах І.Козела "Над хвалямі Серабранкі" (на чарговым абласным аглядзе гэты спектакль атрымаў пуцёўку ў Мінск на Трэцюю Дэкаду народнай творчасці.), А.Астроўскага "На бойкім месцы", В.Гесява "Слава". У 1967 г. за высокія творчыя дасягненні калектыву Лідскага ГДК было прысвоена званне "народны тэатр". У наступныя гады калектывам кіравалі В.Талкалін (спектакль па п'есе В.Сабко "Захавай маю таямніцу", драма М.Лермантава "Два брата"), В.Калбушкіна (Я.Купала "Паўлінка", А.Макаёнак "Трыбунал"), В.Маёраў ("Першы урок" К.Губарэвіч), У.Самсонаў (Р.Раждзественскі "210 крокаў", М.Варфаламееў "Прыгавор", музычная казка Л.Усцінава і А.Табакова "Беласнежка і сем гномаў", В.Меліхавец (Ф.Шылер "Каварства і каханне", М.Матукоўскі "Мудрамер", І.Сівакоў "Філасофскі камень"), У.Хадарук (А.Дудараў "Люці"). Калектыў прымаў і прымае ўдзел у рэспубліканскіх, абласных фестывалях, конкурсах. Сёння тэатрам кіруе Валерый Меліхавец. Тэатр знаходзіцца ў добрай творчай форме [3].

Да ліку новых калектываў гэтага перыяду варта далучыць таксама драматычны гурток Дзятлаўскага РДК пад кіраўніцтвам В.Мацюка. Спектаклі гэтага гуртка "Паўлінка", "Пяюць жаваронкі" і "Хто смяецца апошнім" займалі першыя месцы на абласных аглядах [5, с.174].

50–60-я гады характарызуюцца ростам народных тэатраў і драматычных гурткоў. Значная частка гэтых гурткоў прыходзілася на сельскую мясцовасць. Да ліку найбольш цікавых адносіліся маладзёжны калектыў в.Запкі Свіслацкага раёна, які ўдала ўвасобіў п'есу В.Вольскага "Несцерка" [5, с.96]; драматычны калектыў Гальшанскага Дома культуры, які падрыхтаваў і пасяхова паказаў на раённым аглядзе ў Ашмянах "Навальніцу"А. Астроўскага [5, с.128]; гурток хатычытальні Астравецкага раёна на аглядзе творчасці тэатральных гурткоў добра паказаў п'есу "Паўлінка" Я.Купалы [5, с.131]; тэатральны гурток саўгаса "Малое Мажэйкава" Лідскага раёна, праца ў якім вельмі ажывілася з прыездам ў г.Ліду

рэжысёра П.Дакука (1960 г.). П.Дакука аказваў дзейсную дапамогу не толькі гуртку саўгаса Малое Мажэйкава (ажыццявіў пастаноўку па п'есе Я.Купалы "Прымакі), але і тэатральнаму калектыву клуба чыгуначнікаў г.Ліды: падрыхтаваў цікавы спектакль "Чужое дзіця" [5, с.231, 233].

Гурток калгаса імя Сталіна Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці быў вядомы вясковаму глядачу спектаклямі па п'есах "Партызаны" і "Пяюць жаваранкі" К.Крапівы, "Паўлінка" Я.Купалы, "Несцерка" В.Вольскага, "Папараць-кветка" І.Козела. З 24 лютага па 1 сакавіка 1960 года ў Мінску праходзіў Рэспубліканскі агляд мастацкай самадзейнасці калгасаў і саўгасаў Беларусі, на які былі вылучаны лепшыя калектывы з усіх абласцей. Гурток калгаса імя Сталіна Навагрудскага раёна паказаў п'есу "Выбух" М.Алтухова і М.Гарулёва. Стараннасць і энтузіязм сельскіх аматараў сцэны, вынаходлівасць рэжысёра тэхніка-жывёлавода Н.Моніча выклікалі да калектыва асаблівую сімпатыю [5, с.202 ].

У лістападзе 1960 года прайшлі раённыя, гарадскія і абласныя агляды. Нямала значных работ паказалі драматычныя гурткі раённых і калгасных Дамоў культуры. Аматары Іўеўскага РДК расказалі аб жыцці сучаснай беларускай вёскі, паказаўшы п'есу С.Свірыдава "Цені знікаюць". Шчырую пахвалу заслужылі і ўдзельнікі драматычнага калектыва Смаргонскага ДК, якія на аснове п'есы Г.Стэфанскага "Нячыстая сіла" стварылі музычную камедыю, рэжысёр А.Магадзей [5, с.220].

Летам 1966 года пачалася падрыхтоўка Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю савецкай улады. Пачынаўся ён аглядамі на прадпрыемствах, у калгасах, саўгасах, чырвоных гуртках, пры дамах культуры. Драматычны гурток саўгаса "Поразаўскі" Свіслацкага раёна вызначыўся спектаклем "Папараць-кветка", рэжысёр – Г.Вайцяхоўская. П'есай "Над хвалямі Серабранкі" І.Козела захапіліся адразу два самадзейныя калектывы саўгаса "Малое Мажэйкава" Лідскага і калгаса імя Леніна Навагрудскага раёнаў – і прыехалі з ёю на агляд у Гродна. Першую пастаноўку ажыццявіла самадзейны рэжысёр М. Кулакова, другую таксама пастаноўшчык аматар І.Тананка [5, с.254].

У 1964 г. быў створаны тэатр пры Астравецкім РДК. Званне "народны" яму нададзена ў 1983 годзе (спектакль "Дом

Бернарды Альбы" Ф.Гарсія Лоркі, рэжысёр – Г.Аксютчык). Кіраўнікі – Т.Шутко (1967–1969 гг.), Г.Аксютчык (1984–1987 гг.), Т.Нябеская (1989–1992), С.Юркойць (1993–1998), В.Турабарава (з 1999 г.). За час існавання тэатра было пастаўлена звыш 30 пастановак: Я.Купала "Паўлінка", А.Макаёнак "Трыбунал", І.Шамякін "І змоўклі птушкі", "Іркуцкая гісторыя" А.Арбузава, "Чорт і баба" Ф.Альховіча і інш.

У 1965 г. у Бераставіцкім РДК пад кіраўніцтвам В.Губіча была арганізавана работа агітбрыгады. У 1978–1987 гг. агітбрыгадай кіруе А.Барысевіч. У 1989 годзе агітбрыгада "Сонейка" атрымала званне "народнай". З 1989–1992 гг. у калектыве працуе К.Гамбаран, які ўзяў арыентацыю на пастаноўкі драматычных твораў А.Дударава "Вечар", Ю.Эрдмана "Самазабойца" і інш. У 1993 г. Н. Вытаптава паставіла спектаклі па творах В. Шылера, У. Шэкспіра, А. Бамаршэ. Тэатр мае назву "Магія гульні". Сёння тэатрам кіруе М. Хаменя [3].

Трэба адзначыць калектывы г.Гродна, якія на сённяшні дзень не існуюць, але яны ўнеслі вялікі ўклад у развіццё аматарскай тэатральнай творчасці Гродзенскай вобласці. У 1959 годзе з'явіўся тэатральны гурток пры Гродзенскім палацы культуры тэкстыльшчыкаў. У 1967 годзе яму прысвоена званне "народны". Кіраўнік з 1962 года – А. Гільварг. Сярод лепшых пастановак: "За другім фронтам" В.Скабко, "Барабаншчыца" А.Салынскага, "Паўночная мадонна" бр.Тур, "Пратакол аднаго пасяджэння" і "Зінуля" А.Гельмана, "Чалавечы голас" Ж.Както" і інш. Калектыў – лаўрэат Другога Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці, прысвечанага 70-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі. На аглядах, конкурсах спектаклі вызначаліся высокім прафесійным узроўнем як па рэжысёрскай, так і па акцёрскай лініі.

Пры Гродзенскім Доме афіцэраў у 1968 г. створаны драматычны калектыў. Званне "народны" яму было прысвоена ў 1973 годзе. Кіраўнікі: У.Трушко (з 1973 г.), І.Сіднеў (1976–1980 гг. і з 1982 г.), А.Струнін (1981–1982 гг.), Б.Валошын (1989–99 гг.). У рэпертуары – п'есы "Барабаншчыца" А.Салынскага, "Мой бедны Марат" А.Арбузава, "Чужое дзіця" В.Шкваркіна, "Дзяўчынка і красавік" Т.Ян, "Парог" А.Дударава, "А зоры тут ціхія..." Б.Васільева і інш. [3; 6, с.383–384].

70–80-я гады адзначаюцца ў Гродзенскай вобласці найбольшым ростам колькасці народных, узорных тэатраў і тэатральных гурткоў. У 1976 годзе быў створаны драматычны калектыў Іўеўскага раённага Дома культуры. Яго арганізатарам з'яўляецца рэжысёр В.Багушэвіч. У 1987 годзе калектыву прысвоена званне "народны". З 1998 года рэжысёрам тэатра з'яўляецца І. Гуртавая. Сёння кіраўнік тэатра – М.Завадскі. Сярод лепшых пастановак: У.Галубок "Хвароба ў добрым здароўі", "Паўлінка" Я.Купалы, "Драўляны рыцар" С.Кавалёва, "Радавыя" А.Дударава і інш.

У 1979 годзе на базе Малаберастravіцкага ЦДК створаны дзіцячы драматычны калектыў "Сонейка". Кіраўніком з'яўляецца Л.Валейка. Званне "ўзорны" яму было прысвоена ў 2003 годзе. У рэпертуары калектыву творы такіх аўтараў як Т.Габбэ, А.Вольскі, Г.Марчук, А.Макаёнак, Я.Купала і інш.

У Гродзенскім раёне ў 1980 годзе створаны тэатр-студыя "Гратэск" пры Верцялішкаўскім ЦДК. Яго арганізатарам і кіраўніком з'яўляецца А.Халікаў. Званне "народны" прысвоена ў 2004 годзе. У 1988 годзе А.Барысевічам створаны тэатральны гурток пры Абухаўскім ЦДК. У 1990 годзе тэатр набыў найменне "народны". З 1999 года тэатр узначальвае Б.Валошын. Лепшыя спектаклі тэатра – "Вечар" і "Злом" А.Дударава, "Раскіданнае гняздо" і "Прымакі" Я.Купалы, А.Чэхаў "Жарты" і інш. У 1995 годзе пры Абухаўскім ЦДК узнікае яшчэ адзін калектыў: лялечны тэатр "Скамарошына", арганізатарам і кіраўніком якога з'яўляецца Л.Парцяннікава. Званне "народны" яму было прысвоена ў 2007 годзе.

У 80-х гадах узнікаюць тэатральныя калектывы ў Зэльвенскім РДК (1986 г., кіраўнік – Л.Жыткевіч); "Вяскоўцы" Алекшыцкага ЦДК Бераставіцкага раёна (1982 г., кіраўнік – В.Шыш); "Батлейка" у Залескім ЦДК Смаргонскага раёна (1983 г., кіраўнік – Т.Насцюрына); дзіцячы лялечны тэатр "Шчарсунок" Шчорсаўскага ЦДК Навагрудскага раёна (1983 г., кіраўнік – Я.Моніч); лялечны тэатр "Пятрушка" у РДК г.Масты (1985 г., кіраўнік – Т.Прэдка); паэтычны тэатр "Волат" пры Астрынскім ГДК Шчучынскага раёна (1980 г., арганізатар калектыву – М.Прыёмка; кіраўніком сёння з'яўляецца І.Жукоўская); студэнцкі тэатр эстрадных мініяцюр "Верні-

саж" у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я.Купалы (1982 г., кіраўнік – В.Ляховіч). Усе гэтыя калектывы атрымалі званне "народны" і "ўзорны".

У 80-я гады пры Мастоўскім РДК узнікаюць два калектывы: дзіцячы тэатральны калектыў (кіраўнік – А.Герасімчык) і драматычны калектыў (арганізатар – І.Пацук, кіраўніком сёння з'яўляецца М.Гаўрылаў). У 1995 годзе гэтым калектывам былі прысвоены званні "ўзорны" і "народны". Спектаклі вызначаюцца высокім прафесійным узроўнем.

Сёння горад Гродна, Лідскі і Ваўкавыскі раёны лічацца самымі тэатральнымі. У Лідскім раёне існуюць народны калектыў пры Лідскім РДК (кіраўнік – В.Меліхавец), узорны драматычны калектыў "Какос" пры Лідскім РДК (1991 г., кіраўнік – А.Навіцкая), узорны тэатральны калектыў "Іскарка" Мінойтаўскага ЦДК (1993 г., кіраўнік – Г.Сідарэвіч).

Ваўкавыскі раён славіцца сваімі тэатральнымі калектывамі. У 1987 годзе быў створаны калектыў "Скрыжаванне" пры Роскім ДК Ваўкавыскага раёна (кіраўнік – І.Семеняка); у 1993 годзе дзіцячы тэатральны калектыў пры СШ №1 г.Ваўкавыска (кіраўнік – С.Сазонава); у 1990 годзе створаны дзіцячы тэатральны калектыў "Балаганчык" пры РДК г.Ваўкавыска (кіраўнік – Т.Кашавая); у 2002 годзе створаны дзіцячы музычна–драматычны калектыў "Віфлеемская зорка" пры Воўпаўскім ЦКіВЧ (кіраўнік – М.Жабартовіч). Усе гэтыя калектывы атрымалі званне "народны" і "ўзорны".

Асабліва трэба адзначыць тэатр драмы і камедыі "Славуціч" пры Ваўкавыскім РДК. Гэты калектыў створаны ў 1971 годзе, арганізаваў яго М.Гапонік. Першымі спектаклямі былі "Прапанова" і "Мядзведзь" А.Чэхава, "Калі кахаеш" М.Гарулёва. Затым былі "Пінская шляхта" Дуніна-Марцінкевіча, "Усяго адно жыццё" А.Маўзона і інш. У 1985 годзе, пасля прэм'еры спектакля "І змоўклі птушкі" па п'есе І.Шамякіна, драматычнаму гуртку было прысвоена ганаровае званне "народны". З 1986 года кіраўніком тэатра з'яўляецца В. Макуць. З кіраўніцтвам гэтага рэжысёра прыходзяць новыя традыцыі і новыя спектаклі: "Рэпетытар" Г.Палонскага, "Стары дом" Г.Казанцава, "Тарцюф" Ж.Б.Мальера, "Сон у летнюю ноч" У.Шэкспіра, "Смерць і каханне" ("Чорная панна

Нясвіжа"А.Дударава), "Дыяген" Б.Рацэра, У.Канстанцінава і інш. Калектыў неаднаразова станавіўся лаўрэатам і дыпламантам абласных, рэспубліканскіх фестываляў. Артыстам пляскалі ў далоні гледачы Зэльвы і Слоніма, Ліды і Воранава, Ашмян і Баранавічаў, Слуцка і Гродна, Мінска, Уцены, Таліна, Рыгі і Лімбажы. За вялікі ўклад у развіццё аматарскага тэатральнага мастацтва ў 2007 годзе калектыву было прысвоена званне "Заслужаны аматарскі тэатр драмы і камедыі РБ "Славуціч".

У Гродне сёння існуе шэсць тэатральных калектываў: народны тэатр гумару "Канкан" пры Гродзенскім ГМЦНТ (1991 г., кіраўнік – В.Сяліцкі), народны студэнцкі тэатр эстрадных мініяцюр "Вернісаж" пры Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я.Купалы (1982 г., кіраўнік – В.Ляховіч), узорны тэатральны калектыў "Амброзія" пры Гродзенскім абласным Палацы творчасці дзяцей і моладзі (2000 г., кіраўнік – І.Нікулін). Трэба асабліва адзначыць узорны музычна-драматычны калектыў "Гарадзенскі званочак" пры ГДК г.Гродна. Заснаваны калектыў у 1997 годзе Н.Гардон і Н.Гольцавай. У 2002 годзе за высокае выканальніцкае майстэрства яму прысвоена ганаровае званне "узорны". Цяпер кіраўніком з'яўляецца Н.Кірэева. За 12 гадоў існавання творчы багаж калектыву налічвае звыш 12 спектакляў і ён пастаянна папаўняецца новымі пастаноўкамі. Сярод самых вядомых і любімых: "Страусёнак Роккі", "Казка аб маленькім Каплікe", "Прыгоды Нязнайкі і яго сяброў" і інш. "Гарадзенскі званочак" з'яўляецца дыпламантам і лаўрэатам шматлікіх тэатральных імпрэз: абласнога фестывалю народных і ўзорных тэатраў "Лідскія тэатральныя сустрэчы", Міжнароднага фестывалю тэатраў дзяцей і моладзі "Віграшак" (г.Сувалкі, Рэспубліка Польшча), Міжнароднага фестывалю тэатраў дзяцей і моладзі "Балтык-Сатэлід"(г.Сейны, Рэспубліка Польшча) і інш. Экспертная камісія ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама лічыць, што ўзорны музычна-драматычны тэатр з'яўляецца адным з лепшых дзіцячых аматарскіх калектываў вобласці і заслугоўвае прысваення яму наймення "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь".

Цікавыя творчыя працы прапануе народны тэатр "Памфлет" Свіслацкага Дома культуры (1994 г., кіраўнік – Т.Саляхава). У 1994 годзе калектыву было прысвоена званне "узорны", а у 2007 годзе – званне "народны". У рэпертуары калектыву – "Сіняя птушка" па п'есе Мацерлінка, "Круці не круці – трэба памерці" па п'есе Л.Аляхновіча, "Сабака з залатым зубам" У.Сауліча, А.Макаёнка "Трыбунал" і інш. Калектыў неаднаразова станавіўся дыпламантам Першай ступені на абласных фестывалях тэатральных калектываў [3].

На сённяшні дзень у Гродзенскай вобласці дзейнічаюць 39 "народных" і "узорных" калектываў. У іх ліку: драматычныя – 27 (17 народных + 10 узорных), лялечныя – 5 (2 народных + 3 узорных), літаратурна–паэтычныя – 2 (народных), музычна-драматычныя – 2 (узорных), тэатр эстрадных мініяцюр – 3 (народных) [3].

Па ўсёй вобласці дзейнічаюць каля 270 тэатральных калектываў, якія не маюць звання. Гэтыя калектывы з'яўляюцца ўдзельнікамі раённых тэатральных фестываляў.

З мэтай павышэння прафесійнага ўзроўню кіраўнікоў тэатральных калектываў Гродзенскай вобласці кожны год для іх праводзяцца семінары – практыкумы.

З мэтай папулярызацыі і падтрымкі, стымулявання і развіцця аматарскай тэатральнай творчасці ў нашай вобласці праводзяцца абласныя фестывалі народных, узорных тэатраў у Ваўкавыску, Мастах, Слоніме ("Слонімскія цудадзействы"), Лідзе ("Лідскія тэатральныя сустрэчы").

**Спіс літаратуры**

1. Архіў Рэспубліканскага Дома народнай творчасці.
2. Архіў Гродзенскага абласнога Дома народнай творчасці.
3. Архіў АМЦНТ.
4. Архіў Гродзенскага абласнога ўпраўлення культуры.
5. Пятровіч, С. Тэатральная самадзейнасць Савецкай Беларусі / С.Пятровіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972.
6. Гродно: энциклопедический справочник. – Минск: Белорусская советская энциклопедия, 1989.

**Пяткевіч Аляксей Міхайлавіч,** *кандыдат філалагічных навук, прафесар УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы"*

# ЛІТАРАТУРА І ДРУК У ГРОДНЕ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII СТ.

Ідэі Асветніцтва, дзейнасць у Гродне А.Тызенгаўза шмат у чым прадыктавалі развіццё тут літаратуры і друкаванага слова. Здабыткі навукі, адукацыі, музычна-тэатральнай справы самым цесным чынам далучыліся ў горадзе да з'яўлення і пашырэння прыгожага пісьменства. Праца шматлікіх мануфактур патрабавала шырокай інфармацыйнай падтрымкі і таксама прычынілася да развіцця друку.

У 1775 годзе адкрылася ў Гродне першая ў Беларусі дзяржаўная (каралеўская) друкарня. Была яна і самай вялікай паводле аб'ёму прадукцыі з 12-ці друкарняў у краі. Перш за ўсё яна павінна была забяспечваць патрэбы гродзенскіх прадпрыемстваў у прыкладной прадукцыі – канторскіх кнігах, бланках, аб'явах, квітанцыях і іншых дробных друках. Выпускаліся і розныя юрыдычныя "справы", "абароньг", "прычыны", "адказы", звязаныя з мясцовымі судовымі працэсамі, таксама – прамовы паслоў сейма, які праводзіўся ў Гродне. Толькі ў адным 1793 годзе, як сведчыць А.Мальдзіс [1, с.132], выйшла ў Гродне каля 240 такіх выданняў. Аднак галоўнае месца ў рэпертуары каралеўскай друкарні займала асветніцкая літаратура – кнігі па філасофіі, дапаможнікі для школы, падарожжы, гістарычныя і ваенныя хронікі, медыцынскія і ветэрынарныя парады, літаратурна-мастацкія творы. Усяго выйшла 92 кнігі [1, с.137, 141] на лацінскай, польскай, стараславянскай мовах. Звяртаюць на сябе ўвагу ў прадукцыі каралеўскай друкарні такія выданні, як творы Вальтэра і Мальера, "Новая філасофія" М.Кадлубоўскага, "Флора Літвы" ў 3-х тамах кіраўніка Гродзенскай медыцынскай акадэміі Ж.Жылібера, "Усеагульная гісторыя" для 4 класа В.Скратус-

кага, кнігі павучальнай паэзіі мясцовых аўтараў. Шмат выходзіла перакладаў з французскай літаратуры – пераважна авантурна-прыгодніцкія творы, у якіх каханне трактавалася як самакаштоўнае пачуццё чалавека.

Выконваліся ў каралеўскай друкарні і заказы старaабрадцаў, якія праследаваліся афіцыйнай праваслаўнай царквой і знаходзілі прытулак за межамі Расіі, у тым ліку і ў Беларусі. У Гродне выдаваліся іх псалтыры, розныя "цветники", "службы", "часовники", "канонники". Яны пераважна перадрукоўваліся з маскоўскіх і кіеўскіх выданняў ранейшага часу, не выпраўленых афіцыйнай царквой. Мяркуецца, што выпушчана ў друкарні, арганізаванай А.Тызенгаўзам, 30 такіх кніг. Пачынаюць яны выходзіць, як лічыць А.Зёрнава [2, с.230], з 1781 года. Зрэшты, аб гэтым сведчыць і спіс тагачасных гродзенскіх друкаў, падрыхтаваны А.Мальдзісам [1. с.138]. На тое, што гэтыя кнігі выпушчаныя менавіта прыхільнікамі даўняй веры, звярталі ўвагу многія кнігазнаўцы – ад вядомага рускага бібліёграфа В.Сопікава да сучасных аўтараў. Між іншым, Сопікаў адносіў да прадукцыі стараабрадцаў побач з іншымі гродзенскімі друкамі 90-х гадоў зборнік "Цветник священноинока Дорофея", выдадзены ў 1796 годзе [3, с.261]. Гэта быў год, калі Гродна ў выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай было далучана да Расіі. Але ўжо кнігу "Поучения св.Иоанна Златоустаго" (1798), апошнюю з выпушчаных у Гродне кірыліцкім друкам, не залічвае да вытворчасці стараабрадцаў [3, с.176]. І гэта зразумела: яны, напэўна, не змаглі ажыццявіць гэта выданне ў духу сваёй веры ў новых грамадска-палітычных умовах.

Разам з тым даследчыкі, пачынаючы ад В.Сопікава, даволі аднадушна выказваюць сумненне, ці друкавалі наогул свае кнігі стараверы ў Гродне. Па-першае, мяркуецца, што асноўная перашкода таму – адсутнасць, быццам бы, кірыліцкіх шрыфтоў у каралеўскай друкарні. Але ж відавочна, што такія шрыфты тут былі. Пра гэта сведчаць не толькі згаданыя вышэй "Поучення св.Иоанна Златоустаго", але і выпушчанае раней, у 1795 годзе "Слово по случаю открытия Верховнаго Литовского правления". Зрэшты, Я.Арлоўскі да-

пускаў, што "ў Гродне існавала руская друкарня" [4, с.170–171], з чым згадзіцца ніяк нельга, бо гэта не пацвярджаецца фактамі.

Праўда, эпізадычныя кірыліцкія друкі з'яўляліся ў горадзе над Нёманам задоўга да адкрыцця тут каралеўскай друкарні – у 1686, 1691, 1735, 1767 гг. [5, с.33]. Але гэты факт якраз і можна прыпісаць інтрыгам стараабрадцаў, якія дзеля ўласнай канспірацыі называлі Гродна як месца выпуску сваіх кніг. Бо занадта раскіданыя гэтыя выданні ў часе, і звязаць іх з нейкім адзіным выдавецкім пунктам не выпадае. Друкарні ў горадзе тады не было. Праўда, калі не лічыць невялікага варштата францысканцаў, які з 1678 года выпускаў, відаць, бюлетэнь "Awizy grodzienskie" і выдаў "Konstytucie Sojmu..." Такім чынам, друкі стараабрадцаў выходзілі, напэўна, у каралеўскай друкарні, якая ў сваёй выдавецкай палітыцы кіравалася асветніцкай талерантнасцю, а пазначаныя ранейшым гродзенскім адрасам – гэта хутчэй за ўсё містыфікацыя прыхільнікаў старой веры.

У каралеўскай друкарні выходзіла ў свет і першая ў Гродне газета – "Gazeta Grodzienska" (1776 – каля 1783). Таксама была прадуктам асветніцкіх ініцыятываў А.Тызенгаўза. Мела дзвюхпалосны фармат, выпускалася адзін раз на тыдзень. Інфармавала пра жыццё горада, краіны, давала звесткі з замежжа. Друкавала аб'явы, рэкламу. Нядоўга – у 1796–1797 гг. (з III.X. па I.IV) дзейнічала ў Гродне газета "Kurier Litewski", пераведзеная ў Вільню, дзе разгарнулася яе працяглая гісторыя. У канцы 1792 года (з X па XII) выходзілі тут "Wedomosci Grodzienskie" – орган Таргавіцкай канферэнцыі. У 1776–1800 гадах выдаваўся ў Гродне пазнавальна-асветніцкі штогоднік "Kalendarz Gospodarski...", што рыхтаваўся Т.Дубітоўскім. Змяшчаліся тут, акрамя каляндарнай інфармацыі, матэрыялы на этнаграфічныя, гістарычныя, метэаралагічныя, медыцынскія, гаспадарчыя тэмы, давалася статыстыка.

Каралеўская друкарня ў Гродне працавала і пасля таго, як не стала тут А.Тызенгаўза. У 1788 годзе яна перайшла ў рукі Б.Рома, які з 1792 года стаў падпісваць выданні сваім прозвішчам [6, с.222–223]. Былі гэта пераважна яўрэйскія

друкі, якія не захаваліся. Магчыма, Б.Ром набыў частку каралеўскай друкарні і стаў праводзіць сваю выдавецкую палітыку. Сучасная яўрэйская крыніца сцвярджае, што Б.Ром "атрымаў ад расійскіх уладаў прывілей на адкрыццё яўрэйскай друкарні ў Гродне" [7, с.278] і выпусціў першую сваю кнігу ў 1791 годзе. Але ж расійскіх уладаў у гэты час у горадзе яшчэ не было. І найбольш верагодна, што Б.Ром стаў валодаць гродзенскім прадпрыемствам (ці часткай яго) у 1788 годзе. А.Мальдзіс абазначае час дзейнасці гродзенскай друкарні пад кіраўніцтвам Б. Рома 1788–1802 гадамі [1, с.133]. Быў, праўда, у горадзе яшч адзін друкар, якога можна лічыць адным з наступнікаў А. Тызенгаўза. Гэта Я.Ясенскі, што дзейнічаў тут у 1794–1796 гадах і выдаў дзве кнігі. А.Мальдзіс рэгіструе яшчэ М. Тамашэўскага як уладальніка прыватнай друкарні ў Гродне [1, с.133]. Ён выдаў на польскай мове адзін са сваіх твораў – "міфалагічна-гістарычную" трагедыю "Ахвяра Мінервы".

Увогуле ж літаратурна-мастацкае жыццё ў горадзе звязана ў гэты час з імёнамі вядомых тады польскамоўных паэтаў. Гэта майстар сатырычных вершаў С.Трамбецкі, выдатны байкапісец С.Кубліцкі, што выпусціў у Гродне кнігу "Баечкі і забавы прозай і вершам" (1780). Таксама – А.Лаўрыновіч, аўтар зборніка "Паўкапы баек", які выйшаў у Гродне ў 1789 г. І.Ляхніцкі, вядомы грамадска-палітычны дзеяч у Гродне, выдаў напісаную на мясцовым матэрыяле "Біяграфію селяніна, што жыве на берагах Нёмана, вышэй Ласосна" (Варшава, 1815). Паплечнік Т.Касцюшкі, рэвалюцыянер і паэт Я.Ясінскі выпусціў у каралеўскай друкарні агітацыйна-асветніцкі верш "Да польскіх выгнаннікаў. Пра сталасць" (1793), у якім апяваецца рэвалюцыйная Францыя. Друкаваліся ў Гродне і творы польскага паэта Ф.Карпінскага, які ў 80-90-я гады XVIII ст. часта бываў у Гродне, а пазней асеў непадалёку ў маёнтку Хараўшчына. Былі выдадзены ў Гродне ў гэты час і шэсць казанняў прапаведніка і ўдзельніка паўстання 1794 г. М.Карповіча, які, можна меркаваць, нярэдка тут бываў.

Што да гродзенскага школьнага тэатра езуітаў, знанага ў ранейшыя часы высокім узроўнем сваёй сцэнічнай дзей-

насці, то ў другой палове XVIII ст. ён ужо спыніў сваю творчасць. Дакладней, апошні яго спектакль датуецца ў гістарычных крыніцах 1754 годам. Да другой паловы стагоддзя яшчэ адносяцца п'есы гродзенскіх аўтараў, пастаўленыя на сцэне езуітаў. Гэта лацінамоўная трагедыя на тэмы старажытнарымскай гісторыі "Літасць – высакародны спосаб помсты" (I752), якая належыць пяру мясцовага выкладчыка паэтыкі Ф.Ідвеля. І яшчэ да тутэйшай літаратуры можна аднесці дзве п'есы Р.Гempля, пастаўленыя езуітамі ў 1750 і 1754 гадах [8, с.310].

У гэты час у Гродне працавалі выкладчыкамі розных навучальных устаноў аўтары грунтоўных лацінамоўных філасофскіх трактатаў, перакладчыкі і публіцысты М.Дамашэвіч, А.Бандзевіч, Б.Мажэйка, Ю.Мышкоўскі, І.Стырпейка, Б.Станкевіч, якія прыкметна паўплывалі на развіццё літаратуры ў рэгіёне. І яшчэ. Тут пашыраліся ў рукапісах ананімныя літаратурныя песні на беларускай мове. У іх раскрываліся свецкія інтарэсы чалавека, найперш пачуцці кахання ў іх самых розных праявах, што добра адпавядала духу таго часу.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**


1. Книга, библиотечное дело и библиография в Белоруссии: сборник статей. – Минск, 1974.

2. 400 лет русского книгопечатания. – М., 1964.

3. Сопиков, В. Опыт российской библиграфии. Ч.1 / В.Сопиков. – СПб, 1813.

4. Орловский, Е. Гродненская старина. Ч.I. / Е.Орловский. – Гродно, 1910.

5. Пяткевіч, А. Маршруты кніжнага слова: з гісторыі кнігі, друку на Гродзеншчыне / А.Пяткевіч. – Варшава, 2002.

6. Drukarze dawnej Polski od XV do XVIII wieku. Zeszyt 5. – Wroclaw-Krakow, 1959.

7. Краткая еврейская энцилопедия. Т.7. – Иерусалим, 1994.

8. Мальдзіс, А. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Літаратура Беларусі пераходнага перыяду (другая палова XVII–XVIII стст.) / А.Мальдзіс. – Мінск, 1980.

## ЗМЕСТ

***Першыя гарадзенскія чытанні*** ........................................................ *3*
Пяткевіч А.М. Развіццё беларускай кнігі на Гродзеншчыне........ 4
Швед В.В. "Газэта Гродзеньска" – адна з першых газет Беларусі 10
Игнатович Ф.И. Ж.Э. Жилибер и его попытка издания медико-биологического журнала в Гродно ............................ 20
Афанасьева Т.Ю. "Гродненские губернские ведомости" в фондах Национального исторического архива Беларуси в г.Гродно ............................................................................ 29
Смалянчук А.Ф. Горадня на старонках "Нашай нівы". 1906-1910 гг. ........................................................................ 33
Амелька У.П., Амелька С.У. Перыядычны друк Гродзеншчыны ў гады станаўлення беларускай дзяржаўнасці (1990-я - пачатак 2000-х гадоў). ........................................................ 42
Береснева Е.П. «Гродненская правда» - главная газета области 50
Турмасава Л.І. Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага – адзін з буйнейшых фондатрымальнікаў пасляваеннага перыядычнага друку Гродзенскай вобласці ........ 56
***Другія гарадзенскія чытанні*** ........................................................ 61
Швед В.В. Калі нарадзіўся горад Гродна? ............................ 62
Госцеў А.П. Гродна: назвы горада на працягу 880-гадовай гісторыі ........................................................ 66
Дабрыян А.А. Археалагічныя даследаванні ў Гродна............... 76
Куль-Сяльверстава С.Я. Ад каралеўскага горада да губернскага цэнтра: Гродна на мяжы XVIII – XIX стст. ..... 84
Карнялюк В.Р. Горад-музей Гродна без экскурсаводаў ........... 97
***Трэція гарадзенскія чытанні*** ........................................................ 109
Швед В.В. Давыд Даўмонтавіч – абаронца зямлі гарадзенскай . 110
Марозава С.В. Стэфан Баторый і Гродна .................................. 114
Трусов И.Г. Архитекторы, которые работали в Гродно в XVI веке ........................................................................ 129
Занеўскі С.В. Асоба Марціна Пачобута-Адляніцкага ў гісторыі беларускіх зямель ................................................ 141

Кітурка І.Ф. Антоній Тызенгаўз у справе мадэрнізацыі Гарадзенскай сталовай эканоміі (другая палова XVIII ст.) ........ 154
Куль-Сяльверстава С.Я. Жанчыны ў тэатральным жыцці Гродна ў другой палове XVIII-XIX стст. ........ 164
Госцеў А.П. Яўстафі Арлоўскі – "чалавек навукі" і "настаўнік-чалавек", чалавек культуры ........ 175
Герасимович Т.И. Личности гродненских губернаторов в истории Гродно ........ 185
Ярмусік Э.С. Каталіцкія святары Гродзеншчыны – ахвяры сталінскіх рэпрэсій ........ 194
***Чацвёртыя гарадзенскія чытанні* ........ 203**
Кітурка І.Ф. Гародня часоў Антонія Тызенгаўза: палітычны, эканамічны, культурны цэнтр ВКЛ ........ 204
Швед В.В. Антоній Тызенгаўз і сучасны Гродна ........ 215
Куль-Сяльверстава С.Я. Гродзенскі універсітэт у другой палове XVIII стагоддзя ........ 222
Лябецкі У.С. Невядомыя старонкі гісторыі музычнага мастацтва Гродна: з рэпертуару тэатра Антонія Тызенгаўза .. 229
Трусов И.Г. К истории здания театра кукол в Гродно ........ 236
Ярашук М.В. Тэатральнае жыццё Гродна першай паловы XIX ст. у мемуарнай літаратуры ........ 244
Шарэнда Г.П. Рэпертуар гродзенскага тэатра XIX стагоддзя . 252
Пятроўская С.Г. Гродзенскі абласны драматычны тэатр: гісторыя і сучаснасць ........ 258
Данильчик М.Е. Волшебный мир театра кукол: история и современность ........ 269
Рабцава А.Л. Развіццё аматарскага тэатра на Гродзеншчыне ў другой палове XX – XXI стст. ........ 275
Пяткевіч А.М. Літаратура і друк у Гродне ў другой палове XVIII ст. ........ 286

ISBN 978-985-6835-90-5

9789856835905

Навукова-папулярнае выданне

**ГАРАДЗЕНСКІЯ ЧЫТАННІ**

Зборнік матэрыялаў

Камп'ютэрная вёрстка *А.Лаўнікові̌ч*

Камп'ютэрны дызайн *А. Курпік*

Карэктары: *І. Г. Трайнель, А.К. Вайцяхоўская, Ж.А. Жэгздрын, А. Дж. Бруйло*

Падпісана да друку 30.05.2011. Фармат 60x84/16.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 17,03. Ул.-выд. арк. 18,15.
Тыраж 500 экз. Заказ 1932.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Гродзенскае абласное ўнітарнае
паліграфічнае прадпрыемства «Гродзенская друкарня».

ЛИ № 02330/0552822 ад 08.04.2009.
ЛП № 02330/0552745 ад 25.02.2009.

Вул. Паліграфістаў, 4, 230025, Гродна.


ОВСКАГО

